# СКІДЗЕЛЬ

# 500

# ГОД ГІСТОРЫІ

УДК 94 (476)

ББК 63.3.(4 Беи)

**Аўтары:**
І.Барысаў, М.Дзелянкоўскі, А.Вашкевіч, Д.Люцік, Я.Лялевіч, З.Сямашка, С.Токць

**Рэцэнзенты:**
Генадзь Семянчук, дацэнт кафедры этнаграфіі і археалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы

Аляксей Шаланда, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі Навук Рэспублікі Беларусь

Рэкамендавана да друку кафедрай этнаграфіі і археалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы

**Рэдакцыйная калегія:**
Я.Я.Васілеўскі, І.А.Вітко, М.А.Лазовік, І.А.Барысаў, С.М.Токць (навуковы рэдактар), А.Л.Жвалеўская, З.А.Сямашка, З.І.Міхальчук, К.С.Федаровіч, П.Ф.Чабатарэвіч.

**Скідзель**. 500 год у гісторыі / І.Барысаў, М.Дзелянкоўскі, А.Вашкевіч, Д.Люцік, Я.Лялевіч, С.Токць. – Гродна: Гродзенская абласная тыпаграфія, 2008. – 220 с.

Навукова-папулярная праца, прысвечаная 500-годдзю горада Скідзеля. На аснове шырокага кола архіўных крыніцаў, вусных успамінаў і краязнаўчых матэрыялаў аўтары прасочваюць гісторыю Скідзеля ад часу першай узгадкі ў старадаўнім дакуменце да сучаснасці. Кніга прызначана шырокаму колу чытачоў, як прафесійных гісторыкаў, так і для ўсіх тых, хто цікавіцца мінулым нашай краіны.

ЗМЕСТ

**Слова да чытача (Я.Я.Васілеўскі)**

**Раздзел 1. Скідзель у Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай (канец XV – XVIII ст.) (Сяргей Токць, Янка Лялевіч)**

**Раздзел 2. Скідзель у складзе Расійскай імперыі (1795 – 1915) (Сяргей Токць)**

Прастора, насельніцтва і адміністрацыйныя структуры

Панскі двор і сялянская гаспадарка

Рэформа 1861 г. і змаганне за зямлю

Парэформенная сялянская гаспадарка

Пагроза абеззямельвання: у пошуках выйсця

Валаснае самакіраванне

Царква і школа

Скідзельскія яўрэі

**Раздзел 3. У міжваеннай польскай дзяржаве (1921-1939 гг.). (Сяргей Токць, Андрэй Вашкевіч, Дмітры Люцік)**

**Раздзел 4. Скідзельскае паўстанне 1939 г. (Ілля Барысаў, Сяргей Токць)**

**Раздзел 5. У полымі вайны (1941-1945) (Дзмітры Люцік, Ілля Барысаў, Сяргей Токць)**

Пачатак вайны: гераічная абарона Скідзеля

У страшныя гады акупацыі

Вызваленне

**Замест эпілогу: кароткі нарыс навейшай гісторыі Скідзеля**

Дадатак 1. Скідзельшчына літаратурная (Мікалай Дзелянкоўскі).

Дадатак 2. Спіс гаспадароў Скідзеля ў 1816 г.

Спіс скарачэнняў

## Слова да чытача

Дарагія чытачы!

Мінула 500 гадоў, як у старажытных дакументах упершыню з'явілася назва Скідзель, якая напачатку абазначала двор вялікага князя. З мовы старажытных яцвягаў слова Скідзель перакладаецца, як "шчыт", "застава". Магчыма, што тут сапраўды калісці была застава на шляху да Гродна. Двор Скідзель з'яўляўся цэнтрам воласці, населенай сялянамі-землярobamі і воінамі-баярамі. Ужо з сярэдзіны XVI ст. вядомыя назвы ўсіх вёсак сучаснай Скідзельшчыны, якія часта ўтвараліся ад прозвішчаў першых іх жыхароў. А мястэчка Скідзель было заснаванае ў сярэдзіне XVII ст. як цэнтар гандлю і рамёстваў паводле прывілею караля Рэчы Паспалітай Уладзіслава IV ад 1644 г. Тагачасныя жыхары Скідзеля ўжо клапаціліся пра адукацыю і культуру. У цэнтры мястэчка адразу ж была збудаваная царква, выдзеленыя вольныя ад падаткаў пляцы пад школу і шпіталь.

Скідзель быў заснаваны не ў самы спрыяльны час. Войны, якія тады пракаціліся па нашай Беларусі, нішчылі даробак працавітых скідзельцаў. Таму жыхарам мястэчка не раз даводзілася ад пачатку адбудоўваць свой Скідзель. І кожны раз ён паўставаў з руінаў. Жыхары Скідзеля вызначаліся не толькі працавітасцю, але таксама вальналюбствам і ўпартым характарам. Яны лічылі сябе людзмі вольнымі ад паншчыны і прыгону, і ўпарта супраціўляліся ўсім спробам пазбавіць іх гэтых правоў.

Як і ўсе мястэчкі Гродзеншчыны, Скідзель быў месцам, дзе мірна ўжываліся людзі рознай этнічнай і канфесійнай прыналежнасці. Побач з заснавальнікамі мястэчка беларусамі тут здаўна жылі яўрэі, татары, палякі, расіяне. І ніколі ў Скідзелі не было канфліктаў на нацыянальнай ці рэлігійнай глебе. Наадварот, у цяжкую часіну скідзельчане, ня гледзячы на этнічныя і канфесійныя адрозненні, дапамагалі адзін другому, як толькі маглі. І так было заўсёды. А ў суровыя гады ваенных ліхалеццяў скідзельцы мужна змагаліся супраць захопнікаў, былі адважнымі і ўмелымі салдатамі. У гады Вялікай Айчыннай вайны загінулі на фронце, у партызанскіх атрадах, у канцэнтрацыйных лагерах і фашысцкіх засценках 50 жыхароў Скідзеля. Пра няўміручы подзвіг скідзельскіх камсамольцаў-падпольшчыкаў ведаў увесь Савецкі Саюз. Сённяшнія жыхары Скідзеля свята шануюць памяць пра сваіх загінуўшых землякоў.

Пасля страшэнных знішчэнняў апошняй вайны скідзельчане хутка адбудавалі свой горад, які ператварыўся з аграрнага мястэчка ў індыстрыяльны сучасны горад. У Скідзелі паўстаў першы ў Беларусі цукровы камбінат, было заснавана шмат іншых прадпрыемстваў. Сёння эканоміка горада дынамічна развіваецца, дэманструе высокую эфектыўнасць ва ўмовах сучаснай канкурэнцыі. Камбінат

хлебапрадуктаў з'яўляецца галоўным падаткаплацельшчыкам у Гродзенскім раёне. Пастаўляе сваю прадукцыю на замежныя рынкі масласырзавод.

Горад славіцца сваімі культурнымі і спартыўнымі традыцыямі. У апошнія гады ён змяняецца і харашэе на вачах. Скідзельчане ўпэўнена глядзяць у будучыню. Як і іх продкі – старадаўнія мяшчане, яны з'яўляюцца людзмі адкрытымі на іннавацыі, але вернымі сваім традыцыям і сваёй гісторыі.

**Старшыня Скідзельскага раённага**
**Выканаўчага камітэта**
**Ян Янавіч Васілеўскі**

## Раздзел 1

## СКІДЗЕЛЬ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (канец XV – XVIII ст.)

У матэрыялах Літоўскай метрыкі[1] ў канцы XV – на пачатку XVI ст. даволі часта ўзгадваецца назва Скідзель, якой абазначаецца вялікакняскі двор у Горадзенскім павеце. Гэты двор разам з воласцю (ваколічныя сёлы, якія адміністрацыйна яму падпарадкоўваліся) пры вялікім князі Аляксандры Казіміравічы Ягелончыку (1461-1506) знаходзіўся ў трыманні асобага княскага намесніка Януша Аляксандравіча. Відаць, гэты намеснік быў у сваю чаргу падпарадкаваны горадзенскаму старасце. Паводле актаў княжання Жыгімонта І Старога (1506-1548) органам цэнтральнай улады ў Скідзельскай воласці з'яўляецца вельмі часта менавіта горадзенскі стараста.

Калі быў заснаваны княскі двор у Скідзелі, нам звестак знайсці не ўдалося. Але гэта магло адбыцца за часоў князя Вітаўта (1392-1430), а можа і раней. Напрыклад, у дакументах метрыкі захаваліся звесткі пра заснаванне суседняга са Скідзелем двора Жараслаўка. Недзе ў 1496 г. жараслаўчане сарочнік[2] Даніла Пабоценькаў, бацька яго Якаў Кораз, які перад тым быў сарочнікам у Жараслаўцы, Хлебен, Барсук Іванавіч, Іванюк Маркавіч сведчылі перад вялікім князем Аляксандрам, што “великий князь Витовтъ приехал на тое местцо, где тепере дворъ господарьский Жерославка. А тут в тот часъ на том местцы седели люди господаръскии Городенъскаго повета на имя Олексичи. И великому князю Витовту тое местцо подобалося на двор”. І перасяліўшы гэтых людзей Алексічаў за Нёман у пушчу, Вітаўт справіў на іх селішчах двор. Ад таго часу Жараслаўка стала вялікакняскім дваром: “...и после великого князя Витовта такеж тот двор Жерославка держан къ Городну во вси лета живота великого князя Жикгимонта, ажъ и до его смерти”. Падданыя нават памяталі імёны цівуноў вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча (1432-1440), якія кіравалі гэтым дваром: “перво Муровка, а другий Арод, а третий Мартинъ”. Пасля смерці Жыгімонта, сьведчылі далей жараслаўчане, “приехал Михайло Кголикгиновичъ, и въ тот двор самъ увезался и подержалъ со два годы,

[1] *Літоўская метрыка*, умоўная назва архіва канцылярыі Вял. Кн. Літоўскага XIV- XVIII ст.
[2] *Сарочнік*, прадстаўнік улады ў дзяржаўных сялян у Вял. Кн. Літоўскім. Выбіраўся ад 40 двароў.

и корол его милость будучи ещо великимъ княземъ тотъ дворъ Жерославку за ся на себе взял"[ Акты Литовско-Русского государства. Вып. 1: 1390-1529 г. / Изданы М. Довнар-Запольским. Москва, 1899. № 45. С. 73; Акты Литовской метрики (далей – АЛМ). Т. 1. Вып. 1: 1413-1498 гг. / Собраны... Ф.И. Леонтовичем. Варшава, 1896. Вып. 1. № 332. С. 129.], – з дакумента вынікае, што было гэта напэўна недзе ў 1442 г.

Скідзельскі двор найчасцей узгадваецца ў дакументах у сувязі з раздаваннем земляў у Скідзельскай воласці розным асобам, пераважна баярам, якое адбывалася ўжо ў часы княжання Казіміра Ягелончыка (1440-1492). Так, 8 лютага 1496 г. вялікі князь літоўскі Аляксандр надаў гаспадарскаму лоўчаму Леўку Вейкневічу "землю пашную и бортъную на имя Мелеховъщину, которую державъ ловецъ отца нашого Казимира, короля его милости, на имя Васко"[ Русская историческая библиотека (далей – РИБ). Т. 27. Книга записей 5. № 125. Ст. 645; Lietuvos Metrika (далей LM): knyga Nr. 25 (1387-1546)/ užrašymų knyga 25. – Vilnius, 1998. № 84. С. 145; АЛМ. Т. 1. Вып. 1. № 233. 91.]. І ўжо **9 сакавіка 1498 г.** той самы Леўка просіць ў Вялікага князя **"дву пустовщинъ в Городенском повете подле Скидла на имя Покладовъщины а Пашковъщины" [**LM - 25. № 67. С. 128; № 85. С. 145; АЛМ. Т. 1. Вып. 2: 1499-1507 гг. Варшава, 1897. № 524. С. 49**]**. Напэўна, гэтая самая ранняя ўзгадка назвы Скідзель ў гістарычных дакументах. У **1508 г.** на гэтыя землі па сваім мужу нябожчыку атрымала пацвярджэнне ўдава Васіліса Леўкавая Вейкневічавая [LM - 25. № 86. С. 146]. У 1511 г. нейкі чалавек Скідзельскай воласці просіць вялікняскага пацверджання на пустоўшчыну Зубейкаўшчыну, якую атрымаў яшчэ яго бацька Серко "з росказанья его милости Казимира" на асобную службу і дзякла [LM - 9. (1511-1518) / užrašymų knyga 9. Vilnius, 2002. № 54. С. 102].

У 1501 г. стараста горадзенскі Аляксандр Юр'евіч атрымаў прывілей на "семъ служобъ: у Скиделской волости на имя Гануса Шафроновича, а Олекса, а брата его Карпа, а в Дубеньской волости Федора Денковича, а Данила, а Радивона, а Сидора Комеля" [LM - 25. № 83. С. 144-145; АЛМ. Т. 1. Вып. 2. № 541. С. 58-59; № 610.С. 96-97]. Пяць службаў на імя Косцькавічаў з сям'ю дымамі ў Скідзельскім павеце, з пашняй, дубровай "близко дороги великое Городенское, едучи до Городна на правой руце" і сенажацямі каля свайго двору Мількаўскага прасіў у 1508 г. у вялікага князя пан Мікалай Юр'евіч Пацэвіч [LM - 8. (1499-1514)/ užrašymų knyga 8. Vilnius, 1995. № 372. С. 285]. У 1516 г. з прычыны таго, што "тот лист будучи ему на дорозе с прыгоды замок и сказил ся", Мікалай Юр'евіч атрымлівае новы пацвярджальны ліст на гэты маёнтак [LM - 9. № 549. С. 304]. Добры Мількаўшчына Мікалая Паца ўзгадваюцца ў 1537 г., калі, паводле камісарскіх справаў, пацвярджаюцца межы гэтага двору са Скідзельскімі ўладаннямі вялікай княгіні Боны [LM - 1. (1380-1584)/

užrašymų knyga 1. Vilnius, 1998. № 259,260. С. 62; № 263. С. 63: № 267.С. 64].

У 1511 г. Мікалай Пац вёў справу з горадзенскім плябанам касцёла маткі Божай (пазнейшая Фара Вітаўта) аб выплаце царкоўнай дзесяціны[3] са сваёй пашні Лесішчаў, пад час якой ён сведчыў, што "тая деи пашня здавна дедина и отчизна моя была; нижли Казимеръ король его милость тую пашню отнялъ былъ от предковъ моихъ, не ведаю для которое причины, и приверънулъ къ Скидлю". Ад таго часу і пачалася сплочвацца царкоўная дзесяціна, але калі ўжо Жыгімонт вярнуў зямлю Мікалаю Пацу, той адмовіўся плаціць, бо "за предковъ его десетины тамъ не бывало". Справа вырашылася ўсё ж на карысць плябана касцёла маткі Божай, бо вялікі князь пастанавіў: "коли то держано было за отца и за брата нашого, кролевъ ихъ милости, и за насъ къ двору нашому Скидълю, а десетина съ того даивана, – ино и тыми разы не слушная речь то намъ рухати" [РИБ. Т. 20. Книга судных дел 3. № 144. Ст. 753].

Як і ў іншых частках Вялікага княства Літоўскага, у Скідзельскай воласці на пачатку XVI ст. баярству шырока раздаваліся зямельныя надзелы. Нейкаму баярыну Горадзенскага павета ў 1511 г. была дана пустоўшчына Далістошчына [LM - 9. № 318. С. 219.], у 1514 г. дзве пустоўшчыны – камусці Міхайлу Паўшу [LM - 9. № 523. С. 290]. У тым жа 1514 г. Жыгімонт дазволіў абруснаму Васку Зеновевічу Маселевічу абмяняць дзве пустоўшчыны з двума падданымі на раўнамоцнае валоданне ў межах адной Скідзельскай воласці [LM - 9. № 498. С. 281; LM - 1. № 334. С. 77]. У 1516 г. Міхайлу Фёдаравічу Браныцу былі даны тры службы з двумя пустоўшчынамі на Струзе [LM - 9. № 543. С. 301]. Адверны Чыж са сваёй браццю атрымлівае пацвярджэнне на тое, што купіў дзякальную зямлю "у Скидельской волости к реце Свислочи" і справіў сабе млын на Свіслачы "съ своее земли къ своему берегу" [LM - 9. № 364. С. 235]. Замест занятай пустоўскай зямлі Дашкоўшчыны на Свіслачы ў 1522 г. адверны гаспадарскі Чыж выпрасіў у Жыгімонта іншую пустоўскую зямлю Шастакоўшчыну ў Скідзельскай воласці [LM - 10 (1440-1523) / užrašymų knyga 10. Vilnius, 1997. № 41. С. 59].

У 1516 г. горадзенскі гараднічы Федзька Гаўрылавіч атрымлівае пацверджанне на 5 службаў у Скідзельскай воласці [LM - 9. № 559. С. 309 - 310]. У 1520 г. горадзенскаму баярыну Васку Кошчычу замест земляў Алісееўшчыны і Ерамееўшчыны ў Скідзельскай воласьці, якія калісь трымаў з даніны Ленька Гагін (напэўна, усё ж Ленька Сасін), Жыгімонт замяняе на дзве іншыя – Кандратаўшчыну і Вераскоўшчыну на рацэ Горніца на іншым беразе Нёмана, абумовіўшы замену тым, што "тые земли намъ потребни суть к двору нашому Скидлю" [LM -10. № 50. С. 64]. У красавіку 1521 г. стараста горадзенскі атрымаў 9 службаў Скідзельскай і Горадзенскай валасцей [LM -25. № 179. С. 239].

[3] *Дзесяціна*, прынашэнне царкве дзесятай часткі даходаў.

Служэбнік гаспадарскі Яцута з братамі Васкам і Іванам прасілі ў вялікага князя ў 1523 г. пустоўскую зямлю Давідаўшчыну ў Скідзельскай валасці, “а к тому леска на въспол и у границах от Нестеревы границы ажъ до Жорноклововы границы” [ЛМ-12. (1522-1529)/ užrašymų knyga 12. Vilnius, 2001. № 275. С. 271]. У верасні 1533 г. за сваю сталовую службу казак Іванавіч атрымаў землі Соўкаўшчыну і Ачкараўшчыну каля Скідзеля [ЛМ-1. С. 67].

9 студзеня 1516 г. вялікі князь заставіў двор Скідзель старасту гарадзенскаму Юрыю Мікалаевічу Радзівілу за 500 коп[4] грошай з усімі людзмі воласці Скідзельскай, з іх службамі і падаткамі, з усімі даходамі, “которые зъ места и з волости Скидельской на насъ (г.зн. на гаспадара – аўтары) хоживали” [ЛМ-9. № 210. С. 174.]. Наступны застаўны ліст быў выданы ў 1520 г., калі за 981 капу грошай літоўскіх Юры Радзівіл атрымаў у дзяржанне Жараслаўку і Скідзель [ЛМ-10. № 67. С. 76]. У гэтым лісце вялікі князь заставіў “ему тот двор наш у Городеньском повете на имя Скидел з дворцомъ Жорославскимъ, со всими людми нашыми Скидельское и Жорославское волости путъными и данными, и с тяглыми, и с конюхи, и с кухарьми, и с псарцы, и ловцы, и осочники, и сторожи, и со всими иными людми тых волостеи наших, и зъ их всими службами, и з данными грошовыми и медовыми, и с бобровыми, и куничными, и с дяклами оръжаными и овсяными, и с сеном подяколным, и с колодиною, и с корчомными пенязми, и з ставы, и з млыны, и пожитки, которие з места и з волости Скидельское и Жорославское на нас хоживали, и с пашнею дворною, и с землями пустовскими, со всим с тым, как тые двори наши на насъ деръжаны были, ничого на нас не оставляючи”. Гэтая цытата з вялікакняскага ліста яскрава ілюструе той факт, наколькі разнастайным быў склад насельніцтва тагачаснай Скідзельскай валасці, і якімі былі іх павіннасці і абавязкі перад дзяржаўнай уладай. Скідзельскі двор разам з дварамі Азёры, Крынкі і Адэльск вялікі князь нават дазволіў віленскаму біскупу Яну адкупіць з рук Юрыя Радзівіла [ЛМ-1. № 303. С. 72].

Аднак Скідзельская воласць усё ж не стала прыватным магнацкім уладаннем, як многія іншыя, а засталася ў гаспадарскім ці дзяржаўным валоданні. У 1533 г. ішлі ўпартыя судовыя цяжбы паміж княгіняй Бонай і Мікалаем Радзівілам за землі маёнтка Котра ці Ракіцін, суседняга з дваром Скідзель, якія завершыліся поўнай перамогай Боны, і ў Радзівіла зусім не засталося тут валоданняў. Уздоўж новых межаў уладаньняў Боны былі пастаўлены капцы (насыпаныя ўзвышшы, якія пазначалі межы): “от дороги скидельской, которая идет от Скидля до церъкви Святого Спаса на Котры (сучасная вёска Коматава), першый копецъ вчынили, а отътоль стежкою по Рокитине до дороги соволиское, которая от Соволишокъ до тое жъ церкви Святого Спаса идет, осмъ копъцов положено. А тою дорогою соволискою через березъникъ на тую

[4] *Капа*, грашовая адзінка, роўная 60 грошам.

жъ дорогу скидельскую, подле которое первшый копец естъ вчыненъ, а тою дорогою до дороги озерское, которая от Жыдомъли идет до тое ж церкви святого Спаса на Котре – до тых сутокъ дванадцать копъцовъ въчынили. А на сутъкахъ великий копецъ естъ вчыненъ. А оттоль озерскою дорогою в тую сторону къ Жыдомъли, до межы Яна Мацкевича, семъ копцовъ тежъ положыли.” У 1537 г. Скідзель таксама ўзгадваецца ўжо як уладанне вялікай княгіні Боны [ЛМ-1. № 260. С. 62; № 263. С. 63].

Менавіта італьянка Бона Сфорца, жонка Жыгімонта I Старога (з 1518 г.) лічыцца ініцыятарам “Валочнай памеры” – аграрнай рэформы, прынцыпы якой былі сфармуляваныя ва “Ўставе на валокі” 1557 г. і дапаўненнях да гэтай уставы 1558 г. У сваіх валоданнях каралева Бона пачала праводзіць рэформу ўжо ў 1540-х гадах. Сутнасць яе палягала на тым, што ўсе ворыўныя землі ў гаспадарскіх валоданнях дзяліліся на асобныя ўчасткі – валокі[5], якія станавіліся адзінкай для налічэння павіннасцяў. Валока складался з 30 моргаў[6], але на практыцы яе памер мог вагацца ад 30 да 46 моргаў у залежнасці ад якасці глебы (у сярэдзіне валокі магла патрапіць багна ці пясчаныя ўчасткі, што кампенсавалася дадатковымі моргамі). Мернічыя стараліся, каб валока мела выгляд правільнага чатырохкутніка, бакі якога называліся сценамі. Зямельныя ўчасткі, што выходзілі за межы чатырохкутніка, называліся таму засценкамі. Іх давалі асобным сялянам у якасці наддатку (калі глеба была не вельмі добрая), ці за асобны чынш. Рэформа акрэслівала чатыры катэгорыі глебы паводле якасці: добрая, сярэдняя, дрэнная (подлая), вельмі дрэнная. Ад гэтага залежаў памер чыншу – грашовага падатку за карыстанне валокай. Валокі падзяляліся на асадныя і цяглыя. За першыя плацілі толькі асаду – грашовую плату, а за другія трэба было яшчэ адпрацоўваць два дні ў тыдзень у дворным фальварку. Былі яшчэ службовыя валокі, за якія іх трымальнікі выконвалі асобную службу на карысць вялікага князя – лоўніцкую, псярэцкую, бортніцкую, гуменніцкую і г.д.

Хаця ініцыятары рэформы планавалі, што кожную валоку будзе браць у карыстанне асобная сялянская сям’я, ва ўмовах тагачасных земляробчых тэхналогій і дэмаграфічнай структуры беларускага грамадства апрацоўваць такі надзел і выконваць усе павіннасці звычайна браліся дзве сям’і (часта гэта былі блізкія сваякі, хаця і не заўсёды), а часам і тры.

Валочная памера прадугледжвала ў большасці выпадкаў таксама перанос сялянскіх сядзібаў на новыя месцы. Кожная валока ў адпаведнасці з трохпольнай сістэмай земляробства (азімае ворыва, яравое і пар), дзялілася на тры часткі. Сялянскія сядзібы размяшчаліся

[5] *Валока*, асноўная зямельная мера і адзінка падаткаабкладання ў Вял. Кн. Літоўскім. Раўнялася 21,36 га, складалася з 30 моргаў.
[6] *Морг*, адзінка вымярэння плошчы ў Вял. Кн. Літоўскім. Раўняўся 0,71 га. Складаўся з 30 прутоў.

на сярэднім палетку. Прычым вёскі ўпарадкаваліся такім чынам, каб хаты сялян былі выцягнутыя ў рад уздоўж вуліцы, па другім баку якой узводзіліся гаспадарчыя пабудовы. Усе палеткі адной вёскі ці дворнага фальварка мернічыя стараліся звесці да трох вялікіх суцэльных кавалкаў (абрубаў), каб не было шкоднай для гаспадарання цеаразпалосіцы. З аднаго боку, валочная памера падвышала эфектыўнасць сельскай гаспадаркі, але, з другога, узмацняла ўладу дзяржавы і землеўладальнікаў над сялянствам, вяла да ўзрастання сялянскіх павіннасцяў, падрывала непарушнасць права ўласнасці селяніна на той надзел, які ён да гэтага абрабляў. У перспектыве гэта мела вельмі далёкасяжныя наступствы для жыцця беларускай вёскі.

У 1558 г. Себасцянам Дыбоўскім і Лаўрынам Войнай быў складзены рэгістр Гродзенскай каралеўскай эканоміі, у тым ліку і Скідзельскай воласці, у якім былі адлюстраваны вынікі праведзенай тут валочнай памеры [Писцовая книга Гродненской экономии с прибавлениями. Изданная Виленскою коммисией для разбора Древних актов. Т. 1. Вильно, 1881.]. Адміністрацыйным цэнтрам воласці з’яўляўся гаспадарскі двор Скідзель, які займаў пляц плошчай 2 моргі 12 прутоў[7]. Прычым у дакуменце адзначалася, што двор на гэтым месцы “старадаўна стаіць”. Непадалёку стаяў дворац з гумном і аборамі, якія займалі 2 моргі 10 прутоў. Там жа заставаліся 3 моргі 2 пруты ворнага поля. Паблізу размяшчаліся пяць гародаў і сад вакол ставу, якія займалі 5 моргаў 16,5 прутоў. Пад самым дворам знаходзіўся альховы гай плошчай 2 моргі 2 пруты. Над рэчкай Скідзель размяшчаўся выган для дворнай скаціны плошчай 1 валока 6 моргаў. На рэчцы былі пастаўлены два млыны: адзін каля самога двору, а другі – трохі далей. Дворнае ворыва займала плошчу 24 валокі і было падзеленае на тры палеткі па 8 валокаў у кожным. Два першыя з іх знаходзіліся, як і двор, з правага берагу Скідлянкі, а трэці палетак – на супрацьлеглым беразе (якраз там, дзе зараз і размяшчаецца горад Скідзель, ці дакладней сказаць, яго старая частка). Дворная сенажаць таксама была падзеленая на тры часткі. Першая знаходзілася на беразе рэчкі Спушы і займала плошчу ¼ валокі. Гэтую сенажаць абавязаны быў касіць войт карашаўскі Клім Корпач са сваім войтаўствам. Другая сенажаць знаходзілася пад Скідзельскай пушчай ва ўрочышчы Рэчка і займала плошчу 1 валока 20 моргаў. Яе павінен быў касіць войт паддоўжыцкі (хвайнянскі) Раман Буры. І трэцяя сенажаць знаходзілася каля рэчкі Пыры, непадалёку вёсак Старына і Губінка і лічыла 2 валокі сярэдняга грунту. Яе павінен быў касіць са сваім войтаўствам войт Ян Корс. Такім чынам, дворныя сенажаці займалі плошчу 4 валокі 24 моргі. Усяго ж, як можна падлічыць, да скідзельскага двору належала больш 30 валокаў зямлі.

[7] Прут (прэнт), адзінка вымярэння плошчы ў Вял. Кн. Літоўскім. Раўняўся 23,7 м$^2$.

На супрацьлеглым ад двору беразе Скідлянкі былі пасаджаныя агароднікі Скідзельскага двору, якія мелі па 6 моргаў зямлі. Па два моргі знаходзіліся пры іхніх сядзібах, два ў першым дворным палетку і два ў трэцім. Агароднікі былі паселеныя вуліцай уздоўж Скідлянкі, хаты размяшчаліся тылам да рэчкі, а насупраць праз вуліцу – гумны. Усяго налічвалася тых агароднікаў 24. Усім разам ім было нададзена 4 валокі 24 моргі ворнай зямлі. За гэтую зямлю кожны з іх павінен служыць у двары штотыдзень па 2 пешых дні, а іх жонкі – летам па 6 дзён. Каля вёскі Карашава ва ўрочышчы Насовічы агароднікам былі выдзелены 24 моргі на сенажаць, па моргу на гаспадара. Дакладней сказаць, гэта быў лес ці зараснікі. За гэтую зямлю павінны былі плаціць чынш па 1 грошу[8] 7 пенязяў за морг, ці 40 грошай 8 пенязяў за ўсю сенажаць. Дакладна невядомае паходжанне агароднікаў. У гістарыяграфіі прынята лічыць, што яны былі нашчадкамі "нявольнай чэлядзі" ці ваеннапалонных вялікага князя.

На адной вуліцы з агароднікамі былі паселены служкі. Тут жа абапал Скідлянкі ім выдзялілі чатыры валокі зямлі, якія межавалі з вёскай Сухі Скідзель (пазнейшыя Сухаўляны). Служкі ўтваралі дзве заможныя гаспадаркі па 2 валокі. Жук і Яшка Кулішэвічы мелі 6 валоў і 3 коней, а Багдан і Андрэй Кулішэвічы 4 валоў і 2 коней. Каля рэчкі Спушы паміж валокамі вёсак Бубны і Раўкоўцы служкі атрымалі 8 моргаў сенажаці, за якую яны плацілі чынш 13 грошай 6 пенязяў, ці па 1 грошу 7 пенязяў за морг. Служкі павінны былі па загаду вялікага князя ці яго намеснікаў ездзіць з рознымі даручэннямі, і гэта з'яўлялася іх галоўным службовым абавязкам.

Скідзельскі двор быў цэнтрам воласці, да якой належалі тры войтаўствы – Скідзельскае, Паднямонскае і Паддоўжыцкае. Да гэтых войтаўстваў належала 297 валок, з іх 168 цяглых, 83 асадных, 35 служэбных, 11 нядаўна прынятых з ільготнай платай. З кожнай цяглай і асаднай валокі належала плаціць двору грашовы чынш ад 8 (з дрэннага грунту) да 12 (з сярэдняга грунту) грошай, даніны 6 грошай (напачатку ўяўляла сабой пастаўку двору курэй, яёк, адной гускі з дзесяці двароў і стацыі, ці кармлення дворныхураднікаў), за невады (якія сяляне ў рэчаіснасці не плялі) 2 грошы, даваць воз сена ці 3 гроша і за адвоз яго да двору 2 гроша, што ў суме складала ад 21 да 25 грошай. Апроч таго, з цяглых валок належала адпрацаваць у двары па два дні ў тыдзень "з чым двор прыкажа". А з асадных валокаў замест працы ў двары належала плата 30 грошай, за гвалты[9] бочку[10] або дзве жыта, ці 5 грошай за бочку (таксама ў залежнасці ад якасці глебы), за

[8] Грош, сярэбраная манета ў Вял. Кн. Літоўскім, раўняўся 10 пенязям.
[9] *Гвалты (згоны)*, адпрацовачная павіннасць сялян для выканання тэрміновых сельскагаспадарчых работ у двары феадала, удзельнічаць у якой павінны былі ўсе працаздольныя члены сялянскай сям'і.
[10] *Бочка Віленская*, мера сыпкіх рэчываў у сістэме мер Вял. Кн. Літоўскага. Раўнялася 406,54 л, прыблізна адпавядала 19 пудам пшаніцы, 18 – жыта, 15 ячменю, 10 пудам аўса.

талаку[11] 12 грошай. У суме з асаднай валокі выходзіла ад 68 да 77 грошай, што адпавядала кошту 14-16 бочак жыта. З усіх валокаў, як цяглых, так і асадных, належала таксама даць двору адну ці дзве бочкі аўса і 5 грошай за адвоз кожнай бочкі.

На захад ад двору Скідзель па левым беразе Скідлянкі размяшчаліся сярэдняй якасці валокі вёскі **Некрашы**. Да гэтай вёскі належалі 16 валокаў, з іх 14 цяглых і 2 асадных млынарскіх. З кожнай цяглай валокі павінны былі плаціць па 12 грошай чыншу. Усяго з цяглых і асадных валокаў у Некрашах выходзіла платы 8 копаў 24 грошы, 32 бочкі аўса, а за адвоз аўса ад кожнай бочкі па 5 грошай, ці 2 капы 40 грошай.

Некрашоўцы яшчэ прынялі каля Карашава 14 моргаў "подлага" грунту з умовай плаціць за морг па 2 грошы, ці ўсяго 28 грошай. Сенажаць ім была дадзеная ва ўрочышчы Насовічы каля Карашаўскай пушчы і граніцы зямель княгіні Жыжэмскай у разліку да кожнай ворнай валокі па 2 моргі, ці ўсяго 32 моргі сярэдняга грунту. Плаціць павінны былі за морг па аднаму грошу. Уся плата двору з вёскі Некрашы, за выключэннем аўса і яго адвозу, складала суму 9 копаў 24 гроша гатоўкай. Некрашоўцы мелі цяглай жывёлы 45 валоў і 25 коней. Паміж Некрашамі і вёскай Пярэдняя Пыра (прыкладна на месцы сучаснай вёскі Гушчыцы) знаходзіўся засценак царквы св. Юрыя плошчай 2 валокі 5 моргаў, а таксама дамы папоў той царквы.

На паўднёвы ўсход ад двору за сядзібамі і ворывам агароднікаў і служкаў па беразе Скідлянкі размяшчалася вёска **Сухі Скідзель** (пазнейшыя **Сухаўляны**). У гэтай вёсцы лічыліся 28 цяглых валокаў і 2 бартняцкія. Сяляне павінны былі з кожнай цяглай валокі плаціць па 8 грошай. Разам з іншымі выплатамі гэта складала ў суме 9 копаў 48 грошай. Апроч таго жыхары вёскі павінны былі даваць двору 28 бочак аўса, а за адвоз іх 2 капы 20 грошай. А з бортніцкіх валокаў належала служба бортніцкая ў пушчы Скідзельскай і Мількаўскай.

Сенажаць вёскі Сухі Скідзель знаходзілася на Кабылавай Грудзе і Грынічаве, абапал рэчкі Спушы, каля вёсак Спушы і Бубны, і займала плошчу 30 моргаў, ці па моргу на валоку. За морг сяляне плацілі па 5 пенязяў. Акрамя таго, у гэтай вёскі была яшчэ каля вёскі Падлесся і лесу Гніліца "сенажаць з кустамі 5 моргаў подлага грунту", якія прынялі Сцяпан а Васька Храпялевічы і Якаў Трошчыч. Плацілі яны з морга па 5 пенязяў, а ўсяго 2 гроша 5 пенязяў. За выключэннем бочак аўса і іх адвозу грашовыя павіннасці жыхароў Сухога Скідзеля складалі 10 коп 5 ½ гроша. Сухаўлянцы мелі 69 валоў і 39 коней.

На ўсход ад двору Скідзель размяшчалася вёска **Падлессе ці Гніляны (**пазнейшыя **Гліняны)**, да якой належалі 36 валокаў зямлі, з іх 34 цяглых, адна войтаўская і адна цяслярская (займаў яе цясляр Антон

[11] *Талака*, народны звычай калектыўнай дапамогі. Пазней ператварылася ў прымусовыя работы на грамадскія патрэбы і патрэбы феадала.

Зіновавіч, які служыў пра двары). Войтаўская валока з'яўлялася вольнай ад платы. Вуліца гэтай вёскі была выцягнутая ўздоўж балота Гніліцы, тылам да яго, а гумны праз вуліцу. Падлясяне павінны былі плаціць з кожнай валокі чынш па 12 грошай. Разам з іншымі выплатамі гэта складала ў суме 14 копаў 10 грошай. Апроч таго, належала яшчэ даваць двору 68 бочак аўса, а за адвоз іх 5 копаў 40 грошай. Тут жа, за сцяной іх валокаў, падлясянцам было нададзена 25 моргаў 15 прутоў балоцістай "нікчэмнасці". З гэтых наддаткаў яны не павінны былі нічога плаціць. Да надзелу Падлясянаў таксама была нададзена сенажаць каля лесу Гніліцы і невялікага возера Пьявіца 36 моргаў, за якія павінны былі плаціць па 1 грошу 7 пенязяў ці 1 капу 1 грош 2 пенязі. З усіх валокаў Падлесся, за выключэннем платы за адвоз аўса, выходзіла 16 копаў 18 грошай 4 пенязі. Падлясянцы мелі 127 валоў і 71 каня.

За Падлессем пачыналіся палеткі вёскі **Вялікае Карашава** (пазнейшая **Белякоўшчына)**, вуліца якой выцягнулася ўздоўж рэчкі Спушы, тылам да ракі, а гумны стаялі праз вуліцу насупраць. Да той вёскі належалі 26 валокаў подлага грунту, з якіх, праўда, тры валокі яшчэ на той час ніхто не прыняў. Адна валока лічылася войтаўскай, а 22 цяглымі. Сяляне Карашава мелі 55 валоў і 28 коней. З цяглых валокаў мусілі плаціць па 8 грошай чыншу. Разам з іншымі выплатамі ў суме гэта складала 7 копаў 42 грошы. Апроч таго належала даваць двору аўса 22 бочкі, за адвоз іх 1 капу 50 грошай. Калі хто пажадаў бы заняць непрынятыя яшчэ валокі, дык два гады павінен плаціць толькі па 42 грошы.

Селянін гэтай вёскі Андрэй Хрыстовіч прыняў яшчэ 3 моргі засценку грунту сярэдняга, за якія плаціў 9 грошай. Засценак каля балота Гнілічы плошчай 12 моргаў ворыва і 2 моргі сенажаці быў аддадзены асочнікам (дзве траціны) і селяніну Падлесся Багдану Юрэвічу (траціна), з якога павінны плаціць па 2 гр. за морг ці ўсяго 28 гр.

Сенажаць карашаўцам была нададзена на балоце Гнілішчы – 26 моргаў, за якія належала плаціць па 1 гр. 7 пенязяў за морг, а з 23 прынятых валокаў выхадзіла 39 гр. 1 пенязь. З усіх жа валокаў, моргаў і засценкаў той вёскі ў суме выходзіла платы 9 копаў 58 гр. 1 пенязь. Лаўнік Павел Астрынцэвіч, які выконваў у воласці судовыя функцыі, з братам Хацеем трымаў 2 валокі.

Над возерам Андрусевічы і каля аднайменнага сяла паўстала вёска **Малы Карашаў**, у якім вымераныя былі 20 валокаў, але прынятыя на той час толькі 2. Іх прынялі асочнікі Шымка, Блажэй і Янка Яцкевічы (магчыма Іоскевічы) і Іоська і Сенька Несцяровічы. Гэта былі вельмі заможныя гаспадары, якія мелі разам 8 валоў і 11 коней. Валокі тут былі дрэннай якасці – "лясамі і багнамі выходзяць". На першы год пасяленцы былі вольныя ад усіх павіннасцяў, а потым два гады павінны былі плаціць па 42 гроша, а калі гэты тэрмін

заканчваўся, дык выконваць усе павіннасці, як і астатнія жыхары воласці.

Да Скідзельскага войтаўства таксама належала "псярэцкае" сяло **Раўкоўцы**. Адна "палаць" гэтага сяла размяшчалася тылам да рэчкі Скідзель, другая размяшчался насупраць першай, тылам да валокаў сяла Доўжыцы. У тым сяле лічыліся 30 валокаў сярэдняга грунту, з іх 15 псярэцкіх вольных, 10 лоўчых вольных, а 5 на чыншу асадных. Псярцы Войтка Сяньковіч, Дзямід Станіслаўвіч, Грынец Івановіч, Васіль Казелек, Путач Сезюковіч жылі пры скідзельскім двары, былі вольныя ад усякіх платаў. Тыя гаспадары, якія трымалі 5 чыншавых валокаў, павінны былі плаціць за іх па 1 капе 37 грошай, ці ўсе разам 8 копаў 5 гр. А з 10 лоўчых валок гаспадары "ведлуг старадаўняга абычаю" павінны былі на каралеўскія ловы з сабакамі хадзіць, а таксама нарыхтаваць 5 сціртаў сена на ловы ў Берштаўскай пушчы. Пасля памеры ў Раўкоўцах захаваўся засценак плошчай 5 моргаў грунту сярэдняга, які прыняў псярэц Марка Стасюкевіч, за што мусіў плаціць 15 гр. Таксама 16 моргаў сенажаці сярэдняй на рэчцы Спушы прынялі 8 псярцаў таго сяла. А Ахрым Еўлашэвіч і Сенька Сідаровіч прынялі ва ўрочышы Гнілічы 5 моргаў добрай сенажаці і 16 грунту сярэдняга. Плаціць яны павінны былі з добрага морга па 1 гр. 7 пенязяў, а з сярэдняга – па 1 гр., што ў суме складала 24 гр. 5 пенязяў. Усяго з таго сяла выплат выходзіла 8 коп 44 гр. 5 пенязяў. Раўкоўцы выглядалі самай заможнай вёскай у Скідзельскім войтаўстве, жыхарам гэтага сяла належалі 80 валоў і 41 конь.

Усяго ж да Скідзельскага войтаўства належалі 6 вёсак, якія мелі ў карыстанні 100 цяглых валок, 14 асадных, 30 службовых, а 2 валокі былі толькі нядаўна прынятыя. З гэтых вёсак належала да двору платы 55 копаў 54,5 гроша. Сяляне войтаўства мелі 384 вала і 215 коней.

Да Панямонскага войтаўства Скідзельскай воласці належалі вёскі Капачова, Мазанава, Пярэдняя Пыра, Бірулічы і Канюхі. Войтам тут быў Як Коўш. Да вёскі **Капачова** (пазнейшае **Каўшова**), размешчанай на беразе Нёмана, належалі 44 валокі сярэдняга грунта, з іх 2 войтаўскія, 2 асадныя валокі пад войтам, 1 гуменніцкая[12], а рэшта – 39 валокаў – цяглых. Войт Ян Коўш з сынамі Сташкам і Грысютам трымаў 4 валокі, меў 7 валоў і 5 коней. Васюк Арэшкавіч з сынамі сідзеў на гуменніцтве. Усяго з вёскі выходзіла выплатаў 18 коп 49 гр. Войт Ян Коўш прыняў яшчэ бору хваёвага "годнага на будаванне" 3 валокі грунту "выпустнога", вельмі подлага. Павінен быў плаціць па 15 гр. за валоку, а ўсяго 45 гр. Усёй вёскай капачоўцы прынялі 10 валокоў вельмі дрэннага пясчыстага выпусту, за які плацілі па 15 гр., ці ўсяго 2 капы 30 гр. Сенажаць ім была нададзена на рэчцы Пыра ва ўрочышы Менькава каля сенажаці баяр Бытьчыц, Канстанціновічаў і Талочкаў, якую раней дзяржалі кавалі Алексічы, да кожнай валокі па 2 моргі, а

[12] *Гуменнік*, дворны слуга, які загадваў дворнымі гумнамі

ўсяго 88 моргаў сярэдняй сенажаці. Плацілі за яе з морга па 1 грошу, ці ўсяго 1 капу 28 гр. Усяго ж з Капачоў, акрамя аўса і адвозу, належала платы 23 капы 32 гр. Жыхары Капачова мелі працоўнай жывёлы 106 валоў і 60 коней.

Сялу **Мазанава**, таксама размешчанаму блізу Нёмана, належалі 11 валокаў сярэдняга грунту каля грунтаў пані Зброшкавай. Усе валокі былі цяглыя, з іх акрамя адпрацовак належала платы 3 капы 35 грошай. Акрамя таго, сяляне павінны былі даваць па 2 бочкі аўса і за адвоз па 5 грошай. Жыхары Мазанава мелі працоўнай жывёлы 28 валоў і 13 коней. Назва гэтай вёскі відавочна пайшла ад прозвішча жыхароў Алехны, Куча, Марціша, Кандрата і Багдана Мазановічаў.

У вёсцы **Перэдняя Пыра**, якая размяшчалася на беразе рэчкі Пыра пры ўпадзенні яе ў раку Котру, было вымерана 15 валокаў зямлі, але 8 валокаў вялікі князь аддаў баярыну Піліпу Панасовічу з Васілішкаўскай воласці, каралеўскаму мярнічаму, а адну валоку – баярыну Адаму Аліхверовічу. У выніку пад уладай Скідзельскага двору засталося 6 цяглых валокаў сярэдняга грунта. З іх належала платы 2 капы 30 гр., апроч адпрацовак і 12 бочак аўса і 5 гр. за яго адвоз.

Землі пыранскіх сялянаў межавалі з землямі баяраў Гушчыцаў, Чыжэвічаў і Левановічаў. Да вёскі быў прыдадзены засценак подлага грунту пясчыстага плошчай 8 моргаў, які з'яўляўся вольным ад аплаты. Яшчэ быў прыдадзены адзін засценак над рэчкай Пырай плошчай 11 моргаў, за якія ўжо трэба было плаціць па 3 грошы, як з грунту сярэдняга ці ўсяго 33 грошы. Таксама пыранцы мелі кавалак сенажаці плошчай 1 морг 20 прутоў з платай за яго 5 гр. За рэчкай Котрай, абапал гасцінца, які вёў з Горадна да Скідзеля, засталося 25 моргаў грунту подлага, якія пакінулі пад карчму. Прыняў гэты засценак Іван Русак. Ён плаціў па 2 грошы за морг, ці ўсяго 50 грошай.

Вёсцы Пярэдняя Пыра былі нарэзаныя 24 моргі добрай сенажаці ва ўрочышчы Воўчая Сцежка каля сенажаці вёсак Лашэвічаў і Бірулічаў. Выходзіла па 4 моргі на валоку. Павінны былі плаціць з морга па 1 гр. 7 пенязяў ці з 24 моргаў 40 гр. 8 пенязяў. Усяго ж з жыхароў Пярэдняй Пыры, апроч аўса і адвозу, належала платы да двору 5 коп 11 грошай 8 пенязяў.

Ніжэй па цячэнні на беразе Котры размяшчалася вёска **Бірулічы**, па суседству з грунтамі баяраў Хацяневічаў. У тым сяле было 17 валокаў сярэдняга грунту, з іх у 1560 г. налічвалася 12 асадных і 5 цяглых. Але, калі ў 1561 г. 9 цяглых валокаў ад сяла Пярэдняй Пыры было аддадзена баярам, дык 9 асадных валокаў у Бірулічах перавялі ў разрад цяглых, каб было каму працаваць на дворным палетку. З гэтай вёскі за валокі належала плаціць 9 копаў 41 гр., а таксама даваць 34 бочкі аўса і 2 капы 50 грошай за іх адвоз. Вяскоўцам быў прырэзаны ў якасці наддатку выпуст для жывёлы да ракі Котры плошчай 5 моргаў за 10 гр. платы, сенажаць ва ўрочышчы Воўчая Сцежка 34 моргі добрага грунту, за якую плацілі 57 гр. 8 пенязяў. Яшчэ засценак 9

моргаў “подлага” грунту прырэзалі да валокаў Хведзькі Мараўчыца і Супрона Валасовіча, паколькі “іх рэзкі нікчэмным пясчыстым грунтам выходзілі”. Уся плата з сяла Бірулічы, акрамя аўса і яго адвозу, складала суму 10 копаў 48 гр. 8 пенязяў. Назва гэтай вёскі відавочна пайшла да Паўла, Янкі, Трахіма і Васюка Бірулічаў. Сялянам яе належалі 41 вол і 19 коней.

Да Наднямонскага войтаўства належала таксама сяло **Канюхі** над рэчкай Котрай, у якім налічвалася 13 прынятых сялянамі асадных валокаў і 2 яшчэ на той час непрынятых. З кожнай валокі, з увагі на дрэнную якасць, належала па 8 гр. чыншу. А ўсе грашовыя выплаты за валокі Канюхоў складалі 15 копаў 49 гр., апроч таго 13 бочак аўса і 1 капа 5 гр. за адвоз. Таксама да вёскі прырэзалі “сенажаць з хростам”, якую пан Ленарт Клачко ўступіў канюхоўцам, плошчай 33 моргі “грунту подлага” за валокі іх багністыя без платы. Цяглай жывёлы ў Канюхах налічваліся 52 валы і 31 конь. На валоцы Васіля Лаўрыновіча і Лукьяна Цімановіча мелася 6 валоў і 4 каня.

Такім чынам, Панямонскае войтаўства аб’ядноўвала вёскі, размешчаныя па берагам Нёмана і Котры. А ў Паддоўжыцкае войтаўства ўвайшлі суседнія вёскі Пузева (пазнейшыя Пузавічы) і Храпава, размешчаныя на беразе рэчкі Доўжыцы, прытока Котры. Войтам тут быў Грынец Хвядцэвіч. У вялікім сяле **Пузеве** налічваліся 51 асадная валока і 1 войтаўская сярэдняга грунту. Пузеўцы павінны былі плаціць за іх 65 копаў 27 гр. гатоўкай, даваць 102 бочкі аўса і 8 копаў 30 гр. за яго адвоз. Да гэтай вёскі належала сенажаць добрая у старыне ўрочышча Забродзішча Рагойніч, каля сенажацяў баяраў Дасуцічаў і Канстанцінавічаў, плошчай усяго 52 моргі за плату 1 капа 28 гр. 4 пенязі. Усяго ж з таго сяла Пузеўцы належала платы 66 копаў 55 грошай. Сяляне гэтай вёскі трымалі працоўнай жывёлы 116 валоў і 59 коней.

Вуліца сяла **Храпава** цягнулася паралельна да вуліцы Пузеўцаў. Тут налічваліся 34 валокі сярэдняга грунту. Але ў 1559 г. было прынята толькі 6 валокаў, а ў 1560 г. – яшчэ тры. Заставаліся непрынятымі 24 валокі і 1 была войтаўскай, на ёй сядзеў войт Грынь Хвядцэвіч з сынамі Мялешкам і Алехнам. Навасельцы пасяліліся ў Храпаве паводле лісту каралеўскіх рэвізораў пана Пальчэўскага і ксяндза Піліхоўскага, якія ажыццяўлялі рэвізію ў Скідзельскай воласці. Яны павінны былі плаціць на працягу трох першых гадоў па 52 гр. чыншу. Сенажаць да сяла Храпава была нададзена ва ўрочышы Пальсікоўшчыне (магчыма Пашкоўшчыне), каля сенажацяў баяраў Брандзічаў і Талочкаў. Плаціць за яе сяляне мусілі 17 гр. з 10 прынятых моргаў. Жыхары Храпава мелі на той час хатняй жывёлы 19 валоў і 11 коней. Усяго ж з сялян 13 вёсак, а таксама ад агароднікаў і служкаў да двору Скідзель належала платы 193 капы 45,5 грошай.

На паўднёвы ўсход ад Скідзельскай воласці размяшчалася воласць Мілкаўскага двору. Да гэтага двору належалі сёлы: Савонева

(пазнейшыя Русінаўцы), Рышчышкі (пазнейшыя Рыскі), Хойнава, Доўжыца (пазнейшыя Хвайняны), Саленнікава (пазнейшыя Ахрымаўцы), Бубнава, Осьнікі, Навумава, Спуша, Прыступічы і Плытніца. Большасць з гэтых сёлаў увайшла пазней у абшар гістарычнай Скідзельшчыны.

Сяло Савонева размяшчался на беразе Скідлянкі, да яго належала 28 валокаў подлага грунту, з якіх 18 было цяглых, 7 асадных, 2 войтаўскія і 1 гуменніцкая. Войт Міхал Русін трымаў 2 валокі. Менавіта ён, напэўна, вызначыў пазнейшую назву вёскі Русінаўцы. Сяляне гэтай вёскі плацілі за валокі 13 копаў 49 гр., а таксама давалі 25 бочак аўса і 2 капы 5 грошай за адвоз. Разам з засценкамі ўся плата з вёскі складала суму 14 копаў 49 гр. без уліку аўса і адвозу. У сялян Савонева было працоўнай жывёлы 27 коней і 63 валы.

Да размешчанай таксама на беразе Скідлянкі вёскі Рышчыцы (Рыскі) належалі 19 валокаў сярэдняга грунту, з іх 15 цяглых, 2 асадных і 2 адверніцкіх. Плацілі за гэтыя валокі 8 коп 49 грошай і давалі 34 бочкі аўса і 2 капы 50 гр. за адвоз. Мелі таксама наддатак ва ўрочышчах Ханевічы і Гітартоўшчына. Усяго ж з Рышчыцаў належала платы 9 коп 17 гр. Жыхары вёскі трымалі 26 коней і 49 валоў.

Да сяла **Хойнава**, якое размяшчалася па беразе рэчкі Лешна, належалі 15 валокаў сярэдняга грунту, з іх 14 цяглых і 1 служэбная цясельская. Да гэтай вёскі належаў наддатак 30 моргаў, ці па 2 моргі на кожную валоку. Хойнаўцы плацілі за свае валокі 5 копаў і 50 гр., давалі 28 бочак аўса і 2 капы 20 гр. адвозу. Пётр Шэшка асобна сідзеў на грунце засцянковым, за які плаціў 1 капу 17 гр., даваў 2 бочкі аўса і 10 гр. за адвоз. А ўсяго з Хойнава выходзіла платы двору 9 коп 5 гр.

Побач з Хойнава на беразе рэчкі Доўжыцы знаходзілася сяло **Доўжыца** (пазнейшыя **Хвайняны**), да якога належала 21 валока вельмі дрэннага грунту, за які належаў чынш усяго 6 грошай. Усе сяляне Доўжыцы сідзелі на асадзе і плацілі за свае валокі 23 капы 6 грошай. З прычыны дрэннай якасці глебы яны не мусілі даваць двору авёс і сена. Сенажаць жыхары Доўжыцы мелі ва ўрочышы Мокры лес каля Мілкаўскай пушчы плошай 21 морг. Плацілі па грошу за морг. Усяго ж з Доўжыц належала платы 23 капы 27 гр. Сяляне трымалі 44 вала і 23 каня. Сярод жыхароў гэтай вёскі часта сустракаліся прозвішчы відавочна балцкага паходжання – Ленарт Рачковіч, Нарбут, Ян і Багдан Гінтантовічы. Увогуле, можна зрабіць выснову, што балцкі, а хутчэй за ўсё яцвяжскі, этнічны элемент адыграў істотную ролю ў фармаванні насельніцтва Скідзельскай і Мілкаўскай валасцей.

Валочная памера сярэдзіна XVI ст. па сутнасці вызначыла прасторавую арганізацыю Скідзельшчыны на наступныя пяць стагоддзяў. Амаль усе вёскі, якія былі тады ўтвораны, так і захаваліся да сённяшнага дню, толькі некаторыя змянілі свае назвы. Відавочна, што многія вёскі ўзніклі менавіта ў той момант, напэўна, узяўшы свае назвы ад першых жыхароў, пра што сведчаць прозвішчы

Некрашэвічаў, Каўшоў, Русінаў, Мазановічаў, Бірулічаў, Бубновічаў і г.д.

Само ж мястэчка Скідзель паўстала на стагоддзе пазней пасля валочнай памеры. Яго гісторыя пачалася з прывілея караля Уладыслава IV Вазы (1632-1648) ад 27 ліпеня 1644 г. Напэўна, камусці з каралеўскіх ураднікаў прыйшла ў галаву думка, што на пясчанай частцы дворнага грунту выгадней закласці новае мястэчка, якое стане неўзабаве цэнтрам рамёстваў і гандлю і будзе прыносіць каралеўскаму скарбу куды больш прыбытку, чым малаўраджайны палетак. Падрабязнасцяў гэтага мы ўжо хіба ніколі не пазнаем. Але справа рушыла, і каб заахвоціць ваколічных мяшканцаў перасяляцца, ім была нададзена чатырохгадовая “воля” ад усіх павіннасцяў на новым месцы. За гэты час навасельцы павінны былі паставіць свае хаты і гаспадарчыя пабудовы. Кароль таксама дараваў местачкоўцам права праводзіць два кірмашы на год, першы на Зялёныя Сьяткі, другі на дзень Святога Іллі, а таксама штотыднёвы кірмаш кожны чацвер. Праўда, праз некалькі гадоў штотыднёвы кірмаш быў перанесены з чацвярга на аўторак.

Нам невядома, адкуль прыйшлі першыя мяшчане Скідзеля, але, хутчэй за ўсё, у большасці былі яны жыхарамі ваколічных вёсак Скідзельскай воласці. Праз чатыры гады пасля выдання прывілея Уладыслава IV, у 1650 г. каралеўскія рэвізоры пачалі ўпарадкаваць паўсталае мястэчка. На той час каралём быў ужо абраны брат Уладзіслава IV Ян Казімір (1648-1668), і распачалося казацкае паўстанне на Украіне пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага. Каморнік Горадзенскай каралеўскай эканоміі Войцех Пуцілоўскі вымераў у Скідзелі квадратны рынак, які займаў 3 моргі і 9 прутоў плошчы, а таксама 100 местачковых пляцаў пры самім рынку (21 ½ пляца плошчай па 12 прутоў) і пры 6 вуліцах, якія ад яго ў розных кірунках адыходзілі. З рынкавых пляцаў 2 былі аддадзеныя пад царкву і засталіся вольныя ад усякай платы, а з астатніх 19 ½ належала плаціць у каралеўскі скарб па 12 грошай чыншу, што ў суме складала 3 капы 42 грошы ў год. За вулічныя пляцы быў вызначаны трохі меншы чынш – па 10 грошай [Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ) ў Мінску. Фонд 1882. Вопіс 1. Справа 1. Інвентар Скідзельскай воласці за 1650 г.]

На вуліцы Гродзенскай было вымерана 13 пляцаў, з якіх адзін пляц прызначаўся на шпіталь і быў вольны ад падаткаў. За астатнія належаў чынш па 10 грошай, што ў суме складала 3 капы 20 грошай. На вуліцы Азёрскай лічылася 20 пляцаў, Віленскай 19 ½, Навагрудскай 10, Луненскай 6 ½, Котранскай 7 ½. На Луненскай вуліцы 2 пляцы былі прызначаныя на школу для дзяцей і з’яўляліся вольнымі ад платы, а ад усіх астатніх вулічных пляцаў Скідзеля належаў у суме чынш 12 коп 35 грошай.

Усяго дворнага ворыва, на якім паўстаў Скідзель, лічылася 250 моргаў. З іх 47 пайшлі ўласна пад мястэчка, адзін морг, вольны ад платы, быў пакінуты для "даўняй карчмы". За астатнія ж 202 моргі скідзельцам належала плаціць па 48 грошай, што складала 161 капу 36 грошай. Як мяркуе польскі гісторык Пшэмыслаў Баравік [Borowik P. Skidel w poł. XVII i w XVIII w. // Małe miasta. Oświata i kultura. Białystok, 2004. S. 35], пазней з гэтага ліку 50 моргаў "няўжытых, курганамі выходзячых", былі вызваленыя ад аплаты, што магло адбыцца ў часе рэвізіі 1682, 1692 ці 1700 г.

Таксама местачкоўцам былі нададзены 3 моргі выгану для хатняй жывёлы і 3 моргі альховага гаю над рэчкай Скідлянкай (пазнейшая Свістоўшчына) без усялякіх выплатаў. На падставе прывілея Уладзіслава IV ад 5 верасня 1647 г., падпісанага ў Саколцы, яшчэ былі дададзены скідзельскім мяшчанам 24 валокі зямлі у вёсцы Храпава і 52 моргі лугоў ва ўрочышчы Палькоўшчына ў Старыне. У Малым Карашаве мяшчане атрымалі 12 валокаў, у Мількаўшчыне і Плытніцы 10 валокаў, а ў Вялікім Карашаве ці Белякоўшчыне – 14 валокаў. За гэтыя землі скідзельцы абавязаны былі плаціць чынш. Напрыклад, у Белякоўшчыне трэба было плаціць па капе грошай за валоку – усяго 14 копаў. Праўда, як сцвярджае П.Баравік, чарговая каралеўская рэвізія з 1679-1680 гг. адабрала ў скідзельцаў белякоўскія валокі і перадала іх сялянам той вёскі [Borowik P. Skidel w poł. XVII i w XVIII w.... S. 36]. Ён жа знайшоў інфармацыю, што мястэчку былі перададзены 3 валокі з вёскі Хваты ці Служкі. Магчыма, што такія перадачы былі звязаныя з перасяленнем у Скідзель вясковых жыхароў, якія, аднак, захоўвалі за сабой ранейшыя зямельныя ўчасткі. Да Скідзеля таксама належала некалькі засценкаў. Напрыклад, пры Храпаўскіх валоках – 52 моргі сенажаці. Усяго ж за зямлю мяшчанам Скідзеля належала плаціць двору каля 80 коп грошай.

Але гэта складала толькі каля 17 % ад сумы ўсіх падаткаў і выплатаў з мястэчка Скідзель – 480 копаў у год (28800 грошай). Гэтыя падаткі скідзельскі войт, выбіраны праз местачкоўцаў, павінен быў аддаваць да двору, дзе знаходзіўся каралеўскі адміністратар. Як можна меркаваць, самай прыбыльнай справай у той час было трыманне корчмаў, у якіх прадавалі гарэлку, піва і мёд (медавуху). За права гандляваць гэтымі напоямі скідзельскія мяшчане плацілі асобы падатак "капшчыну", якая, паводле інвентара, складала 360 коп у год, ці 75 % ад усіх выплатаў мяшчанаў Скідзеля двору. У інвентары адзначалася, што арэнду корчмаў павінны трымаць самыя мяшчане, а не "жыды" (з гэтага можна зрабіць выснову, што ў той час у Скідзелі ўжо жылі і яўрэі). Дзеля гэтага з ліку мяшчанаў належала выбіраць двух ці трох мужоў "добра аседлых", якія павінны былі пільнаваць, каб не было шкоды дзяржаўнаму скарбу, і каб ніхто не рабіў мёду, піва і гарэлкі без дазволу.

З усіх, хто прыязджаў у Скідзель на кірмаш, збіраўся търговы збор. Напрыклад, з бочкі солі і бочкі рыбы ён складаў 3 грошы, за продаж быдла 2 грошы за галаву. Ад гэтага збору былі вольныя толькі самі жыхары мястэчка. Але збіраючы гэтых збор, мяшчане выплочвалі з яго 40 коп да двору. Таксама належала да двору 10 коп лапатковага збору, які патрэбна было збіраць ад рэзнікаў. Паводле старадаўняга звычаю, рэзнік з кожнай зарэзанай жывёліны лапатку аддаваў да двору. Пазней гэтую даніну перавялі на грошы. Апроч рэзнікаў інвентар узгадвае таксама ў Скідзелі кавалёў, столяра, шаўцоў, фарбажа і кушнера.

Інвентар 1650 г. утрымліваў падрабязнае апісанне скідзельскага двору, выгляд і інтэрьер жылога дому, стан гаспадарчых пабудоў. Пры двары заставаўся фальварак, у якім высяваліся жыта, пшаніца і ячмень. Там жа працаваў бровар, які пастаўляў сваю прадукцыю ў корчмы мястэчка і вёсак Скідзельскай воласці [НГАБ у Мінску. Ф. 1882. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 54 адв.]

На беразе Скідлянкі па-ранейшаму жылі дворныя агароднікі, якія трымалі па 6 моргаў зямлі. Яны павінны былі выплочваць чынш па 5 грошай за морг. Чыншавых агародаў было 6, служэбных ці цяглых 15. За апошнія іх трымальнікі адпрацоўвалі паншчыну ў фальварку. Некаторыя агароднікі трымалі дадатковыя землі. Напрыклад, Іван Вітко трымаў засценак памерам 3 моргі, а Даніла Шыла – 5 моргаў дворнай пашні, за якія мусіў плаціць 24 грошы за морг, што ў суме давала 2 капы. Побач з агароднікамі па-ранейшаму жылі служкі, якія плацілі з валокі па 4 капы чыншу – усяго 16 копаў з 4-х валокаў. Яны таксама трымалі млын на рацэ Скідлянцы.

Да Скідзельскай воласці ў 1650 г. належалі вёскі Канюхі, Карашава, Падлессе або Гніляны, Сухаўляны або Сухі Скідзель, Бірулічы, Пярэдняя Пыра, Каўшова або Капачова, Пузава, Некрашы, Малое Карашава, Вялікае Карашава ці Белякоўшчына. Да Падлеся належалі 36 валокаў ворыва. З іх ліку 12 валокаў было цяглых, за якія належала паншчына. Але з прычыны закладання мястэчка Скідзель і памяншэння дворнага ворыва, паменшылася і паншчына гнілянцаў – з трох да двух дзён на тыдзень. Аднак яны абавязваліся хадзіць на вырубы лесу да пушчы, а таксама раз у год вясной сплаўляць плыты з жытам, праўда, недалей, як да Гродна. Чыншавых валокаў у Гнілянах было 11 ¾, з якіх належала плаціць з валокі па 100 грошай, ці ў суме 19 коп 35 грошай. Усяго ж разам з засцянковымі сенажацямі з Гнілянаў выходзіла гатовай платы 46 коп 25 грошай.

Вёсцы Сухаўляны належалі 28 валокаў, з якіх цяглых было 8 1/3, за якія сяляне выконвалі такія ж самыя павіннасці, як і жыхары Падлесся. Чыншавых валокаў было 10 1/6, за якія плацілі па 2 капы за валоку. Пустых неабрабляемых валокаў налічвалася каля 7. Праўда, сухаўлянцы абавязваліся якраз узяцца і за апрацоўку гэтых валокаў. Усяго ж жыхары Сухаўлянаў павінны былі плаціць 38 копаў 19 грошай.

Такім чынам, у параўнанні з 1588 г. плата з гэтай вёскі вырасла амаль у чатыры разы.

Да вёскі Каўшова належалі 44 валокі зямлі. Але 28 з іх трымаў Мікалай Коўш, які плаціў за карыстанне імі 28 копаў. Цяглых валокаў у Каўшове было 7¼, за якія вяскоўцы павінны былі плаціць 14 копаў 30 грошай, а таксама “мусілі ўбіраць дворнае ворыва і сена восенню і вясной, а ад штотыднёвых работаў былі вольныя”. Таксама ў Каўшове было 5 ¼ чыншавых валокаў, за якія сяляне плацілі 11 копаў 30 грошай. Увесь чынш з вёскі Каўшова складаў 59 копаў 28 грошай. Плата з гэтай вёскі ўзрасла ў параўнанні з 1558 г. у два з паловай разы.

Вёсцы Пузава належалі 52 валокі, з іх адна аддавалася скідзельскаму войту. Цяглых валокаў налічвалася 14 ¼. З тых валокаў кожны тыдзень павінны былі два дні адпрацоўваць, а таксама тыдзень у год хадзіць на вырубы і вясной ці восенню сплаўляць плыты з жытам. Таксама ў інвентары спецыяльна агаворвалася, што сяляне вольныя павінны быць ад абавязку ездзіць з падводамі да Варшавы і Вільні. Чыншавых валок у Пузаве было 30 1/3 , за якія плацілі па 2 капы. А ўся плата з гэтай вёскі складала 89 копаў 55 грошай. У параўнанні з 1558 г. яна ўзрасла прыкладна ў паўтары разы.

Да Некрашоў належалі 16 цяглых валокаў. Сяляне з 7¾ валокі павінны былі адпрацоўваць у тыдзень па тры дні ў фальварку з валокі з чым двор накажа, а таксама “жыта да сплаву вывозіць”. А з астатніх 7¾ былі вольныя ад штотыднёвай працы, але іх абавязкам з’яўлялася засяваць і жаць дворнае ворыва і ўбіраць сенажаці. А для ўсіх разам сялянаў Некрашоў быў агульны абавязак трымаць у парадку і, калі трэба, абнаўляць масты на рацэ Котры. Агульная сума выплатаў з Некрашоў складалаш 31 капу 48 грошай. Плата ўзрасла ў параўнанні з 1558 г. болей чым у тры разы.

Такім чынам, мы бачым, што грашовыя выплаты з сялянаў Скідзельскай воласці значна ўзраслі ў параўнанні з часамі валочнай памеры. Гэты было абумоўлена не толькі ростам эксплуатацыі сялян з боку ўлады, але ў таксама працэсамі інфляцыі і пераводам часткі сялян з паншчыны на чынш.

Рэвізія 1679-1680 гг. увогуле зліквідавала фальварак Скідзельскага двору. З дворнага ворыва 100 моргаў забралі скідзельцы, а астатнія 200 былі перададзеныя сялянам вакольных вёсак. Але неўзабаве і гэтыя вясковыя грунты забралі для сябе жыхары мястэчка. Прычынай такога кроку дзяржаўных уладаў паслужылі знішчэнні, якія нанесла Беларусі вайна паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг. Пасля ваенных знішчэнняў сяляне былі проста не ў стане падымаць уласную гаспадарку і адначасова яшчэ адпрацоўваць паншчыну ў фальварку.

Разам з заснаваннем мястэчка была пабудавана і местачковая ўніяцкая царква св. Пятра і Паўла. Яе фундатарам стаў войт скідзельскай воласці Павел Казейка. На забеспячэнне царквы былі

выдзеленыя два агароды скідзельскага двору (па 6 моргаў кожны), 2 пляцы на рынку мястэчка, 2 местачковых моргі, па адной валоцы ворыва ў Белякоўшчыне і Пузаве, а таксама ўласна пляц пад будынкам царквы ў мястэчку. У даход царквы ішлі штрафныя грошы, якія войт збіраў з тых, хто без важкай прычыны адсутнічаў на нядзельным набажэнстве [НГАБ у Мінску. Ф.1882. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 56-57, 59 адв, 60, 63]. Але, як лічыць П.Баравік, скідзельская царква св.Пятра і Паўла хутчэй за ўсё была спаленая падчас вайны 1655-1683 гг. [Borowik P. Skidel w poł. XVII i w XVIII w.... S. 37]. На яе месцы пазней збудавалі новую Свята-Пакроўскую царкву. У 1764 г. Станіслаў і Крыстына з Браніцкіх Цыдзікі ўзгадвалі яе ў сваім тэстаменце. Яны ахвяравалі скідзельскаму святару Станіславу Бялькевічу з маёнткаў Котра і Несцяровічы 2600 злотых. Узамен за гэта святар павінен быў раз у тыдзень у аўторак маліцца за іх душы. Прытым гэтыя набажэнствы папераменна адбываліся ў скідзельскай Пакроўскай царкве і ў Юр'еўскай царкве ў Котры [Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею для разбора древних актов. Т. 7. Акты Городненского гродского суда. Вильна, 1874. № 26].

Але на той час скідзельская царква была ўжо вельмі старой пабудовай. У 1754 г. на павятовым сейміку гарадзенскай шляхты яе ўзгадалі ў ліку іншых цэркваў у каралеўскіх маёнтках "зусім ападлых і зруйнаваных" [Borowik P. Skidel w poł. XVII i w XVIII w.... S. 37]. У дакуменце 1782 г. таксама ўзгаданая скідзельская царква, як "драўляная, старая, патрабуючая рамонту, пакрытая гонтай". У апошнім дакуменце ўзгадвалася і старая каплічка, якая знаходзілася непадалёку ад царквы.

Фундатар царквы св.Пятра і Паўла войт Павел Казейка напэўна быў самым багатым чалавекам у воласці. Паводле інвентара 1650 г., ён меў 8 валокаў зямлі ў Гнілянах, Канюхах, Велькім Карашаве і Каўшове. Павел Казейка таксама, паводле прывілея Уладыслава IV, меў 11 моргаў сенажаці над рэчкай Пырай, за якія павінен быў плаціць па 3 грошы за морг. Жыў Казейка ў вёсцы Гніляны, дзе трымаў 2 валокі зямлі, з адной ён плаціў 3 капы, а з другой 1 капу 40 грошай [НГАБ у Мінску. Ф. 1882. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 58 адв.] У 1679 г. уладальнікам гэтых валокаў названы ўжо Кандрат Казейка, напэўна сын былога войта [Borowik P. Skidel w poł. XVII i w XVIII w.... S. 38].

Апроч збірання падаткаў скідзельскі войт быў абавязаны дбаць пра меры і вагі, патрэбныя для паспяховага гандлю ў мястэчку. Меў ён таксама і судовыя паўнамоцтвы, мог разбіраць дробныя крыўды паміж мяшчанамі і маёмасныя спрэчкі, калі кошт рэчы альбо сума грошай не перавышала 10 коп. На яго прысуды можна было скардзіцца ўжо каралеўскаму чыноўніку – гродзенскаму падстарасце. Апроч пасады войта у Скідзелі таксама існаваў досыць цікавы орган мясцовага самакіравання, які складаўся з некалькіх паважаных людзей, выбіраных мяшчанамі. Яны павінны былі кантраляваць справядлівы

збор капшчызны[13] і тарговых збораў. На гэтай глебе нярэдка ўзнікалі спрэчкі паміж жыхарамі мястэчка. У 1679 г. мяшчане скардзіліся каралеўскім камісарам, што шляхта, якая на той час таксама жыла ў Скідзелі, адмаўлялася плаціць мяшчанскія складкі, і каралеўскія чыноўнікі пацвердзілі, што гэтыя складкі павінны плаціць усе без вынятку жыхары. П.Баравік сцвярджае, што ў той час у Скідзелі ўжо жылі і яўрэі [Borowik P. Skidel w poł. XVII i w XVIII w.... S. 35].

На пачатку XVIII ст. новая навала пракацілася па Скідзельшчыне. У часы Паўночнай вайны арміі ваюючых дзяржаў нанеслі страшэнныя знішчэнні Беларусі (на беларускіх землях баявыя дзеянні адбываліся ў 1702-1708 гг.). Інвентар 1708 г. якраз адлюстраваў страты, нанесеныя Скідзелю Паўночнай вайной [Нацыянальны гістарычны архіў Літвы (далей – НГАЛ). SA. № 11 290. Арк. 49-54. Інвентар Скідзельскага ключа за 1708 г.]. З 80,5 пляцаў 42 былі "зусім пустымі", 13 ранейшых плацаў увогуле не ўлічвалася. З 201 морга зямлі, прызначанага для мястэчка, ужо даўнейшая рэвізія паказвала 50 моргаў "няўжытых, выходзячых курганамі". Засталіся 151 морг зямлі, за якія мяшчанам патрэбна было плаціць па 1,15 злотых[14] за морг. І з тых моргаў было 16 цалкам пустых. За рэшту – 135 моргаў – трэба было плаціць падатак 202,12 злотых. З гэтых моргаў, як узгадваў інвентар, таксама належала дзесяціна да фарнага касцёла ў Гродне. З былога дворнага ворыва, прызначанага каралеўскай камісіяй мястэчку, частка, як адзначылі рэвізоры, "зараз угорам ляжаць". З тых 200 моргаў дворнага ворыва, якія раздавалася ваколічным вёскам, але ў выніку прынялі іх мяшчане, на момант складання інвентара была засеяна толькі трэцяя частка. У выніку інвентаром было вызначана скідзельскім мяшчанам плаціць толькі палову чыншу – 100 злотых.

Да мястэчка па-ранейшаму належалі 24 валокі зямлі ў Храпаве. За 12 з іх ліку быў вызначаны чынш па 5 злотых за валоку, а за 12 – па 2,15 злотых. Але гэтыя палеткі былі ў вельмі дрэнным стане: "...цяпер кавалкамі рознымі пазасяваныя, а кавалкамі угорам па большай частцы пустымі ляжаць два палеткі, трэці палетак зусім западлы, у якім вельмі малыя кавалкі месцамі абробленыя". З тых абробленых валокаў быў вызначаны чынш з 5 валокаў па 5 зл. за валоку і з 10 валокаў па 2, 12 зл., што давала ў суме 65 злотых. А 6 валокаў, адзначылі складальнікі інвентара, "зусім пустыя адлогам ляжаць і багнамі".

У 1708 г. у Скідзелі налічвалася ўсяго 11 рамеснікаў: два рэзнікі, каваль, два шаўцы, ганчар і чатыры пекары. Ад кожнага з іх быў вызначаны чынш у памеры 12 грошай. Таксама існавалі тры піўныя карчмы і адна гарэлкавая. Усяго ж ад мястэчка належаў чынш за зямлю і ад рамеснікаў больш за 560 злотых ці 16804 гроша.

---

[13] *Капшчына (капшчызна)*, падатак у Вял. Кн. Літоўскім, які спаганяўся за гатаванне піва, мёду і гандаль гарэлкай.
[14] *Злоты*, грашовая адзінка ў Вял. Кн. Літоўскім і Рэчы Паспалітай. Раўняўся 30 грошам.

У Хватах Аляксей Вітко, як і продак яго Іван, меў засценак пры агародах над рэчкай Скідлянкай, за які плаціў агулам 8 грошай, але з прычыны спаленай сенажаці чынш быў зменшаны да 4 грошай. У інвентары адзначалася, што за спаленне сенажаці трэба ў двары даходзіць справядлівасці. Што паслужыла прычынай гэтага здарэння, падзеі нядаўняй вайны ці што іншае, нам невядома.

Апроч чыншу да дзяржаўнага скарбу належала арэнда, у якую ўваходзілі шынок гарэлкавы ці кабак, капшчызна з піва ад мястэчка і воласці, targовы лапатковы збор, былая войтаўская валока грунту ў Глінянах, мост праз рэчку Котру, з якога бралася маставое, а таксама карчма каля гэтага мосту. Адзначалася, што ў лепшыя годы арэнда даходзіла і да сумы 900 злотых. Але на 1708 г. была вызначана сума 800 злотых. Усяго ж у 1708 г. дзяржаўны скарб павінен быў атрымаць ад Скідзельскага ключа 4030 злотых прыбытку (120900 грошай).

Некаторыя землі маёнтка застаўляліся мясцовай шляхце. Напрыклад, у Бірулічах былі “застаўныя валокі у пана Ваўкавыцкага і ў іншай шляхты”. Пан Леўка, магчыма, нашчадак таго самага Леўка Вейкневіча з канца XV ст., браў 3,5 валокі ў заставу ў вёсцы Рыскі па 16 злотых за валоку, але гаспадарыў такім чынам, што праз 7 гадоў меў пажытку 370 злотых. Напэўна, што яго метады гаспадарання былі непрымальныя як для мясцовых сялян, так і для дзяржаўнай улады. Каралеўская адміністрацыя адабрала ад Леўкі гэтыя валокі і пастанавіла, што “так з усімі трэба рабіць, хто грунты забірае і падданых вынішчае”. Войту Скідзельскай воласці давалася паўвалокі зямлі за чынш памерам 10 злотых. У 1708 г. войтам быў жыхар вёскі Некрашы (імя і прозвішча яго ў інвентары не ўказвалася), а перад гэтых – Сухаўлянаў.

З усіх 16 вёсак Скідзельскага ключа належала платы да двору 26776 злотых ці 80281 грош. Калі параўнаць з 1560 г., дык памеры выплатаў выраслі ў грошах з сумы 13288,7 у 6 разоў. Тут трэба, канешне, ўлічваць той факт, што ў 1708 г. усе павіннасці налічваліся ў грошах, пра паншчыну ў інвентары нічога не гаварылася. У вёсцы ж Пузавічы, якая і ў 1560 г. была на асадзе, плата вырасла з 4015 грошай да 9881,5, ці трохі болей чым у два разы. Праўда, у 1708 г. у Пузавічах з 52 валокаў 20 было зусім пустых, якія не абрабляліся. І плата за такія землі не бралася. Пустых валок было многа ў большасці вёсак ключа.

У наступным інвентары за 1712 г. было пададзена апісанне Скідзельскага двору: “З мястэчка да Двору вядуць вароты двайныя на бягунках пад дашкам, саломай крытым. Будынак саломай крыты. Да каторага ўваход з ганка ў сені праз дзверы на бегуне з драўлянай засоўкай. Да ізбы з сеняў дзверы на завесах з клямкай і зашчэпкай, вокнаў два з дрэва, дзве лавы, нявелькі стол, зэндэль, печ з шэрай кафлі, мураваны комін, выведзены на гарышча. З той ізбой камора злучаная, дзверы да яе на бегуне, вакно драўлянае, нявелькі столік, з той каморы дзверы да сеняў перад шпіцарняй на бегуне, з тымі сенямі

шпіцарня злучана, дзверы да яе на бегуне, вакно з дрэва вялікае з акенніцай, з сярэдзіны засоўваецца. З тых жа сеняў да боку стайня невялічкая, да якой з падворку і з сеняў дзверы на бегунах, з вялікіх сеняў і ізбы направа пякарня, да якой дзверы на бегуне, пры пякарні лавы ў кола, жарня з жалязкамі, за той пякарняй свіран нявелькі саломай пакрыты, з трыма засекамі, дзверы да яго на бегуне з драўлянай засоўкай звонку, пад тым свіранам нявелькі склепік, да якога дзверы на бегуне з драўлянай засоўкай. Праз падворак ех opposita (насупраць – аўтары) таго будынку гумно новае саломай пакрытае нявелькае з аднаго склепіку, вароты да яго двайныя на бегунах і з зашчэпкай. Другое гумно старое зусім пахіленае, ледзьве стаіць... Дрэва прыдатнае да іншай будоўлі, у сярэдзіне таго гумна свіран таксама пахілены" [НГАЛ. SA. № 11 291. Арк. 36. Інвентар Скідзельскага ключа за 1712 г.].

Арэнда з мястэчка Скідзеля на 1711 г. была вызначана ў суме 1000 зл., а ў 1712 г. гэтая сума была падвышана да 1100 зл. Інвентар 1712 г. таксама ўзгадваў, што каля мястэчка на рэчцы Скідлянцы быў млын, "ад якога мястэчку была вялікая выгода і скарбу", але "з прычыны кепскага грунту грэбля і ўпуст не маглі нігды вытрымаць, і часта вырывала і направа не мала каштавала". Таму, як адзначыў аўтар інвентара, ужо гадоў з дваццаць млын не дзейнічаў. Сума прыбыткаў скарбу з усяго Скідзельскага ключа ў 1712 г. павінна была складаць суму 3738 злотых ці 112140 грошай [НГАЛ. SA. № 11 291. Арк. 41].

Пасля перажытых цяжкіх войнаў Скідзель у XVIII ст. жыў больш мірна. У 1775 г., паводле дадзеных П.Баравіка, у мястэчку налічвалася 90 дымоў [Borowik P. Skidel w poł. XVII i w XVIII w.... S. 35]. Крыніца за 1765 г. сцвярджае, што ва ўсім Скідзельскім ключы налічвалася 463 яўрэя. Такім чынам, у XVIII ст. ў жыцці Скідзеля пачынала адыгрываць усё больш істотную ролю яўрэйская грамада.

16 мая 1783 г. Скідзель моцна пацярпеў ад пажару. Згарэлі 55 яўрэйскіх дамоў і 9 хрысціянскіх, а ацалела 13 яўрэйскіх дамоў і 42 хрысціянскія [Borowik P. Skidel w poł. XVII i w XVIII w.... S. 39]. На падставе гэтага можна зрабіць выснову, што на той час у мястэчку налічвалася 68 яўрэйскіх дамоў і 51 хрысціянскіх. Аказалася, што спіс дымоў з 1775 г. не ўлічыў у Скідзелі 27 хрысціянскіх дымоў, паколькі гэтыя "хаткі не толькі, што самыя вельмі малыя, але таксама на так малых пляцах пабудаваныя, што ніводны з іх нават маленькага гароду мець не можа, а ўзгаданыя мяшканцы зусім убогія, грунта не абрабляюць і жывуць з найму". Напэўна тут вялася гаворка пра местачкоўцаў, якія ў пазнейшых інвентарах XIX ст. называліся кутнікамі.

З цягам часу каралеўская адміністрацыя расчаравалася ў сваім праекце зрабіць Скідзель квітнеючым цэнтрам гандлю і рамёстваў. Нашчадкі першых мяшчанаў аддавалі перавагу сельскагаспадарчым

заняткам і жылі пераважна з зямлі, а гандаль і рамёствы паступова пераходзілі ў рукі яўрэяў. Калі ў 1765 г. старастам Гродзенскай каралеўскай эканоміі стаў вядомы рэфарматар Антоні Тызенгауз, дык ён пачаў актыўна аднаўляць фальваркі, а мяшчан пераводзіць у разрад паншчынных сялян на той якраз падставе, што апошнія вядуць выключна сялянскі лад жыцця і не жадаюць займацца гандлем і рамёствамі. Але тут ён ужо сустрэў супраціў. Жыхары Скідзеля паскардзіліся каралю, што “за ўпраўленнем яго міласці Тызенгауза ... страцілі правы вольных людзей і прымацаваны да ярма і надзвычай высокай аплаты” [Копытина Г.Г. Земяне Гродненской экономии в 80-х – начале 90-х годов XVIII в. // Роль крестьянства в социально-экономическом развитии общества. Сборник статей межреспубликанской научной конференции молодых ученых. Минск, 1984. С. 89]. Так выявіўся вольналюбівы дух скідзельскіх мяшчанаў, з якім прыходзілася пазней сутыкнуцца кожнаму, хто спрабаваў наступаць на іх правы.

## Раздел 2

## СКІДЗЕЛЬ У РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

### Прастора, насельніцтва і адміністрацыйныя структуры

У 1795 г. адбыўся апошні, трэці падзел Рэчы Паспалітай, у выніку якога гэтая дзяржава спыніла сваё існаванне і знікла з карты Еўропы. Амаль уся тэрыторыя сучаснай Беларусі апынулася ў складзе Расійскай імперыі. Гэтая падзея аказала самы непасрэдны ўплыў на лёсы Скідзеля і яго жыхароў. У верасні 1795 г. імператрыца Кацярына II сваім указам падаравала Скідзель ва ўласнасць ўдаве князя Антона Светаполк-Чацвярцінскага і яго нашчадкам. Чацвярцінскія атрымалі ў "вечное и потомственное владение" 1500 душ сялян трох былых сталовых маёнткаў Гарадзенскай каралеўскай эканоміі, размешчаных па суседству – Скідзель, Котру і Скалубава. Праўда, апошні маёнтак яны неўзабаве прадалі графу Валіцкаму, уладальніку мястэчка Азёры. Да маёнтка Скідзель, паводле інвентара 1815 г. [Аддзел рукапісаў Бібліятэкі Віленскага універсітэта. Ф. 4. Адз. зах. 1038. Інвентар маёнтка Скідзель 1815 г.], належалі вёскі Белякоўшчына, Гліняны, Карашава, Некрашы, Рыскі, Сухаўляны, Хваты з Агароднікамі і само мястэчка Скідзель з вёскай Пыране. Агульная плошча маёнтка складала 5545 дзесяцін[15] 1142 сажняў зямлі. Двор Чацвярцінскіх стаў адміністрацыйным цэнтрам для сялянскага насельніцтва, на яго ўладальнікаў ускладвалася адказнасць за выплату мясцовымі жыхараў дзяржаўных падаткаў, выкананне імі рэкруцкай павіннасці, трыманне ў добрым стане дарог і мастоў, а таксама плаціны на рацэ Котры, якая служыла важнейшым водным шляхам для сплаву лесу з абшараў Гарадзенскай пушчы.

Паводле ревізскага перапісу 1811 г. у маёнтку Скідзель налічваліся 1454 асобы сялян абодвух палоў [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 1. С. 296. Арк. 10 адв.]. Наступны перапіс быў праведзены ўжо ў 1816 г. Паводле яго вынікаў, у маёнтку Скідзель налічваліся 1353 сялянскія душы (706 мужчынскіх і 647 жаночых) [НГАБ у Гродне. Ф. 24. В. 7. С. 32. Рэвізскія сказкі Гродзенскага павета за 1816 г.]. Скарачэнне колькасці насельніцтва ў параўнанні з 1811 г. адбылося ў выніку наступстваў вайны 1812 г. У самім мястэчку Скідзель у 1816 г. было 225 сялянскіх душ (120 мужчынскіх і 105 жаночых). Скідзельскі

[15] *Дзесяціна*, мера плошчы ў Расійскай імперыі. Раўнялася 1,0925 га. Складалася з 2400 квадратных сажняў.

яўрэйскі кагал налічваў 229 душ (99 мужчынскіх і 130 жаночых). Вельмі верагодна, што гэта былі заніжаныя лічбы, бо яўрэі ўсімі сіламі імкнуліся зменшыць дадзеныя пра колькасць сваёй супольнасці, а асабліва – яе мужчынскай часткі, і такім чынам зменшыць і падатковы ціск. У кожным разе, калі яшчэ ўлічыць татарскую грамаду, а пра яе жыхароў у нас няма дакладных звестак, у мястэчку Скідзель на пачатку XIX ст. пражывала каля паўтысячы жыхароў.

Колькасць жыхароў у вёсках маёнтка Скідзель у 1816 г. была наступнай: Гліняны – 283 душы (144 мужчынскія і 139 жаночых), Хваты – 41 (20 мужчынскіх і 21 жаночых), Агароднікі – 29 (15 мужчынскіх і 14 жаночых), Некрашы – 172 (87 мужчынскіх і 85 жаночых), Белякоўшчына – 170 (87 мужчынскіх і 83 жаночых), Рыскі – 183 (99 мужчынскіх і 84 жаночых), Карашава – 148 (87 мужчынскіх і 61 жаночых), Сухаўляны – 102 (47 мужчынскіх і 55 жаночых).

Апроч сялян і мяшчан у Скідзелі і ваколіцах жыло таксама некалькі сем'яў дробнай засцянковай шляхты. Гэтая шляхта, як і сяляне, сваімі рукамі апрацоўвала ўласныя, ці арэндныя зямельныя надзелы, але была вольная ад падаткаў і рэкруцтва. З асяроддзя шляхты звычайна набіраліся аканомы і цівуны для панскіх маёнткаў. Паводле дадзеных за 1829 г., у Скідзелі налічваліся 3 шляхецкіх дымы і 17 мужчынскіх душ. Дымы дробнай шляхты знаходзіліся таксама ў суседніх з мястэчкам вёсках і засценках: Русінаўцах (7 дымоў і 15 мужчынскіх душ), Багатырэвічах (6 дымоў і 19 мужчынскіх душ), Котры, Хацяновічах і Несцяровічах (11 дымоў і 14 мужчынскіх душ), Гушчыцах (2 дымы і 3 мужчынскія душы) [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 3. С. 1128. Арк. 46. Алфавітны спісак шляхты і памешчыкаў Гродзенскай губерні за 1829 г.].

У 1829 г. у мястэчку Скідзель налічваліся 203 жылыя дамы (з іх 76 належалі хрысціянам і 127 іўдзеям) і 1296 жыхароў (299 хрысціян і 997 іўдзеяў) [Sorkina I. Miasteczka powiatu grodzieńskiego w XIX i na początku XX w. // Rocznik Grodzieński. 2007. Nr 1. S. 12; НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 3. С. 536. Арк. 105, 118]. З гэтых лічбаў вынікае, што ў хрысціянскай хаце ў сярэднім жыло 4 чалавека, а ў яўрэйскай – 8. Паводле дадзеных дзяржаўнай адміністрацыі за 1857 г., у Скідзелі налічваліся 232 двары і 985 жыхароў. Цяжка сказаць, чым абумоўлена змяншэнне колькасці насельніцтва. Магчыма, што цяжкімі эпідэміямі, якія адбыліся ў першай палове XIX ст. Але, да дадзеных тагачаснай статыстыкі таксама трэба ставіцца асцярожна.

Звесткі пра колькасць насельніцтва маёнтка Скідзель утрымлівае і інвентар 1845 г. [НГАБ у Гродне. Ф. 96. В. 1. С. 1267]. Паводле яго дадзеных, у вёсках маёнтка і ў самім мястэчку налічвалася 2045 жыхароў (1014 мужчынскіх душ і 1031 жаночая). У інвентары таксама прыводзіліся лічбы рэвізскага перапісу насельніцтва за 1834 г., паводле якога ў маёнтку Скідзель былі налічаны 1953 душы (1005 мужчынскіх і 953 жаночых). Сярэдняя сялянская сям'я складала 6-7 душ, у мястэчку

Скідзель – 5-6 душ, а сярод кутнікаў, якія не апрацоўвалі зямельных надзелаў і часта не мелі нават уласных хатаў – 4-5 душ.

У інвентары 1845 г. таксама прыводзіліся дадзеныя пра колькасць рабочых і нерабочых душ (паўнавартаснымі работнікамі лічыліся мужчыны ад 18 да 55 гадоў і жанчыны ад 16 да 50 гадоў). Рабочых сялянскіх душ налічвалася 651 мужчынская і 630 жаночых, нерабочых – 363 мужчынскія і 401 жаночая (табл. 1). Кутнікаў у маёнтку налічвалася 48 мужскіх душ і 34 жаночых, ці 4 % ад усяго насельніцтва. У Скідзелі кутнікі складалі калі 15 % ад колькасці беларускага насельніцтва мястэчка.

*Табліца 1*

**Сялянскае насельніцтва маёнтка Скідзель паводле інвентара 1845 г.**

| | Цяглыя Двары | Двары Кутнікаў | Сялянскіх душ па рэвізіі 1834 г. | | Сялянскі душ паводле інвентара 1845 г. | | Рабочых душ | | Нерабочых душ | | Душ кутнікаў | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Муж. | Жан. | Муж. | Жан. | Муж. | Жан. | Муж. | Жан. | Муж. | Жан. |
| Скідзель | 46 | 13 | 179 | 139 | 185 | 168 | 105 | 93 | 48 | 55 | 32 | 20 |
| Гліняны | 55 | 3 | 220 | 223 | 241 | 254 | 141 | 148 | 90 | 96 | 10 | 10 |
| Карашава | 26 | - | 101 | 99 | 138 | 116 | 67 | 71 | 71 | 45 | - | - |
| Хваты | 15 | - | 51 | 44 | 55 | 45 | 34 | 27 | 21 | 18 | - | - |
| Сухаўляны | 21 | - | 74 | 67 | 64 | 75 | 50 | 46 | 14 | 29 | - | - |
| Рыскі | 33 | 2 | 115 | 129 | 108 | 115 | 79 | 74 | 29 | 41 | 6 | 4 |
| Белякоўшчына | 40 | - | 128 | 122 | 144 | 147 | 85 | 88 | 59 | 59 | | |
| Некрашы | 45 | - | 137 | 130 | 144 | 160 | 97 | 92 | 47 | 68 | | |
| Разам | 281 | 18 | 1005 | 953 | 1079 | 1080 | 658 | 639 | 379 | 411 | 48 | 34 |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 96. В. 1. С. 1267.

У выніку рэалізацыі палажэнняў сялянскай рэформы 1861 г. Скідзель стаў цэнтрам новай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі – воласці. Напачатку Скідзельская воласць аб'ядноўвала вёскі былых маёнткаў Скідзель і Котра князёў Чацвярцінскіх. Пазней былі далучаны вёскі суседніх прыватнаўласніцкіх маёнткаў: Друцкіх-Любецкіх (Чарлёна, Харціца, Русінаўцы, Лаўна, Бірулічы), Ажэшкаў (Ханявічы), Чачотаў (Галавачы і Залясяны), Багаткаў (Гушчыцы і Кашубінцы), Выганоўскіх (Котра), Татароўскіх (Тарасюкі), дзяржаўныя вёскі Раўкі, Гарашкі, Пяшчанка, Хвайняны, Бубны, Осьнікі, Ахрымаўцы, Прыступічы, а таксама шляхецкія ваколіцы Пяшчанка, Сікорыца, Гушчыцы. Вёскі ж маёнтка Котра Чацвярцінскіх былі пераведзеныя ў склад Жытамлянскай воласці.

Ва ўстаўной грамаце маёнтка Скідзель, складзенай у 1862 г. [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 599. Арк. 3-3 адв. Устаўная грамата маёнтка Скідзель. 1862 г.] у сувязі з правядзеннем сялянскай рэформы, таксама прыводзіліся дадзеныя пра колькасць насельніцтва. Адтуль вынікае, што паводле X рэвізскага перапісу ў маёнтку Скідзель налічвалася 2041 сялянская душа (табл. 2). У параўнанні з IX перапісам 1834 г. прырост склаў усяго каля 4 %. Гэта было сведчаннем таго, што апошняе дваццацігоддзе перад рэформай 1861 г. складвалася для

жыхароў Скідзельшчыны цяжка. На 1862 г., паводле дадзеных эканоміі, у маёнтку налічвалася 2106 сялянаў (1036 мужчынаў і 1070 жанчын).

*Табліца 2*

**Насельніцтва маёнтку Скідзель у 1862 г.**

| | Па выніках Х перапісу 1859 г. | | Наяўных на час складання ўстаўной граматы | |
|---|---|---|---|---|
| | Мужчын | Жанчын | Мужчын | Жанчын |
| Дваровых людзей | 15 | 13 | 14 | 15 |
| Гліняны | 244 | 253 | 244 | 269 |
| Карашава | 104 | 114 | 98 | 95 |
| Белякоўшчына | 146 | 144 | 160 | 150 |
| Хваты | 53 | 55 | 58 | 63 |
| Некрашы | 140 | 158 | 158 | 152 |
| Сухаўляны | 69 | 81 | 72 | 87 |
| Рыскі | 82 | 109 | 96 | 114 |
| Скідзель | 125 | 136 | 136 | 125 |
| Разам | 978 | 1063 | 1036 | 1070 |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 599. Арк. 3-3 адв. Устаўная грамата маёнтка Скідзель. 1862 г.

Паводле дадзеных губернскай адміністрацыі за 1869 г., у Скідзельскай воласці налічвалася 38 вёсак і ўрочышчаў, 962 дымы і 5929 душ абодвух палоў [НГАБ у Гродне. Ф. 14. В. 1. С. 601. Арк. 20 адв. Статыстыка насельніцтва Гродзенскай губерні за 1869 г.]. У другой палове XIX ст. дынаміка дэмаграфічнага росту значна паскараецца. Паводле дадзеных “Памятных кніжак” Гродзенскай губерні, на пачатак 1878 г. у Скідзелі было ўжо 1525 жыхароў (719 мужчын і 806 жанчын), з іх 1062 яўрэя (70 %) [Памятная книжка Гродненской губернии на 1879 г. Гродно, 1878. С. XLI.], а на пачатак 1890 г. у Скідзельскай воласці налічвалася 29 вёсак і 10346 сялян (5284 мужчыны і 5062 жанчыны), 829 сялянскіх двароў і 313 шляхецкіх і мяшчанскіх [Памятная кніжка Гроденской губернии на 1892 г. Гродно, 1891]. Павелічэнне насельніцтва было абумоўлена вельмі высокімі паказчыкамі натуральнага прыросту. Напрыклад, паводле дадзеных Памятных кніжак Гродзенскай губерні, у 1880 г. у Скідзельскім прыходзе нарадзілася 160 дзяцей, што ўтварала надзвычай высокі паказчык 53 ‰ (гэта значыць, што на тысячу жыхароў нарадзілася 53 дзіцяці). Праўда, і смяротнасць была вельмі высокай – памерлі 84 чалавека (27,2 ‰). Такім чынам, натуральны прырост насельніцтва складаў 24,7 ‰.

У 1888 г., паводле дадзеных губернскай адміністрацыі, у Скідзельскай воласці налічвалася ўсяго 26048 дз. зямлі [НГАБ у Гродне. Ф. 11. В. 3. С. 140. Статыстыка пазямельнага валодання ў Гродзенскім уездзе. 1885 г.], у тым ліку прыватнаўласніцкай 13801 дз., сялянскай надзельнай (былых памешчыцкіх сялянаў) 9557 дз. 1773 саж., у былых дзяржаўных сялян 2391 дз. 2256 саж., царкоўнай зямлі 201 дз. 1557

саж., дзяржаўнай зямлі (Раўкоўска-Стральцоўская лясная дача) 94 дз. 600 саж. Такім чынам, болей за палову зямлі належала прыватным уласнікам, у большасці былым памешчыкам, што з'яўлялася адной з самых балючых сацыяльных праблем тутэйшага грамадства. Буйнейшымі землеўладальнікамі заставаліся Георгій і Станіслаў Чацвярцінскія, да маёнтку якіх Скідзель з фальваркамі Фенькава, Струпіна і Будоўля належалі 4203 дз. 2012 саж. зямлі. На другое месца выйшла сям'я былога валаснога старшыні Рыгора Мазалеўскага, сынам якога належалі маёнткі Каўшова (1671 дз.) і Вялікая Мількаўшчына (895 дз.). На трэцім месцы знаходзіўся ўладальнік маёнтка Чарлёна з фальваркамі Лаўна, Русінава, Мар'іна князь Друцкі-Любецкі – 2082 дз. зямлі. Сярод сярэдніх землеўладальнікаў бачым таксама выхадца з сялян вёскі Гліняны Аляксандра Гайко, якому належаў фальварак Грэбелька (236 дз.).

У 1901 г., паводле дадзеных губернскай адміністрацыі, колькасць насельніцтва ў Скідзелі складала ўжо 3465 чалавек, з іх 2866 яўрэяў і 589 хрысціян. Такім чынам, за апошнія 20 гадоў XIX ст. насельніцтва мястэчка вырасла болей чым у два разы. Паводе саслоўнай прыналежнасці жыхары мястэчка падзяляліся: дваране – 8, прадстаўнікі духоўнага саслоўя – 8, мяшчане – 2809, сяляне – 569. У мястэчку на той час быў 71 мураваны будынак і 411 драўляных, з іх 405 жылых і 77 нежылых. Таксама ў Скідзелі налічвалася 70 гандлёвых прадпрыемстваў і 12 прамысловых (амаль выключна гарбарняў), а зварот капіталаў за 1901 г. склаў 347740 руб. [НГАБ у Гродне. Ф. 2. В. 30. С. 2278а. Арк.75-84, 129-145]. Паводле апошняга паказчыку Скідзель выйшаў на другое месца сярод мястэчак Гродзенскага ўезда і саступаў толькі Крынкам.

У "Памятнай кніжцы" Гродзенскай губерні на 1908 г. насельніцтва Скідзеля паказана 2975 жыхароў. Нам невядома, чым абумоўлена такое істотнае разыходжанне ў колькасці жыхароў у параўнанні з папярэдняй крыніцай, дадзеныя якой мы прыводзілі вышэй. На той час у Скідзельскай воласці налічваліся 4 праваслаўныя царквы (у Скідзелі, Галавачах, Чарлёне і Гушчыцах) і 1 каталіцкі касцёл (у Кашубінцах), 6 народных вучылішчаў (з іх 2 у Скідзелі), вінная казённая крама, фельчарскі пункт [НГАБ у Гродне. Ф. 18. В. 4. С. 1049. Арк. 17].

У 1909 г.у Скідзельскай воласці налічвалася 12242 сялянскія душы ў 36 сельскіх грамадах і 1497 сялянскіх гаспадарак. Кошт гэтых гаспадарак ацэньваўшся гродзенскім падатковым інспектарам у суму 514500 руб. [НГАБ у Гродне. Ф. 17. В. 1. С. 340б. Арк. 185]. Гэта значыць, што сярэдняя сялянская гаспадарка на Скідзельшчыны ацэньвалася сумай 343,7 руб.

Паводле дадзеных губернскага статыстычнага камітэта за 1914 г. у Скідзелі налічвалая ўжо 4214 жыхароў [НГАБ у Гродне. Ф. 14. В. 1. С. 368. Статыстыка Гродзенскай губерні за 1914 г.]. Такім чынам, у параўнанні з дадзенымі за 1815 г. насельніцтва мястэчка вырасла за сто гадоў болей чым у чатыры разы.

## Панскі двор і сялянская гаспадарка

Падараванне імператрыцай Кацярынай І былога старасцінскага маёнтка Скідзель князям Чацвярцінскім мела вялікія наступствы для гаспадарчага развіцця мястэчка і суседніх вёсак. Напачатку, як можна меркаваць на падставе архіўных дакументаў, новыя ўладальнікі не ўносілі нейкіх асаблівых зменаў у звыклае жыццё мясцовых жыхароў. Вайна 1812 г. прынесла вялізныя разбурэнні і людскія страты, якія мястэчку прыйшлося доўга залечваць. Паводле дадзеных, сабраных пасля вайны расійскай адміністрацыяй, за час ваенных дзеянняў у маёнтку Скідзель памерлі і загінулі 205 чалавек, 3 мужчын забралі ў рэкруты, 14 чалавек забралі французы, 33 асобы “бежали з неприятелем” [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 1. С. 296. Арк. 10 адв.]. Такім чынам, людскія страты склалі ў суме 255 чалавек, ці каля 18 % ад усяго насельніцтва.

22 сакавіка 1815 г. быў складзены інвентар маёнтка Скідзель, які паказваў плошчу дворнай і сялянскай зямлі [Аддзел рукапісаў Бібліятэкі Віленскага універсітэта. Ф. 4. Адз. зах. 1038. Інвентар маёнтка Скідзель 1815 г.]. Да панскага двору і фальваркаў непасрэдна належалі 844 дз. 1005 саж. зямлі, з іх ліку 5 дз. 1650 саж. уласна пад жылым домам Чацвярцінскіх, гаспадарчымі забудовамі і гародамі, 413 дз. 1824 саж. ворыва, 4 дз. 1408 саж. сенажаці, 20 дз. 1091 саж. нязручнай сенажаці, 33 дз. 1421 саж. “мелкой пораслі”, 39 дз. 437 саж. “нязручнай” зямлі пра рэчцы Скідлянцы, 6 дз. 1140 саж. пад дарогамі, 4 дз. 270 саж. пад рэчкамі, 1940 саж. пад рвамі. Ва ўрочышчы Храпава да двору належалі 130 дз. 2068 саж. ворыва, 22 дз. 1540 саж. “неудобного болота”, 14 дз. 1213 саж. “неудобной земли”, 1 дз. 25 саж. пад дарогамі, ва ўрочышчы Абалонь – 121 дз. 824 саж. выгану і 2 дз. 400 саж. пад каналамі і рвамі.

У карыстанні жыхароў мястэчка Скідзель і вёскі Пыраны знаходзілася 737 дз. 316 саж. зямлі ў шасцёх кавалках ці абрубах: звыш 520 дз. ворыва, 7 дз. сенакосу, звыш 20 дз. пашы. Пад пабудовамі і гародамі знаходзіліся 29 дз. 1161 саж., а пад местачковай плошчай і вуліцамі 9 дз. 240 саж. Астатняя плошча прыходзілася на балоты, зараснікі, пяшчаныя землі і дарогі. У Скідзелі і Пыранах, паводле дадзеных інвентара налічвалася 59 двароў і 261 сялянская душа (139 мужчынскіх і 122 жаночых).

Самай вялікай вёскай маёнтка Скідзель былі Гліняны, у якіх налічвалася 50 двароў і 267 сялянскіх душ (146 жаночых і 121 мужчынская). Да Глінянаў належалі 490 дз. 1612 саж. ворыва, 66 дз. 1022 саж. сенакосу, 1 дз. 1647 саж. “болотной лесной поросли”, 19 дз. 1975 саж. “болота неудобного”, 37 дз. 408 саж. выгану. Пад дарогамі знаходзіліся 6 дз. 267 саж., а пад рвамі і канавамі – 10 дз. 390 саж. Апроч таго глінянцам належалі ва ўрочышчы Абалонь 13 дз. 575 саж. сенакосу, 33 дз. 1461 саж. “болотной лесной поросли”, 14 дз. 446 саж. “болота неудобного”. Усяго ж у карыстанні гэтай вёскі знаходзілася 751

дз. 1202 саж. зямлі. Акрамя таго была яшчэ спрэчная зямля ва ўрочышчы Абалонь – 2 дз. 288 саж. ворыва і 9 дз. 1746 саж. сенакосу, на якую таксама прэтэндавалі сяляне вёсак Бубны і Пяшчанка ўладальніка Парчэўскага.

У вёсцы Некрашы налічваліся 42 двары і 150 сялянскіх душ, з іх 84 жаночыя і 66 мужчынскіх. Да гэтай вёскі належала 505 дз. 670 саж. зямлі. У Хватах і Агародніках налічвалася 16 двароў і 76 душ (40 жаночых і 36 мужчынскіх). Да жыхароў гэтае вёскі належала 120 дз. 162 саж. ворыва, 12 дз. 576 саж. сенакосу, 24 дз. 1457 саж. маладога лесу, 2 дз. 1183 саж. пяшчанай зямлі, 12 дз. 315 саж. ляснога выгану, пад хрысціянскімі могілкамі было занята 1965 саж. і пад яўрэйскімі 1290 саж., а пад дарогай – 2 дз. 1219 саж. Яшчэ Хватам і Агароднікам належалі ва ўрочышчы Рыскі 18 дз. 2372 саж. сенакосу, 3 дз. 1200 саж. нязручнага балота і 5 дз. 1686 саж. “мелкой поросли”. Усяго ж надзел гэтай вёскі складаў 203 дз. 1425 саж. зямлі. Апроч таго была спрэчная зямля з жыхарамі вёскі Пузавічы – 69 дз. 858 саж.

Вёска Сухаўляны налічвала ў 1815 г. 18 двароў і 90 сялянскіх душ (50 жаночых і 40 мужчынскіх). Сухаўлянцам належалі 473 дз. 1519 саж. ворыва, 35 дз. 581 саж. сенакосу, 3 дз. 1190 саж. “мелкой порослі”, 15 дз. 258 саж. нязручнага балота ў 9-х месцах, 68 дз. 631 саж. нязручнай зямлі ў трох месцах, 13 дз. 1296 саж. пашы ў двух месцах, 85 дз. 130 саж. пяшчанай зямлі ў 5-х месцах. Пад могілкамі знаходзіліся 1 дз. 2385 саж., пад дарогамі – 5 дз. 370 саж., пад рэчкаю – 2 дз. 200 саж. Апроч таго, сяляне гэтай вёскі мелі ва ўрочышчы Абалонь 1 дз. 600 саж. ворыва, 7 дз. 840 саж. сенакосу і 35 дз. 900 саж. “болотистой мелкой поросли”. Ва ўрочышчы Рыскі ім належала 11 дз. 1600 саж. сенакосу, 2 дз. “мелкой поросли” і 2 дз. 1300 саж. нязручнага балота. Усяго ж у карыстанні вёскі Сухаўляны знаходзіліся 763 дз. 1860 саж.

У вёсцы Белякоўшчына налічвалася 38 двароў і 147 сялянскіх душ (77 мужчынскіх і 73 жаночых). Сялянам гэтай вёскі належалі 562 дз. 1089 саж. зямлі. У суседнім Карашаве былі 32 двары і 135 душ (72 мужчынскія і 63 жаночыя). У карыстанні карашаўцаў было 595 дз. 493 саж. зямлі.

У вёсцы Рыскі было 40 двароў і 186 душ (94 мужчынскія і 92 жаночыя). У карыстанні гэтай вёскі была 521 дз. 395 саж. зямлі. Да маёнтку Скідзель тады належала яшчэ вёска Сарочыцы, якая складалася з 6 двароў і 38 душ. Сяляне Сарочыцаў мелі ў карыстанні 61 дз. 888 саж.

Усяго ж у маёнтку лічылася 5545 дз. 1142 саж. зямлі, з якіх 844 дз. 1105 саж. (15 %) знаходзілася пад дворам і фальваркамі і 4701 дз. 137 саж. (85 %) знаходзілася ў карыстанні сялян. Такім чынам, у 1815 г. у цэлым яшчэ захоўвалася структура землекарыстання, вызначаная валочнай памерай 1558 г. і прывілеямі Уладзіслава IV, паводле якіх было заснаванае мястэчка Скідзель.

Княгіня Калета Чацвярцінская спрабавала нейкім чынам паправіць становішча свайго маёнтка пасля ваенных разбурэнняў. У маі 1817 г. яна асабіста напісала прашэнне міністру ўнутраных спраў Расійскай імперыі Восіпу Казадаўлеву: “Имение мое, местечко Скидель, состоя по большой дороге из Гродна в Вильню, во время бывшаго неприятельского вторжения безпрестанными переходами войск крайне разорено; к поправлению коего, не нахожу другого удобнейшего средства, как учредить в оном ярмарки: – Почему на основании закона; всемилостивейше дарованной дворянству Грамоты, Ваше высокопревосходительство покорнейше прошу дозволить мне учредить две таковыя, как то: первую июня 24 в день святого Иоанна Крестителя, вторую же 30 сентября в день Святого Архистратига Михаила по римскому календарю” [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 29. С. 408. Арк. 2].

З архіўных дакументаў вынікае, што вышэйзгаданая княгіня Калета Чацвярцінская была жанчынай вельмі энергічнай і ўладарнай. У 1820-х гадах яна пачала актыўна праводзіць у маёнтку гаспадарчыя пераўтварэнні, якія выклікалі абурэнне падданых і шматлікія скаргі. Галоўным мерапрыемствам стала пераразмеркаванне зямельных надзелаў сялян. Калета Чацвярцінская забірала лепшыя землі ў сваіх падданых і адводзіла пад фальваркі. Цяпер гэтыя землі абрабляліся тымі ж сялянамі з дапамогай паншчыны. Прычым найбольш пацярпелі ад гэтых пераўтварэнняў мяшчане Скідзеля. У 1827 г. княгіня забрала ў скідзельцаў лепшыя зямельныя ўчасткі, а ўзамен прызначыла значна горшыя па якасці.

Гэтыя дзеянні Калеты Чацвярцінскай выклікалі ўпарты супраціў жыхароў мястэчка, якія лічылі сябе мяшчанамі, а не прыгоннымі сялянамі, і не маглі пагадзіцца на тое, што княгіня адбірае ад іх спадчынныя землі. Справа ў тым, што местачкоўцы спрадвеку свабодна валодалі сваімі зямельнымі надзеламі, перадавалі іх у спадчыну, аддавалі ў пасаг, прадавалі і закладвалі. Калі Чацвярцінская забрала лепшыя землі пад фальварак, а скідзельцам прызначыла іншыя, значна горшыя, апошнія ўспрынялі гэта як грубае парушэнне сваіх правоў. У чэрвені 1827 г. намеснік Царства Польскага цэсарэвіч Канстанцін Паўлавіч атрымаў скаргу ад жыхароў Скідзеля на сваю ўладальніцу Калету Чацвярцінскую. Пра яе змест можна здагадвацца з загаду цэсарэвіча, выдадзенага 4 студзеня наступнага 1828 г.: “Дабы жители местечка Скидель отыскивающие мещанство не были понуждаемы к работанию барщины ночью и в праздничные дни, а с крестьян не были взыскиваемы последством экзекуции поземельные оброки, сверх инвентаря установленные” [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 2. С. 1825. Арк. 8]. Гэты загад абвесціў княгіні і жыхарам мястэчка маршалак шляхты Гродзенскага павета Баржэцкі.

Але неўзабаве цэсарэвіч атрымаў яшчэ адну скаргу, пра што сведчыла з’яўленне новага “повеления” ад 6 сакавіка 1827 г.: “Я получил вновь прошение от 32-х человек жителей м.Скиделя отыскивающих

мещанства, в котором они повторили прежнюю жалобу свою на притеснения им помещицею княжною Четвертинскою и на потерпенные некоторыми из них от экономического управления побои, а также на угнетение оных строгою экзекуцией за неплатежи казенных податей, коих многие из просителей не в состоянии платить быв разорены владелицей Четвертинскою”. Але 23 кастрычніка таго ж года ў Скідзель была паслана ваенная каманда “для приведения крестьян в повиновение княгини Четвертинской”.

Канчатковы свой загад па справе жыхароў Скідзеля цэсарэвіч Канстанцін выдаў 31 снежня 1828 г., у якім ён канстатаваў, што “...скидельские жители, почитая себя мещанами и несогласясь на принятие назначенных им Повятовым Маршалом земель, отложились от повиновения дворовому начальству”. На думку цэсарэвіча, скарга гэта з'явілася ці ў выніку “подстрекательства корыстных людей”, ці “от недоразумения самих крестьян, кои признавая себя мещанами, полагают, что якобы помещица не имела права отбирать у них земель и наделять другими”. Такім чынам, царскі намеснік ў спрэчцы скідзельцаў з уладальніцай прыняў бок апошняй. Дарэчы, як вынікае з тэксту цэсарэвічава загаду, дык сяляне да сваёй скаргі далучылі нейкі старажытны дакумент ці яго копію, які пацвярджаў іх мяшчанскія правы і прывілеі. Але тут намеснік імператара адзначыў, што такія справы павінны разглядацца “по закону” і ў адпаведных інстанцыях. Скаргу жыхароў Скідзеля цэсарэвічу асабіста перадаў жыхар горада Ліпска ў Царстве Польскім адстаўны падпаручнік польскіх войскаў Марцін Штукоўскі, які гасцяваў у братоў Ляўковічаў у ваколіцы Самастрэльнікі пад Скідзелем. Напэўна, адстаўны ваяка за пэўную плату пагадзіўся выканаць просьбу скідзельцаў.

Да якіх вынікаў прывяла гаспадарчая дзейнасць Калеты Чацвярцінскай? Часткова адказ на гэтае пытанне дае інвентар маёнтка Скідзель, складзены ў 1845 г. [НГАБ у Гродне. Ф. 96. В. 1. С. 1126. Інвентар маёнтка Скідзель 1845 г.]. Гэты дакумент ўтрымлівае даволі падрабязныя звесткі пра гаспадарчы стан мястэчка і вакольных вёсак. Уладальнікамі маёнтка ў інвентары пазначаныя Калета Чацвярцінская і яе сыны Кавалер Мальційскага ордэна Канстанцін і Камерюнкер Світы яго Імператарскай Вялікасці Густаў (Георгі) Антонавічы Чацвярцінскія. Сыны, напэўна, больш займаліся службай (абодва даслужыліся да вельмі высокіх чыноў Сапраўднага Стацкага Саветніка), а кіраванне маёнтка даверылі сваёй маці.

Скідзельскі маёнтак належаў да ліку найбуйнейшых у Гродзенскай губерні. Яго агульная плошча складала 6868 дз. 1687 сажняў зямлі, з якой ужо 3098 дз. 1515 саж. (45,1 % ) знаходзілася пад фальваркамі, а 3559 дз. 1912 сажняў (54,9 %) – было ў карыстанні сялян (табл. 3). Апроч таго, хаты і гароды местачковых яўрэяў займалі 26 дз. 154 саж. зямлі, а пляцы, якія належалі скідзельскім татарам – 26 дзес. 2037 саж. Яшчэ 158 дз. 470 сажняў належала да прычту Скідзельскай праваслаўнай

царквы. Праўда, да статыстычных дадзеных інвентара адносна плошчы землекарыстання трэба падыходзіць з пэўнай асцярожнасцю, паколькі ў самім дакуменце адзначалася, што “в этом имении земли не приведены в точную известность, но соображаясь с посевом, общее пространство полагать можно в 6717 дес. 271 саж.” [НГАБ у Гродне. Ф. 96. В. 1. С. 1126. Арк. 38].

*Табліца 3*

**Структура зямельных угоддзяў маёнтка Скідзель у 1845 г. (у дз.)**

| | Сядзібы | Ворыва | Сенажаці | Выганы | Лес | Разам |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пад фальваркамі | 30 | 1091,5 | 415 | 78 | 1483 | 3097 |
| У сялян | 180 | 2668 | 410 | 300 | - | 3558 |
| Разам | 210 | 3759 | 825 | 378 | 1483 | 6655 |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 96. В. 1. С. 1126.

Паводле дадзеных інвентара ў самім Скідзелі налічвалася 46 цяглых сялянскіх двароў і 13 кутнікаў. Ва ўсім маёнтку – 281 цяглы двор і 18 кутнікаў. Маёмасны стан сялян выглядаў не вельмі добра, пра што сведчаць дадзеныя аб забяспечанасці іх хатняй жывёлай (табл. 4).

*Табліца 4.*

**Забяспечанасць жывёлай сялян маёнтка Скідзель**

| | Цяглыя Двары | Коні | Валы | Каровы | Цяляты | Авечкі | Свінні |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Скідзель | 46 | 15 | 57 | 14 | 12 | 52 | 79 |
| Гліняны | 55 | 73 | 94 | 56 | 69 | 165 | 137 |
| Карашава | 26 | 19 | 48 | 24 | 19 | 14 | 32 |
| Хваты | 15 | 9 | 30 | 10 | 9 | 56 | 30 |
| Сухаўляны | 21 | 21 | 41 | 18 | 18 | 53 | 25 |
| Рыскі | 33 | 12 | 53 | 28 | 17 | 41 | 31 |
| Белякоўшчына | 40 | 28 | 80 | 37 | 28 | 45 | 57 |
| Некрашы | 45 | 16 | 70 | 40 | 17 | 98 | 50 |
| Разам | 281 | 193 | 475 | 227 | 189 | 524 | 441 |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 96. В. 1. С. 1126.

Сялянскія землі падзяляліся на сядзібы (дзе размяшчаліся хаты, гаспадарчыя пабудовы і гароды), ворыва і сенажаці. Местачковыя сяляне мелі ў сваім карыстанні па 800 сажняў сядзібнай зямлі, 8 дзесяцін ворыва, 1 дз. 800 саж. сенажацяў. Яны плацілі аброк уладальніку 1,5 руб. з двору (табл. 5). Але ўзнікае пытанне: Ці адпавядалі дадзеныя інвентара рэальнаму стану рэчаў? На падставе аналізу розных

крыніц у нас складваецца перакананне, што скідзельцы так і не пагадзіліся прыняць тыя землі, што прызначыла ім у 1827 г. уладальніца Калета Чацвярцінская. Таму ў рэчаіснасці яны мелі значна менш зямлі ў карыстанні, чым паказваў інвентар.

*Табліца 5*

**Землекарыстанне і грашовыя павіннасці сялянаў маёнтка Скідзель**

| | Сядзібы | | Ворыва | | Сенажаці | | Чынш (у руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Дзес. | Сажні | Дзес. | Сажні | Дзес. | Сажні | |
| Скідзель | 17 | 2133 | 368 | - | 61 | 800 | 69 |
| Гліняны | 38 | 1600 | 541 | - | 77 | - | 174 |
| Карашава | 17 | 800 | 242 | - | 34 | - | 12,9 |
| Хваты | 10 | - | 140 | - | 20 | - | 45 |
| Сухаўляны | 14 | - | 196 | - | 28 | - | 31,5 |
| Рыскі | 33 | - | 363 | - | 44 | - | 15,34 |
| Белякоўшчына | 26 | - | 373 | - | 53 | - | 18,60 |
| Некрашы | 9 | - | 336 | - | 56 | - | 100,8 |
| Разам | 165 | 2133 | 2559 | - | 373 | 800 | 466,33 |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 96. В. 1. С. 1126.

Значная частка рухомай і нерухомай маёмасці, якой карысталіся сяляне скідзельскага маёнтка, з'яўлялася ўласнасцю эканоміі (табл. 6). Напрыклад, больш за палову дамоў і гаспадарчых пабудоў сялян належала памешчыку, а таксама прыкладна чвэрць коней. Нам цяжка адказаць, якім чынам склалася такая сітуацыя. Магчыма, яны была вынікам хранічнай запазычанасці сялянаў эканоміі.

*Табліца 6*

**Маёмасць сялян маёнтка Скідзель**

| | Уласнасць эканоміі | Уласнасць сялян | Разам |
|---|---|---|---|
| Хаты | 160 | 134 | 294 |
| Хлявы | 155 | 139 | 294 |
| Клуні | 174 | 120 | 294 |
| Амбары | 90 | 189 | 279 |
| Коні | 64 | 129 | 193 |
| Каровы | - | 227 | 227 |
| Авечкі | - | 523 | 523 |
| Свінні | - | 441 | 41 |
| Дробная жывёла | - | 189 | 189 |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 96. В. 1. С. 1126. Арк. 4 адв. Інвентар маёнтка Скідзель 1845 г.

Інвентар таксама акрэсліваў павіннасці сялян на карысць панскага двору, галоўнай з якіх была паншчына. Прычым жыхары самога мястэчка знаходзіліся ў больш прывілеяваным становішчы ў параўнанні з іншымі. Яны мусілі адпрацаваць адзін дзень з сялянскага двору паншчыны ў тыдзень, а жыхары вёсак – па тры дні. Апроч таго, ад кожнага двору належала адпрацаваць 30 жаночых дзён паншчыны з 1 красавіка па 1 лістапада, па 6 дзён гвалтаў ці згонаў (тэрміновыя

працы пад час жніва і касьбы, калі ўсе дарослыя члены сялянскай сям'ї, апроч аднаго, які даглядаў за дзецьмі і агнём у печы, шлі на панскі палетак), шарваркаў (прызначаліся для будаўніцтва дарог, мастоў і іншых тэрміновых і неабходных грамадскіх работаў) па 20 у год для местачкоўцаў і па 12 для вяскоўцаў (10 з іх прызначаліся на грамадскія патрэбы саміх сялян, а астатнія – на патрэбы панскага двору), адбыць варту па 5 дзён (залічвалася за тыдзень паншчыны), даць даніну па 1 курыцы, 6 яек ад двору і 1 гусцы з 10 двароў (даніна традыцыйна пералічвалася на грошы), напрасці для пана ад кожнага сялянскага двору па 1 фунту тонкай і па 4 фунты тоўстай авечай поўсці з таго матэрыялу, які выдаваўся з фальварку.

Мужчыны лічыліся здольнымі да выканання паншчыны ад 18 да 55 гадоў, жанчыны – ад 16 да 50 гадоў. Затое на гвалты ці згоны павінны былі ісці мужчыны ад 14 да 60 гадоў і жанчыны ад 14 да 55 гадоў. Для выканання паншчыны існавалі адмысловыя ўрокі, якія вызначалі аб'ём працы. Напрыклад, работнік мусіў за дзень узгараць ⅓ дз. ворыва, забаранаваць ⅔ дз., нажаць ад 225 да 400 сажняў азімага жыта ў залежнасці ад якасці палетку. Калі ён спраўляўся з гэтай работай, то мог і раней вяртацца дадому, калі ж не – дык павінен быў прыйсці на другі дзень і завершыць працу.

Апроч натуральных павіннасцяў існаваў і грашовы чынш, велічыня якога вагалася па вёсках маёнтку ад 46,5 капеек да 3-х рублёў серабром з двору. Тлумачылася гэтая розніца якасцю зямлі, якой карысталіся сяляне. Яны мелі права на воз дроў з панскага лесу кожны тыдзень. Будаўнічы матэрыял можна было атрымаць у тым жа лесе “в случае необходимости”. Напэўна, тут ужо вырашаў уладальнік ці аканом маёнтка ў кожным канкрэтным выпадку. Сяляне таксама мелі права пасвіць сваю жывёлу “в зарослях и экономических лесах”.

Матэрыяльнае становішча сялян складальнікам інвентара ацэньвалася як “ниже посредственного”. Найгорш выглядалі ў гэтых адносінах жыхары Скідзеля. Напэўна на іх дабрабыце адбілася зацятае змаганне з уладальнікамі за зямлю і мяшчанскія вольнасці. Напрыклад, усяго 15 скідзельскіх гаспадароў з 46 мелі коней, а 12 гаспадароў увогуле не мелі цяглай працоўнай жывёлы – ні каня, ні пары валоў. Хутчэй за ўсё такія гаспадары не абраблялі сваіх палеткаў, а аддавалі іх у арэнду, самі ж займаліся, напэўна, нейкімі іншымі заробкамі. Толькі 14 гаспадароў трымалі па адной карове. У шасці гаспадарках – Марыяны Кошчычавай, Івана Пучкоўскага, Гаўрылы Халецкага, Пятра Бараноўскага, Гаўрылы Мазалеўскага, Франца Лотыша – зусім не было хатняй жывёлы. У гаспадароў Якуба Чабатарэвіча і Восіпа Юрэвіча меўся толькі адзін вол. Казімір Злоцкі трымаў усяго тры свінні, а Андрэй Чабатарэвіч і Мацвей Гарноўскі – па дзве. Самым заможным гаспадаром у мястэчку Скідзель, паводле дадзеных інвентара, можна лічыць Вікенція Лапыша. Яго сям'я складалася з жонкі, трох сыноў, дачкі, аўдавеўшай пляменніцы з дарослай дачкой і служанкі. Гэтая

сям'я мела каня, двух валоў, цялушку, 3 авечкі і 5 свіней. Тут трэба адзначыць, што гаспадары, які не мелі хатняй жывёлы, не абавязкова былі самымі беднымі. Яны маглі зарабляць на жыццё рамяствам і гандлем, напрыклад, трыманнем корчмаў і шынкоў.

Найбольш заможнымі сярод вёсак маёнтка Скідзель выглядалі жыхары Глінянаў. А сярод іх самым багатым гаспадаром быў Міхал Свёкла. Яго сям'я мела 2 коней, двух валоў, дзве каровы, цялушку, 11 авечак і 5 свіней. Невыпадкова, што менавіта сям'я Свёклаў паставіла ў сярэдзіне XIX ст. першы мураваны помнік на скідзельскіх могілках. У Глінянах таксама заможнымі былі гаспадаркі Міхала Данілава Гайкі, Міхала Іванава і Сымона Тамашова Гайкаў. Напрыклад, у Сымона Гайкі былі 2 кані, 2 валы, 2 каровы, 3 цялушкі, 6 авечак, 6 свіней.

Паводле звестак эканоміі, сярэдні гаспадар у маёнтку Скідзель збіраў увосень 13,74 чвэрці[16] жыта (болей за пятнаццаць цэнтнераў), 0,32 чвэрці пшаніцы, 2,9 чвэрці ячменя, 5,9 чвэрці аўса, 1,2 чвэрці гароху, 1,3 чвэрці грэчкі, 22,8 чвэрці бульбы, 0,07 чвэрці ільну, 0,09 чвэрці канаплі (табл. 7). Ураджайнасць азімага жыта ў сярэднім складала 4 чвэрці 1 чацвярык з дзесяціны, ці каля 490 кг.

*Табліца 7*

**Пасевы і зборы сельскагаспадарчых культур у маёнтку Скідзель у 1845 г.**

| | Сялянскія гаспадаркі | | | Эканомія | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| С/г культуры | Пасеяна (у чвэрцях) | Сабрана (у чвэрцях) | Ураджайнасць | Пасеяна (у чвэрцях) | Сабрана (у чвэрцях) | Ураджайнасць |
| Жыта | 702 | 3861 | Сам 5,5 | 180 | 810 | Сам 4,5 |
| Пшаніца | 20 | 90 | Сам 4,5 | 20 | 90 | Сам 4,5 |
| Ячмень | 150 | 825 | Сам 5,5 | 50 | 225 | Сам 4,5 |
| Авёс | 300 | 1650 | Сам 3,5 | 200 | 900 | Сам 4,5 |
| Гарох | 60 | 330 | Сам 5,5 | 15 | 67 | Сам 4,5 |
| Грэчка | 60 | 360 | Сам 6 | 15 | 75 | Сам5 |
| Бульба | 800 | 6400 | Сам 8 | 500 | 3500 | Сам 7 |
| Лён | - | 20 | - | - | - | - |
| Канапля | - | 25 | - | - | - | - |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 96. В. 1. С. 1126. Арк. 40 адв.

Паводле інвентара, грашовы прыбытак на адзін сялянскі двор у маёнтку Скідзель складаў у сярэднім 95,39 руб. у год. Разлічвалася гэтая лічба наступным чынам. Напрыклад, гаспадар мястэчка Скідзель засяваў звычайна 2 дз. 1600 сажняў зямлі азімым жытам. Ураджай складаў у сярэднім 14 чвэрцяў. Пры коштах на жыта 2,60 руб. срэбрам за адну чвэрць прыбытак у грашовым вымярэнні складаў 36,40 руб. Такой жа сумай эканомія ацэньвала даход скідзельскага гаспадара ад

[16] *Чвэрць*, мера аб'ёму сыпкіх рэчываў, галоўным чынам збожжа, роўная прыкладна 209 л. Дзялілася на дзве асьміны, 8 чацвярыкоў і 64 гарнцы.

яравых пасеваў. З 1 дз. 800 сажняў сенажацяў скідзельскі селянін збіраў 133 пуды сена коштам па 13 капеек за пуд, што складала 17,29 руб. Агароды пры хатах, паводле разліку эканоміі, прыносілі гаспадару яшчэ 5,30 руб. З агульнай сумы прыбыткаў сялянскага двору 34,68 руб. (36 %) належала аддаць эканоміі. У рэчаіснасці сяляне Скідзельскага маёнтка плацілі ад 46,5 капеек да 3 руб. аброку з аднаго двору ў залежнасці ад вёскі, а рэшту адпрацоўвалі на паншчыне і згонах.

Апрача павіннасцяў на карысць панскага двору, сяляне мусілі яшчэ плаціць дзяржаўныя падаткі, якія складаліся з падушнага падатку, харчовага і агульнага земскага збору. Велічыня падатку налічвалася паводле дадзеных рэвізскага перапісу ад колькасці мужчынскіх душ. Прычым плаціць трэба было і за збеглых, памёрлых і рэкрутаў. Падаткі раскладваліся па-роўну на кожны двор. Іх агульная сума па ўсяму маёнтку Скідзель складала 1585 руб., ці ў сярэднім 5,64 руб. з сялянскага двору і 1,6 руб. з рэвізскай мужчынскай душы. Праўда, памешчык скардзіўся, што "причитающееся с крестьян подати едва вносятся и в половине, а другую всегда почти вносит за них экономия, не получая никогда в возврат таковых" [НГАБ у Гродне. Ф. 96. В. 1. С. 1267. Арк. 41 адв. Інвентар маёнтка Скідзель за 1845 г.]. Складальнік інвентара адзначаў: "Государственные подати крестьяне плотят половину в сентябрьской рате, а другую половину дворовое начальство в мартовской рате". Памешчык таксама выплочваў 39 руб. казённых падаткаў за дваровых людзей. Эканомія яшчэ плаціла прыватны земскі падатак, падатак на вінакурэнне і падатак на Брэсцкі кадэцкі корпус, якія ў суме складалі 629 руб. 16 кап.

Зрэшты для ўладальнікаў галоўным клопатам быў не дабрабыт падданых, а гаспадарчы стан фальварачнай гаспадаркі. У маёнтку былі створаны чатыры фальваркі: Скідзель (да яго хадзілі адпрацоўваць паншчыну сяляне мястэчка Скідзель і вёсак Гліняны, Карашава і Хваты), Канстанцінава (Сухаўляны і Рыскі), Фенькава (Белякоўшчына) і Пыраны (Некрашы). У галоўным фальварку Скідзель знаходзіліся 2 цагляныя жылыя дамы і 1 драўляны, гумно, "скотский и овчарный сараи из глины", стайня з экіпажным сараем з цэглы, драўляныя лянднік і сушыльня, мураваная саладоўня. Эканомія прадавала прадукцыю фальваркаў у Гродна і ў Крулявец (Кенігсберг). За правоз канём груза на адлегласць 28 вёрстаў сялянам залічваўся дзень паншчыны. На той час чвэрць жыта ў Скідзелі каштавала 2 рублі, чвэрць пшаніцы – 4 руб., ячменя – 1,5 руб., аўса – 1 руб., гароху – 2 руб., грэчкі – 2 руб., бульбы – 0,75 руб.

Жыта ў маёнтку высявалася на дзесяціну 4 чвэрці 1 чацвярык, ураджай дасягаў сам-5,5. Ячменя высявалі 4 чвэрці 6,5 чацвярыкоў, грэчкі 3 чвэрці 6 чацвярыкоў, ураджай складаў сам-6. Бульбы высаджвалі 6 чвэрцяў на дзесяціну, ураджай складаў у сярэднім сам-8.

Гаспадарка ў фальварку была арганізаваная паводле строгіх рацыянальных прынцыпаў, вёўся дакладны бугалтарскі ўлік. Усе работы, усе выдаткі і прыбыткі, запісваліся ў спецыяльныя кнігі. Гэтыя кнігі

захаваліся [Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. Ф. 15123. Архіў князёў Чацвярцінскіх], што дае нам магчымасць скласці пэўнае ўяленне пра панскую гаспадарку ў маёнтку Скідзель. Напрыклад, у 1822 г. на фальваркавых палетках было нажата 911 коп[17] жыта, 397 коп пшаніцы, 257 коп ячменя, 708 коп аўсу, 11 коп бабоў, 65 вазоў гароху на шасці моргах, 79 коп грэчкі на 33,5 моргах, 20 коп канаплі, 19 коп льну, 7 вазоў вікі і столькі ж канюшыны, 1025 вазоў (15375 пудоў) першага сена і 20 вазоў (300 пудоў) атавы. Высаджвалася на панскіх гародах таксама бульба. У фальварку Скідзель на люты 1823 г. утрымлівалася такое пагалоўе хатняй жывёлы: 11 валоў, 11 быкоў-бугаёў, 71 карова, 17 цялятаў, 331 авечка, 46 свіней, 18 індыкоў, 20 гусей, 12 качак, 31 курыца.

Эканомія сачыла і за матэрыяльным станам сялянаў. Рабілася гэта з той мэтай, каб ведаць, хто сапраўды з прычыны беднасці не ў стане выплочваць дзяржаўныя падаткі, а хто можа іх плаціць, але не жадае. Напэўна, супраць апошніх прымаліся нейкія карныя дзеянні. Такім чынам, тут быў непасрэдны матэрыяльны інтарэс эканоміі. Захаваліся дадзеныя, якія эканомія сабрала ў 1828 г. адносна сялян вёскі Белякоўшчына. Так, самы заможны гаспадар вёскі Мікалай Вайцяшэня сабраў у той год ураджай 10 коп жыта (прыкладна 40-50 пудоў зерня), 4 капы ячменя, 2 капы аўса, 1 капу грэчкі, 30 коп льну і 6 вазоў сена. Бядняк Лявон Шыла сабраў 5 коп жыта, 1 капу ячменя, 1 капу аўса, 1 капу грэчкі, 10 коп льну, 2 вазы сена.

Эканомія атрымлівала таксама прыбыткі ад розных прадпрыемстваў і арэнды. У мястэчку Скідзель, паводле дадзеных інвентара 1845 г., былі 2 пастаялыя двары, 21 шынок (яшчэ 6 корчмаў знаходзілася па вёсках маёнтка), 1 вадзяны млын, завод рагатага быдла і аўчарны завод (мэтай існавання гэтых заводаў было паляпшэнне пароды мясцовай хатняй жывёлы). Пры паштовай станцыі ў Струпіне працавала цагельня. Асноўным прадпрыемствам у маёнтку і звестуном надыходзячай індустрыялізацыі з'яўлялася паравая вінакурня, якая расходавала ў дзень 10 пудоў мукі альбо 20 чвэрцяў бульбы. Вытворчасць гарэлкі працягвалася тут на працягу 6 месяцаў. За гэты час прадукавалася 6525 вёдраў гарэлкі (80257,5 л)[18]. Для гэтага патрабавалася 225 чвэрцяў мукі альбо 3600 чвэрцяў бульбы. Прыбытак эканоміі ад продажу гарэлкі ацэньваўся сумай у 4160 руб. Гэта была самая істотная крыніца даходаў у маёнтку. Вядро гарэлкі каштавала 2,6 руб. Калі дапусціць, што гарэлку спажывалі толькі поўнасцю працаздольныя мужчыны маёнтка, дык выходзіць 122 л на аднаго. Але напэўна, што вельмі шмат гарэлкі спажывалася вайскоўцамі, якія часта праходзілі праз Скідзель, ды і ў самім мястэчку стала кватаравалі вайсковыя часткі царскай арміі.

Складальнік інвентара адзначыў, што “сидельцы в питейных домах по деревням христиане, в самом местечке же Евреи”. Праўда, у

[17] *Капа*, мера для падліку ўраджая збожжа, налічвала 60 снапоў. Умалот з капы залежаў ад ураджаю.
[18] *Вядро*, мера вадкіх рэчываў. Раўнялася 12,3 л.

фінансавым дакуменце эканоміі за 1835 г. сцвярджалася, што ў Скідзелі прыватныя шынкі трымалі Гіляры і Якуб Чабатарэвічы, Ян Голуб, Лукаш Гарноўскі, Міхал Мазалеўскі, Ян Пучкоўскі, Язэп Халецкі, якія прадавалі гарэлку і піва з панскіх бровараў [Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. Ф. 15123. Архіў князёў Чацвярцінскіх]. Млынар Рубін Іоселевіч плаціў эканоміі 333 злотых за арэнду млына. Улічваліся панскім касірам нават самыя дробныя траты і прыбыткі. Напрыклад, у 1835 г. было пазначана, што эканомія прадала 7 валоў на агульную суму 346 злотых 20 грошай і 1 індыка за 3 злотых. Складальнік інвентара 1845 г. таксама адзначаў, што некаторыя мясцовыя сяляне наймаюцца для сплаву тавараў па Нёману да Кёнігсберга, за што зарабляюць па 12-14 руб., але эканомія на гэтыя грошы не прэтэндуе.

Скідзельскія мяшчане не спынялі змаганне за сваю зямлю і мяшчанскія вольнасці. У лістападзе 1848 г. г. жыхары мястэчка Клімент Жук, Ян Дзелянкоўскі і Гаўрыла Сцяпанаў скардзіліся гродзенскаму губернатару фон Ховену, што чыноўнікі не вяртаюць ім старажытныя каралеўскія прывілеі. У 1846 г. яны перадалі гэтыя прывілеі па просьбе гродзенскага паліцэйскага спраўніка Юдзіна пісьмаводу Сасулічу. Спраўнік аддаў тыя паперы ўезднаму маршалку шляхты, а апошні – уладальніку Скідзеля князю Чацвярцінскаму. Трэба прызнаць, што новы спраўнік Гродзенскага ўезда Магнус спрабаваў у 1850 г. вярнуць сялянам гэтыя прывілеі. Аднак князь Канстанцін Чацвярцінскі адпісаў яму, “что привилеи жителям Скиделя не нужны, поскольку по указу Сената от 28 марта 1824 г. № 545 они предоставлены распоряжению владельца наравне с крепостными”. Князь проста не жадаў вяртаць сялянам старадаўнія дакументы, “дабы не допустить могущих от этого произойти со стороны их недоразумений и ябед, что уже и испытано было мною” [НГАБ у Гродне. Ф. 2. В. 34. С. 895. А. 17–17 адв. Скарга сялян мястэчка Скідзель на князя Чацвярцінскага. 1851-1855 гг.]. Аднак у кастрычніку 1851 г. губернатар усё ж прымусіў князя вярнуць азначаныя прывілеі ў губернскае праўленне для разгляду. Як аказалася, гэта былі: прывілей караля Рэчы Паспалітай Уладыслава IV на заснаванне кірмаша ў Скідзелі ад 1640 г., яго ж прывілей 1647 г. аб надзяленні зямлёй скідзельскіх мяшчан і прывілей Яна Казіміра ад 1653 г. аб пераносе кірмаша з чацвярга на аўторак. Непісьменныя жыхары Скідзеля (у скарзе вышэйназваныя сяляне паставілі крыжыкі) старанна захоўвалі гэтыя прывілеі і перадавалі іх з пакалення да пакалення. Старажытныя каралеўскія паперы сталі для скідзельцаў сцягам барацьбы за волю і зямлю.

Змагаліся жыхары Скідзеля за волю і, так сказаць, у прыватным парадку. У 1847 г. напісаў скаргу на Чацвярцінскага гродзенскаму губернатару скідзельскі кутнік Лявон Ванюкевіч [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 12. С. 706. Арк. 1-2. Скарга Лявона Ванюкевіча на ўладальніка маёнтка Скідзель князя Чацвярцінскага. 1847 г.]. Яго дзед Міхал Іванавіч Ванюкевіч у 1795 г. быў запісаны у мяшчане горада Гродна, а

потым пасяліўся ў маёнтку Скідзель, дзе працаваў кавалём. Лявон патрабаваў вызваліць яго з прыгоннай залежнасці і спагнаць з князя грошы, якія той не выплаціў за працу яго бацьку (2500 злотых) і яму самаму за 18-гадовую службу (45 рублёў). Як вынікала са справы, 219 рублёў ад князя Ванюкевіч ужо атрымаў. Пастановай павятовага суда ад 19 красавіка 1849 г. ён і яго сястра Ганна Курчэўская былі вызваленыя ад прыгоннай залежнасці, але ці выплаціў Чацвярцінскі патрабуемыя Ванюкевічам грошы, нам невядома [НГАБ у Гродне. Ф. 2. В. 35. С. 959. Аб вызваленні з прыгоннай залежнасці селяніна мястэчка Скідзель Лявона Ванюкевіча. 1849-1850 гг.].

У 1859 г. жыхары Скідзеля зноў пісалі ва ўладныя інстанцыі паперы, у якіх дамагаліся прызнання іх мяшчанскіх правоў. Губернскае начальства палічыла, што вінаваты ў гэтым нейкі “падгаворшчык Камінскі” [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 5. С. 2118. Арк. 3 адв. Скарга сялян мястэчка Скідзель на прыгнёт. 1859 г.]. Напэўна, гэта быў дробны шляхціц, які спецыялізаваўся на адвакацкіх паслугах сялянам у іх спрэчках з уладальнікамі.

Не былі ціхімі і пакорлівымі таксама сяляне вёсак маёнтка Скідзель. У 1859 г. уладальнік суседняга маёнтка Галавачы Ціт Чачот скардзіўся на жыхароў вёскі Гліняны, якія пасеклі дрэвы ў яго лесе, пабілі ляснога стражніка і забралі з панскай стайні сваіх коней (іх гэты самы стражнік забраў за незаконны выпас на лугах маёнтка Галавачы). Праўда, Чачот урэшце рэшт глінянцам усё дараваў [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 5. С. 2153. Арк. 1. Скарга памешчыка Чачота на сялян вёскі Гліняны. 1859-1862 гг.]. Напэўна, што ён неяк дамовіўся ці з самымі Чацвярцінскімі, ці з упраўляючым іх маёнтка. Дарэчы, эканомам у скідзельскім двары шмат гадоў быў шляхціц Багатырэвіч з аднайменнай суседняй ваколіцы. Пры маёнтку дзейнічаў і шпіталь, лекарам у якім шмат гадоў працаваў Калежскі рэгістратар Рыгор Шырма. Пазней яго нашчадкам належаў маёнтак Мількаўшчына ў Скідзельскай воласці.

### Рэформа 1861 г. і змаганне за зямлю

Выключна важную ролю ў гісторыі Беларусі XIX ст. адыграла сялянская рэформа 1861 г., якая скасоўвала прыгонную залежнасць сялянскага насельніцтва ад землеўладальнікаў. Сяляне атрымлівалі асабістую свабоду і станавіліся патэнцыйнымі ўласнікамі сваіх зямельных надзелаў. Надзелы гэтыя, аднак, яны павінны былі выкупіць. Палажэнні рэформы, падпісаныя імператарам Аляксандрам I у лютым 1861 г., вызначалі 9-гадовы пераходны перыяд. На гэты час памешчыкі захоўвалі свае ўладныя паўнамоцтвы, а сяляне заставаліся ў статусе “часоваабавязаных” і працягвалі адбываць паншчыну. Велічыню сялянскіх надзелаў, памеры грашовага чыншу і выкупу за іх, а таксама любыя іншыя аспекты ўзаемаадносін сялян са сваімі былымі ўладальнікамі пасля рэформы вызначалі адмысловыя дакументы –

устаўныя граматы, якія даручана было складаць самім жа памешчыкам. Пасля праверкі правільнасці гэтых граматаў міравымі пасярэднікамі[19], яны ўводзіліся ў дзеянне нават у тым выпадку, калі сяляне і не пагаджаліся з умовамі вызвалення.

Менавіта так і адбылося ў маёнтку Скідзель. У 1862 г. была складзена устаўная грамата, якая вызначала памеры сялянскага землекарыстання і грашовага чыншу за зямлю для сялян маёнтка. Усяго сялянам мястэчка і сямі вёсак адводзілася 3225 дз. 1115 саж. зямлі, якая станавілася іх патэнцыйнай уласнасцю (табл. 8).

*Табліца 8*

**Землекарыстанне сялян маёнтка Скідзель паводле ўстаўной граматы 1862 г. (у дзесяцінах і сажнях)**

| | Сядзібы | | Ворыва | | Сенажаць | | Выган | | Нязручная зямля | | Разам | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Дзес. | Сажні | Дзес. | Сажні | Дзес. | Сажні | Дзес. | Сажні | Дзес. | Сажні | Дзес. | Сажні |
| Скідзель | 9 | 897 | 460 | | 61 | 800 | 19 | 400 | 1 | 38 | 550 | 2135 |
| Гліняны | 38 | 1600 | 541 | 800 | 77 | 800 | 24 | 400 | 16 | 698 | 697 | 1898 |
| Карашава | 16 | 1600 | 233 | 800 | 33 | 800 | 17 | 800 | 15 | 224 | 315 | 1824 |
| Белякоўшчына | 25 | 800 | 354 | 1600 | 50 | 1600 | 15 | 2000 | 7 | 53 | 453 | 1253 |
| Хваты | 10 | | 140 | | 12 | 330 | 6 | 600 | 12 | 1136 | 188 | 1736 |
| Некрашы | 14 | | 314 | 132 | 9 | 156 | 17 | 1200 | 13 | 810 | 423 | 2298 |
| Сухаўляны | 13 | 800 | 186 | 1600 | 18 | 580 | 8 | 800 | 16 | 1870 | 251 | 1870 |
| Рыскі | 28 | | 252 | | 37 | 800 | 11 | 1600 | 14 | 101 | 343 | 101 |
| Разам | 155 | 897 | 2482 | 132 | 20 | 1866 | 120 | 600 | 96 | 130 | 3225 | 1115 |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 599. Арк. 5 адв - 6. Устаўная грамата маёнтка Скідзель. 1862 г.

Паводле ўстаўной граматы ў мястэчку Скідзель налічвалася 46 сялянскіх двароў, надзеленых палявымі зямельнымі ўчасткамі, 10 агароднікаў (валодалі толькі прысядзібнымі гародамі) і 9 парабкаў (пераважна былых дваровых людзей), якія ўвогуле не мелі зямлі. Устаўная грамата адводзіла скідзельцам 9 дзес. 897 саж. сядзібнай зямлі, 460 дзес. ворыва, 61 дзес. 800 саж. лясных сенажацяў у агульнае карыстанне з былым уладальнікам Чацвярцінскім, а таксама 19 дзес. 400 саж. пашы. Уся плошча надзеленай сялянам мястэчка зручнай для карыстання зямлі складала 549 дзес. 2097 саж., а нязручнай – 1 дзес. 38 саж. Двум былым панскім парабкам былі нарэзаны поўныя зямельныя надзелы, а яшчэ двум – агародныя. У выніку на адзін сялянскі двор прыходзілася ад 324 да 436 саж. сядзібы, 10 дз. ворыва, 1 дз. 800 саж. сенажаці. Пашай жыхары мястэчка, як і астатнія сяляне маёнтка, павінны былі карыстацца супольна. Паводле ўстаўной граматы аброк з падворнага зямельнага ўчастка складаў 14 руб. 50 кап. у год, а з усіх скідзельскіх сялянаў – 667

[19] Пасада *міравога пасярэдніка* ўводзілася якраз для рэалізацыі палажэнняў аграрнай рэформы. Ён выбіраўся з ліку мясцовых землеўладальнікаў

руб. У вёсках маёнтка Скідзель падворны надзел складаў 11 дз. 800 саж., за выключэннем Некрашоў, дзе ён быў трохі меншы (табл. 9).

*Табліца 9*

**Землекарыстанне сялян маёнтка Скідзель паводле ўстаўной граматы 1862 г. у разліку на адзін двор (у дзесяцінах і сажнях)**

| | Сядзібы | Ворыва | Сенажаць | Разам |
|---|---|---|---|---|
| Скідзель | ад 324 да 436 саж. | 10 дз. | 1 дз. 800 саж. | 11 дз. 1124 саж. |
| Гліняны | 1600 саж. | 9 дз. 800 саж. | 1 дз.800 саж. | 11 дз. 800 саж. |
| Карашава | 1600 саж. | 9 дз. 800 саж. | 1 дз. 800 саж. | 11 дз. 800 саж. |
| Белякоўшчына | 1600 саж. | 9 дз. 800 саж. | 1 дз. 800 саж. | 11 дз. 800 саж. |
| Хваты | 1600 саж. | 9 дз. 800 саж. | 1942+1256 | 11 дз. 800 саж. |
| Некрашы | 800 саж. | 7 дз. 1146 саж. | 2318 саж. | 9 дз. 864 саж. |
| Сухаўляны | 1600 саж. | 9 дз. 800 саж. | 1 дз. 800 саж. | 11 дз. 800 саж. |
| Рыскі | 1 дз. | 9 дз. | 1 дз. 800 саж. | 11 дз. 800 саж. |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 599. Арк. 9 адв.- 6. Устаўная грамата маёнтка Скідзель. 1862 г.

Аднак рэформа, пра што мы ўжо вышэй гаварылі, не вызваляла сялян ад выканання павіннасцяў на карысць землеўладальніка. Калі яны не жадалі хадзіць на паншчыну, дык павінны былі плаціць чынш, які вылічваўся на падставе ацэнкі ўсіх павіннасцяў і пераводу іх на грошы. Ён складаў па вёсках маёнтка каля 30 руб. на двор (табл. 10), толькі ў мястэчку быў у два разы меншы на той падставе, што местачкоўцы выконвалі на палову меней паншчыны. Кошт жа выкупу надзела ў большасці вёсак складаў 80 руб., а ў мястэчку Скідзель – 24,3 руб. Павіннасці сялянаў падлічваліся паводле наступных расцэнак: рабочы дзень селяніна з канём ці парай валоў – 15 капеек, пешы дзень – 9 капеек. Уладальнік гарантаваў сялянам таксама выдачу паліва па 26 вазоў у год на двор. Воз дроў каштаваў 15 капеек, а ўсе 26 вазоў – 3 руб. 90 кап. Выдача паліва павінна была адбывацца толькі па суботах. Прычым сялянам забаранялася ўязджаць у лес без наглядчыка.

*Табліца 10*

**Павіннасці сялян маёнтка Скідзель паводле ўстаўной граматы 1862 г. у разліку на адзін двор**

| | Колькасць адпрацовачных дзён (паншчыны і гвалтаў) | Чынш да рэформы 1861 г. (у руб.) | Чынш па ўстаўной грамаце (у руб.) | Кошт надзела на выпадак выкупу (у руб.) |
|---|---|---|---|---|
| Скідзель | 86 | 1,5 | 14,5 | 24,30 |
| Гліняны | 180 | 3 | 31,60 | 80 |
| Карашава | 180 | 0,46 ½ | 29,06 ½ | 80 |
| Белякоўка | 180 | 0,46 ½ | 29,06 ½ | 80 |
| Хваты | 180 | 3 | 31,60 | 80 |
| Некрашы | 180 | 2,40 | 28,8 | 40 |
| Сухаўляны | 180 | 1,50 | 30,10 | 80 |
| Рыскі | 180 | 0,46 ½ | 29,06 ½ | 120 |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 599. Арк. 9 адв.- 6. Устаўная грамата маёнтка Скідзель. 1862 г.

11 снежня 1862 г. у Скідзель прыехаў міравы пасярэднік для праверкі правільнасці ўстаўной граматы. Сяляне вёсак Карашава, Белякоўшчына, Хваты, Сухаўляны і Рыскі абвесцілі яму, што яны амаль не маюць выгану. Але пасярэднік прызнаў грамату правільнай і палічыў “допустить условное введение в действие”. У выніку ўстаўная грамата была ўведзена ў маёнтку Скідзель 12 снежня 1862 г., хаця сяляне ўсіх вёсак і самаго мястэчка адмовіліся яе падпісаць, незадаволеныя такімі ўмовамі вызвалення [НГАБ у Гродне. Ф. 48. В. 1. С. 7. Арк. 16 адв. Аб надзяленні зямлёй сялян мястэчка Скідзель. 1867-1886 гг.].

У студзені 1863 г. у Польшчы, Літве і Беларусі выбухнула паўстанне супраць Расійскай імперыі, якое адсунула на другі план рэалізацыю сялянскай рэформы. Але з другога боку, каб схіліць на свой бок беларускае сялянства, царскі ўрад істотна змяніў умовы рэформы на яго карысць. Імператарскі ўказ ад 1 сакавіка 1863 г. зменшыў чынш з сялян Беларусі за зямлю на 20 % ад сумы, вызначанай устаўнымі граматамі. У выніку ў Скідзелі памер чыншу цяпер складаў 11 руб. 90 кап. з аднаго ўчастка зямлі, а з усіх 46 скідзельскіх гаспадароў належала плаціць 547 руб. 40 кап. у год. Пасля падаўлення паўстання распачалі працу адмысловыя ўрадавыя праверачныя камісіі, якія пераглядалі ўстаўныя граматы, пераправяралі памеры і вартасць сялянскага землекарыстання і памеры павіннасцяў. Па выніках азначанай працы складаліся выкупныя акты. Гэтыя дакументы вызначалі ўмовы канчатковага выкупу сялянскіх надзелаў. Цяпер выкуп станавіўся абавязковым, паколькі пасля паўстання 1863 г. урад імкнуўся ў Беларусі зліквідаваць усялякі ўплыў памешчыкаў на сваіх былых сялян. Ён браў на сябе абавязак выкупіць зямлю ў землеўладальнікаў, а сяляне павінны былі ўжо на працягу многіх гадоў выплочваць ураду гэтую пазыку.

У Скідзельскім маёнтку праверачная камісія працавала ў верасні 1864 г. І сяляне, і былыя ўладальнікі зацята баранілі свае інтарэсы. Напрыклад, князь Станіслаў Канстанцінавіч Чацвярцінскі скардзіўся, што чыноўнікі камісіі няправільна запісалі ў катэгорыю нязручнай для апрацоўкі 106 дз. сялянскай зямлі (тым самым была, на яго думку, заніжана вартасць нададзенай вяскоўцам зямлі, а адпаведна змяншаліся і прыбыткі князя) і патрабаваў перагляду на сваю карысць. Таксама былы ўладальнік дамагаўся вяртання ў яго ўласнасць лясных участкаў, якія камісія пакінула сялянам. Справа ў тым, што дзесьці на пачатку XIX ст. сяляне некаторых вёсак закінулі апрацоўку часткі сваіх зямель, зусім страціўшых урадлівасць. Калі ж на гэтых землях падрос малады лясок, дык ужо пан забараняў сялянам яго чапаць, а потым прызначыў сваіх палясоўшчыкаў для аховы. Паколькі ў лесе яшчэ захоўваліся сляды разораў ад былой сялянскай працы, дык камісія схілілася на бок сялянаў. Апошнія таксама адчайна змагаліся за гэтыя ўчасткі. Калі ў 1863 г. Чацвярцінскі паспрабаваў пачаць высечку і

вываз лесу каля вёскі Хваты, дык сяляне рашуча гэтаму супрацівіліся [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 598. Арк. 9].

23 кастрычніка 1864 г. жыхары Скідзеля напісалі скаргу ў губернскую па сялянскіх справах прысутнасць. Яе аўтар падпісаўся ад імя "жытелей М.Скидля". Ён падрабязна апісаў усе праблемы, з якімі сутыкнуліся пасля рэформы скідзельскія сяляне і свае крыўды на княгіню Чацвярцінскую.

*ДАКУМЕНТ*

Первая паверечна Камисия Гродненского уезда, акончив свое поверечное действие, нам объявив по постановлению своему оброк, из кожного хозяискаго участка по 4-е рубля коп. 1. и по 2-е серебр: и по 3 рубля 94 коп. серебром, невзирая на то что мы только пользуемся ближними 3-я десятинами, на которых всякий год зимавой и еравой хлеб посеваетца, овса, ячменя, высеваем по 6 гарнцев, а в сбор по одной капе, и по снятии яроваго хлеба, на оном месте отсеваем жытом, и высеваем по 4-е капны, а гороху, пшеницы, гричихи не сеям по неместности, хотя и по большей части неудобные поля, в 2-х верстах от нас имеем, то служыт в 10-ю проволоку жыта, а от 6-и до 8-и верст, лежащея земля урочище Загайно, и сенокос Тращяница, наделена в 1828 году, и до сего времени непользовались ним, непожелав принят в количестве земледелия нашего, то Княгиня Четвертинска с своим сыном, постановила на нас Военное Учреждение, и стояло на нас 52-а Солдата и Офицер, на этзекуции, целый месяц и разрушыли наше движимое и недвижимое имущество, за неприимку выше поясненнаго надела, то по составлению приговора при камисии отказались, а хорошее земли в Глинянах и за мызою, и в Струпине отнято Княгинею Четвертинскою, сенокос в Фенковском лесу, удобнейшый, только приносит нам в пользу по 30 пудов сена а хозяев 15-ть и 12-и пудов не сберут, выгона всего 16-ть десятин, которыми пользуемся 46 хозяев Крестьян, да 150 Евреев, и 15-ь Татаров, а удобнейший Выгон, название Свистовщина, отнял Князь Четвертинский, обсадив деревом, и сделал в свою пользу сенокос, и никакого пастбища для нас нет, деревня Хваты, в четверть версты от местечка, деревня Некрашы в полверсты, и их участки под самыми нашыми Домами, также и дворовое, и всякий час берут великие штрафы с нас за наше жывотное, а нашее земли в отдаленности, по чему неможем держать скота более, как по одному или два вола. В переходе воиск всякий божый день нам велика обида, потому что при большом тракте разгон фурманок, постоянство, воиско, и в переходах воиска нас обижают опалом и разрывают убогую нашу ограду на дрова, а лес, везде для нас замкнут, начто просим, дабы отпустить нам, хотя и самаго сучья и павала в неделю по одному возу, в Котранской стражы казенных лесов, хотя и на нашых сенокосах великие заросли, то нам запращено, и вся жызнь и пользование наше, из заробатыванья чужых полей на третье сноп приговором, а нашые поля по несколько лет атлогом лежат прытом, все деревни имеют свой доходы на уплату показанного оброка, из Шынководства, но мы, и взяли полгодовый патент за который

уплатили 7 руб с половиною, то незнаем по какому случаю нам шынководство запращено и деньги за патент не возвращены, но Г.Мировой Посредник нам всем объявил, заниматца шынководствием и прочими торговлями, чем незанимаемся, по множеству Евреев и по бедности наше, – и видим себя не в силе уплачивать назначенный оброк но просим християнского великодушия и Блюстителей закона Гродненского Губернского по крестьянским делам Присутствия, учинит какое либо ходатайство, или разпоряжение на одобрение жызни сих просителей, и о облегчение оброка, на что ожыдаем милостивого Удовлетворения…

*НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 598. Арк. 8.*

Сяляне Скідзеля адмаўляліся прыняць тыя землі, якімі надзяліла іх Калета Чацвярцінская яшчэ ў 1827 г. Яны з таго часу з неверагоднай упартасцю дамагаліся вяртання адабраных надзелаў і зараблялі на жыццё арэндай чужых палеткаў. У выніку ў часе працы праверачнай камісіі скідзельцы таксама адмовіліся прыняць новыя землі і пагадзіліся на вельмі малыя надзелы, паколькі ўсё спадзяваліся дабіцца вяртання сваёй спрадвечнай зямлі. Чыноўнікі камісіі таксама прызналі, што зямля, якой надзяліла скідзельцаў Чацвярцінская, сапраўды вельмі дрэнная і павінна быць залічаная ў разрад нязручнай для апрацоўкі, а значыцца – быць вольнай ад аплаты. Але сяляне ўсё роўна не пагадзіліся яе прыняць. Чыноўкі праверачнай камісіі паказалі: “При осмотре крестьянских земель коммисия нашла по сравнению с паказаниями уставной грамоты много совершенно неудобных ни к пашне, ни к сенокошению угодий зачисленных в удобныя: по местечку Скидель отданныя крестьянам в урочищах Загайно и Тростянице в 1828 году вместо хорошей земли в Глинянах и Струпине, такого качества, что крестьяне, и прежде по принуждению принявшие их, при поверке решительно отказались от владения ею; хотя коммисия по осмотре и объявила крестьянам, что она будет зачислена в неудобную без обложения повинностью, но крестьяне местечка составили приговор об отказе…”. Таксама ўзніклі спрэчкі адносна выгану для сялянскай жывёлы. Паводле ўстаўной граматы скідзельцам было прызначана 19 дз. 400 саж. пашы, але “коммисия по измерению действительно нашла в разных местах разбросанными 16 десят. 400 саж., но крестьяне жаловались, что они с незапамятных времен владели и частию выгона с северо-западной стороны прилегающаго к общему выгону с еврейским обществом, эта часть примыкает к их полю и как на нее евреи не смотря на их настояния без присмотра пускают свой скот, то постоянно подвергаются патраве их посевы, почему они и огораживают эту часть выгона”. Скідзельскія ж яўрэі са свайго боку скардзіліся на няправільны захоп сялянамі часткі агульнага выгану. Камісія на месцы даследавала справу і прышла да высновы, “что у крестьян не достает 3-х десятин до показанного за ними по грамоте количества выгона… и утвердила за

ними участок в 3 дес... остальное пространство в 12 дес. она оставила в общем пользовании всех жителей местечка”. Князь Чацвярцінскі заступаўся за яўрэяў і даводзіў, што “выгон в количестве 33 десятин был всегда в общем пользовании и коммисия неправильно наделила крестьян из онаго 19 дес. 400 саж., нарушив тем выгоды прочих жителей местечка”. Чацвярцінскі, аднак, не ўзгадваў пра адабранне ім у скідзельцаў пашы ва ўрочышы Свістоўшчына. Сяляне сцвярджалі, што памешчык “взамен того... дозволял им пасти скот по парным полям, что ныне воспрещает и требует за то отработок, который они, должны отбывать в пользу евреев арендующих имение”.

Калі на паседжанні Губернскай па сялянскіх справах прысутнасці 25 мая 1865 г. зацвярджаліся вынікі праверкі маёнтка Скідзель, дык асобую думку наконт землекарыстання скідзельцаў пісьмова выклаў член прысутнасці П.Нябольсін. Гэты ліберальна настроены чыноўнік выказваў дабразычлівае стаўленне да сялянаў і найбольш актыўна выступаў на іх баку ў спрэчках з уладальнікамі. Запіс П.Нябольсіна ў журнале паседжання з’яўляецца вельмі цікавым поглядам на праблемы сялянскага землекарыстання.

*ДАКУМЕНТ*

«Скидельские домохозяева отказались от огромнаго пространства земель в 328 дзесят, которое по инвентарю и по уставной грамоте, помещик показывал удобным и за которое он заставлял крестьян сначала отрабатывать барщину, а потом платить оброк. И барщина, и оброк были не легкие, а между тем эти 328 десят. оказались ничего не стоющими и почи ничего не производящими. Из полных хозяев крестьяне обратились теперь почти ясно в простые огородники: так ничтожны теперешние их участки. По закону... такая земля должна поступить к крестьянам по выкупному акту безплатно. Но крестьяне, из боязни, чтобы она не была когда нибудь обложена какими-бы то ни было денежными сборами, составили приговор об отказе от нея. Поверочная коммисия старалась, как видно, урезонить крестьян и растолковать им неосновательность их опасений, не крестьяне остались при своем и земли не приняли. Ясно, несомненно до очевидности, что такую добровольую утрату угодий, могущих с течением времени, при труде из негодных обратиться хоть для чего нибудь да в удобныя, крестьяне готовятся нести вследствие крайней своей неразвитости, неразумия и подозрительности.

Этих исторических в здешнем населении недостатков – в сословии землевладельцев, конечно, не ощущается. Скидельский помещик не затруднился безпрекословно присоединить 328 десят. крестьянской земли к своим дворовым угодиям и не побоялся немыслимых в будущем поземельных сборов с неудобных пространств.

Но на губернском присутствии лежит обязанность охранять имущественные права крестьян и предохранять здешнее забитое, неуспевшее еще очнуться и крайне неразвитое население от необдуманных и для них самих вредных поступков...

В здешнем крае крестьянское землевладение не общинное, а подворное. Крестьянские участки здесь не благоприобретенные, не случайные, полученные вследствие периодических переделов земель: они безусловно потомственны и искони наследственны. «Господарь», то-есть крестьянин-домохозяин, владелец сваей «батьковщины» своей предковской «седибы», всегда лично и полновластно распоряжался сваим участком. По закону (ст. 81 мест. полож.) ни помещик, ни общество не должны вмешиваться в его распоряжение землей.

Угодия заключающие в себе 328 десят., тоже находились в наследственном пользовании всех домохозяев, из которых каждый имел тут свои наследственные и потомственные резки и полосы. Каким же образом Скидельское сельское общество могло, одним почерком пера, по приговору вышедшему из начал неразумия, забитости и подозрительности, порешив абсолютно за всех домохозяев и их наследников отказ от такого значительного пространства земли, рано или поздно, вследствие общих государственных реформ долженствующей очень и очень пригодится для них?

С такими вопросами поземельного владения надо обращаться как можно осмотрительнее, не забывая, что как-бы мирской приговор ни был складно написан и удовлетворителен по наружной форме – он все таки мог быть результатом кого нибудь из тех эксплуататоров-евреев, без которых неживуче ни одно еврейское местечко; а Скидель переполнен евреями».

*НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 598 . Арк.11.*

Падазрэнне Нябольсіна, што скідзельцаў збіваюць з панталыку яўрэі, з'яўлялася характэрным для прадстаўнікоў царскай адміністрацыі, якія прывыклі ва ўсім абвінавачваць мясцовае яўрэйскае насельніцтва. Але ў галоўным гэты чыноўнік меў рацыю: адмова ад вялізнага надзела няхай і неўрадлівай зямлі была стратэгічнай памылкай жыхароў Скідзеля і ў будучым ім сапраўды дорага каштавала. Нябольсіннават сцвярджаў, што “отказ от земельных угодий выходил за пределы прав Скидельского сельского общества, поскольку 328 десятин состояли в подворном пользовании”, а таму “нужна подписка от имени каждого хозяина”. Ён прапаноўваў, каб міравы пасярэднік ці які іншы чыноўнік паспрабаваў “разъяснить крестьянам вредную для них самих ошибочность взгляда на собственные свои выгоды и убедить их не делать помещику столь ценного подарка, который в будущем времени, им быть может прийдется приобретать себе очень дорогою ценою, по причине близости губернского города, судоходного Немана и железной дороги” [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 598. Арк. 11]. На думку Нябольсіна, патрэбна было скласці два спіскі скідзельскіх гаспадароў – тых, хто за прыём зямлі, і тых, хто супраць: “уже и то будет огромной заслугой что мы двоих-троих, а может быть и двадцать-тридцать семей спасем от опасного шага”. Аднак Нябольсін застаўся ў меншасці, і

большасцю галасоў губернская прысутнасць зацвердзіла вынікі працы праверачнай камісіі, паводле якіх за скідзельцамі засталіся вельмі малыя надзелы зямлі.

Выкупны акт сялян мястэчка Скідзель быў уведзены ў дзеянне 31 жніўня 1865 г. Ад імя ўладальніка яго падпісаў Сапраўдны Стацкі Саветнік і Камергер Імператарскага Двара Канстанцін Антонавіч Чацвярцінскі. Паводле гэтага дакумента, сялянам мястэчка Скідзель надаваліся 14 дз. 369 саж. сядзібнай зямлі, 236 дз. 1410 саж. ворыва, 46 дз. 2208 саж. сенажаці. Прычым з плошчы ворыўнай зямлі амаль палову – 106 дз. 26 саж. – складаў пералог [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 598. Арк. 384-386. Размежаванне земляў маёнтка Скідзель. 1864-1886 гг.]. За яго трэба было плаціць трэцюю частку ад сумы, якая вызначалася за нармальнае ворыва. Таму ў дакуменце ў графу, дзе паказвалася плошча ворыва, упісвалася толькі трэцяя частка плошчы пералогу – 35 дз. 809 саж. Усяго ж грашовай павіннасцю абкладаўся зямельны надзел скідзельцаў плошчай 226 дз. 2369 саж., да якога дадаваліся 19 дз. 400 саж. пашы і 20 дзес. 1955 саж. “няўдобіцы”, якія падаткам не абкладаліся. Патэнцыйнай уласнасцю сялянаў Скідзеля (пасля канчатковага выкупу) станавіліся 266 дз. 2324 саж. зямлі., а з улікам рэшты пералогу – 70 дз. 1618 саж. – гэта складала 337 дзес. 1542 саж. Апроч таго, была яшчэ паша, якая знаходзілася ў агульным карыстанні з скідзельскімі яўрэямі і татарамі – 12 дзес. 1961 саж. Пазней, у 1867 г. Антон Рэкець, які шмат гадоў служыў пры двары Чацвярцінскіх, і адстаўны салдат Гаўрыла Лапыш атрымалі ад памешчыка ў падарунак 315 саж. сядзібнай зямлі, 3 дз. 1096 саж. ворыва і 2346 саж. сенакосу. Гэтыя землі былі ўлучаны ў агульны зямельны надзел скідзельскай грамады.

Выкупная плата была ўстаноўленая праверачнай камісіяй ў суме 90 кап. за дзесяціну “зручнай” зямлі. Цяпер за падворны зямельны ўчастак плата складала ў сярэднім у год 4 руб. 20 кап., а з 48 поўных надзелаў Скідзеля належала плаціць 201 руб. 37 кап. З 11 агародных надзелаў належала плата 2 руб. 53 кап. (па 23 кап. з агародніка). А з усяе скідзельскай грамады штогадовы аброк складаў 203 руб. 90 кап. Пры капіталізацыі 6 % вартасць усяго зямельнага надзела скідзельцаў складала 3398 руб. 29 кап., а аднаго поўнага ўчастка – каля 70 руб. Сялянам усіх вёсак былога маёнтка Скідзель было нададзена ў суме 3951 дз. 2321 саж. зямлі (табл. 11).

*Табліца 11*

**Зямельныя надзелы сялян былога маёнтка Скідзель паводле выкупных актаў 1865 г. (у дзесяцінах і сажнях)**

| | Абкладзеная платай зямля | | Выганы | | У агульным валоданні з памешчыкам ці іншымі грамадамі | | Няўдобіца | | Пералог | | Зараснікі | | Разам | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Дзес. | Саж. | Дзес. | Саж. | Дзес. | Саж. | Дзес. | Саж. | Дзес. | Саж. | Дзес. | Саж. | Дзес. | Саж. |

| | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Скідзель | 230 | 2023 | 29 | 2000 | 15 | 1600 | 18 | 500 | 70 | 1618 | - | - | 365 | 20 |
| Хваты | 201 | - | 19 | 900 | - | - | 14 | 1800 | 16 | - | 4 | 1800 | 255 | 2100 |
| Некрашы | 421 | 1002 | 16 | 2378 | - | - | 55 | 1102 | - | - | 1 | 225 | 494 | 2307 |
| Белякоўшчына | 407 | 1988 | 19 | 2298 | - | - | 154 | 1934 | - | - | 23 | 980 | 606 | - |
| Гліняны | 601 | 1296 | 155 | 504 | - | - | 29 | 1800 | - | - | - | | 786 | 1200 |
| Карашава | 343 | 1800 | 91 | 1350 | - | - | 22 | 237 | - | - | 11 | 1207 | 468 | 2194 |
| Сухаўляны | 385 | 819 | 23 | 382 | - | - | 88 | 813 | - | - | 1 | 2386 | 498 | 2000 |
| Рыскі | 311 | 1760 | 25 | 1750 | - | - | 132 | 925 | - | - | 6 | 65 | 475 | 2100 |
| Разам | 2903 | 1088 | 375 | 1962 | 15 | 1600 | 515 | 1911 | 86 | 1618 | 58 | 1863 | 3951 | 2321 |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 598.

Жыхары Скідзеля з умовамі праверачнай камісіі не пагадзіліся і працягвалі спадзявацца на тое, што ім удасца такі вярнуць свае землі. А дзеля гэтага яны працягвалі спробы вярнуць старажытныя дакументы, якія ў іх адабралі. Для пошуку гэтых дакументаў імі быў наняты Губернскі Сакратар Іван Пузевіч. У ліпені 1864 г. у гродзенскае губернскае праўленне прыйшло пісьмо з Сената з адказам на запыт гэтага самага Пузевіча: “...требуемые им документы, как обнаружилось по справке, в имеющихся здесь актах Литовской метрики не оказалось, найдены же относятся не к местечку Скидель, но к селу или фольварку того же названия. Что же касается местечка /miasteczka/, то в книге записей № 119 на странице 665, значится королевская привилегия 27 июня 1646 г., которою Литовскому Подскарбию и администратору гродненскою экономиею Гедеону Тризне разрешено: на избранных им местах, возле принадлежащей означенной экономии села Скиделя, основать местечко, с освобождением жителей с постройки оного, на известное время от платежа оброка и прочих повинностей и с дозволением производить торги однажды в неделю и ярмарки дважды в год. Затем оказалось в книге записей №128 на странице 125 привиллегия 17 февраля 1653 г. по сим которой, торги, пожалованные местечку Скидельскому или Райгродскому Гродненской экономии, вместо четверга назначены во вторник. Торги же в четверг вновь утверждены пользовавшемуся ими в прежние времена местечку Головачи вблизи Скиделя в Гродненском уезде /powiece/” [НГАБ у Гродне. Ф. 2. В. 7. С. 2322. Арк. 1-1 адв. Справа па прашэнні даверанага сялян мястэчка Крынкі Гродзенскага уезда Пузевіча аб выдачы сялянам дакументаў і прывілеяў польскіх каралёў. 1864-1867 гг.]. З гэтай цытаты можна меркаваць, што сяляне Скідзеля прасілі Пузевіча здабыць копіі дакументаў, якія пацвярджалі іх мяшчанскія правы.

У 1867 г. Губернская прысутнасць зноў разглядала “выкупное производство” па маёнтках Скідзель і Котра князёў Чацвярцінскіх, а

таксама скаргі з боку як сялянаў, так і былых уладальнікаў. Так, прысутнасць пастанавіла правесці праверку сялянскіх пераложных зямель, паколькі многія ўчасткі, на яе думку, былі неправільна аднесены да пералогу. З прычыны дрэннай якасці глебы, сяляне высявалі там зерне раз у тры гады, а таму, такія землі павінны ацэньвацца не ў памеры трэцяй часткі ад іх плошчы, а паловы. Па-другое, разглядалася прашэнне Чацвярцінскага вярнуць яму лясныя ўгоддзі, незаконна, быццам бы, перададзеныя сялянам. Аднак прысутнасць тут зноў стала на баку вяскоўцаў.

У кастрычніку 1875 г. Андрэй Покаш, Сцяпан Трусь і Давыд Сяўрук ад імя скідзельскай грамады падалі прашэнне ў Гродзенскі міравы з'езд. У гэтым прашэнні яны патрабавалі вярнуць скідзельцам зямлю, якую забраў ў часы прыгону князь Чацвярцінскі. Сяляне нават цытавалі ў перакладзе на расійскую мову прывілеі каралёў Рэчы Паспалітай XVII ст., паводле якіх ім надавалася больш 30 валокаў зямлі.

*ДАКУМЕНТ*

"Об отнятых землях и угодиях от нас и верителей наших Князем Четвертинским мы постоянно жаловались Верховным властям и накануне в 1860 г. Государю императору и всеподданейшая жалоба наша была посредством Г. Министра Внутренних Дел препровождена Г.Виленскому Генерал-Губернатору, а сим последним от 11 марта 26 июня, 11 октября 1861 г. за № 1862, 4864 и 8203 требовались сведения Г.Уездного Предводителя Дворянства и Мирового Посредника в то время 4 участка Гродненского уезда, которые и доставлены были от Предводителя 5 января 1862 г. за № 3 и Мировым Посредником Князем Любецким 9 марта 1862 г. с актом, составленным 1861 года ноября 24 дня вместе с Уездным Исправником Магнусом по сему делу и тем актом представлено было нам право завести иск судебным порядком. По иску с князем Четвертинским о земле, сенокосах и угодиях Правительствующий Сенат от 16 мая 1874 г. указом объявил нам на основании положения 19 февраля 1861 г. о Губернских и Уездных по крестьянским делам учреждениях не доходит да разсмотрения Судебных мест по 2 пункту Высочайшего повеления 11 июля 1863 г., чем предоставил право искать в крестьянских учреждениях отобранных от нас земель. На основании чего мы вместе с сим подали в Гродненскую соединенную палату Уголовного и Гражданского суда прошение, дабы она выслала в Съезд подлинное делопроизводство, в котором имеются документы о землях, отобранных от нас князем Четвертинским, а именно: три Привилегии Королей Польских 1) Лист дела 7 с переводом до листа дела 13 2) с листа дела 14 до листа дела 19 с переводом и 3) с листа дела 20 до 26 с переводом, а) с листа дела 27 до 50 экономические инвентарные описи 1675 и 1680 г. с переводами и б) с листа дела 50 по 112 домашние документы, удостоверяющие о том, что мы имеем полное право как и прочие ныне мещане продавать жалованные нам польским королем земли один другому и посторонним лицам с платою за оные покупателем в городской доход, а тогда

Скидельскую экономию чинша, каковой виден из вышесказанных документов и из инвентаря Гродненской экономии в присутствии Королевских коммисаров составленного с описанием земель в следующем порядке: на Гродненской улице местечка Скидель 13 плацев из них 1 свободный под богодельню, Езерской 20, Виленской 19 ½ , Новогрудской 10, Луненской 6 ½ , на этой же улице оставлены два плаца под детскую школу и Котржанской 7 ½ плацев. Другие принадлежащие земли описаны в том инвентаре и уволоки земли местечковой. В силу привилегии дарованной Королем Владиславом IV месяца Сентября 5 дня 1647 г. в Соколке данной владеют «пользуются 24 Остроповскими уволоками земли, эти уволоки по причине безплодности земли мы позволим им (т.е. мещанам) разбить на морги и между собой безобидно поделить». В малом Карашеве они владеют 12 уволоками, в Мильковщине в Плытнице владеют 20 уволоками, в Глинянах 2-мя и Павел Казейко 2-мя. Затем в силу привиллегии в Беляковщине 14 уволок «застенки и морги». При Остроповских уволоках в урочище Пальковщизна в Старжине они владеют сенокосами в количестве 52 морга, при малом Карашеве владеют 8 моргами, при реке Пыра 11 моргами сенокоса. Общй итог суммы, следуемой с М.Скидель за плацы, морги, аренду, мельницу, уволоки и застенки 480 коп. 35 грошей, из числа этих грошей следует 14 литовских грошей войту для получения квитанции при внесении местечкового чинша. Последний инвентарь описанных земель нам принадлежащих состоялся 1791 г. Октября 7 дня; а затем всей земли с сенокосами состояло во владении нашем более 80 уволок, считая на каждую уволоку по 30 моргов, что составит 2400 моргов из числа всей земли. Князь Четвертинский оставил в нашем и верителей наших владении не более 3 десятин, а остальную отнял и обратил в свою собственность и построил на оной фольварки.

В виду того, что Пр. Сенат признал дело наше с князем Четвертинским не подсудным обида же наша ясно видна, потому что мы и верители наши неудостоились даже из собственных земель который заменен 3 десятинами, а отказались от предлагаемых князем Четвертинским 300 десятин земли при поверочной Коммисии потому что неудобна и потому что дело наше заведенное судебным порядом не было еще разрешено. Ныне же когда приближается время к ограничению наших земель, а потому покорнейше просим съезд ГГ Мировых Посредников разсмотреть подлинное дело, препровожденное Соединенною Палатою и сделать зависящее распоряжение о наделении нас и верителей наших согласно закону и Правил 26 Марта 1869 г. наделом показанным по инвентарю, составленному Князем Четвертинским в 1846 г. для каждого домохозяина по 11 десятин с саженями пахотной, в противном случае не в состоянии будем прокормиться ибо все наше существование зависит от хлебопашества”.

*НГАБ у Гродне. Ф. 48. В. 1. С. 7. Арк. 33-34 адв.*

Пра аднаго з аўтараў гэтага ліста – Вікенція Покаша, у дакуменце гаварылася, што ён меў уласны дом у Гродне на Сафійскай вуліцы. У ліпені 1876 г. Покаш і Клімент Жук напісалі новае прашэнне прыкладна

такога ж зместу, як і папярэдняе. Але просьба скідзельцаў не была нават разгледжана, паколькі “возвращение земель Польских Королей не может входить в состав действий мирового съезда”.

9 ліпеня 1876 г. быў падпісаны канчатковы выкупны акт для сялян мястэчка Скідзель [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 598. Арк. 465-466. [Размежаванне земляў маёнтка Скідзель. 1864-1886 гг.]. Паводле гэтага дакумента, у скідзельцаў налічвалася 13 дз. 789 саж. сядзібнай зямлі, 235 дз. ворыва (у тым 106 дз. 26 саж. пералогу, прынятага за 35 дз. 808 саж.), 53 дз. 452 саж. сенакосу. На адзін двор прыходзілася 3 дз. 1191 саж. ворыва і 1 дз. 316 саж. сенакосу. Усяго абкладзенай выкупным плацяжом зямлі было 230 дз. 2023 саж., а калі ўлічыць падараваную памешчыкам Антону Рэкецю і Гаўрылу Лапышу, дык 243 дз. 135 саж. Местачковы выган займаў плошчу 29 дз. 2000 саж. Такім чынам, плошча зручнай зямлі складала 272 дз. 2135 саж. Да разраду нязручнай зямлі належалі 13 дз. 2600 саж. няўдобіцы, 4 дз. 300 саж. паштовай дарогі, 2000 саж. ракі, а ўсяго – 18 дз. 500 саж. Да гэтага трэба дадаць 70 дз. 1618 саж. пералогу і 15 дз. 1600 саж. агульнага з яўрэямі выгану. Такім чынам, усяго ўласнасцю сялянскай грамады Скідзеля з часам станавілася 377 дз. 1053 саж. Але дзеля гэтага патрэбна было да 1914 г. плаціць штогод 208 руб. 28 кап., ці 205 руб. 56 кап. з 47 поўных участкаў і 2 руб. 72 кап. з 11 агароднікаў.

Новыя выкупныя акты па вёсках былога маёнтка Скідзель былі зацверджаны пастановай Губернскай па сялянскіх справах прысутнасцю ад 14 сакавіка 1877 г. (табл. 12), а ў 1882 г. былі складзены новыя планы сялянскіх зямель [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 600. Арк. 16. Размежаванне земляў маёнтка Скідзель. 1882-1887 гг.].

*Табліца 12*

**Плошча зямельных участкаў і памеры выкупных плацяжоў сялян былога маёнтка Скідзель (у разліку на двор)**

| | Сядзіба | | Ворыва | | Сенажаць* | | Выкупны плацеж за 1 дзес. (у руб.) | Гадавы чынш паводле ўстаўной граматы 1862 г. (у руб.) | Канчатковы выкупны плацёж за год (у руб.) | Поўны кошт падворнага ўчастка (у руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Дзес. | Саж. | Дзес. | Саж. | Дзес. | Саж. | | | | |
| Скідзель | - | | 3 | 1191 | 1 | 316 | 0,90 | | 4,37 | |
| Белякоўшчына | - | 600 | 5 | 1708 | 4 | 561 | 0,72 | 29,06 | 7,33 | 122,13 |
| Гліняны | - | 728 | 9 | 600 | 1 | | 1 | 31,60 | 10,55 | 175,89 |
| Карашава | - | 1966 | 10 | 2146 | 1 | 1219 | 0,80 | 29,06 | 10,58 | 176,28 |
| Некрашы | - | 1100 | 7 | 1981 | 1 | 1200 | 1 | 28,08 | 10,03 | 167,23 |
| Рыскі | - | 884 | 7 | 1753 | 2 | 863 | 0,80 | 29,06 | 8,31 | 138,45 |
| Сухаўляны | - | 1000 | 11 | 1467 | 6 | 772 | 0,80 | 30,10 | 14,68 | 308,28 |
| Хваты | - | 820 | 7 | 300 | 3 | | 1 | 31,60 | 13,40 | 223,33 |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 598. Размежаванне земляў маёнтка Скідзель. 1864-1886 гг.
* У надзел вёсак Белякоўшчына, Карашава і Сухаўляны ўваходзіў таксама лес, які ў табліцы ўлучаны ў графу "сенажаць" – адпаведна 2 дз. 2345 саж., 1952 саж. і 4 дз. 900 саж.

У маі ж 1882 г. у Скідзель прыехаў міравы пасярэднік Аляксей Шахаў, каб правесці размежаванне земляў паміж сялянамі мястэчка і князем Чацвярцінскім. Ён загадаў старасце Якубу Чабатарэвічу выдзяліць работнікаў для правядзення размежавальных работ. Але сяляне катэгарычна адмовіліся гэта зрабіць: "... из них первый Федор Делянковский, потом Игнатий Мозолевский, а за ним и все остальные отвечали мне, что границы обходить они не будут, рабочих не дадут так как у них мало земли и границы их им известны" [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 598. Арк. 494. Размежаванне земляў маёнтка Скідзель. 1864 - 1886 гг.]. Тады пасярэднік загадаў апісаць маёмасць 47-мі гаспадароў мястэчка, а старасту Чабатарэвіча – арыштаваць на 7 сутак за непадпарадкаванне ўладам. 14 верасня 1882 г. жыхары Скідзеля Клімент Жук і Іван Каяла падалі скаргу на імя гродзенскага губернатара, у якім выклалі пазіцыю скідзельцаў: "... мы и верители наши того числа собрались для обсуждения вопроса – на каком основании остаемся, тогда как мы считамся по книгам полными наделенными участками (земельных угодьев) но таковых у нас и верителей наших не находим..." [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 600. Арк. 2. [Размежаванне земляў маёнтка Скідзель. 1882-1887 гг.]. Аўтары скаргі прасілі "возвратить отнятый у нас и верителей наших пастбища 3 десят., сенокоса 5 десят. и водопой на речке Скидлице границучей с землей Князя Четвертинского и снятии ареста с деятельного в обществе сельского старосты Якова Чеботаревича". Сяляне паслядоўна падалі губернатару яшчэ некалькі скаргаў прыкладна такога ж зместу.

18 мая 1884 г. уваўнаважаныя скідзельскай грамады Іван Фларыянаў Каяла і Канстанцін Лявонцьеў Мазалеўскі скардзіліся ў Гродна на міравога пасярэдніка Шахава: "Г.Мировой Посредник Шахов с землемером Левиным нарушил границы, коим отнял у нас и верителей наших пастбища и пахатной земли 15-ть десят. с сажн. и в роще Березина при реке Скидлицы 8 десятин, последнее т. е. пастбище Березина граничит с рекою Скидлицею, а Мировой Посредник сделал границу за канавою /последняя служит для спуска воды/ еще отступ от оной более 20 сажень, почему мы видимо крайне обиженные неправедными действиями б. Мирового Посредника Шахова и об сказанном были жалобы наши Посредником скрыты...". Міравы пасярэднік Шахаў у сваю чаргу тлумачыўся, што, паводле выкупнога акта, сялянам Скідзеля належала 361 дз. 1853 саж. і агульная з яўрэямі і татарамі паша плошчай 15 дз. 1600 саж. Пры новым памеры зямлі аказалася, што сяляне фактычна маюць у валоданні 364 дз. 161 саж. зямлі і 18 дз. 620 саж. агульнай пашы. Скаргаў тады з боку сялянаў не

было, паведамляў пасярэднік, апошнія толькі прасілі прыпыніць размежаванне да таго часу, пакуль галоўны камітэт па ўладкаванні Сельскага стану не разгледзіць іх скаргу аб вяртанні зямель, забраных калісьці Калетай Чацвярцінскай.

Пратакол аб размежаванні зямель паміж скідзельскімі сялянамі і суседнімі землеўладальнікамі быў складзены міравым пасярэднікам 21 мая 1883 г., але скідзельцы падпісваць яго катэгарычна адмовіліся. Сяляне вёскі Сухаўляны Міхал Гуліда і Ігнат Парай і Хватоў Рыгор Трусь, якія прысутнічалі ў якасці сведкаў і давераных з боку суседскіх вёсак, таксама адмовіліся ад подпісу, заявіўшы, "...что боятся неприятностей со стороны Скидельских крестьян если подпишут", а селянін вёскі Котра Бутвілоўскі не падпісаў таму, што "крестьяне м.Скидля постоянно запахивают его границу и делают неприятности" [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 600. Арк. 82]. Сяляне ж вёсак Некрашы і Пузавічы ўвогуле адмовіліся выбіраць давераных для подпісу. Аднак губернская прысутнасць 29 кастрычніка 1887 г. зацвердзіла вынікі размежавання і без подпісу сялянаў.

14 снежня 1885 г. новы міравы пасярэднік Стацкі Саветнік Анатоль Ерын прыехаў у Скідзель з мэтай нарэшце прымусіць сялян падпісаць гэты пратакол аб размежаванні. На яго загад выбраць упаўнаважаных для подпісу "крестьяне и поверенные их Мозолевский и Коялло отказались узбрать уполномоченных для подписи документов... потому что не включены принадлежащие им угодия 1) в урочище Храпова 15 дес. 2) водопой у р. Скидлицы при мельнице ур. Березино 3) Лесной сенокос Дубище в Феньковском лесу 4) Лесной сенокос Решки в Феньковском лесу". 21 красавіка 1886 г. міравы пасярэднік правяраў прэтэнзіі сялян і "в течении трех часов обходил линии проведенные землемером Левиным". Прэтэнзіі скідзельцаў пад час гэтага абходу былі абвергнутыя, але Каяла і Мазалеўскі зноў адмовілся ад подпісу. Зрэшты, гэтыя прэтэнзіі скідзельцаў мелі хутчэй тактычны характар, каб зацягнуць час, яны ўсё спадзяваліся на вяртанне адабраных Калетай Чацвярцінскай земляў.

Губернская па сялянскіх справах прысутнасць 29 кастрычніка 1887 г. зацвердзіла вынікі размежавання зямель маёнтка Скідзель і ваколічных сялянскіх грамадаў. 3 снежня 1887 г. валасны старшыня Рыгор Трусь заклікаў жыхароў мястэчка ў валаснoе праўленне, дзе ўручыў ім копію пастановы Губернскай па сялянскіх справах прысутнасці ад 29 кастрычніка, але скідзельцы ад атрымання гэтай копіі "совершенно отказались". Такім чынам, скідзельцы так і не прызналі дэ-юрэ вынікі рэформы 1860-х гадоў і працягвалі лічыць сваімі тыя землі, якія адабрала ад іх княгіня Чацвярцінская.

Зацята змагаліся за зямлю з былымі ўладальнікамі Чацвярцінскімі і сяляне іншых вёсак былога маёнтка Скідзель. Асаблівай упартасцю сярод іх вызначаліся жыхары вёскі Гліняны. 15 верасня 1883 г. давераныя глінянскіх сялян Павел Гарошка, Якуб Лабко і Восіп Гайко

падалі скаргу губернатару, у якім скардзіліся на свае гаротнае жыццё. Восіп Гайко распісаўся за сябе і непісьменнага Якуба Гайко, а Павел Гарошка распісаўся за сябе самаруч. У гэтым прашэнні вельмі яскрава былі апісаныя праблемы і цяжкасці, характэрныя, па сутнасці, для тагачаснай беларускай вёскі.

*ДАКУМЕНТ*

“Отнятые в нас и верителей наших земля пахотная и лес с зарослями, пастбище и сенокос Памещиком Четвертинским закрепостным правом /преманифестом/ и частию вышедших из зависимости, ныне сказанные угодья находятся в полном их помещиков владении, недопуская нас и верителей наших даже малою частию пользоватся, чрез что мы и верители наши совершенно находимся обиженными по малому количеству земли, не имевши куска зарослей и леса и сенокоса, последний помещиками в нас и верителей наших отнят а они наделили нас и верителей наших собственно нашим пастбищем, считая они что надел разверстан ими Четвертинскими по одной десятины на хозяина, десятина которого недает сена даже шести пуд, Спрашивается? Чем мы и верители наши можем прожить имевши мы землю пахатную девять десятин чем мы можем изновозить ее тогда как собственный наш сенокос Помещиками Четвертинскими отнят, и неимеем на нем продержать двух овец, коровы и одной лошади и чем мы можем изновозить вышеписанную пахотную землю, неимевши шести пуд сена и чем мы можем прокормить семейства находящиеся в одном номере более двадцати душ, несчастные семейства крестьян деревни Глиняны имеют угнет чрез помещиков Четвертинских день и ночь неимеют покоя находясь в задумчивости о дневном насущном куске хлеба, как прокормится сами и как продержать необходимы для обработки земли и отбытия казенных и общественных повинностей одну лошадь, бедные семейства даже несоблюдают некоторых прздников и всеми семействами отправляются за 20 и 30 верст для обработки сенокоса за пятую и шестую часть, хлеб же приобретаем третью части т.е. за одну десятину неудобной земли, нужно попохать две десятины помещику и несколько дней пешо отбыть, попохать ту взятую десятину два раза и скарозить тоже само, засеять своим семеном и отдать третьи сноп помещику, а десятина эта даст всего урожая одну или 1 ½ копну что начасть крестьянина прихоится только одна копна, а другой год и совсем занесет и семено, вот чем прокамливаемся мы и верители наши, да еще нужно отбыть денежные и натуральные повинности и покупать дров огреть избы и приготовить скудную пищу; жизнь несчастная адская бедных семейств крестьян деревни Глинян, и об этих несчастиях б. Г.Мировому Посреднику Шахову хорошо знать, так как он был очевидцем вышеписанному и пожелал наших пагуб, скрыл наши письменные и словестные жалобы, чрез что мы несем угнет от Помещиков Четвертинских»

*НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 601. Арк. 358. Размежаванне земляў маёнткаў Скідзель і Котра князёў Чацвярцінскіх. 1881-1886 гг.*

Гэтыя ж праблемы былі характэрныя і для сялян суседніх са Скідзелем маёнткаў, якія належалі іншых памешчыкам. Так, на ўсход ад Скідзеля размяшчаўся значна меншы па памерах маёнтак, уладальнікамі якога былі браты Аляксандр і Мікалай Кахоўскія. Да яго належалі тры вёскі: **Каўшова, Пузавічы і Хвайняны.** Вёскі гэтыя гістарычна належалі да Скідзельскай воласці. Праверачная камісія ў выніку сваёй працы падала такую характарыстыку сялянскіх гаспадарак азначанага маёнтка: "Относительно пашни крестьяне всех трех деревень показали, что земля их дурная, большею частию песчаная, и есть места, которые по безплодности своей или вовсе заброшены или обрабатываются чрез несколько лет. Урожай на тех полях, на которые достает у них удобрения бывает в хорошие года до 5 зерен, на тех полях, на которые недостает у них удобрения, с трудом собирают и 2 зерна. Покосов весьма мало и те болотные и накашивают на каждый двор 4 воза, а в самые урожайные годы до 5 возов. Виды высеваемого хлеба: рожь, овес и гречиха, в деревне Ковшово хоть и высевается пшеница, но при самых огородах и в самом незначительном количестве" [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 3. С. 88. Праверка маёнтка Каўшова памешчыкаў Кахоўскіх. 1864 г.]. Землеўладальнік Кахоўскі ў сваю чаргу сцвярджаў, што зямля не такая ўжо і кепская, як сцвярджаюць сяляне, а ў вёсцы Каўшова ўраджай часам дасягае і 6 зёрнаў. Не мелі сяляне, паводле меркавання камісіі, і добрых дадатковых заробкаў: "Деревня Ковшово находится при самой реке Немане, но крестьяне неимеют от нее никаких особых выгод. Некоторые крестьяне из этой деревни действительно ходят на барках и тем зарабатывают себе деньги, но как объясняют крестьяне, к этому тяжолому труду вынуждает их только то, что они не имеют возможности существовать при одной той земле, которую имеют в своем владении. Заработками этими занимаются только те, которые имеют большие семьи, а одиночные неимея возможности отлучаться от хозяйства остаются без заработков и при одной своей земле". Зямельныя надзелы сялян маёнтка Каўшова былі ахарактарызаваныя так: "Почва у крестьян деревни Ковшово ¾ надела суглинистая, так называемая ячменная, а ¼ надела супесчаная, так называемая овсяная; преобладающий хлеб: рожь, ячмень и овес, высевается и пшеница, но в небольшом количестве; средний урожай 3 ½ зерна. Сенокосы болотные и 1 дес. сенокоса приходится на 10 дес. пашни. В деревне Пузевичи одна половина надела суглинистая, другая половина супесчаная, преобладающий хлеб: рожь, ячмень, овес и гречиха, с средним урожаем в 3 зерна. Сенокосы болотные и одна дес. сенокоса приходится на 5 дес. пашни. В деревне Хвойнянах земля песчаная, подзолистая, преобладающий хлеб: рожь и гречиха, высевается также и овес, но в небольшом количестве с средним урожаем в 2 ½ зерна. Покосы болотные и 1 дес. сенокоса приходится на 12 дес. пашни". У выніку ацэнкі якасці зямельных угоддзяў выкупныя плацяжы былі вызначаныя

ў наступных памерах: у вёсцы Каўшова 95 капеек за дзесяціну, у Пузавічах – 90 капеек, у Хвайнянах – 64 капейкі.

Сяляне вёскі Пузавічы паводле выкупнога акту, складзенага 29 жніўня 1864 г., атрымалі зямельныя надзелы плошчай 11 дес. 300 сажняў. Гэтыя надзелы складаліся з 3 дзес. 272 саж. сядзібнай зямлі, 8 дзес. 1431 саж. ворыва, 1 дзес. 1801 саж. сенажацяў. Поўныя надзелы атрымалі 22 гаспадары. З былых панскіх парабкаў адзін таксама атрымаў поўны надзел, а трох – паменшаныя трохдзесяцінныя. Гадавы выкупны плацёж з падворнага ўчастку складаў 10 руб. 01 капейку. Паводле ж ранейшай  устаўной граматы вялічыня чыншу дасягала 24 руб. 42 кап. Капітальная вартасць аднаго сялянскага надзелу складала 166 руб. 88 кап. Апроч падворных надзелаў супольнай уласнасцю вёскі сталі 9 дзес. 1200 саж. пашы, 33 дзес. 1967 саж. нязручнай зямлі і 8 дзес. 1086 саж. зараснікаў.

Таксама 29 жніўня 1864 г. быў складзены выкупны акт вёскі Хвайняны. Паводле устаўной граматы, сялянам было нададзена 9 падворных участкаў памерам 13 дзес. 214 саж. кожны. Структура падворных надзелаў была наступнай: 1710 саж. сядзібнай зямлі, 11 дзес. 358 саж. ворыва, 1 дзес. 546 саж. сенажацяў. Устаўная грамата прадугледжвала супольную з памешчыкам пашу памерам 21 дзес. 1886 саж.

Паводле вынікаў праверкі ва ўласнасці вёскі Хвайняны ўсяго знаходзілася 218 дзес. 2198 саж., а за выняткам пералогавай, нязручнай зямлі і зараснікаў павіннасцямі абкладаліся 131 дзес. 600 саж. Паводле ўстаўной граматы сума чыншу з аднаго падворнага ўчастка складала 29 руб. 63 кап. Пасля праверкі выкупны плацёж быў вызначаны ў суме 9 руб. 12 кап. за поўны надзел. Капітальная вартасць сялянскага падворнага надзела складала 152 руб.

У вёсцы Каўшова налічвалася 36 гаспадароў. З былых панскіх парабкаў два атрымалі поўныя надзелы, тры – трохдзесяцінныя ўчасткі, а адзін – агарод. Па ўстаўной грамаце чынш складаў з аднаго поўнага надзела 29 руб. 63 кап., а пасля правядзення праверачных работ выкупны плацеж быў зменшаны да 10 руб. 70 кап. Паводле выкупнога акта сялянскі надзел на адзін двор склаў 10 дзес. 2218 саж.: 953 саж. сядзібнай зямлі, 9 дзес. 1375 саж. ворыва, 2290 саж. сенажацяў. Капітальная вартасць надзела складала 178 руб. 37 кап. Ва ўласнасць вясковай грамады пераходзілі 18 дзес. 2263 саж. пашы, 24 дзес. 354 саж. зараснікаў і 64 дзес. 655 саж. нязручнай зямлі.

Такім чынам, праверачная камісія істотна змяніла ўмовы вызвалення сялянаў у маёнтку Каўшова на іх карысць у параўнанні з устаўной граматай. Але самыя сяляне гэтымі ўмовамі засталіся незадаволеныя. Прыкладна праз месяц пасля завяршэння праверачных работ, 24 верасня 1864 г. сяляне вёскі Пузавічы паскардзіліся ў Губернскую па сялянскіх справах прысутнасць. Яны сцвярджалі, што плата за іх зямельныя надзелы занадта высокая (90 капеек за дзесяціну,

а за поўны надзел – 10,01 руб.), зямля ў іх кепская, а сенажаці балотныя, аддаленыя ад вёскі і даюць толькі па 4 вазы сена на гаспадара, пашы не хапае, таму "не держим скот и не удобряем землю". Вяскоўцы таксама сцвярджалі, што ўладальнік Кахоўскі сем гадоў назад адабраў у іх 13 моргаў сенажацяў ва ўрочышчы Губінка. Яны прасілі прысутнасць зменшыць чынш за зямлю і вярнуць ім забраныя лугі.

У той жа дзень падалі прашэнне ў Гродна і жыхары вёскі Каўшова. Яны, апроч Губернскай прысутнасці, паскардзіліся яшчэ і губернатару. Каўшоўцы сцвярджалі, што не ў стане плаціць за свае надзелы па 10 руб. 86 кап.: "Мы не в состоянии уплачивать и при оном тяжело нам жыть, по ничтожности нашего земледелия, ибо из 7-и десятин пользуемся, которые приносят нам в пользу 3-и зерна, а по 3-й десятине имеем, которые хороших времен приносят одно зерно другое, а худых времен и посев заносит который не можем возноважывать, пахадной земли, ... пастбища не имеем, лесу на опал и постройку не имеем, сена самый лучший хозяин более 30-и пудов не имеет, а то и по 15 пудов не собираем. Варыва никогда не имеем, а только купленным всякий год жывимся по милости Вышняго Создателя". Сяляне лічылі, што выкупны плацёж з вёскі Каўшова павінен "па справядлівасці" складаць 6 руб. з аднаго надзела ў год.

А 25 верасня 1864 г. падобнага зместу скаргу падалі ўжо жыхары Хвайнянаў: "Первая Гродненская Поверочная Комиссия за отведенную нам землю назначила слишком большую плату за участок земли 9 р. 12 к. но наша земля вся песчаная и высевается на ней только рожь в иных местах и рожь высевается раз в несколько лет есть места, что высеваемый нами хлеб часто сносится ветром в некоторых местах сеется ячмень и овес но в самом незначительном количестве, собираемый нами хлеб очень недостаточно для прокормления себя в течение года. Сенокосы болотные и в хорошие годы собираем сена не более как по 3 воза, а посему покорнейше имеем честь просить Гродненское по крестьянским делам Присутствие сделать нам уменьшение наложенного Поверочною Коммиссиею за землю оброка, потому что мы не в состоянии такового уплатить". Грамада вёскі ўпаўнаважыла сялян Рыгора Сарлая і Рыгора Лазовіка падаць гэтае прашэнне губернатару.

Былы ж уладальнік сялянаў Аляксандр Кахоўскі 21 верасня 1864 г. напісаў ліст у Губернскую прысутнасць, у якім выказаў задавальненне дзеяннямі Паверачнай камісіі. Трэба адзначыць, што маёнтак братоў Кахоўскіх (Аляксандр Кахоўскі быў паручнікам артылерыі, а яго брат Валеры – капітанам артылерыі) шмат разоў ужо закладваўся, і на ім вісела мноства пазыкаў. Бацька братоў палкоўнік Мікалай Кахоўскі быў вінны свай суседу Канстанціну Чацвярцінскаму паводле заёмнага ліста ад 1 жніўня 1850 г. 1500 руб., уладальніцы маёнтка Лунна Валерыі Чахоўскай, паводле заёмнага лісту ад 24 лютага 1859 г., 1500 руб., надворнаму саветніку Івану Пілецкаму па лісту ад 13 жніўня 1859 г.

1000 руб. У Кахоўскіх быў пратэрмінаваны за даўгі дом у Санкт-Пецярбургу. Даволі шмат участкаў зямлі браты падаравалі розным сялянам (хаця ў рэчаіснасці, напэўна, гэта быў продаж пад выглядам падарунку).

На падставе дакументаў можна меркаваць, што асабліва вострых канфліктаў паміж сялянамі і ўладальнікамі маёнтку Каўшова не было. Аляксандр Кахоўскі нават даслаў 28 жніўня 1864 г. ліст у Губернскую прысутнасць, у якім заступаўся за сваіх былых сялянаў: “В урочище называемое Мостовское находятся луга среди которых есть заросли и все это всегда оставалось во владении крестьян деревень Пузевичи и Хвайняны; лугами и зарослями крестьяне эти и по настоящее время пользуются, но теперь объявляют, что будто бы помещик Г.Незабитовский воспрещает им рубить те заросли – а потому имею честь заявить поверочной комиссии, что означенные луга и заросли всегда принадлежали к имению нашему Ковшово и были постоянно в пользовании крестьян деревень Пузевичи и Хвойняны”. У наступным лісце ў Губернскую прысутнасць Кахоўскі пісаў: “Крестьяне деревень Ковшово и Хвойняны заявили желание иметь у себя лес. Уступая их просьбе и желанию и стремясь к улучшению их быта, я уступаю в их собственность из принадлежащаго мне леса следующее количество – для крестьян деревни Ковшово 12 дес. 614 саж. и для крестьян деревни Хвойняны 20 дес. 2148 саж. А также уступая просьбе крестьян деревни Пузевич об уступке им сенокосов я предоставляю из собственных своих сенокосов 6 дес. 2092 сажени в их пользу”.

Аляксандр Нячуй-Кахоўскі памёр у 1873 г. Ён лічыўся, апроч Каўшова, таксама уладальнікам маёнтка Алона у Троцкім уездзе Ковенскай губерні. Нашчадкам яго па жаночай лініі быў палкоўнік Левандоўскі. Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў прад’явіла свае правы на азначаныя маёнткі. Так Кахоўскія знікаюць з жыцця сялян Каўшова, Пузавічаў і Хвайнян. Але не знікае барацьба за зямлю. Цяпер вяскоўцы зацята вялі яе супраць тых сялянаў, якія набылі ва ўласнасць спрэчныя ўчасткі у былых паноў Кахоўскіх. Гэтыя сяляне – Рыгор Мазалеўскі і Цімафей Стальбоўскі – пяратварыліся ў новых землеўладальнікаў. І цяпер ужо з імі вялі бясконцыя судовыя цяжбы за спрэчныя кавалкі зямлі жыхары трох вёсак былога маёнтка Каўшова.

## Парэформенная сялянская гаспадарка

Рэформа 1861 г. істотна змяніла ўмовы гаспадарання беларускага селяніна. Самым галоўным было вызваленне часу, які раней ён затрачваў на паншчыну. Цяпер жа ўвесь гэты час сяляне маглі прысвяціць сваёй уласнай гаспадарцы. Але затое пасля рэформы значна ўзраслі грашовыя выплаты. Напрыклад, у 1892 г. жыхары Скідзельскай воласці плацілі 2635,6 руб. казённых падаткаў і земскіх збораў, 2539,4 руб. страхавых выплатаў, 2158,45 валасных збораў і 6750,64 выкупных плацяжоў [НГАБ у Гродне. Ф. 14. В. 1. С. 265. Арк.

82]. У суме гэта складала 14084 руб. Паводле памятнай кніжкі Гродзенскай губерні на 1892 г., у Скідзельскай воласці налічваліся 829 сялянскіх двароў [Памятная книга Гродненской губернии на 1892 г. Гродно, 1891], а сялянскае насельніцтва складала 10346 душ, з іх 5284 мужчынскіх і 5062 жаночыя. Такім чынам, сярэдняя фінансавая нагрузка на адзін двор складала амаль 17 руб. У рэчаіснасці сялянскіх двароў у воласці было значна больш, паколькі ў дадзеным дакуменце іх колькасць паказана ў адпаведнасці з дадзенымі рэформы 1860-х гадоў, а з таго часу многія гаспадаркі падзяліліся.

Паводле падлікаў складальніка інвентара 1845 г., адпрацовачныя павіннасці сялян маёнтка Скідзель ў пераліку на грошы складалі для вяскоўцаў амаль 29 руб., а для жыхароў мястэчка (якія адбывалі ўтрая менш паншчыны) – каля 13,3 руб. Але ў рэчаіснасці сяляне плацілі грашыма ад 45 капеек да 3,5 руб. ад асобнага двору, а астатнія павіннасці прыпадалі на паншчыну і згоны. Цяпер жа падаткі трэба было абавязкова заплаціць грашыма, якія спачатку неабходна неяк зарабіць. Чвэрць жыта каштавала ў Гродзенскай губерні ў канцы XIX ст. каля 6 руб. Такім чынам, гаспадару ў 1892 г. тэарэтычна патрэбна было прадаць прыкладна дзве-тры чвэрці жыта, каб расплаціцца з падаткамі. Але большасць сялянаў на Скідзельшчыне амаль не мелі жыта ці якіх-небудзь іншых прадуктаў сваёй гаспадаркі для продажу. Часам наадварот, прыходзілася вясной дакупляць харчаванне. Таму зарабіць грошы на падаткі сяляне маглі толькі наёмнай працай, што было справай вельмі няпростай.

І ўсё ж у цэлым сялянская гаспадарка на Скідзельшчыне, як і па ўсёй Беларусі, дасягае заўважальных поспехаў у парэформенны час. Найбольш яскравым паказчыкам гэтага стаўся рост ураджайнасці вясковых палеткаў. Так, у 1845 г. ураджайнасць азімага жыта ў сялян Скідзельскага маёнтка ў сярэднім складала 4 чвэрці 1 чацвярык з дзесяціны, ці каля 490 кг. У 1907 г. ураджайнасць на палетках сялян Скідзельскай воласці складала каля 770 кг. з дзесяціны, ці вырасла ў параўнанні з 1845 г. болей чым у 1,5 раза. Праўда, памешчыцкія гаспадаркі ў Скідзельскай воласці на пачатку XX ст. яшчэ лепш прыстасаваліся да вымогаў рынку, чым сялянскія (табл. 13). У буйных землеўладальнікаў была вышэй ураджайнасць, шырэй культываваліся новыя культуры – бабовыя, буракі. Памешчыкі шырока выкарыстоўвалі мнагапольны севазварот і травасеянне, а сяляне па-ранейшаму прытрымліваліся архаічнага трохполля. Напрыклад, у гаспадарках тутэйшых памешчыкаў пад кармавымі травамі знаходзілася 380 дз. зямлі, і яны збіралі з іх па 200 пудоў сена. У сялян травамі было засеяна толькі 50 дз., якія давалі па 150 пудоў сена.

*Табліца 13*

**Пасевы і зборы сельскагаспадарчых культур у сялянскіх і памешчыцкіх гаспадарках Скідзельскай воласці ў 1907 г.**

| | Сялянскія гаспадаркі | | | Памешчыцкія гаспадаркі | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| С/г культуры | Пасеяна (у дз.) | Сабрана (у пудах.) | Ураджайнасць (у пудах з дзесяціны) | Пасеяна (у дз.) | Сабрана (у пудах) | Ураджайнасць (у пудах з дзесяціны) |
| Азімае жыта | 2029 | 98160 | 48 | 2020 | 121200 | 60 |
| Азімая пшаніца | 44 | 1760 | 40 | 50 | 2500 | 50 |
| Яравое жыта | 12 | 240 | 20 | - | - | - |
| Авёс | 793 | 27755 | 35 | 800 | 40000 | 50 |
| Ячмень | 333 | 16317 | 49 | 300 | 15000 | 50 |
| Грэчка | 158 | 5056 | 32 | 40 | 1600 | 40 |
| Бабовыя | 28 | 560 | 20 | 800 | 24000 | 30 |
| Бульба | 672 | 48384 | 72 | 800 | 80000 | 100 |
| Лён | 60 | 360 | 6 | - | - | - |
| Буракі | 7 | 350 | 50 | 50 | 2100 | 70 |

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 305. В. 1. С. 18. Арк. 115.

Самыя падрабязныя звесткі пра стан сялянскай гаспадаркі на Скідзельшчыне на пачатку XX ст. захаваліся адносна вёскі Сухаўляны, жыхары якой аднымі з першых у Гродзенскім уездзе пагадзіліся перайсці да гаспадарання на асобных хутарах. Гэтая акалічнасць паслужыла прычынай таму, што губернская камісія па справах землеўпарадкавання абрала Сухаўляны ў якасці своеасаблівага выпрабавальнага палігону. Дзяржаўныя чыноўнікі зрабілі ў маі 1910 г. падрабязнае апісанне маёмаснага становішча сухаўлянцаў [НГАБ у Гродне. Ф. 18. В. 1. С. 1034. Аб арганізацыі агранамічнай дапамогі сялянам. 1909-1910 гг.]. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе параўнаць матэрыялы азначанага апісання з дадзенымі гаспадарчага інвентара маёнтка Скідзель за 1845 г. і зрабіць пэўныя высновы пра развіццё сялянскай гаспадаркі на Скідзельшчыне на працягу 50 гадоў пасля рэформы 1861 г.

У 1845 г. у Сухаўлянах налічваўся 21 двор і 139 сялянскіх душ (64 мужчынскія і 75 жаночых). Праз 65 гадоў колькасць асобных зямельных участкаў у вёсцы дасягнула 44, ці вырасла болей чым у два разы. Праўда, два зямельныя надзелы былі аддадзены ў арэнду, а ў двух дварах гаспадарка, мяркуючы па ўсяму, зусім не вялася. Такім чынам, у рэчаіснасці ў 1910 г. у вёсцы было 40 зямельных участкаў, якія апрацоўваліся мясцовымі жыхарамі, і 255 сялянскіх душ. Колькасць жыхароў вырасла ў параўнанні з 1845 г. у 1,8 раза. У 1845 г. двор у сярэднім налічваў 6,6 сялянскіх душ, а ў 1910 г. – 6,4.

Паводле інвентара 1845 г. сухаўлянцам належалі 238 дз. зямі, з іх 14 дз. складалі прысядзібныя ўчасткі, 196 дз. ворыва і 28 дз. сенакосаў. Усе гаспадары валодалі роўнымі ўчасткамі – 800 сажняў сядзібнай зямлі, 8 дз. ворыва і 1 дз. 800 сажняў сенакосаў (на двор прыходзілася каля 11,3 дз. ці прыкладна 12,35 га). Мужчыны тады мусілі адбываць тры дні паншчыны з сялянскага двору на тыдзень у фальварку князёў Чацвярцінскіх, а жанчыны 30 дзён з пачатку красавіка па пачатак лістапада. Апроч таго, сухаўлянцы адбывалі па 6 дзён гвалтаў і 12 дзён шарваркаў. Кожны гаспадар павінен быў таксама выплаціць уладальніку яшчэ па 1,5 руб. серабром чыншу.

Пасля рэформы 1860-х гадоў сухаўлянцам было надзелена 8 дз. 1800 саж. сядзібнай зямлі, 243 дз. 2007 саж. ворыва, 40 дз. 2112 саж. сенакосу, 91 дз. 2100 саж. лесу, 88 дз. 813 саж. няўдобіцы і 1 дз. 2386 зараснікаў. Усяго ва ўласнасць жыхароў вёскі перайшлі 496 дз. 2014 саж. [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 598. Арк. 271-272]. За гэтую зямлю ім трэба было плаціць 308,28 руб. у год., ці 80 кап. за дзесяціну зручнай зямлі. Падворны ўчастак уключаў 1000 сажняў сядзібы, 11 дз. 1467 саж. ворыва, 4 дз. 900 саж. лесу, што ў суме складал 18 дз. 839 саж. За такі ўчастак (усіх было 21) плата складала 14,68 руб. у год. Капітальная вартасць зямлі вёскі была 5137,89 руб., а падворнага ўчастка – 308, 28 руб.

Пасля рэформы сухаўлянцы не мусілі хадзіць на паншчыну, але павінны былі выплочваць выкупныя плацяжы за надзельныя землі. Праўда, умовы надзялення іх зямлёй выглядалі лепшымі, чым у большасці іншых вёсак Скідзельшчыны. Сухаўлянцы мелі шмат сенакосаў і лесу. Пасля пераўтварэнняў 1860-х гадоў надзельны зямельны фонд ужо істотна не змяняўся да 1910 г., і сяляне маглі паправіць сваё становішча толькі за кошт купленай зямлі. Натуральна, што з ростам колькасці насельніцтва, змяншалася плошча зямлі ў разліку на адну сялянскую душу.

Як сведчаць дадзеныя 1910 г., дабрабыт вёскі істотна палепшыўся ў параўнанні з часамі паншчыны. Асабліва гэта заўважна на прыкладзе забяспечанасці сухаўлянцаў хатняй жывёлай. Пагалоўе коней, свіней і авечак у вёсцы вырасла болей чым у тры разы (табл. 14). Валы на пачатку XX ст. ужо ўвогуле не выкарыстоўваліся ў якасці працоўнай жывёлы, і ў Сухаўлянах трымалі толькі двух быкоў для разводу. Колькасць кароў вырасла амаль у чатыры разы. Такім чынам, тэарэтычна, сухаўлянцы былі забяспечаны мяса-малочнымі прадуктамі харчавання непараўнальна лепш, чым у 1845 г. Праўда, мы не ведаем, колькі гэтых прадуктаў яны мусілі прадаваць на скідзельскім і гродзенскім рынках, каб выплаціць падаткі і зарабіць неабходныя для вядзення гаспадаркі грошы. Тут трэба адзначыць яшчэ той факт, што ў 1845 г. сяляне князя Чацвярцінскага моцна пацярпелі ад веснавой паводкі, і губернскія ўлады нават мусілі аказваць ім матэрыяльную

дапамогу, таму дадзеныя інвентара могуць не зусім адэкватна адлюстроўваць становішча сухаўлянцаў у першай палове XIX ст.

У 1845 г. у вёсцы таксама былі даволі заможныя сяляне. Так, гаспадар Юры Ватыль, сям'я якога складалася з сямі душ, меў двух коней, двух валоў, дзве каровы, дзве цялушкі, 3 авечкі і 2 свінні. Усе гаспадары ў 1845 г. былі больш-менш забяспечаны працоўнай жывёлай. Праўда, у чатырох гаспадарках не было кароў (19 % ад агульнай колькасці), а ў сямёх – свіней (33 %). Натуральна, што гэтыя сем'і былі горш за астатніх забяспечаны харчаваннем.

У 1910 г. шэсць гаспадароў вёскі мелі па тры каня, пяць гаспадароў – па тры каровы, сем – па тры і болей свіней. Бясконныя гаспадаркі у вёсцы зусім адсутнічалі. У трох гаспадароў не было кароў, у 21 – свіней (52,5 %). Апошні факт нам не зразумелы, паколькі свініна традыцыйна займала вельмі важнае месца ў мясным рацыёне беларускіх сялян. Былі ў Сухаўлянах гаспадары, якія амаль не трымалі хатняй жывёлы. У гаспадарках Аляксея Змітровіча і Васіля Кузьміцкага былі толькі конь і карова, а Рыгор Ярашэўскі, Рыгор і Якуб Рашко трымалі толькі каня. Апошнія, напэўна, зараблялі на жыццё возніцтвам, што было абумоўлена блізкасцю мястэчка Скідзель з вялікай колькасцю дробных прадпрыемстваў, якія патрэбавалі такіх паслуг.

*Табліца 14*

**Эканамічны стан сялян вёскі Сухаўляны ў 1845 г. і 1909 г.**

| | Плошча зямельнага надзела ( у дз.) | Двары | Сялян. душ | Коні | Валы | Каровы | Цялушкі | Авечкі | Свінні |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1845 г. | 238 | 21 | 139 | 21 | 41 | 18 | 18 | 53 | 25 |
| 1909 г. | 497 | 40 | 255 | 78 | 2 | 68 | 37 | 167 | 83 |

Крыніцы: НГАБ у Гродне. Ф. 18. В. 1. С. 1034. Арк. 72-74; Ф. 96. В. 1. С. 1126.

У інвентары 1845 г. гаварылася, што сяляне Скідзельскага маёнтка абрабляюць зямлю парай валоў і драўлянай сахой. У 1910 г. у гаспадароў вёскі Сухаўляны налічвалася ўжо 30 жалезных плугоў і 10 драўляных. Такім чынам, сяляне зусім адмовіліся ад архаічнай сахі, як прылады апрацоўкі глебы, але поўны пераход да фабрычных жалезных плугоў яшчэ не завершыўся. З сельскагаспадарчага інвентара ў гаспадароў вёскі меліся 42 драўляныя бараны і толькі 1 жалезная, 23 сячкарні, 3 малатарні, 3 механічныя прывады, 46 вазоў. Некаторыя сяляне дасягнулі заўважальных поспехаў у мадэрнізацыі сваіх гаспадарак. Так, Банэдысь Гуліда (сям'я складалася з 9 асобаў) меў жалезны плуг, барану, сячкарню, механічны прывад, малатарню, два вазы, трох коней, тры каровы, цялушку, восем авечак. Мікалай Ватыль (сям'я складалася з 6 асобаў) меў жалезны плуг, барану, сячкарню, механічны прывад, трох коней, дзве каровы, двух цялушак, восем авечак, дзве свінні.

Што датычыць жылых і гаспадарчых збудаванняў, дык у Сухаўлянах налічвалася 39 жылых хат, ацэненых агульнай сумай 5470 руб., 34 хлявы (2135 руб.), 40 адрын (4820 руб.), 11 амбараў (535 руб.), 1 свінарнік (10 руб). Забудова сялянскіх сядзібаў з'яўляецца адным з галоўных паказчыкаў маёмаснай дыферэнцыяцыі ў вёсцы. Асабліва важным паказчыкам дабрабыту была хата, у якой жыла сялянская сям'я. Самым дарагім у вёсцы з'яўляўся дом Максіма Стальбоўскага – 350 руб. (меў памеры 27х9,5 аршынаў, ці 19,2х6,75 м). Самыя ж танныя хаты былі ў братоў Ігната і Якуба Ражко – каштавалі па 50 рублёў. А самую маленькую хату ў Сухаўлянах меў Тамаш Гнідка – 7х7 аршынаў ці 5х5 м (каштавала каля 80 руб.) Некаторыя сяляне мелі таксама даволі каштоўныя гаспадарчыя пабудовы. Самая вялікая ў вёсцы адрына была ў Мікалая Ватыля – 56х12 арш. ці 39,8х8,5 м (каштавала 300 руб). Таксама каля 300 руб. каштавала адрына ў Максіма Стальбоўскага.

Апрача земляробства сухаўлянцы яшчэ мала займаліся іншымі накірункамі сельскагаспадарчай дзейнасці. У вёсцы налічвалася 205 пладовых дрэў, 2 рамачных вуллі і 19 пчаліных калодаў. Перадавікамі тут былі Мікалай Ватыль (меў 60 пладовых дрэў) і Банэдысь Гуліда (50 пладовых дрэў і 10 пчаліных калодаў).

Губернская камісія па землеўпарадкаванні таксама пастанавіла стварыць у Сухаўлянах узорны (*показательный*) сялянскі хутар. Удзельнічаць у эксперыменце пагадзіўся Ігнат Парай, які належаў да ліку найбольш заможных гаспадароў вёскі. Плошча яго зямельнага надзела складала 15 дз. 2090 саж. Камісія выдзяліла на арганізацыю ўзорнага хутара 301 руб. 70 кап. На гэтыя грошы былі закуплены: плуг "Сухені" з разцом (9,5 руб.), пружынная барана на 9 зубоў (20 руб.), малатарня "Ланец" (80 руб.), веялка "Аўлі" (24 руб.), сячкарня "трыбаўка" (22 руб.). Як адзначылі губернскія чыноўнікі, "из приобретенных орудий Игнат Парай охотно согласился принять веялку, пружинную борону и соломорезку, что же касается молотилки и плуга, то он просит, чтобы первая была не ручная, а с приводом, а вместо одноконного плуга дать ему плуг пароконный, как более пригодный для обработки почвы в деревне Суховляны" [НГАБ у Гродне. Ф. 18. В. 1. С. 1034. Арк. 16]. Кошт прывада з двума перадачамі, як паведаміла камісіі гродзенская фірма па продажу сельскагаспадарчых машын, паводле самай мінімальнай ацэнкі, складаў 60 руб. Парай у сваю чаргу абавязваўся весці васьміпольны севазварот, ажыццяўляючы дакладны запіс усіх выкананых работ і фінансавых выдаткаў. Параю, як і іншым сялянам Сухаўлянаў, былі выдадзены за кошт дзяржавы таксама штучныя ўгнаенні.

На жаль, нам не ўдалося знайсці звестак пра далейшы ход гэтага эксперыменту. У кожным выпадку, яму было адведзена вельмі мала часу, паколькі неўзабаве выбухнула першая сусветная вайна. Зразумела, што для паспяховай мадэрнізацыі сваёй гаспадаркі беларускі селянін мусіў зрабіць досыць значныя грашовыя інвестыцыі ў

памеры, як найменш некалькіх соцен рублей. І гэта пры наяўнасці ў яго дастатковай колькасці зямлі – пажадана не менш 15 дз. Натуральна, што сабраць такія грошы былі ў стане толькі нямногія. Таму, што выдатна бачна на прыкладзе Сухаўлянаў, сяляне ў кожнай вёсцы абіралі розныя жыццёвыя стратэгіі. Хтосьці, няхай сабе і паволі, абнаўляў прылады працы і стараўся дапасаваць сваю гаспадарку да вымогаў рынку. Хтосьці спрабаваў развіваць новыя кірункі раслінаводства – найперш садаводства. Ну а некаторыя ці ўвогуле закідвалі працу на зямлі, альбо прысвячалі ёй вельмі мала часу і сілаў, аддаючы перавагу іншым заробкам. Праўда, многія сяляне яшчэ стараліся жыць па старынцы, імкнучыся самастойна забяспечваць сябе ўсім неабходным, а найперш – харчаваннем, з драбнеючага надзелу зямлі. І тэхнічныя навінкі, як ні парадаксальна, кансервавалі гэтакі стыль жыцця, дазваляючы захаваць прыймальны яго ўзровень на значна ўжо меншым участку. Але патрабаванні жыцця станавіліся ўсё больш настойлівымі і жорсткімі, і, хочаш ня хочаш, прымушалі сялян адступаць ад традыцыйнай жыццёвай стратэгіі і спрабаваць знайсці выйсце з тупіковай сітуацыі.

А галоўнай праблемай у развіцці сялянскай гаспадаркі стала драбленне зямельных надзелаў. Прычынай таму з'яўляўся імклівы дэмаграфічны рост у другой палове XIX ст. У 1895 г. губернская адміністрацыя сабрала і абагульніла дадзеныя адносна раздзелаў сялянскіх зямельных участкаў. Паводле гэтых дадзеных, у Скідзельскай воласці па выніках працы праверачных камісій сялянам было нададзена 858 падворных участкаў зямлі агульнай плошчай 8937 дз. [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 20. С. 164. Арк. 1-4 адв. Ведамасці пра драбленне сялянскіх надзелаў за 1895 г.]. Такім чынам, у сярэднім на участак зямлі прыходзілася каля 10,4 дз. Сялянскае насельніцтва воласці тады складала 2928 мужчынскіх душ. Гэта значыць, што на адну душу выходзіла ў сярэднім 3 дз. зямлі. У 1895 г., ці праз 30 гадоў пасля рэформы 311 (36,2 %) участкаў былі падзелены на дзве часткі, 126 (14,7 %) – на тры, 41 (4,8 %) – на чатыры, 5 – на пяць, 4 – на шэсць. Непадзеленымі засталіся 370 участкі (43,1 %) [НГАБ у Гродне. Ф. 534. В. 1. С. 3. А. 13]. Колькасць мужчынскіх душ дасягнула лічбы 4812, што складала 164,3 % ад паказчыка 1860-х гадоў.

Новыя дадзеныя былі сабраныя губернскімі ўладамі ў 1904 г. Тут, праўда, мы бачым разыходжанне стартавых дадзеных з папярэднімі падлікамі. Адносна Скідзельскай воласці было паказана, што ў выніку рэалізацыі аграрнай рэформы сялянам былі нарэзаны 822 падворныя участкі зямлі агульнай плошчай 11780 дз., а сялянскае насельніцтва воласці тады складала 3036 душ [НГАБ у Гродне. Ф. 14. В. 3. С. 72. Арк. 17]. Нам не зразумела, ці абумоўлены разыходжанні дадзеных 1895 г. і 1904 г. звычайнымі памылкамі ў падліках, ці іншымі прычынамі. Паводле дадзеных 1904 г. у 1860-х гадах у сярэднім на участак зямлі ў Скідзельскай воласці прыходзілася каля 14 дз., а на адну мужчынскую

душу выходзіла ў сярэднім 3,9 дз. зямлі. У 1904 г. ад першапачатковай лічбы 353 (42,9 %) надзелы былі падзелены на дзве часткі, 144 (40,8 %) – на тры, 30 (3,5 %) – на чатыры, 9 – на пяць, 3 – на шэсць. Непадзеленымі засталіся 283 участкі (34,4 %) [НГАБ у Гродне. Ф. 534. В. 1. С. 3. Арк. 13]. Насельніцтва Скідзельскай воласці ў 1904 г. дасягнула лічбы 5399 чалавек (вырасла ў 1,8 раза ў параўнанні з дадзенымі за 1860-ыя гады). У разліку на адну душу цяпер выходзіла 2,2 дз. надзельнай зямлі.

Спробы вырашыць праблему за кошт набыцця новай зямлі не мелі значнага эфекту. Паводле дадзеных Скідзельскага валаснога праўлення на студзень 1906 г., у воласці сяляне набылі ў прыватную ўласнасць 1148,5 дз., што складала толькі 8,9 % ад усяго мясцовага сялянскага землекарыстання і 9,7 % ад надзельнага фонду [НГАБ у Гродне. Ф. 305. В. 1. С. 17. Арк. 40]. Каб набыць зямлю ва ўласнасць, селянін мусіў сабраць вельмі значныя, па меркаванні тагачасных вяскоўцаў, грашовыя сродкі. Напрыклад, калі ў Скідзельскай воласці памешчык Адам Чачот у 1904 г. прадаваў землі маёнтка "Галавачы", дык 1 дз. у сярэднім каштавала каля 100 руб. [НГАБ у Гродне. Ф. 18. В. 1. С. 46. Арк. 1]. Выкарыстанне крэдытаў Сялянскага банка, якія павінны былі заахвоціць вяскоўцаў набываць памешчыцкія землі, для большасці сялян таксама выглядала на практыцы нерэальным. Падатковы інспектар Гродзенскага ўезда у справаздачы за 1910 г. слушна адзначаў, што набыць новую зямлю ва ўласнасць ўдаецца толькі рэдкім счасліўцам [НГАБ у Гродне. Ф. 18. В. 1. С. 46. Арк. 1]. Ён таксама назваў драбленне сялянскіх гаспадарак галоўнай бядой мясцовай вёскі. Гэта, на думку чыноўніка, не давала вяскоўцам магчымасці нават проста пракарміцца са сваіх надзелаў, нягледзячы на "выдающуюся скромность жизненных потребностей".

Працэс драблення сялянскіх гаспадарак не спыняўся. У 1915 г. у Скідзельскай воласці ўжо 302 надзелы былі падзелены на дзве часткі, 234 – на тры, 97 – на чатыры, 31 – на пяць, 8 – на шэсць, 4 – на сем, 11 – на восем. Усяго 135 надзельных участкаў (16 %) засталіся непадзеленымі з часу рэформы. А 210 сялян Скідзельскай воласці ў 1915 г. ужо з'яўляліся ўвогуле беззямельнымі [НГАБ у Гродне. Ф. 534. В. 1. С. 28]. Купленая зямля па-ранейшаму складала невялікую частку сялянскіх надзелаў. У 1915 г. сярод азімых пасеваў сялян купленая зямля складала 15,6 %, а сярод яравых пасеваў – 18 %.

У той жа час на тэрыторыі Скідзельскай воласці 12944 дз. землі належалі прыватным землеўладальнікам, пераважна былым памешчыкам, што перавышала плошчу сялянскага землеўладання. Натуральна, што такая сітуацыя распальвала сярод беднейшага сялянства нянавісць да абшарнікаў, якіх яно лічыла прычынай сваёй беднасці.

## Пагроза абеззямельвання: у пошуках выйсця

Пагроза малазямелля стала галоўным выклікам беларускаму селяніну ў другой палове XIX – на пачатку XX ст. Насельніцтва імкліва павялічвалася, а зямлі не прыбывала. Гаспадары з жахам думалі пра тое, як іх дзеці будуць жыць з маленькага зямельнага надзела. Самай простай стратэгыяй у такіх умовах стала адчайнае змаганне за кожны кавалак зямлі для сваёй сям'і. Прычым сяляне ўсё менш зважалі ў гэтым змаганні на нормы традыцыйнай маралі і выкарыстоўвалі ўсе магчымыя сродкі. Валасныя суды і вышэйшыя сялянскія ўстановы былі проста заваленыя справамі, якія датычылі спрэчак з-за зямлі. Прычым найчасцей судзіліся самыя блізкія сваякі, якія не маглі мірна падзяліць спадчынныя надзелы.

Спрэчкі, бойкі і судовыя працэсы не ратавалі, аднак, сялян ад абеззямельвання, яны толькі разбуралі маральныя нормы і традыцыі, атручвалі жыццё сям'і і грамады. Самым пажаданым выйсцем з цяжкага становішча з'яўлялася набыццё новай зямлі. Аднак, рэалізаваць гэтую спрадвечную мару беларускага селяніна было неверагодна цяжка. Праўда, рэформа 1860-х гадоў адкрыла для некаторых сялян магчымасці, якіх яны раней не мелі. Скідзельскі валасны старшыня Рыгор Іванавіч Мазалеўскі адразу пасля вызвалення пачаў актыўна скупляць зямлю ў навакольных памешчыкаў, у тым ліку і ў сваіх былых уладальнікаў Чацвярцінскіх. Неўзабаве ён стаў адным з буйнейшых землеўладальнікаў у Гродзенскай губерні.

Але далёка не кожны меў такія здольнасці, як Мазалеўскі. Мала было сабраць грошай, трэба было яшчэ умець імі распарадзіцца. Напрыклад, у снежні 1877 г. селянін вёскі Каўшова Міхал Восіпаў Шагун падаў у Губернскую прысутнасць прашэнне, у якім сцвярджаў, што былы яго пан Аляксандр Мікалаевіч Кахоўскі паводле партыкулярнай здзелкі ад 13 кастрычніка 1868 г., уласнаручна ім падпісанай, “отдал ему в обеспечение взятых у него 150 руб. половину пустоши с лугами без огорода, оставшейся после крестьянина Дмитрия Дучка более 6 десятин земли и обязался при продаже имения совершить формальную купчую крепость, но лет пять тому скоропостижно помер, а имение Ковшово продано было судебным приставом Гродненской соединенной палаты Григорию Мозолевскому” [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 1. С. 1992. Прашэнне селяніна Міхала Шагуна аб выдачы яму пасведчання пра набыццё зямлі ў памешчыка М.Кахоўскага. 1877-1878 гг.]. Такім чынам, Кахоўскаму прыходзілася пазычаць грошы ў сваіх былых прыгонных і закладваць ім зямельныя ўчасткі. Але новы ўладальнік не жадаў прызнаваць правы Шагуна на зямлю. Губернская прысутнасць заявіла, што дадзеная справа не ўваходзіць у яе кампетэнцыю і параіла Шагуну звярнуцца ў суд. Шанцы выйграць судовы працэс у багацея Мазалеўскага непісьменны Міхал Шагун, напэўна, меў невялікія.

Новыя багацеі-землеўладальнікі з сялян разглядаліся цяпер сялянскай грамадой як чужыя, як новыя паны. На іх ужо пашыраліся характэрныя для вёскі нормы падвойнай маралі, калі тое, што было грахом адносна сваіх, зусім не лічылася такім у дачыненні да чужых – паноў, яўрэяў. У жніўні 1876 г. скідзельскі валасны суд спагнаў з жыхара Скідзеля Паўла Вікенцьева Покаша 4,5 руб. на карысць Восіпа Стальбоўскага, арандатара маёнтка Каўшова, за тое, што ён высек у лесе апошняга 120 жэрдак [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 1. С. 1831. Аб спагнанні з Паўла Покаша 4 руб. на карысць арандатара маёнтка Каўшова Стальбоўскага. 1876 г.]. У гэтай справе цікавым фактам быў той, што сяляне вёскі Сухаўляны Даніла Стальбоўскі, Міхал Вольскі, Іосіф Ярашэўскі, Міхал Гуліда, Міхал Каскевіч, Бенядыкт Рэкець, Іван Сеўка падпісалі ліст (за непісьменных аднавяскоўцаў распісаўся Сцяпан Дарошак), завераны пячаткай вясковага старасты Стальбоўскага, што яны далі Вікенцію Покашу "жердей по три, а некоторые по 4 штуки, и дали ему прутов для покрытия хлебного сарая и по этому он Покош в чужем материале не нуждался получивши от нас сколько ему было нужно". Справа ў тым, што крадзёж з панскага лесу ніколі не лічыўся сярод сялян амаральным учынкам, наадварот, яны заўсёды праяўлялі салідарнасць з тым, каго суд абвінавачваў у такім учынку.

У 1879 г. сяляне вёскі Пузавічы судзіліся з Рыгорам Мазалеўскім за ўрочышча Старына, і іх упаўнаважаны Амвросій Сарлай абскардзіў у Міністэрстве ўнутраных спраў пастанову Міравога з'езда па гэтай справе. Прычым сам Мазалеўскі ўжо не траціў час на такія заняткі, яго давераннай асобай быў Калежскі Асэсар Алімп Бучынскі.

Купіць зямлю селяніну ў Беларусі было няпроста яшчэ і з фармальных прычын. Пасля паўстання 1863 г. урад забараніў памешчыкам каталіцкага веравызнання купляць зямлю, каб абмежаваць "польскае" землеўладанне, а адпаведна і ўплыў памешчыкаў-каталікоў на мясцовае грамадства. А каб памешчыкі не куплялі зямлю праз падстаўных сялян, былі ўведзены даволі складаныя працэдуры.

Прыкладам можа паслужыць набыццё 10 дз. зямлі селянінам мястэчка Скідзель Якубам Іоскевічам у памешчыцы маёнтка Котра (да яго належалі вёскі Гушчыцы і Кашубінцы) Марыі Багатка. Паводле запыту начальніка губерні міравы пасярэднік запатрабаваў у валаснога праўлення "удостоверение в благонадежности в политическом отношении крестьянина Иоскевича" [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 1. С. 333. Арк. 1 - 1 адв. [Аб дазволе купіць зямлю селяніну м.Скідзель Я.Іоскевічу. 1871 г.]. Паліцэйскі прыстаў таксама падаў у маі 1871 г. пісьмовую характарыстыку Іоскевіча: "... имею уведомить Ваше Высокоблагородие, что крестьянин Скидельской волости дер. Карашево Яков Афанасьев Иоскевич, имеющий в М-ке Скидель собственный дом, в бывших в здешнем крае беспорядках не участвовал, под полицейским надзором не состоит, дел о его подсудности у меня в производстве нет, а повода

считать себя в политическом отношении неблагонадежным не подавал. Вероисповедания Иоскевич православного, по промыслу столяр и колесник, содержится с семейством своим частию своим трудом, а частию доходами с дома. По собранным сведениям от его соседей он оказывается поведения хорошего, образ жизни ведет безупречный, нрава тихого, скромного".

Гэты самы Якуб Іоскевіч напэўна быў незвычайным чалавекам. Як вынікае ўжо з іншых дакументаў, ён ажаніўся яшчэ ў часы прыгону на шляхцянцы Марыі Пачабут і купіў у Скідзелі дом у шляхцянак сясцёр Эміліі і Карнеліі Яшчукевічавых. Пры пакупцы быў падпісаны 25 чэрвеня 1854 г. дакумент наступнага зместу: "Ниже подписавшиемся при словесно и очевидно упоменных свидетелях настоящим документом объявляем: Что дом состоящий в местечке Скидель Князей Четвертинских на новой улице построенной покойными нашими родителями Казимиром и Францишкою Ящукевич с четырьмя комнатами, кухнею конюшнею сараем и погребом а также с фруктовыми деревьями и с двумя чиншевым плацами, вдоль к реке простирающимися к этому дому принадлежащими продаст Якову Афанасьеву сыну и Марье урожденной Почобут Иоскевичам за 400 руб. каковыя деньги четыреста рублей в собственныя руки мы получим, за тем сказанный дом совсем к оному принадлежностями на вечныя времена отдаем в собственность Якова Афанасьева и Марии с Почобутов Иоскевичам, которыя как своею собственностью имеют право распоряжаться, то есть кому захотят дарить или продать" [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 17. С. 598. [Размежаванне земляў маёнтка Скідзель. 1864-1886 г.]. Сведкамі набыцця дома былі Вікенці Мазалеўскі, Хведар Пратасевіч і Давыд Сяўрук. Дом быў набыты на правах "вечнага чыншу". Інакш кажучы, Іоскевічы павінны былі плаціць за зямельны ўчастак уладальнікам мястэчка Чацвярцінскім цвёрда ўстаноўленую плату. Працытаваны дакумент адкрывае нам вельмі цікавую старонку з жыцця тагачаснага Скідзеля. Аказваецца, прыгонны селянін мог ажаніцца на шяхцянцы і набыць ва ўласнасць за вялізныя на той час грошы нерухомую маёмасць.

Калі ж пачалося правядзенне сялянскай рэформы, дык Якуб і Марыя Іоскевічы звярнуліся з прашэннем у Губернскую па сялянскіх справах прысутнасць, каб тая дазволіла ім выкупіць свой участак на правах местачковых агароднікаў: "... покорнейше имеем честь просить милостивого распоряжения об установлении с владеемого нами в местечке Скидель выше сказанного плаца ежегодного выкупного оброка на равне с нашими собратьями огородниками, приняв во внимание 1-е Что я проситель Яков по ревизским сказкам состою записанным при деревне Карашево Имения Скидля при брате моем 2-е Что покупка помянутого плаца совершена домашним образом и что в последствии Князь Четвертынский может наложить на нея непомерную плату чинша который и ныне вносим по 3 руб. 80 коп., или же отобрать от нас совсем

этот плац и тем лишить нас при старых наших летах приюта и последняго способа к существованию. 3-е. Что и мы просители выйдя из крепостной зависимости должны воспользоваться на равнее с нашими собратьями Высочайшим Манифестом который застал нас владеющих сказанным плацом предоставляет и нам милостивое право укрепощения того же плаца посредством выкупного оброка в вечную нашу собственность". За Іоскевічаў у прашэнні распісаўся "дваранін" Мацвей Іванавіч Пачабут, напэўна, сваяк жонкі Якуба Іоскевіча Марыі. Чыноўнікі параілі Іоскевічам звярнуцца непасрэдна да Чацвярцінскіх, і калі тыя пагодзяцца, выкупіць гэты ўчастак. Чым завершылася справа, нам невядома.

Трэба адзначыць, што сярод тых, хто здолеў набыць зямлі і ўзбагаціцца ў часе правядзення рэформы пераважалі асобы, якія мелі высокі статус і ў прыгонныя часы. Цяпер жа яны актыўна выкарыстоўвалі назапашаны капітал і важныя сацыяльныя сувязі. Напрыклад, сяляне з Глінянаў Гайкі і Свёклы выконвалі важныя функцыі пры дворным кіраванні, былі касірамі і пісарамі. Пасля вызвалення з прыгону Аляксандр Гайко набыў фальварак Грэбелька, яго нашчадкі купілі зямлю у памешчыка Чачота. Закхей Аляксандравіч Гайко на мяжы XIX-XX ст. служыў паліцэйскім акалотачным (начальнікам участка – акалотка) у Брэсце, у службовым фармуляры было адзначана, што яму належаць 78 дз. зямлі ў Гродзенскім уездзе [НГАБ у Гродне. Ф. 2. В. 37. С. 2360. Арк. 562]. Сыны Ваніфацція Свёклы Уладзімір і Пётр сталі валаснымі пісарамі. Уладзімір скончыў народнае вучылішча. У 1880 г. ён быў пісарам у суседняй са Скідзелем Жытамлянскай воласці. Захавалася скарга шляхціцаў засценка Абуховічы Казіміра і Адама Абуховічаў на пісара Свёклу, што ён вымагае па 10 руб. з чалавека за выдачу "увольнительных" пасведчанняў мясцовай дробнай шляхце, якая імкнулася звольніцца з сялянскіх грамадаў і прыпісацца да гродзенскай мяшчанскай грамады, а для гэтага патрабаваўся дазвол ад валаснога праўлення. Абуховічы пісалі, што Свёкла на гэтым "нажил капитал не на сотни, а на тысячи рублей [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 5. С. 900. Арк. 6,13]. У канцы XIX ст. ён ужо працаваў пісарам у Сакольскім уездзе Гродзенскай губерні. Напэўна, ужо яго сын Леанід служыў на пачатку XX ст. канцылярскім служачым у гродзенскім губернскім праўленні. У службовым фармулярным спіску яго было адзначана, што скончыў Сакольскае ўезднае вучылішча і быў запісаны ў разрад мяшчанаў Гродна [НГАБ у Гродне. Ф. 2. В. 37. С. 2355. Арк. 286]. Брат Уладзіміра Свёклы Пётр скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю, з 1876 г. працаваў народным настаўнікам у Мастах, а потым стаў валасным пісарам у Слонімскім уездзе [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 1. С. 2795. [Звесткі пра асабовы склад валасных пісараў. 1897-1898 г.].

Такім чынам, самыя прадпрымальныя і заможныя сяляне пасля рэформы 1861 г. інвеставалі свой капітал у зямлю і адукацыю.

Дзякуючы атрыманай навуцы яны займалі выгодныя пасады ў дзяржаўнай адміністрацыі, станавіліся паліцэйскімі чыноўнікамі, пісарамі, настаўнікамі. Паступова яны парывалі сувязі з роднымі вёскамі і нават сваякамі, пераходзілі ў іншы свет, у іншае асяроддзе, набывалі новыя сацыяльныя сувязі.

Але для большасці сялян гэткі шлях быў недаступным. Адным з магчымых выйсцяў з тупіковай сітуацыі малазямелля станавілася міграцыя з роднай вёскі. У канцы XIX ст. у Беларусі набірае сілу перасяленчы рух у Сібір. Вяскоўцы прадавалі свае надзелы і разам з сем'ямі выпраўляліся ў далёкае падарожжа ў пошуках новай зямлі і лепшай долі. Праўда, на Гродзеншчыне пересяленне ў Сібір і ў іншыя аддаленыя землі Расійскай імперыі не набрала такога размаху, як на ўсходзе Беларусі. І ў Скідзельскай воласці, наколькі дазваляюць меркаваць даступныя нам дакументы, перасялілася не так і шмат жыхароў. Напрыклад, у 1906 г. Сымон Целеш з вёскі Некрашы прасіў дазволу перасяліцца на Каўказ, але ці ўдалося яму ажыццявіць сваю задумку, нам невядома [НГАБ у Гродне. Ф. 18. В. 1. С. 55. [Аб перасяленні ў Сібір. 1906 г.]. У тым жа годзе сельскі сход вёскі Белякоўшчына адмовіўся прыняць назад з Сібіры свайго аднавяскоўца Івана Сымонавіча Швабу, паколькі сяляне палічылі, што ён "человек недобросовестный и занимается постоянным нищенством и пьянством из-за лени".

На пачатку XX ст. распачынаецца працэс міграцыі беларускага сялянства ў Паўночную Амерыку. Гэты працэс таксама закрануў Скідзельшчыну. Пісар Скідзельскай воласці пісаў мясцоваму земскаму начальніку наконт эміграцыі мясцовых сялян у Амерыку паводле прапанаванаму губернскімі ўладамі плану: "1. Отход рабочих за последние 10 лет достиг 49 человек, а именно: 1901 – 1, 1902 – 1, 1904 – 3, 1905 – 4, 1906 – 6, 1907 – 8, 1908 – 10, 1909 – 7, 1910 – 9. Выселений не было. 2. Все рабочие по национальности белоруссы, православные, хлебопашцы, малоземельные, частью не состоятельные. Все мужчины и одна женщина в возрасте от 19 да 40 лет. 3. Поводом к возникновению движения рабочих за границу послужила агитация среди крестьянского населения агентов евреев, а началось оно лет 15 тому назад и ныне вызывается хорошими заработками в Америке. 4. Ликвидации хозяйств обыкновенно не производят, так как отлучаясь, рабочие обыкновенно оставляют хозяйство свое в распоряжении членов семьи: отцов, братьев или жен, которые содействуют рабочим в поездке их в Америку; по возвращении же домой рабочие остаются в таком же имущественном положении, как были да выезда их за границу" [НГАБ у Гродне. Ф. 534. В. 1. С. 12. Арк. 71]. Хоць пісар і адзначаў, што ў эміграцыю падаюцца малазямельныя і небагатыя сяляне, усё ж паездка ў Амерыку патрабавала значных грашовых выдаткаў. Толькі за пераход дзяржаўнай мяжы, заўсёды нелегальны, эміграты плацілі яўрэям-пасярэднікам ад 15 да 25 рублёў, а яшчэ ад

100 да 150 руб. патрэбна было аддаць за білет на параход, каб перасекчы Атлантыку. Што ж датычыцца стаўлення мясцовых жыхароў да эміграцыі, дык скідзельскі пісар так бачыў гэтую праблему: “Население одобряет это движение и если заработки увеличатся, то и дальнейшее движение рабочих расширится и наоборот... Эмиграция никакого влияния на местное население не производит. При желании рабочих они могут зарабатывать на месте, но отправляющиеся рабочие гонятся за крупными заработками, какие дает Америка, не обращая внимания на способы заработка. Не замечается, чтобы отлучка рабочей силы производила особое расстройство или улучшение в крестьянском хозяйстве, некоторые рабочие, побыв в Америке 3-4 года, возвращаются без всяких средств, а некоторые привозят с собой 50-100 руб. Из всех возвратившихся один только рабочий привез с собой через 5 лет 600 руб.”. У заключэнне валасны пісар сцвярджаў: “Судя по возвратившимся на родину рабочим, пребывание за границей никакого культурного влияния на рабочих не оказывает, как видно, вследствие не продолжительного пребывания, а главное не знания иностранных языков”. Галоўнай мэтай падарожжа ў далёкую Амерыку для скідзельскіх сялян з’яўлялася зарабіць грошай, каб па вяртанні купіць зямлі і паправіць сваю гаспадарку. Не ўсім гэта ўдавалася, а некаторыя назаўсёды заставаліся ў чужой краіне і пачыналі новае жыццё.

У другой палове XIX ст. адбываюцца значныя змены ў сацыяльнай структуры сялянскіх супольнасцяў. Пасля рэформы 1861 г. у склад вясковых грамадаў уліваюцца былыя дваровыя людзі. Толькі нямногія з іх атрымлівалі поўныя зямельныя надзелы, а значна большая колькасць – ўсечаныя трохдзесяцінныя. А многія ўвогуле засталіся без зямлі, папаўняючы шэрагі вясковага і местачковага пралетарыяту. Гэтая бяднейшая частка вясковай супольнасці нярэдка падвяргаецца ўціску і дыскрымінацыі з боку заможнейшых суседзяў. На сялянскую грамаду дзяржавай ўскладвалася калектыўная адказнасць за выплату падаткаў і выкупных плацяжоў, за выкананне натуральных павіннасцяў. Яна была адменена толькі ў 1903 г. Калі бядакі не спраўляліся з сваім заданнем, дык выклікалі гнеў выбарных службовых асобаў і нараканне суседзяў. Але асабліва цяжкім грузам для сялян з’яўлялася рэкруцкая павіннасць. Кожная грамада павінна была ў часе набору паставіць пэўную колькасць рэкрутаў. Калі ў 1869 г. праводзіўся чарговы рэкруцкі набор, дык ад Скідзельскай воласці патрабавалася паставіць 14 рэкрутаў [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 14. С. 379. Арк. 75 адв. Аб правядзенні рэкруцкага набору ў 1869 г.]. А з 1863 г. па 1872 г. сяляне воласці паставілі 144 рэкрута, альбо ў войска забралі кожнага дваццатага жыхара мужчынскага полу [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 1. С. 1013. Арк. 6 - 6 адв. Скарга сялян Скідзельскай воласці на няправільную аддачу ў рэкруты. 1873 г.]. Напрыклад, у Скідзелі налічвалася 131 мужчынская душа, а ў рэкруты забралі 6 маладых мужчын

Самыя заможныя і ўплывовыя гаспадары імкнуліся праўдамі і няпраўдамі не аддаваць сваіх сыноў ці малодшых братоў на шматгадовую вайсковую службу. Часта яны дасягалі гэтага з дапамогай подкупу службовых асобаў. Натуральна, што такі спосаб выклікаў сваркі, варожасць і прыводзіў да заняпаду вясковай салідарнасці. А ахвярамі найчасцей станавіліся самыя бедныя і бездапаможныя. Пакрыўджаныя пісалі скаргі на несправядлівасць мясцовых уладаў, але амаль не мелі шанцаў вярнуць сваіх сваякоў з войска. Напрыклад, жыхарка вёскі Раўкі Марыяна Сырэль скардзілася ў 1872 г. на тое, што яе мужа Сцяпана Багдзенка няправільна аддалі ў рэкруты [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 1. Спр. 792. Скарга сялянкі вёскі Раўкі Марыяны Сырэль-Багдзенка на няправільную аддачу мужа ў рэкруты. 1872 г.]. Апошні быў парабкам з вёскі Сарочыцы суседняй Дубнаўскай воласці. Перайшоў у Раўкі на гаспадарку ўдавы Марыяны, якая мела пяцёра дзяцей. Але Дубнаўская воласць аддала яго ў рэкруты з сям'і яго дзядзькі з Сарочыцаў. Марыяна сцвярджала, што Сцяпан, які нарадзіўся ў снежні 1842 г., з 9-гадовага ўзросту не жыў у сям'і свайго дзядзькі Восіпа, а служыў парабкам. Аднак, хаця Раўкоўская грамада зрабіла прыгавор аб прыняцці яго ў сваю вёску, не было так званага адпускнога прыгавору з Сарочыцаў. А паколькі няшчаснаму Сцяпану, з якім так жорстка абышліся самыя блізкія сваякі, не споўнілася яшчэ 30 гадоў, дык забралі яго ў войска паводле закона, і ў Марыяны не было шанцаў яго вярнуць. Яна напісала з дзясятак скаргаў, справа гэтая нават разглядалася ў Сенаце, але ўсё безвынікова. Марыяна Сырэль скардзілася, што няма каму працаваць на гаспадарцы, няма як плаціць падаткі. Калі яна падала скідзельскаму старшыні прашэнне з просьбай даць ёй ільготы на выплату падаткаў, дык той, паводле яе слоў, шпурнуў гэтае прашэнне на зямлю. Каб выплаціць нядоімку падаткаў, Марыяна мусіла ўзяць пазыку 13 руб. у мясцовага яўрэя-шынкара, а ўзамен аддала яму на 3 гады ў арэнду частку сваёй сенажаці. І падобных спраў было вельмі шмат, і ўсе яны завяршаліся безвынікова для пакрыўджаных.

Асабліва цяжкімі былі жыццёвыя лёсы сіротаў. Сялянка вёскі Карашава Ганна Пілец 18 снежня 1903 г. скардзілася гродзенскаму губернатару: “Когда мне было пять лет от роду я лишилась отца и матери и осталась круглою сиротою при дяде моем Василии Пилеце на отцовском хозяйстве. Дядя мой, желая избавиться от меня сироты, выдал меня за муж помимо моей воли за крестьянина деревни Глинян Скидельской волости Алексея Кемежука. Мне тогда было не более 15 или 16 лет от роду. Оказалось, что он полуумный и ко супружеской жизни неспособен, вследствие чего я вынуждена была оставить дом и идти на службу. Так я скитаюсь уже 18 лет и снискиваю себе пропитание личным трудом – службою. Я все время страдаю от того, что у меня нет паспорта, но знакомые, уважая мою честность и трудолюбие, держали меня на службе. Но в последнее время стали требовать от меня паспорта

и я обратилась к Скидельскому волостному Старшине, но мне в этом отказывает” [НГАБ у Гродне. Ф.10. В. 7. С. 1826. Арк. 270-271 адв. Аб перасяленні сялян Гродзенскай губерні. 1903 г.]. Ганна Пілец пісала, што “без паспорта я обречена на голод, холод и всякие лишения”. Яна жыла ў Скідзелі на вуліцы Татарскай у доме яўрэя Перліса на кватэры Ганны Бубен. Пілец было аб’яўлена ад імя губернатара, што яна павінна звярнуцца да мясцовага земскага начальніка.

Пашпартоў ад валаснога праўлення мусілі дамагацца сяляне, якія вырашылі назаўсёды пакінуць родныя мясціны і шукаць шчасця ў далёкіх гарадах. А для валасных уладаў гэта было добрай нагодай вымагаць грошы. Напрыклад, у 1887 г. унтэр-афіцэр Іван Восіпаў Міхно, які застаўся пасля службы ў Пецярбургу, двойчы скардзіўся гродзенскаму губернатару на нявыдачу яму пашпарта скідзельскім валасным праўленнем: “...так как без вида притесняет меня Полицейское Управление и требует от меня, который не могу вырвать ни какими просьбами” [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 5. С. 2977. Арк. 1. Справа па скарзе унтэр-афіцэра Міхно на нявысылку яму пашпарта Скідзельскім валасным праўленнем. 1887 г.]. Іван Міхно сцвярджаў, што ўжо выслаў у Скідзель 33 рублі, але ўсё безвынікова. Родам быў ён з вёскі Ахрымаўцы. Пагражаў, што будзе скардзіцца ў самыя вышэйшыя інстанцыі. Валаснoе праўленне, з свайго боку, патрабавала ад Міхно “свидетельства о увольнении из военной службы”.

У гэтых умовах у парэформенным сялянскім грамадстве ўзрастае колькасць людзей, якія не жадаюць падпарадкоўвацца нормам традыцыйнай маралі і кідаюць выклік грамадству. Менавіта тады пачынае фармавацца такая сацыяльная з’ява, як прафесійная злачыннасць, а адпаведна і злачынная субкультура са сваімі ўласнымі нормамі паводзінаў і каштоўнасцямі. Усё часцей узнікаюць арганізаваныя злачынныя шайкі, што гадамі тэрарызуюць цэлыя ваколіцы. Такая шайка, ці “хеўра”, з’явілася і ў Скідзелі. У жніўні 1878 г. невядомыя падпалілі хату паліцэйскага ўрадніка Паўтаржыцкага. Станавы прыстаў Ваўрушэвіч падазраваў мясцовага яўрэя Шмуэля Лямперта: “...личность эта всему обществу всех сословий известна. Это есть скидельский еврей, сын раввина Шмуэль Сроэлевич Лямпорт – мальчуган недостигший еще вполне 21 года, необузданный во всех пороках, довольно грамотный, развит в умственном отношении в высшей степени – конечно на мошеннические проделки” [НГАБ у Гродне. Ф.1. В. 16. С. 758. Арк. 2]. Лямперт на той час ужо абвінавачваўся па цэламу шэрагу крымінальных спраў, а паводле абвінавачання ў крадзяжы 300 рублёў са Скідзельскай акцызнай канторы адседзеў 9 месяцаў у турме. Прыстаў Ваўрушэвіч прызнаваў, што Шмуэль “...с таким знанием маскирует свои преступления, что никакой надзор за ним иметь места не может”. Таму ён прапаноўваў выслаць яго ў Сібір паводле адміністрацыйнага загада генерал-губернатара, паколькі “рассчитывать на формальные следствия и уголовный суд нет никакой

надежды”. Прыстаў і сам пабойваўся адчайнага сына рабіна (праўда, бацька адрокся ад Шмуэля, і толькі маці старалася яму дапамагаць): “Носится очень секретно молва, что Шмулько Лямперт угрожает и моей личности, как становому приставу – сжечь, задушить или убить, ежели что-нибудь и может последовать, то я положительно указываю вперед на разбойника Шмульку Лямперта и его сообщников, живущих в местечке Скидель: Николая Грецкого, его брата Станислава и Осипа Севрука”. Неўзабаве Шмульку Лямперта ўсё ж здолелі неяк адправіць на вайсковую службу (ён сам намерваўся дэзертыраваць і эміграваць у Амерыку), і нам невядомы далейшы яго лёс. Напэўна, якраз такія эмігранты пазней стварылі ў Злучаных Штатах славутую яўрэйскую мафію, пра якую апавядае вядомы кінафільм “Аднойчы ў Амерыцы”.

Злачынная “хеўра”, як ее называлі самі ўдзельнікі, працягвала існаваць і без Шмулькі Лямперта, замест якога да яе далучыўся васемнаццацігадовы сын цырульніка яўрэй Калман Струпінскі, што, як напісаў прыстаў, “замечается из ежечасных взаимных посещений и выпивок”. Нефармальным лідарам гэтай “хеўры” з’яўляўся Мікалай Грэцкі, які ўжо быў асуджаны за кражу рэчаў са Скідзельскай царквы і пабываў у арыштанцкіх ротах. Яго сына Фердынанда ў жніўні 1879 г. выслалі ў Сібір за крадзеж. Помстай “хеўры” за гэта, на думку паліцыі, і стаў 17 жніўня 1878 г. падпал хаты тысяцкага Паўтаржыцкага. Цікава, што апошні ўжо гарэў пад час вялікага пажару ў Скідзелі ў 1877 г., толькі паспеў адбудаваць новы дом з хлявом, якія каштавалі 700 руб. (а гэта вельмі дарагая па мерках таго часу хата). Згарэла ў агні таксама рухомая маёмасць тысяцкага на суму 400 рублёў.

Цэлая серыя пажараў здарылася ў Скідзелі ў верасні таго ж 1878 году. 8 верасня згарэў амбар Фадзея Труся, 17 верасня – амбар селяніна Каялы, 27 верасня згарэлі хата і сарай яўрэя Хаіма Пачымка, 29 верасня – амбар мясцовага фельдшара Іванова. Жыхары мястэчка бачылі ў гэтым помсту “хеўры” за высылку яе сяброў у Сібір. Затэрыразаваныя скідзельцы пагадзіліся 8 лістапада 1878 г. на сваім сходзе з патрабаваннем Мікалая Грэцкага, каб вярнуць у Скідзель з высылкі за кошт грамады яго сына Фердынанда. Прынялі ўдзел у сходзе 33 гаспадары з агульнай колькасці 47. З іх, дарэчы, толькі 11 былі пісьменнымі. Прычым Іван Мазалеўскі зрабіў прыпіску да пастановы сходу, што прагаласаваў за вяртанне Фердынанда Грэцкага толькі таму, што баіцца падпалу.

Праўда, Фердынанда Грэцкага з высылкі ў 1878 г. так і не вярнулі. Пра гэта сведчыць пазнейшая справа, якая распачалася з прашэння ссыльнага Грэцкага ў Міністэрства ўнутраных спраў, напісанага ўжо ў 1903 г. [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 3. С. 2277. Аб адмове сялян мястэчка Скідзель прыняць у сваё асяроддзе ссыльнага селяніна Фердынанда Грэцкага. 1879–1879 гг.]. З тэксту вынікае, што ён быў высланы са Скідзеля ў Сібір пастановай сельскага і валаснога сходаў ад 20 чэрвеня 1879 г. ва ўзросце 24 гадоў. 28 чэрвеня 1903 г., альбо праз 24 гады

пасля высылкі, скідзельская грамада зноў адмовілася прыняць Фердынанда ў сваё асяроддзе. Прычым міравы пасярэднік Сямёнаў прызнаў гэтае рашэнне справядлівым. Але губернскія ўлады націснулі на валаснoe кіраванне, і 31 снежня 1904 г. валасны сход прыняў ужо рашэнне аб згодзе прыняць у сваё асяроддзе Фердынанда Грэцкага, якому на той час было каля 48 гадоў. Жыў ён у Арамашэўскай воласці Ішымскага ўезда Табольскай губерні. Ці вярнуўся нарэшце Фердынанд Грэцкі ў родны Скідзель, нам невядома.

Але вярнемся зноў у XIX ст. 12 лістапада 1879 г. віленскі генерал-губернатар прыняў рашэнне выслаць Мікалая Грэцкага і Восіпа Сяўрука ў Архангельскую губерню пад нагляд паліцыі адміністрацыйным парадкам, ці без судовага рашэння [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 16. С. 758. Арк. 2-12]. Абодва падазраваліся ва ўзброеным нападзе на Луненскае валаснoe праўленне. Праўда, ужо ў 1882 г. яны вярнуліся на радзіму. У 1883 г. па загаду гродзенскага губернатара былі складзены спісы прафесійных злачынцаў губерні. На той час гэтая праблема сапраўды набыла грозныя памеры, а асабліва пашырылася канакрадства. Паводле дадзеных паліцыі, у Скідзелі налічвалася 14 прафесійных злодзеяў, з іх двух беларусаў – Восіп Іванаў Сяўрук і Мікалай Мацвееў Грэцкі, а ўсе астатнія – яўрэі. Восіпу Сяўруку было каля 30 гадоў, ён жыў пры гаспадарцы свайго бацькі. Станавы прыстаў даў Сяўруку такую характарыстыку: “Неоднократно замечался в кражах и разных мошенничествах... отъявленный вор, буян, прегоркий пьяница, но вместе с тем весьма ловкий и беззастенчивый плут, готов на всякого рода преступления, даже на поджег и разбой, весьма опасный человек, судился в 1882 г в Гроднен. Уголов. Палате за воровство” [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 17. С. 286. Арк. 61 адв. Спісы канакрадаў. 1883 г.]. Мікалай Грэцкі меў на той час каля 60 гадоў. Па прафесіі ён быў слесарам, у часе рэформы 1860-х гадоў паказаны ў разрадзе агароднікаў. Прыстаў адзначыў, што Грэцкі здольны “на всяго рода преступления”, але “пока ведет себя незазорно”. У Скідзельскай воласці быў яшчэ адзін, па звестках паліцыі, прафесійны злачынца з беларусаў – Рыгор Аляксееў Лабко з вёскі Гліняны, які меў каля 50 гадоў узросту. Лабко атрымаў такую характарыстыку паліцыі: “Был под судом по делу о нападении на Гудзевичское волостное правление в 1878 г. с целью ограбить из Волостного правления сундук с деньгами до 7000 руб. Нападение сделано шайкою, выстрелами шайка разогнана, некоторые переловлены. Лобко притворился подвозчиком наемным, сидел в тюрьме 8 месяцев, в числе шайки был и Севрук, но увернулся”.

10 мая 1888 г. ў Скідзелі быў падпалены дом Хаіма Фрыдмана, у якім жыў на кватэры са сваёй сям’ёй станавы прыстаў Яўхім Ваўрушэвіч. Пры гэтым згарэлі 12 хатаў жыхароў мястэчка: дом, хлеў і амбар Хаіма Фрыдмана; дом удавы Караліны Злоцкай (ацэнены на суму ў 100 руб.) і маёмасць на 10 руб.; дом Данілы Францава Гарноўскага (300 руб.) і маёмасць на 43 руб.; дом Антона Вікенцьева Парая (150

руб.); дом Мікалая Мацвеева Грэцкага (400 руб.) і маёмасць на 42 руб., у гэтым доме кватаравала бабка-павітуха Вольга Барадзіна, у якой таксама згарэлі рэчы на 10 руб.; дом Марыі Мазалеўскай (50 руб.); дом і хлеў Канстанціна Севасцьянава Гарноўскага (200 руб.) і салома на 9 руб.; дом і хлеў Юрыя Давыдава Сяўрука (200 руб.), другі яго ж дом з амбарам (150 руб.) і рэчаў на 38 руб.; дом Рыгора Восіпава Рэкеця (200 руб.), амбар (100 руб.), хлеў (50 руб.), зерне і рэчы на 35 руб.; дом, хлеў і амбар пад адной страхой Сцяпана Антонава Труся (300 руб.) і рэчы на 15 руб.; дом, амбар і хлеў пад адной страхой Ігната Восіпава Паўлоўскага (250 руб.) і рэчы на 10 руб. Усяго страты сялянаў Скідзеля склалі 6798 руб. Згарэўшыя хаты і гаспадарчыя пабудовы былі, на шчасце, застрахаваныя. Найболей жа ад пажару пацярпеў станавы прыстаў, у якога прапала рухомая маёмасць на суму 2428 руб.: залаты кішэнны гадзіннік (110 руб.), футра з бабровым каўняром (50 руб.), тры жаночых футры (250 руб.), фартэпіяна (200 руб.), мяккая мэбля (80 руб.), посуд (115 руб.), чатыры іконы (75 руб.), ручная швейная машына (30 руб.), конная брычка (60 руб.), карова (40 руб.), паршук (8 руб.) і інш. Улады выдалі Ваўрушэвічу "пособие" на суму 500 руб. Паводле матэрыялаў следства, "жители предполагали, что поджог сделали конокрады" [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 17. С. 1442. [Аб пажары ў мястэчку Скідзель. 1888 г.]. Згарэлі ў пажары канфіскаваныя ў злодзееў рэчы – воз Ёселя Фурмана і пісьмовы стол Ідаля Гальдштэйна. Праўда, ад пажара пацярпеў і Мікалай Грэцкі, якога паліцыя лічыла прафесійным злодзеем. Прычым яго дом меў самы высокі кошт сярод усіх згарэўшых. Але гэтая справа так і засталася нераскрытай. А прыстаў Яўхім Ваўрушэвіч у 1892 г. перавёўся ў Бельскі ўезд памочнікам паліцэйскага спраўніка. Паходзіў ён з вёскі Сяхновічы Кобрынскага павета з сям'і праваслаўнага святара, скончыў Жыровіцкае духоўнае вучылішча, але з 1854 г. служыў у паліцыі.

З'яўленне прафесійнай злачыннасці было адлюстраваннем тых кардынальных зменаў, якія адбываліся як у жыцці Скідзеля, так і ўсяго беларускага грамадства. Гэтыя змены пастулова, але няўхільна разбуралі векавыя традыцыі. Сяляне гублялі зямлю, якая вызначала сістэму іх каштоўнасцяў, і павінны былі шукаць новыя дарогі ў жыцці. Гублялі свой аўтарытэт традыцыйныя інстытуты – грамада, патрыярхальная сям'я, царква, але адначасна ўзрастала значэнне асабістага высілку чалавека, яго здольнасці ўплываць на свой лёс, зараджаліся новыя сацыяльныя сувязі, заснаваныя на сяброўстве, новых ідэалагічных каштоўнасцях. Скідзельшчына паволі ўступала ў сучасную эпоху з усімі яе супярэчнасцямі.

### Валасное самакіраванне

Адным з важнейшых наваўвядзенняў рэформы 1861 г. стала ўтварэнне органаў сялянскага самакіравання. Яго першасным элементам стала сялянская грамада (сельское общество), у якую

звычайна ўваходзілі жыхары адной альбо дзвюх, часам трох, вёсак. Сельскі сход, які складаўся з гаспадароў, мог абмяркоўваць і вырашаць істотныя для сялян пытанні: аб прыняцці ці непрыняцці ў склад грамады (датычыла злачынцаў, для якіх адмова прыняцця ў родную вёску азначала высылку ў Сібір), аб пастаўцы рэкрутаў і г.д. На гэтых сходах сяляне выбіралі сельскіх старастаў і зборшчыкаў падаткаў. Апошнія разам з дэпутатамі ад кожных дзесяці двароў бралі ўдзел ужо ў валасных сходах, на якіх выбіралі валаснога старшыню, яго намесніка і валасных суддзяў. Дзяржаўныя ўлады ўскладвалі на гэтую ўстанову тыя функцыі, якія да адмены прыгону выконваў панскі двор: выплату падаткаў, пастаўку рэкрутаў, выкананне натуральных павіннасцяў і г.д. І менавіта выкананне гэтых функцый з'яўлялася галоўным крытэрыем спраўнасці выбарных службовых асобаў. Таму дзяржаўныя ўлады імкнуліся сцісла кантраляваць дзейнасць сялянскага самакіравання і, асабліва, працэс выбараў валасных старшыняў. Гэта ўскладвалася ў першую чаргу на міравых пасярэднікаў, якія напачатку выбіраліся з ліку мясцовых памешчыкаў. Але пасля паўстання 1863 г. урад адмяніў выбарнасць міравых пасярэднікаў у Беларусі, і гэтых чыноўнікаў на пасады пачаў прызначаць генерал-губернатар па рэкамендацыі губернатараў. На пастановы міравога пасярэдніка сяляне маглі скардзіцца ў з'езд міравых пасярэднікаў (для сялян Скідзельскай воласці гэта быў з'езд міравых пасярэднікаў Гродзенскага і Ваўкавыскага ўездаў), альбо яшчэ вышэй – у Губернскую па сялянскіх справах прысутнасць, што месцілася ў Гродне. Так выглядала структура ўстаноў, якія ажыццяўлялі кантроль за дзейнасцю сялянскага самакіравання.

Першыя сялянскія выбары былі праведзены ўжо ў 1861 г. У Скідзельскай воласці старшынёй стаў Рыгор Іванавіч Мазалеўскі. Калі ў 1863 г. у Беларусі выбухнула паўстанне, дык віленскі генерал-губернатар Міхаіл Мураўёў загадаў правесці перавыбары ў валасцях і сельскіх грамадах, каб пазбавіцца ад тых асобаў, якія маглі сімпатызаваць паўстанцам. Але ў Скідзельскай воласці старшынёй ізноў быў абраны Рыгор Мазалеўскі. У Скідзельскай грамадзе старастай абралі Тамаша Размыслевіча, у Некрашах – Філімона Хальца, Агародніках – Сямёна Неўгеня, Глінянах – Міхала Клімчука, Сухаўлянах – Міхала Плашкевіча, Белякоўшчыне – Івана Іоскевіча, Рысках – Сцяпана Гуліду, Карашаве – Фёдара Іоскевіча, Тарасюках – Вікенція Тарасюка, Коматаве – Марка Сямко, Агародніках – Якуба Ханту, Плавах – Івана Пільца, Абухаве – Барталамея Слізевіча, Мігаве – Сцяпана Краўчыка [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 14. С. 15. Акр. 155-155 адв. [Аб правядзенні выбараў валасных старшыняў і пісараў у Гродзенскай губерні. 1863 г.]. Такім чынам, у склад Скідзельскай воласці першапачаткова ўваходзілі вёскі (за выключэннем Тарасюкоў), якія належалі да маёнткаў Скідзель і Котра князей Чацвярцінскіх. Пазней да Скідзельскай воласці далучылі большую частку Кашубінскай (складалася з грамадаў Кашубінцы, Галавачы, Бірулічы, Закрэўшчына і Струпіна) і Чарлёнскай (складалася з

грамадаў Чарлёна, Лаўна, Харціца, Русінаўцы, Сарочыцы, Каўшова, Мазанава, Скраболы, Агароднікі) валасцей, а вёскі былога маёнтка Котра Чацвярцінскіх, у сваю чаргу, перадалі ў Жытамлянскую воласць.

Чыноўнік Чаплін 29 ліпеня 1863 г. так апісваў парадак і ход выбараў асобаў сялянскага самакіравання ў Гродзенскім уездзе: “Первоначально каждое сельское общество избирало из среды себя двух самых благонадежных людей и затем в Волостной избе каждое сельское общество поочередно производило болотировку посредством бобов, которые раздавались мною каждому домохозяину по одному, те же двое крестьян, которых общество желало выбирать становились около стола и клали на стол свои шапки которыя прикрывались; а потом каждый домохозяин подходил поочередно к столу и клал свой боб в шапку того, кого он желал быбрать и таким образом в чьей шапке оказывалось более бобов, тот утверждался Старостом, а другой кандидатом или как они называют помощником”. Як сцвярджаў Чаплін, “такой справедливый и безпристрастный способ выборов чрезвычайно как понравился крестьянам“.

Такім чынам, у Скідзельскай воласці першым валасным старшынёй стаў жыхар мястэчка Скідзель Рыгор Іванавіч Мазалеўскі, які раней выконваў абавязкі паліцэйскага служачага. Кіраваў Мазалеўскі воласцю жалезнай рукой, часам жорстка збіваючы тых, хто асмельваўся яму пярэчыць. Але аднойчы справа магла павярнуцца такім чынам, што Рыгору Мазалеўскаму самаму пагражала высылка ў Сібір [НГАБ у Гродне. Ф.1. В. 34. С. 1216. Аб устанаўленні паліцэйскага нагляду за Рыгорам Мазалеўскім. 1863 – 1868 гг.]. Прычынай паслужыла наведванне Скідзеля ў канцы 1862 г. папячыцелем Віленскай навучальнай акругі князем Шырынскім-Шыхматавым. Пры размове з папячыцелем старшыня дазволіў сабе некалькі выказванняў, якія маглі абыйсціся яму вельмі дорага. 26 лістапада 1863 г. генерал-губернатар Мураўёў пісаў начальніку Гродзенскай губерні: “Дошло до моего сведения, что Старшина временно обязанных крестьян в м.Скидель Гродненского уезда Мозолевский в прошлом году при проезде Попечителя Виленского учебного округа чрез означенное местечко где он осматривал сельское училище в присутствии его Попечителя позволил себе в самых неблагонамеренных выражениях отзываться на счет правительственных распоряжений поясняя, между прочим, что Императрица Екатерина заграбивши этот край, лишила их тех привилегий и преимуществ, какими предки их будто-бы пользовались, что Русское правительство установило крепостное право которого в Польше не существовало и что наконец Высочайший манифест 19-го Февраля 1861 года не принес существенного улучшения их быта. Кроме сего известно, что Мозолевский проникнутый Польским духом и вредными революционными идеями, сильно сочувствует мятежу, а по своему уму пользуясь влиянием на общество крестьян и мещан распространяет между ними польскую пропаганду и враждебные

чувства к правительству. Хотя по доведении этих обстоятельств до сведения высшаго начальства были сделаны распоряжения об удалении Мозолевского от занимаемой им должности, за всем тем общество Скидельское, по проискам Мозолевского вновь избрало его в Старшины, должность которую он занимает будто-бы и в настоящее время".

Мураўёў прапанаваў гродзенскаму губернатару сабраць патрэбныя звесткі і "уведомить меня, не признаете ли Вы нужным Мозолевского, как человека неблагонадежного и вредного выслать с семейством из края на водворение на постоянное место жительства во внутренние губернии". Прычым генерал-губернатар не забываў пра Мазалеўскага, бо праз год, 10 снежня 1864 г., ён запатрабаваў прыспешыцца з дастаўкай яму звестак пра скідзельскага старшыню.

Аднак на бок апошняга стаў ваенны начальнік Гродзенскага ўезда, які 6 лютага 1865 г. напісаў губернатару, што "Мозолевского не следует не только высылать из края но и удалять от должности старшины". Весці дазнанне по справе Мазалеўскага было даручана мясцоваму паліцэйскаму прыставу, які пачаў збіраць пісьмовыя сведчанні розных асобаў. Міравы пасярэднік Окунеў заявіў яму, што Мазалеўскі "будет одним из дельных и полезных Старшин". Сам Рыгор Мазалеўскі даў наступныя паказанні: "Зовут меня Григорий Иванов Мозолевский, лет от роду 45, Вероисповедания Православного, Грамотен, женат, детей имею, под судом и следствием не был, состою Старшиною Скидельской волости по выбору крестьян в каковой утвержден в июне месяце 1863 г. комиссией состовляющейся из Гг. Военного Начальника г.Гродно и Уезда, Уездного Исправника и Члена Гродненского губернского по Кр. Дел. Присутствия... Во время посещения Господина Попечителя Виленского Учебного округа Скидельского Народного Училища ничего противу правительственных распоряжений не говорил, а только от имени крестьян просил, чтобы (если возможно) ученикам преподаваем был по прежнему обыкновению вместе с Руским и Славянским, польский языки".

Скідзельскі Благачынны святар Антоні Будзіловіч 24 студзеня 1865 г. паведаміў, што не чуў размовы Мазалеўскага з князем Шырынскім-Шыхматавым. Але пры гэтым ён выказаўся адносна старшыні вельмі станоўча, адзначыўшы, што апошні вылучаецца добрымі паводзінамі, стала наведвае царкву, пабудаваў дом для народнага вучылішча і будуе такі ж у Глінянах, арганізаваў вываз лесу на рамонт Юр'еўскай царквы.

Затое інакш ахарактарызаваў Мазалеўскага другі скідзельскі прыходскі святар Іван Хамічэўскі, які даваў свае паказанні 29 студзеня 1865 г. Ён сцвердзіў, што старшыня "действительно просил его (князя Шырынскага-Шыхматава – аўтары) дозволить препадавать ученикам польский язык для того чтобы они могли молиться по Польским молитвенникам как привыкли молиться их деды и прадеды и когда Г. Попечитель старался доказать ему безполезность изучения

крестьянскими мальчиками польского языка, то Мозолевский, утверждая свое мнение не осторожно выразился о настоящих Правительственных распоряжениях, например, в роде того, что в былое время под Польским Правительством крестьянам здешнего края гораздо лучше и проч.” Мяркуючы па ўсяму, менавіта Хамічоўскі пісаў даносы на Мазалеўскага, паколькі ў сваіх паказаннях ён выказаў уласныя прэтэнзіі да валаснога старшыні: “Когда я по открытии здешняго Народного училища отнесся в Волостное Правление, прося о содействии к собранию в оное учеников, то Волостное Правление ответило мне в насмешливом тоне и оставило меня по прежнему действовать собственными силами, потому-то в первом году учащихся не бывало более 20-ти человек в приходе, состоящем из пяти с лишком тысяч душ... Что касается до его образа мыслей и действий в настоящее время, то это для меня вовсе неизвестно; знаю только характер Мозолевского, по которому он удивительно может применяться к различным переменам обстоятельств и располагать свои действия видимо по воле начальства, с подчиненными обращается довольно деспотически и бывает дерзок в отношении к каждому, к кому не состоит в прямом отношении подчинения”.

31 студзеня 1865 г. новыя паказанні даваў дабрачынны Будзіловіч: “На данный мне запрос в дополнение к прежнему моему ответу о Старшине Мозолевском про разговор его с Г.Попечителем сколько я мог слышать чрез затворенные двери, то Мозолевский говорил Попечителю о правах данных мещанам М.Скиделя Прежними Польскими Королями т.е. что они мещане Скидельские, были свободные от барщины, имели много земли, и сенокосов, между тем Помещик Князь Четвертинский получивши Имение Скидель привел их в крепостное состояние отнял лучшие их земли: об этом мещанами М.Скидля заведено дело в Гродненском Уездном Суде и Мозолевский в этом смысле говорил Попечителю от лица Мещан М.Скидля, что они не получили еще всех тех угодий которыми они прежде пользовались. О крестьянах здешняго Края Мозолевский не мог говорить, потому что они всегда были в крепостном состоянии да 1862 года. Священник Хомичевский, как недавно поступивший на Приход мог и незнать о прежних правах данных Скидельским мещанам, и о заведенным ими деле, а потому ошибочно отнес разговор Попечителя с Мозолевским к нынешним Правительственным распоряжениям”.

Сам жа святар Хамічэўскі 1 лютага 1865 г. таксама падаў дадатковыя звесткі па гэтай справе: “На спрос Вашего Благородия, с кем именно из подчиненных Старшина Мозолевский обходится деспотически, не могу указать положительно на известную личность, так как в Скидельской волости считается до 700 дворов, в каковом числе мне знакомых крестьян очень мало, притом если я бывал в Волостном Правлении и видел пример, такого обращения Мозолевского с крестьянами, то вовсе не имел надобности узнавать ту личность, с

которой старшина обходился сурово. Я туда являлся по своей надобности, а не для того, тобы следить за действиями Старшины. Только и теперь не могу без отвращения вспомнить как однажды какой-то крестьянин целовал его грязный сапог, а Мозолевский как царь Китая сидел развалясь на дыване".

Даваў паказанні па справе Мазалеўскага і былы скідзельскі святар, які ўжо на той час служыў у суседнім Азёрскім прыходзе, Адам Міхалевіч. Ён назваў старшыню "усердным христианином". А 31 студзеня таго ж года Мазалеўскі ўласнаручна напісаў свае паказанні. Гэта адзін з рэдкіх дакументаў таго часу, напісаны рукой селяніна: "гаварил Господину попечителу что крестьяне М.Скидля имели свои права прежде баршчину не годили, покупали годин у другого землу а княз Четвертынски нас укрепостил, но в каких словах говорил не помню".

10 лютага 1865 г. гродзенскі губернатар паслаў у Вільню ліст з просьбай пакінуць Рыгора Мазалеўскага "на прежнем месте жительства и при занимаемой должности, но вместе с тем, принимая в соображение, что Мозолевский усвоил себе привратныя понятия и заявил свое сочувствие польско-католической пропоганде, изволить приказать учредить за его действиями негласный полицейский надзор и поручить местному Мировому посреднику иметь над ним негласное наблюдение". 9 сакавіка 1868 г. міравы пасярэднік Окунеў прасіў "снять с Мозолевского сей гнет и тем дать ему возможность без стыда продолжать полезную деятельность".

Такім чынам, Рыгора Мазалеўскага ўратавала ад высылкі тое, што за яго заступіліся многія мясцовыя ўплывовыя асобы. Цікава, што бацьку Рыгора Івана Мазалеўскага Калета Чацвярцінская ў 1829 г. аддала ў рэкруты. Магчыма, што ён быў адным з арганізатараў супраціву скідзельцаў супраць уладальніцы. Іван Мазалеўскі напісаў скаргу на імя імператара, што княгіня незаконна аддала яго ў салдаты, паколькі яму было ўжо болей за 30 гадоў, а таксама паведаміў, што ў маёнтку сваім Чацвярцінская хавала дзезерціраў. Праводзілася таксама следства па гэтай справе. Але са службы Івана ўжо не вярнулі, паколькі ў Скідзельскай царкве нібыта з прычыны былога пажару не знайшлі яго метрыкі [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 3. С. 817. Скарга Івана Мазалеўскага на няправільную аддачу яго ў рэкруты. 1830 г.].

Несумненна, валасны старшыня сапраўды меў выключныя дзелавыя якасці. Як мы ўжо вышэй адзначылі, Мазалеўскі пачаў скупаць землі ў мясцовых памешчыкаў і неўзабаве ператварыўся магчыма ў самага буйнага ў Беларусі землеўладальніка сялянскага паходжання. Засталося тайнай, адкуль Мазалеўскі браў грошы на набыццё зямлі. У Скідзелі да гэтага часу захавалася паданне, што ён выпадкова знайшоў у лесе скарб паўстанцаў 1863 г. Але галоўным усё ж было тое, што Мазалеўскі здолеў вельмі добра распарадзіцца сваімі капіталамі. Ён неўзабаве пакінуў пасаду валаснога старшыні і

засяродзіўся на кіраванні вялізным маёнткам. Памёр Рыгор Мазалеўскі ў 1895 г. ва ўзросце 78 гадоў [Няпростымі і часам трагічнымі былі жыццёвыя лёсы нашчадкаў Рыгора Мазалеўскага. Яго ўнучка Любоў Іванаўна Мазалеўская (1903 – 1964) стала вядомай беларускай артысткай і тэатральным рэжысёрам. Яна вучылася ў Скідзельскім вучылішчы, у Гродзенскай гімназіі. У 1920 г. разам з Чырвонай Армія накіравалася на ўсход. Скончыла ў 1926 г. у Маскве Беларускую тэатральную студыю. Была арганізатарам і рэжысёрам Беларускага тэатра юнага глядача. Унука Рыгора Мазалеўскага Канстанціна, які служыў у часе нямецкай акупацыі ў паліцыі, расстралялі партызаны ў 1943 г.].

У 1875 г. валасным старшынём стаў жыхар Пяшчанкі Лявон Бубен. Летам 1878 г. Павел Гарошка, Гіляры Кемяжук, Кандрат Малашэвіч, Раман Скварнюк, Станіслаў Касарэвіч, Канстанцін Неўгень, Іван Гайдук, Якуб Кемяжук, Якуб Лабкоў і Іван Юркевіч напісалі гродзенскаму губернатару пісьмовую скаргу на няправільны выбар валасным старшынёй Лявона Бубена. Як сцвярждалі аўтары скаргі, калі міравы пасярэднік перад пачаткам выбараў запытаўся ў сялян, ці жадаюць яны абраць Бубена на новы тэрмін сваім старшынёй, дык нібыта ўсе сяляне адзінагалосна заявілі, што былы старшыня не адпавядае сваёй пасадзе. Аўтары скаргі пералічылі цэлы шэраг грахоў валаснога старшыні і прасілі губернатара прызначыць новыя выбары і “прекратить самовластие мирового посредника”. Міравы пасярэднік Аляксей Шахаў у сваю чаргу тлумачыўся, што выбары прайшлі абсалютна законна і справядліва, “никакого влияния с моей стороны на эти выборы оказываемо не было”, і ў выніку большасцю галасоў – 84 супраць 12 – быў абраны на паўторны тэрмін Лявон Бубен. У пацверджанне пасярэднік прыклаў пратакол выбарчага сходу. Цікава, што сярод 96 удзельнікаў галасавання налічвалася толькі 9 пісьменных сялян. Да іх ліку належалі і сааўтары скаргі – Павел Гарошка і Раман Скварнюк.

Павел Гарошка і Раман Скварнюк напісалі таксама скаргу віленскаму генерал-губернатару, які загадаў 24 красавіка 1879 г. начальніку гродзенскай губерні разабрацца з гэтай справай. Міравы пасярэднік Шахаў 2 верасня 1879 г. пісаў губернатару, быццам Павел Гарошка “по большей части занимается препровождением времени в корчме”. Тады Павел Гарошка и Раман Скворнюк 6 красавіка 1879 г. падалі кассацыйную скаргу ў Міравы з’езд. У гэтай скарзе падаецца надзвычай каларытнае і дэталёвае апісанне валасных выбараў. Прычым скарга была напісана вельмі эмацыйна і смела: “Чтобы публика присутствующая знала, за что мы обвиняемся, просим прочесть нашу настоящую жалобу вслух с начала до конца, не касаясь существенного нарушения закона, при разрешении сего дела... Посредник собрав сход в Скидельском волостном Правлении предложил выбрать Старшину и велел собравшемуся сходу выйти на четверть часа из волостного

правления и насовещавшися; сход обсудив предложение, и войдя в Волостное Правление объявил; старого старшины не желаем а на место его избрали крестьянина деревни Хватов Семена Невгеня. Г.Мировой Посредник Шахов спросил сход почему именно; тогда несколько лиц вышло на фронт пред Г.Посредника в том числе я Горошко 1-ый доказывал Г.Посреднику что старый старшина подчинил крестьян евреям, давая им по их собственным надобностям стойковые подводы для проездов по разным соседним местечкам и в г.Гродно безплатно... Для выборов старый старшина собрав сход в Волостном Правлении взял три ведра водки запер дверь Волостного Правления и напоив сход... составил приговор которым повысил жалованье для Волостного Писаря с каждого двора по 15 коп. сер."

Гарошка і Скварнюк сцвярджалі, што ў часе галасавання пасярэднік "велел Волостному Писарю брать домохозяев за клапаны сермяги и из толпы выводить по одиночке для утверждения старого Бубна старшиною на другое трехлетие, и когда писарь вывел половину то несколько сами перешли, а остальные ни суда, ни туда". Аўтары скаргі заявілі, што для сялян цяжкія не падаткі, але "тяжелые для нас распоряжения Г.Мирового посредника Шахова, старшины и писаря, последния лица, что нибудь выдумают, то прибавку жалованья, то починку Волостного Правления, то Еврейскую почту, на устройство последней Г.Мир. Посредник Шахов собрал сход в Волостное Правление запер дверь на замок и непременно требовал чтобы дали приговор Еврею и последний имел поставить почту при волостном правлении, но такие условия Боже упаси, Еврей драл бы деньги, а крестьяне возили бы евреев поэтому отказывались от составления приговора, а Посредник весь сход держал на замке, но впоследствии одного крестьянина члена схода Венедикта Лосевича заставила натура в волостном правлении снять портки, тогда Г.Посредник отпер дверь и крестьяне задыхнувшись едва успели выйти на двор". Сяляне сцвярджалі, што яны страцілі давер да старшыні і міравога пасярэдніка, а таму "держимся старого чтобы неохватили нас неграмотных новыми приговорами в том вся суть а не в платеже Государственных податей, да чем же крестьян обвинить, непременно надо его поставить ребром противу Государства, иначе ни Г.Посредник ни старшина и Писар не умеют обвинить и такая наша крестьянская доля".

Напярэдадні новых валасных выбараў 7 ліпеня 1881 г. сяляне Скідзельскай воласці Павел Гарошка, Андрэй Лабкоў, Іван Гайдук, Міхал Літвін, Якаў Кемяжук, Канстанцін Неўгень, Міхал Гайко і Рыгор Літвін даслалі новае прашэнне гродзенскаму губернатару, у якім скардзіліся на валаснога старшыню: "Служащий ныне Скидельским волостным Старшиною Леон Бубен в продолжение шести летней его службы много погубил крестьян, на последнее трехлетие он Бубен напросил выборов чтобы его выбрали опять в старшины ... ныне также предстоит выбор старшины и жена его объясняет крестьянским жителям что муж ея

будет старшиною без балтировки и во время уборки хлебов и сенокосов с полей будут старшине опять рабочие безплатно и на своем продовольствии работать. Ваше Превосходительство старшина имеет большой круг обработки земли от помещиков всей волости 20 под озимовый и 15 под яровой засев десят. И такое количество сенокоса на обработку его крестьян силком заставляют обрабатывать, а не пойди работать, научит их родственников своих побить, тот занесет жалобу старшине, а он сделает виновным того, потому что не пошел работать ему, вот где правосудие… и этой пагубе нет спасения” [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 1. С. 2296. Арк. 38-39. Скарга скідзельскіх сялян на няправільны выбар валаснога старшыні Бубена. 1878 г.].

Выбарны сход адбыўся 13 ліпеня 1881 г. у складзе 112 чалавек. Былы старшыня Лявон Бубен пры галасаванні набраў толькі 19 балаў, селянін вёскі Гарашкі Юры Навіцкі – 38, селянін вёскі Раўкі Самуіл Масюкевіч – 65, селянін вёскі Хваты Іван Багушэвіч – 97. Апошні і стаў валасным старшынёй з гадавым заробкам у 130 руб.

Але цяпер ужо былы старшыня Лявон Бубен, староста вёскі Пяшчанка Андрэй Шмойла і староста вёскі Оснікі Павел Яцко падалі 19 ліпеня 1881 г. скаргу губернатару на няправільныя выбары. Аказалася, што новы міравы пасярэднік Белазёрскі выдаліў Бубена са сходу: “Самые выборы производились ни то открытой, ни то закрытой баллотировкой. Положено было на стол две шапки, одна белая, а другая черная, и при них бобы, и было сказано, что кто желает прежняго Старшину – тот должен класть бобы в белую шапку, а кто не желает – в черную. Между те по невместимости волостного правления и духоты многие из крестьян находились в сенях и при начатом тотчас же противною стороною крике и шуме не могли слышать такового заявления, а некоторые может быть даже и не поняли его, так как подобный порядок выборов никогда в Скидельской волости не практиковался… Так когда стали по списку вызывать крестьян для кладки бобов в шапку, то, при вызове каждого, крестьяне этой партии неистово кричали: «в черную, в черную», а один из числа их главный руководитель и выборный Павел Горошко став у стола, дозволял себе даже падталкивать руку избиравшего и, подсказывая ему, направлял ее в черную шапку. Вызванный избиратель, будучи ошеломлен таким криком и гвалтом, не имея возможности ничего разобрать и не понимая сути дела под влиянием и напором и даже угрозами противной стороны, брал боб и бросал его без всякого сознания по указанию Горошки…”. Аўтары скаргі патрабавалі прызнаць выбары незаконнымі і правесці перавыбары. Міравы пасярэднік Белазёрскі 7 жніўня 1881 г. напісаў губернатару, што выбары былі правільнымі. Губернская прысутнасць таксама падтрымала яго.

6 лютага 1882 г. сяляне вёскі Гліняны Павел Гарошка, Ларыён Кемяжук і Восіп Гайко падалі гродзенскаму губернатару прашэнне “от всего люда Скидельской волости”. У гэтым прашэнні яны скардзіліся,

што “мировой посредник Шахов и Старшина Леон Бубен укрепостили всю волость помещику князю Четвертинскому и помещицы Багатко” [НГАБ у Гродне. Ф.10. В. 5. С. 817. Адмова сялян Скідзельскай воласці рамантаваць масты. 1882-1883 гг.]. Міравы пасярэднік Шахаў у сваё апраўданне назваў аўтараў скаргі нядобранадзейнымі асобамі і даў такую характарыстыку гэтых асобаў: “Всеми своими поступками личности эти всюду заявляли себя как ослушники распоряжений и требований начальства и подстрекатели к этому других крестьян. Но из всех их самые вредные Гарошко, Лобко и Кемежук и особенно первые двое. Личности эти, действуя всегда вместе и неразлучно, не занимаясь вовсе хозяйством, а занимаясь только одним пьянством, изыскивают все возможные средства и способы выдумывая сами и подговаривая другим крестьян к возбуждению разных дел, подач кляузных и ложных жалоб, искажая при этом самые факты или же приводя во все не бывалые и ложные. Андрей же Лобко находится при них как составитель всяких кляузных и несправедливых жалоб... Но что всего вреднее, так это то, что подговаривая крестьян к подаче таковых жалоб, личности эти нередко совсем в противоположном смысле толкуют им разные требования и распоряжения Правительства и начальства, приводя тем крестьян в сомнение, а иногда даже и к отказу от исполнения распоряжений и предписаний высших властей”.

Шахаў прасіў губернатара распачаць супраць “кляузников” крымінальную справу за абразу свайго гонару і паклёп. Але 15 лістапада сяляне Павел Канстанцінаў Гарошка, Іларыён Рыгоравіч Кемяжук, Фларыян Іванавіч Квяткоўскі і Канстанцін Лявонцьеў Мазалеўскі зноў скардзіліся губернатару на былога ўжо міравога пасярэдніка Шахава: “Г-н бывший Мировой Посредник... Шахов в продолжении его бытности нашим и верителей наших Мировым Посредником 12 лет прогонных денег никому за проезд не плотил, а вместо прогона платил толчками в шею” [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 5. С. 1819. Скарга сялян Скідзельскай воласці на міравога пасярэдніка Шахава. 1884 г.]. Таксама ў скарзе сцвярджалася, што Шахаў не выплаціў воласці 300 руб. за кватэру. Сяляне патрабавалі спагнаць з былога пасярэдніка ўсе запазычанасці. На гэтым скідзельцы не супакоіліся, і 15 лістапада яшчэ напісалі скаргу генерал-губернатару ў Вільну, у якой падрабязна пералічылі ўсе грахі Шахава: “Г.Шахов укрепостил Скидельскую волость в виде барщины возить пристава Ваврушевича по гостям... и разным разгулкам, жену пристава по разным гульбищам и секретаря Пристава по тем же надобностям... волостных стойковых лошадей давал в наем еврею М.Скидля Шепшелю и жене его для привоза их в сторонные места на торги без всякого вознаграждения подводчику от еврея”. Прычынай гэтых скаргаў на чыноўніка, якога на той час ужо не было ў воласці, паслужыла наступнае: “Дошло до слуха схода Скидельской волости, что б. Мирового Посредника... Шахова Г.Гродненский губернатор изволил сделать представление Вашему Высокопревосходительству о назначении

его вновь Мировым Посредником...”. Такім чынам, скідзельцы жадалі паквітацца з пасярэднікам, якога няўзлюбілі. Праўда, сялянам было рэкамендавана падаць на Шахава ў суд, што яны, хутчэй за ўсё, рабіць не сталі.

Трэба прызнаць, што выбранаму паводле справядлівага, наколькі можна меркаваць, галасавання, новаму валасному старшыні Багушэвічу не надта пашэнціла на гэтай пасадзе. 20 мая 1885 г. з’езд міравых пасярэднікаў паведаміў гродзенскаму губернатару, што яго пастановай ад 10 мая “скидельский волостной Старшина Богушевич, за нерадение по службе и нетрезвое поведение окончательно удален от должности” [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 5. С. 2189. Арк. 1. Аб выдаленні з пасады валаснога старшыні Багушэвіча]. Наколькі гэтае сцверджанне адпавядала рэальнасці, нам не вядома. Такі ж самы лёс спасцігнуў і наступнага скідзельскага старшыню Рыгора Труся. Міравы пасярэднік 1-га ўчастка Гродзенскага ўезда пісаў 28 красавіка 1888 г.: “Скидельский волостной старшина Григорий Трусь до того предался пьянству, что постоянно просиживает в шинках м.Скидля и даже по целым дням нельзя заставить его явиться в волостное Правление, чтобы добиться подписи срочных ведомостей или донесений. Во время разбора волостных судов сторону выигравшую дело сейчас зовет в шинок для получения с ней угощения и вследствие подобного поведения Старшины, всякия взыскания и исполнения по Скидельской волости приостановились...” [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 9. С. 620. Арк. 2 – 2 адв. Скарга Р.Труся на адхіленне яго з пасады валаснога старшыні. 1888-1889 гг.]. Аднак Рыгор Трусь 22 верасня 1888 г. абскардзіў пастанову міравога з’езду і сцвярджаў, што ён дабрасумленна стараўся выконваць свае абавязкі, а віна яго была ў тым, што старшыня не выдаў кватэрных грошай паліцэйскаму ўрадніку, паколькі валасным сходам “не ассигновано было таких денег”. Рыгор Трусь патрабаваў “допустить меня к моим обязанностям, на коих я избран вол. сходом”.

Выключную ролю ў дзейнасці валаснога самакіравання адыгрывалі пісары, якія напачатку нярэдка былі адзінымі пісьменнымі людзмі ў цэлай воласці пры непісьменных старшынях і суддзях. Таму часта менавіта ім належала сапраўдная ўлада. Паводле закону пісараў наймала воласць, але ў рэчаіснасці іх прызначалі на пасады міравыя пасярэднікі. У 1883 г. скідзельскім пісарам стаў Юліан Раімчык, які паходзіў з сялян Пескаўскай воласці Ваўкавыскага ўезда і раней працаваў народным настаўнікам. Яму быў вызначаны заробак 377 рублёў у год, а таксама 24 чвэрці жыта і 24 чвэрці бульбы ссыпкі ад сялян. Але міравы пасярэднік Бярэзін зняў Раімчыка з гэтай пасады. У лютым 1885 г. сяляне Павел Гарошка, Іларыён Кемяжук і Фларыян Квяткоўскі падалі гродзенскаму губернатару прашэнне з просьбай вярнуць у воласць пісара Раімчыка. Абвінавачаны Бярэзін напісаў губернатару падрабязны адказ на гэтую скаргу, у якім тлумачыў, што выдаліў Раімчыка за “крайний беспорядок”, а замест яго прызначыў

пісара суседняй Азёрскай гміны Раманоўскага. Па словах Бярэзіна, ён не толькі наведваў Скідзельскую валасць, але яшчэ і "арестовал при городской Полиции волостного старшину и несколько сельских старост", і якраз пры ранейшым пасярэдніку сяляне не атрымлівалі "разсудки". Губернатар стаў на бок пасярэдніка, а 21 красавіка 1885 г. скідзельскі валасны сход пастанавіў пакінуць пісарам Пятра Раманоўскага. У пастанове было запісана, што "о возврате б. писаря Юльяна Раинчика в нашу волость мы никогда поверенных с прошениями не посылали и на сей предмет доверенности никогда не давали". Гэты дакумент быў падпісаны новым валасным старшынёй Масюкевічам і пісарам Раманоўскім. Раманоўскага хутка змяніў на пісарскай пасадзе Ігнат Твардоўскі, які паходзіў з мяшчан мястэчка Тураў Мазырскага павета Мінскай губерні, а ў 1889 г. пісарам стаў селянін Пётр Адамовіч.

У 1888 г. у Скідзельскай воласці выдаткі на службовых асоб складалі суму 613 руб. У канцылярыю валаснога праўлення паступілі за той год 772 службовыя паперы, а з праўлення былі адпраўлены 1407 папер. У Скідзельскім валасным судзе за год разглядалася 41 справа, якія датычылі дробных крымінальных праступкаў, было 53 абвінавачаных. У выніку судовых пастаноў 6 чалавек пакаралі розгамі, 9 пасадзілі пад арышт, 29 прысудзілі грашовыя штрафы, а 17 чалавек апраўдалі. Усяго тры справы былі завершаны мірам паміж бакамі. Акрамя таго было яшчэ разгледжана 60 грамадзянскіх спраў па розных маёмасных спрэчках (пераважна зямельных). З іх ужо 10 завершылася палюбоўна, ці мірам [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 1. С. 2667. Арк. 29 адв. - 30. Ход сялянскай справы ў Гродзенскай губерні за 1888-1889 гг.].

За 1892 г. скідзельскім валасным судом разглядаліся 39 дробных крымінальных справаў. Паводле прысудаў адна асоба была пакараная розгамі, пад арышт пасаджана 7 чалавек, грашовымі штрафамі пакараныя 31 [НГАБ у Гродне. Ф. 14. В. 1. С. 265. Ведамасці міравых пасярэднікаў пра памеры падаткаў. 1892 г.]. І колькасць справаў у валасным судзе з гадамі ўзрастала. У 1914 г., напярэдадні сусветнай вайны, скідзельскім валасных судом разбіраліся ўжо 274 справы. Былі асуджаныя да розных пакаранняў і спагнанняў 97 мужчын і 15 жанчын [НГАБ у Гродне. Ф. 14. В. 3. С. 72. Арк. 18. [Статыстыка Гродзенскай губерні за 1910–1914 гг.].

З 1890 г. і да 1905 г. старшынём Скідзельскай воласці быў Мікалай Сыралевіч, які кіраваў дэспатычнымі метадамі. 10 мая 1902 г. селянін Георгі Іванавіч Чобат з Хвайнянаў падаў гродзенскаму губернатару скаргу на валаснога старшыню [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 7. С. 1525. Скарга селяніна Г.Чобата на валаснога старшыню. 1902 г.]. Ён пісаў, што Сыралевіч незаконна пасадзіў яго пад арышт на 2 сутак, не даваў ежы і пітва, а давалі яму "только грязной воды з дзегтем из глиняного черепа, где моют сапоги". Ад такой вады Чобат атруціўся, і яго званітавала. Старшыня з гэтага толькі насмяхаўся: "Наверное сала обожрался". Чобат жа пісаў, "что я и в настоящее время чувствую

расстройство желудка". У сваёй скарзе Чобат падрабязна апісаў і іншыя грахі старшыні Сыралевіча: "1) Взяты хабары старшиною Сыролевичем с крестьян села Черлены Семена Росича один пуд рыбы, палец бокового свиного сала, одного барана и 10 руб. деньгами за волостной суд, который он имел с противником своим; о чем имеется свидетельство крестьян д. Черлена Наум Русиновский и Яков Антонов Щасный. 2) Взято с крестьянина д. Хорцица с Николая Манкевича десять руб, свидетели по сему делу крестьяне той же деревни Иван Манкевич и крестьянин местечка Скидель Осип Мозолевский. 2) Старшина Сырелевич стянул на выпивку с крестьянина села Черлена Осипа Андреева Семенчени 6 руб. Свидетель посему делу крестьянин местечка Скидель Иван Лапыш. 3) Не выдача волостным старшиною пашпорта крестьянину деревни Русеновцов Василию Онуфриеву Самойлу и вместо пашпорта поколотил еще, за то, что Самойло не дал ему Старшине взятки, о чем имеются свидетели крестьяне деревни Русиновцев Макар Лукьянов Самойло и Лука Осипов Кивейша 4) Волостной старшина вмешивается в волостной суд заинтересован где получает хабарныя взятки, что и видно его интересы, дает с руки волостным судьям тянуть жребий, с которыми имеется сговор – 1-й, 2-й и 3-й нумера держит в руке выше остальных нумерей и прямо подает тем 3-м волостным судьям с которыми зарание сговорившийся, посему делу свидетели местные полицейские Урядники Каскевич и Градов, скидельский староста Лотыш и отставной фельдфебель деревни Хвойняны Тимофей Иванов Пышкайло. 5) Заявление крестьянами жалоб волостному старшине Сыролевичу дотех пор не принимает жалоб покуда заявитель не пропьет с им Старшиною руб. 20-30 и тогда только запиша жалобу и столько этим сделано по волости старшиною зла, что не возможно перечесть с чего и нажил громадный капитал и народ в таком угнетении, как под игом Турецким: на все выше изложенныя пункты подтвердять выше прописанныя мною свидетели". Уся ж гэтая гісторыя распачалася з таго, што Чобат падаў у валасны суд позву на ўдаву свайго памерлага брата Ульяну за знявагу яго словам. Георгі і Ульяна павінны былі дзяліць па-роўну харчовыя запасы з аднаго ўчастка зямлі, у тым ліку і зласчаснае сала, за якога і пасварыліся. 25 красавіка 1902 г. скарга Чобата была разгледжаная Міравым з'ездам, які прыйшоў да высновы, што большасць абвінавачанняў у бок старшыні не адпавядае сапраўднасці: "В отношении остальных обвинений лишь свидетели Тимофей Пышкайло да полицейский урядник Каскевич отчасти подтвердили жалобу". Пышкайла, напрыклад, сцвярджаў: "...если старшина узнает у кого есть деньги, то заставляет себя поить. Свидетели вместе со старшиною и другими крестьянами пьянствовали в безпатентном кабаке в м.Скидель у еврея Шмойлы в сентябре и октябре месяце 1901 г."Ураднік Каскевіч таксама паказаў, што старшыня падаваў жэрабя суддзям з сваіх рук, а "после окончания суда он с судьями и со стороною, выйгравшей в суде дело заходил в дом Шолома

Ента и там пьянствовали". Валасныя суддзі пацвердзілі, што цягнулі жэрабя з рук старшыні, аднак, заявілі пры гэтым, што апошні рабіў гэта па іх просьбе дзеля таго, каб не зацягваць справу, пры чым усё рабілася па-чэснаму. За гэты факт старшыня Сыралевіч быў пакараны штрафам у памеры 5 рублёў.

Міравы пасярэднік Сямёнаў апраўдваў валаснога старшыню: "Я не смогу вполне придать веры показаниям свидетелй, так как Николай Сырелевич состоит 12 лет в должности Скидельского волостного Старшины, награжден за службу двумя медалями, единогласно выбран в июле месяце 1899 г. на новое трехлетие в должность Старшины и за все время заведывания мною 1-м Мировым участком на действия его ни одной жалобы не поступило". Сыралевіч прабыў яшчэ тры гады на сваёй пасадзе і пажадаў у 1905 г. балатавацца ў чарговы раз, але прайграў выбары.

Вынікі гэтых выбараў зноў жа выклікалі спрэчкі і скаргі. У канцы лістапада 1905 г. гродзенскі губернатар атрымаў скаргу Мікалая Сяўрука і Карпа Броска на незаконнае зацвярджэнне земскім начальнікам на пасаду валаснога старшыні селяніна вёскі Хвайняны Васіля Чобата, у якой аўтары падрабязна апісвалі ход выбараў [НГАБ у Гродне. Ф. 18. В. 4. С. 433. Скарга на няправільныя выбары старшыні ў Скідзельскай воласці. 1905 – 1906 гг.]. Выбары гэтыя адбыліся 5 лістапада ў прысутнасці земскага начальніка графа Літке, які прапанаваў сходу абраць на новы тэрмін ранейшага старшыню Сыралевіча. Аднак сход "в виду его дерзкого характера и взяточничества, а также безпрерывного пьянства" абраў на пасаду старшыні селяніна мястэчка Скідзеля Канстанціна Мазалеўскага, "как человека достойного и заслуживающего внимания крестьян Скидельской волости", а кандыдатам на гэтую пасаду – Васіля Чобата з Хвайнянаў. Земскі начальнік абвесціў, што старшынёй усё ж будзе Чобат, і "чрез эту причину Волостной Сход поднял волнение окончившееся буйством ввиду нежелания схода иметь волостным Старшиною кр. Чобота". Сяўрук і Броска назвалі дзеянні земскага начальніка незаконнымі і прасілі губернатара зацвердзіць Канстанціна Мазалеўскага "и тем прекратить волнения крестьян Скидельской волости или прислать особого чиновника и произвести новые выборы, собрав всех крестьян волости, где будут доказаны все злоупотребления и неправильные действия Сырелевича поддерживаемого во всех отношениях Земским Начальником Графом Литке". Цікава, што аўтары скаргі Сяўрук і Броска былі непісьменнымі.

Земскі начальнік Літке ў сваю чаргу тлумачыўся губернатару 2 снежня 1905 г., "что давление было только со стороны крестьян из местечка Скиделя, составивших партию для выбора в Старшину из своей среды". Ён сцвярджаў, што асабіста апытаў усіх прысутных на сходзе, каго яны жадаюць мець на пасадзе старшыні, і высветліў, што ўсе, хто не местачковыя, аддаюць перавагу Чобату, але "запуганы со

стороны Скидельских и их опасаются". Таксама Літке свой выбар абгрунтоўваў тым, што Васіль Чобат быў гаспадаром-земляробам, а "Мозолевский лавочник и потому не так свободен для должности Старшины, особенно по большой Скидельской волости, где масса разсудок и дел... Семъя Чебота ни в чем не замечена и он представляется благонадежным человеком, тогда как семья Мозолевского – известна уже своей неблагонадежностью, а он сам на том-же сходе позволил себе сказать что я как начальник стесняю свободу данную Манифестом 17 октября – потому что его как и других не имеющих права голоса на сходе я не допустил к выборам и голосованию". Губернская прысутнасць 23 снежня 1905 г. зацвердзіла пастанову Скідзельскага сходу і стала на бок земскага начальніка.

На той час жалаванне валаснога старшыні ў Скідзелі складала 127 руб. у год, валасны пісар атрымліваў 415 руб., старшыня валаснога суда 60, а суддзі – па 36 руб. Усе гэтыя выдаткі звычайна зацвярджаліся валасным сходам у канцы года. Але бюджэт Скідзельскай воласці на 1906 г. своечасова не быў прыняты з-за адмовы сялянаў фінансаваць сельскія вучылішчы. Прыйшлося ў канцы студзеня зноў збірацца і пановаму абмяркоўваць выдаткі. Тады права голасу мелі ўсяго 128 асобаў, а прынялі ўдзел у сходзе 90 чалавек [НГАБ у Гродне. Ф. 305. В. 1. С. 14. Арк. 40. [Прыгаворы валасных і сельскіх сходаў Гродзенскага ўезда].

У снежні 1908 г. губернатару прыйшла скарга сялян Скідзельскай воласці Аляксея Лабко, Івана Гуліды і інш. (усяго пад прашэннем было пастаўлена 32 подпісы, пераважна жыхароў вёскі Гліняны) на незаконнае абранне 11 лістапада таго году на пасаду старшыні Якуба Жука [НГАБ у Гродне. Ф. 18. В. 4. С. 1059. [Скарга на няправільныя выбары старшыні Скідзельскай воласці. 1908 г. – 1909 г.]. Аўтары скаргі сцвярджалі, што "вся волость, выборы, а равно и все домохозяева несогласны дабы он (Жук – аўтары) был старшиною, как он по своим недобросовестным и незаконным поступкам недостоен быть старшиною, и доверия о волостных имуществах и суммы мы на его не можем иметь". Лабко і Гуліда патрабавалі правесці праверку валасных фінансаў, а таксама сцвярджалі, што Жук з'яўляецца нядобранадзейнай асобай.

16 студзеня 1909 г. сваю версію падзей выклаў земскі начальнік 5-га ўчастка Дзмітрыеў. Ён сцвярджаў, што "жалоба названных лиц вызвана деятельностью Жука как по исполнении решений волосного суда и по взыскании ссудного и мирского капиталов и штрафов с крестьян волости. Недоимок этих взысканий а равно не исполненных решений по Скидельской волости числилось более чем за 10 лет и только благодаря деятельности Жука решения волостного суда, которых было не исполнено до 300, в настоящее время почти все приведены в исполнение; также взыскано много недоимок, как мирского и других сборов, так и просроченного ссудного капитала и штрафов, несмотря на то, что волость Скидельская одна из больших волостей Гродненского

уезда, как по своей территории так и по количеству населения... благодаря энергии названного Жука крестьянами Скидельской волости было составлено несколько приговоров о высылке из среды обществ крестьян, угрожавших общественному благосостоянию, и по высылке этих крестьян в течение минувшего 1908 г. в пределах Скидельской волости не произошло никаких безпорядков, чем раньше отличалась эта волость”.

Такім чынам, сялянскае самакіраванне з'яўлялася арэнай амаль несупыннай барацьбы, пакутавала ад карумпаванасці службовых асобаў. Але, з другога боку, у архіўных дакументах якраз і захаваліся найперш звесткі пра канфлікты і ўяўныя ці сапраўдныя факты карупцыі. А ў рэчаіснасці валаснoе праўленне выконвала таксама вельмі шмат патрэбнай сялянам працы. Ды і тыя ж канфлікты адлюстроўвалі рост прававой самасвядомасці мясцовых жыхароў, іх зацікаўленасці ў грамадскіх справах, жадання адстойваць свае інтарэсы і ўменне аб'ядноўвацца і актыўна дзейнічаць дзеля гэтага.

## Царква і школа

У жыцці традыцыйнага сялянскага грамадства рэлігія адыгрывала надзвычай важную ролю, а царква была адным з галоўных сацыяльных інстытутаў. Скідзель, як і большасць мястэчак Беларусі, з'яўляўся цэнтрам царкоўнага прыхода. Сюды на рэлігійныя святы і ў звычайныя выходныя дні збіраліся на набажэнства тлумы народу з ваколічных вёсак. Людзі сустракаліся, размаўлялі, абменьваліся навінамі. Гэта служыла фактарам кансалідацыі лакальнай сялянскай супольнасці, наладжванню патрэбных сацыяльных сувязяў. Большасць жыхароў Скідзельшчыны, як і большасць тагачаснага насельніцтва Беларусі, у першай траціне XIX ст. належала да грэка-каталіцкай ці уніяцкай канфесіі і з'яўлялася прыхаджанамі Скідзельскай Пакроўскай царквы. Філіяй гэтай царквы была Катранская царква св. Юрыя каля вёскі Гушчыцы. Значна меншая частка жыхароў Скідзеля належала да рыма-каталіцкай канфесіі і з'яўлялася парафіянамі касцёла ў маёнтку Кашубінцы, які быў філіяй Азёрскага касцёла. Ніякіх канфліктаў ці спрэчак на рэлігійнай глебе не ўзнікала, прынамсі нам на гэты конт ніякіх звестак не патрапіла.

У 1832 г. настаяцелем скідзельскай уніяцкай царквы з'яўляўся святар Восіп Імшэнік, які паходзіў з “вольных людзей” Брэсцкага павета Гродзенскай губерні [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 27. С. 230. Арк. 97 адв.]. Паводле дадзеных губернскай адміністрацыі за 1838 г., прыхаджанамі скідзельскай царквы былі прыватнаўласніцкія сяляне княгіні Чацвярцінскай (2208 душ абодвух палоў у вёсках Беляноўшчына, Гліняны, Карашава, Некрашы, Рыскі, Сухаўляны, Хваты і ў самім Скідзелі), Парчэўскага (912 душ у вёсках Гарашкі, Раўкі, Стральцы), Друцкага-Любецкага (360 душ у Русінаўцах), Кахоўскай (912 душ у Каўшове, Пузавічах і Хвайнянах), Валіцкага (328

душ у вёсцы Мазанава), Брауна (144 душы ў вёсцы Агароднікі), Багаткі (280 душ у Гушчыцах і Кашубінцах), Ваўкавыцкага (56 душ), Татароўскага (72 душы ў Тарасюках), а таксама 336 казённых сялян (Стральцы, Пяшчанка, Хвайняны) і 16 чалавек дробнай шляхты з ваколіцы Жукі [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 19. С. 1752. Арк. 5-4. Аб перабудове ўніяцкіх цэркваў у Гродзенскім і Лідскім паветах. 1838 г.].

У 1839 г. грэка-каталіцкая царква была далучана да праваслаўнай. Для ўладаў Расійскай імперыі гэта мела велізарнае ідэалагічнае значэнне. Яны разглядалі беларусаў уніяцкага вызнання як частку адзінага рускага народу і бачылі скасаванне уніяцтва як важны крок на шляху іх поўнай і канчатковай асіміляцыі. Як адбываўся пераход з уніятаў у праваслаўе на Скідзельшчыне, ніякіх звестак нам знайсці не ўдалося. Пасля паўстання 1863 г. расійскі ўрад разглядаў праваслаўе як сваю ідэалагічную апору на беларускіх землях і прыкладаў вялікія намаганні для паляпшэння становішча духавенства і знешняга выгляду храмаў. Напрыклад, у 1865 г. з'яўляецца праект пабудовы ў Скідзелі новай мураванай царквы замест ранейшай драўлянай.

У сакавіку 1865 г. епіскап брэсцкі Ігнаці звярнуўся да гродзенскага губернатара з прапановай пабудаваць у Скідзелі новую мураваную царкву. Паводле ранейшага плану, прадугледжвалася будаўніцтва новай царквы ў вёсцы Цэцяроўка Гродзенскага ўезда, на што было выдзелена ўрадам 4 тыс. рублёў. Епіскап Ігнаці прапаноўваў абмежавацца ў Цецяроўцы рамонтам старой, але яшчэ трывалай драўлянай царквы, а рэшту грошай – 3 тыс. руб., перадаць на будаўніцтва новай мураванай царквы ў Скідзелі. Неабходнасць гэтага ён падмацоўваў наступнымі аргументамі: "Гродненского же уезда в м. Скидель приходская деревянная церковь очень не вместительна для многолюдного прихода в 5000 слишком душ обоего пола предположена к увеличению вырезкою передней стены для прибавления нынешняго притвора с пристройкою к нему нового в меньшем размере: каковую перестройку принял на себя вотчинник имения князь Четвертинский. Прибавление сказанного притвора в церкви довольно узкой и низкой ни мало не увеличит пространство ея так как и ныне в праздники народ стекается к Богослужению, занимая и сказанный притвор, не помещается внутри, и очень многие находится вынуждены стоять вне храма на церковном погосте. Необходимо затем требуется в м.Скидель чрез которое вблизи церкви на площадь проходит из Гродна почтовая дорога в Лиду, Новогрудок и Волковыск, более общирный и благолепный храм Божий на том же видном месте, где ныне существует деревянная небольшая с низкою гонтовою крышею и по давности постройки довольно непрочная церковь... По сим причинам в М.Скидель при почтовой дороге большая предстоит необходимость в постройке каменной, благолепной и обширной церкви, нежели в Цецеровском малочисленном приходе..." [НГАБ у Гродне. Ф. 845. В. 1.

С. 19. Арк. 25 - 25 адв. Аб рамонце праваслаўнай царквы ў м.Скідзель. 1865 г.]. Гродзенскі губернатар Скварцоў пагадзіўся з аргументамі епіскапа Ігнація і загадаў скласці рахунак на будаўніцтва мураванай царквы ў Скідзелі, разлічанай на 800 прыхаджан.

У сваю чаргу ўладальнік маёнтка Скідзель князь Чацвярцінскі 10 красавіка 1865 г. звярнуўся ў гродзенскае праўленне з такім лістом: "Пасля працяглых неўраджаяў, гадоў дзесяць таму, былым маім сялянам як прыхаджанам Скідзельскай царквы прадбачвалася неабходнасць перабудаваць яе. Пакутуючы ад голада і харчуючыся хлебам, які купляўся за мой кошт, яны не былі ў стане панесці выдаткі для гэтай работы, на што я ў палёгку сялянам ахвяраваў з уласных грошай 550 рублёў серабром. Рамонт зроблены быў старанна, узняты ўвесь будынак, пакладзены падрубы з трывалага матэрыялу, пастаўлены новыя кроквы і дах накрыты нанава... Царква прыведзена была б у добры стан і прастаяла б доўгі час. Але калі праект узвядзення новай мураванай царквы пастаўлены і не адменены, так што мая нарада не можа мець места, то са сваяго боку я рады ахвяраваць на гэты прадмет падрыхтаваны мною драўляны матэрыял, які ляжыць пры царкве, і акрамя таго грошай 200 руб."

Гродзенскі губернатар звярнуўся 25 мая 1865 г. да генерал-губернатара Мураўёва з просьбай задаволіць хадатайніцтва епіскапа Ігнація. Праект храма на 800 прыхаджан быў распрацаваны архітэктарам Ціхвінскім і пададзены ў губернскае праўленне 3 лістапада 1867 г. Для ажыццяўлення гэтага будаўніцтва каля Скідзеля архітэктар Міхаэліс нават спраектаваў цагляны завод, а 200 рублёў на яго ўзвядзенне было адпушчана ўрадам з кантрыбуцыйных сум, накладзеных на памешчыкаў каталіцкага вызнання пасля паўстання 1863 г. А ў жніўні 1865 г. прыхаджане скідзельскай царквы па загаду ўладаў сабралі 127 рублёў на набыццё звона ў памяць аб "усмирении" паўстання 1863 г. Аднак праект пабудовы новага храма так і не быў рэалізаваны з прычыны яго высокага кошту. Адыгралі сваю ролю тыя абставіны, што ў Скідзелі не было каталіцкага касцёла, а таму адсутнічаў матыў супрацьпастаўлення праваслаўя і каталіцтва, які для расійскіх уладаў быў вельмі важным.

Ідэя пабудаваць у Скідзелі новы мураваны храма яшчэ раз узнікла ў 1914 г. Быў нават распрацаваны архітэктурны праект гэтага храма ў папулярным тады сярод праваслаўнага духавенства неарускім стылі (арыентаваўся на культавае дойлідства Маскоўскай дзяржавы XV-XVI стст.). Рахунак будаўніцтва склаў суму 34249 руб. [НГАБ у Гродне. Ф. 8. В. 2. С. 2907. Арк. 1-33. [Праект мураванай царквы ў м.Скідзель. 1914 г.]. Але неўзабаве выбухнула сусветная вайна, і гэты праект таксама не быў рэалізаваны.

Была адрамантаваная ў 1860-х гадах таксама і старажытная Юрьеўская царква. 12 мая 1864 г. міравы пасярэднік Хацяінцаў напісаў ліст да начальніка губерні з просьбай дапамагчы ў яе рамонце: "В

Скидельской волости в близи самаго местечка находится древняя Православня Церковь Св. Георгия Победоносца, пользующаяся большим уважением, в доказательство чего с незапамятных времен на день Св. Георгия туда стекается ежегодно до трех и четырех тысяч народа к служению молебствия и поклонению Св. угоднику. Ныне по ветхости, воздвигнутый уже более трехсот лет и без всякого поддержания храм приходит в разрушительное состояние. Желая поддержать сей древний храм я обращался к владельцу местечка Князю Четвертинскому, покойныя братья коего похоронены под сею церковью, и он согласился пожертвовать 60 дерев на обшивку тесом и поправку крыши, но едва-ли сего дерева достаточно будет на сей предмет. На прочия же расходы у Благочинного Протоиерея Антония, много способствующего и собственными трудами к поддержанию и благолепию Православных Церквей есть лишь сумма до ста рублей, но весьма неудовлетворительная на покрытие предвидимых издержек. Крестьяне собственники еще в недавнее время пожертвовали по 30 коп. со двора на колокол в означенную Церковь и при всем желании стеснены быть полезными кроме собственного труда, от коего они неотказываются, а посему считаю святым долгом ходатайствовать пред Вашим Превосходительством не найдете ли возможным оказать денежное пособие от казны на поддержание означенной Церкви в сумме до шестисот рублей" [НГАБ у Гродне. Ф. 97. В. 1. С. 41. Арк.1-21. [Аб рамонце царквы св. Юрыя. 1864-1870 гг.].

Губернатар Скварцоў у сваю чаргу звярнуўся да епіскага Брэсцкага Ігнація. 23 мая 1864 г. апошні адпісаў яму: "...сказанная древняя церковь, состоящая в Скидельском приходе, при почтовой дороге, при неименью средств к поддержанию ея пришедшая в ветхость, необходимо нуждается в капитальной починке, а преимущественно в исправлении стен, и обшивке их тесом, в новой гонтовой крыше, настилке досчатого пола, на место нынешнего испорченного кирпичного, в новом приличном Иконостасе, вместо нынешняго весьма бедного и неблаговидного; и в новой приличной из булыжного камня ограде, так как ныне, кроме рва уже засыпавшегося никакой ограды не имеется". У ліпені таго ж году царкву агледзелі прадстаўнікі ўезднага царкоўна-будаўнічага камітэта, якія прыйшлі да наступнай высновы: "Два нижние венца и прочие в стене южной стороны оказавшихся совершенно сгнившими нужно заменить новыми на 85 погонных саженей. Рызницу как не приличную и неблаговидную пристройку на самом виду с почтоваго тракта следует разобрать яко во все не нужную. Все покоробившиеся стены выпрямить и скрепить оныя еще 4 склепами. Вместо ветхой и неблаговидной формы Башню построить новую. Крышу церкви покрыть новым Гонтом. Стены с наружи церкви и башню обшить досками. Сем оконных переплетов, вместо ветхих и безобразных, новые сделать с надлежащими наличниками. Каменный цоколь облицевать осколками на извести. Во

внутри церкви стены и потолки выбелить крышу и стены с наружи с башнею, двери и оконные переплеты выкрасить на масле. Иконостас с иконами и крылосами новый сделать". Быў складзены каштарыс рамонту на 709 руб. серабром.

Праўда, 23 кастрычніка 1864 г. царкоўна-будаўнічы камітэт прыйшоў да наступнай высновы: "Так как план на исправление сказанной св.Георгиевской Церкви составлен довольно изысканно, и то по желанию бывшаго члена сего Камитета Мирового Посредника Хотяинцева, имевшаго в виду какия-то особенные средства на изящную отделку сей церкви, то за устранением Г.Хотяинцева, считать ныне выполнение сего плана необязательным" [НГАБ у Гродне. Ф. 845. В. 1. С. 19. [Аб рамонце праваслаўнай царквы ў м.Скідзель. 1865 г.]. На працягу другой паловы 1860-х гадоў рамонт Юр'еўскай царквы быў зроблены. Аднак, у 1870 г. губернская кантрольная палата прыйшла да высновы, што плата за направу іканастаса была завышаная на 30 руб., бо майстру, адстаўному салдату Платону Шароўнікаву заплацілі 200 руб. замест 170, як прадугледжваў каштарыс. Скідзельскі благачынны Антоні Будзіловіч адказваў, што на "расчетную сумму 170 руб. из мастеровых никто не соглашался брать на себя постройки иконостаса", таму заключаны быў кантракт з Шароўнікавым на суму 200 руб. Пасля гэтага рамонту Юр'еўская царква, збудаваная яшчэ ў першай палове XVI ст., прастаяла да другой паловы XX ст. Як вынікае з тэксту архіўных дакументаў, у гэтай царкве хавалі сваіх памерлых ўладальнікі Скідзеля князі Чацвярцінскія. Пазней, у 1870 г. яны збудавалі непадалёку ад свайго палаца мураваную каталіцкую капліцу ў неагатычным стылі, у падмурках якой быў зроблены фамільны склеп.

У 1860-х гадах праваслаўнымі святарамі ў Скідзелі былі Антоні Будзіловіч і Іван Хамічэўскі. Пазней А.Будзіловіча перавялі ў Вялікую Бераставіцу, а І.Хамічэўскага – у Радзівонішкі (а потым у Лунна). У канцы XIX – на пачатку XX ст. настаяцелямі Скідзельскага прыхода былі Іван Гашунін, Дзмітры Някрасаў, Сцяпан Прыселкаў, Іосіф Гушкевіч. У Катранскай царкве св.Юрыя, якая была прыпісной да Скідзеля, некалькі дзесяцігоддзяў святаром быў Ніканор Канстанцінавіч Пракаповіч. У 1900 г. яго змяніў Васіль Урублеўскі.

З інстытутам рэлігіі быў цесна звязаны напачатку і інстытут народнай адукацыі, паколькі першыя школкі звычайна ўтвараліся пры храмах. Як мы ўжо вышэй адзначалі, ужо пры заснаванні мястэчка ў сярэдзіне XVII ст. быў адведзены пляц для школкі. Але пра яе існаванне ніякіх звестак няма. У першай палове XIX ст. на Скідзельшчыне былі пісьменныя сяляне. Так, касірам фальварка Скідзель быў селянін Гайко з Глінянаў, пісарам – Свёкла з той жа вёскі, умеў пісаць і чытаць першы валасны старшыня Рыгор Мазалеўскі. Нам невядома, дзе яны навучыліся грамаце. Магчыма, што Чацвярцінскія пры маёнтку арганізавалі школку для сялянскіх дзяцей, як гэта рабілі многія памешчыкі.

Дзяржаўнае народнае вучылішча ў Скідзелі было ўтворана ў 1860 г. У 1862 г., як сведчаць дакументы, яго настаўнікам быў праваслаўны святар Іван Хамічэўскі. Але сяляне неахвотна аддавалі сваіх дзяцей у навуку. Хамічэўскі нават напісаў ліст папячыцелю Віленскай навучальнай акругі князю Шырынскаму-Шыхматаву, у якім скардзіўся на мясцовыя ўлады, што тыя не аказваюць яму ніякай дапамогі ў справе арганізацыі вучылішча. Калі святар прыйшоў у валаснае праўленне, дзе сабраліся для нарады вясковыя старасты, і звярнуўся да прысутных з просьбай загадаць сялянам аддаваць сваіх дзяцей у школу, дык тыя адказалі яму: "Будет время когда выпадет снег, а местный старшина перебил разговор священника и обратился к другим предметам". Хамічэўскі таксама паведамляў, што ў вёсцы Гліняны адстаўны салдат Антон Савіцкі заснаваў прыватную школу, дзе вучыць дзяцей без дазволу ўладаў. Шырынскі-Шыхматаў напісаў гродзенскаму губернатару, а той загадаў разабрацца з гэтай справай мясцоваму міравому пасярэдніку. Апошні паведамляў у Гродна, што ў лістападзе 1862 г. у Скідзельскім вучылішчы налічвалася ужо 40 дзяцей. Адстаўному салдату Інгерманландскага палка Антону Казіміраву Савіцкаму было забаронена займацца навучаннем дзяцей. Гэты Савіцкі быў родам з Мінскай губерні, як ён апынуўся ў Глінянах і што сталася з ім пазней, нам невядома.

А 20 снежня 1862 г. Хамічэўскі даслаў Шырынскаму-Шыхматаву справаздачу пра стан вучылішча, далучыўшы ўласныя развагі адносна перспектыў народнай адукацыі на Скідзельшчыне: "Представляя при сем Вашему Сиятельству полугодичную отчетную ведомость о состоянии Скидельского народного училища, честь имею донести: что крестьяне здешней местности, особенно живущие в М.Скидель и ближних деревнях еще слишком пропитаны польским духом, так что несчитают большим для себя благодеянием заведенное здесь училище когда в нем не учат Польскому языку; а потому в следующем учебном году еще нельзя надеятся, чтобы они согласились нанять дом под училище и отапливать его на свой счет. По моему мнению, нельзя приступать к разсуждению с ними об этом предмете до тех пор пока они не убедятся в несомненной пользе для них детей образования, кода уже не нужно будет просить их отдавать в школу детей, а сами они охотно будут того желать, наконец мне гораздо легче было бы действовать на народ и доказывать ему пользу обучения Русской грамоте и в духе православном, если бы ближайшие его начальники мировые посредники, волостные писаря не были католики или псевдо-православные каков местный Старшина, и если бы дела в Волостных управлениях производились не на Польском а на русском языке" [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 27. С. 1637. Арк. 9 – 9 адв. Скарга святара І.Хамічэўскага на адмову валаснога праўлення садзейнічаць у арганізацыі народнага вучылішча. 1862 г.].

У 1862 г. Скідзель наведаў сам папячыцель Віленскай навучальнай акругі князь Шырынскі-Шыхматаў і пабываў у мясцовым вучылішчы. Праўда, дакладная дата гэтага візіту нам невядомая. Тады валасны старшыня Рыгор Мазалеўскі, паводле сцверджання святара Івана Хамічэўскага, "...просил его дозволить препадавать ученикам польский язык для того чтобы они могли молиться по Польским молитвенникам как привыкли молиться их деды и прадеды и когда Г. Попечитель старался доказать ему безполезность изучения крестьянскими мальчиками польского языка, то Мозолевский, утверждая свое мнение не осторожно выразился о настоящих Правительственных распоряжениях, например, в роде того, что в былое время под Польским Правительством крестьянам здешнего края жилось гораздо лучше и проч." [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 34. С. 1216. Аб устанаўленні паліцэйскага нагляда за Рыгорам Мазалеўскім. 1863-1868 гг.].

Мы ўжо вышэй распавядалі пра тое, што гэтая справа ледзве не каштавала Мазалеўскаму высылкі ў Сібір. Пад час яе расследавання 2 лютага 1865 г. былі дапытаныя бацькі вучняў народнага вучылішча: староста вёскі Некрашы Піліп Халецкі, стараста Глінянаў Міхал Кемяжук, стараста Сухаўлянаў Міхал Пласкевіч, сяляне Некрашоў Казімір Ватыль, Станіслаў Даўгун, Андрэй Халецкі, Сцяпан Кемяжук, Васіль Даўгун, Антон Фурман, Сымон Стальбоўскі, Матэуш Бедыс, сяляне Сухаўлянаў Юры Ватыль, Сільвестр Ватыль, Васіль Змітровіч, Сцяпан Дарошык, сяляне Глінянаў Аляксандр Лабко, Рыгор Машэй, Сымон Гайко. Паліцэйскі прыстаў жадаў даведацца, "просили ли они о преподавании их детям вместе с Русским и Словянским Польского языка". Адказ сялян быў наступным: "...все они единогласно отозвались что действительно просили в Канцелярии Волостного Управления при бытности Старшины Г. бывшаго Исправника Магнуса, Полковника Фадеева и Господина Попечителя Народных Училищ о преподавании если возможно вместе с Русским и Славянским польского языка; но когда в этом им отказано и они остались убежденными, что Русскому человеку довольно знать Русский язык; то они с охотою отдали своих детей в народное Училище".

Жаданне сялян вывучаць польскую мову было абумоўлена тым фактам, што гэтая мова ў той час лічылася "панскай". На ёй размаўлялі памешчыкі – эліта тагачаснага грамадства. За імі цягнуліся падпанкі – дробная шляхта, якая служыла пры фальварках у якасці эканомаў, цівуноў і стражнікаў. А паводзінам шляхты наследавалі ўжо тыя з сялянскіх вярхоў, хто меў больш высокі статус – войты, старасты, панскія лакеі, паліцэйскія служкі. Беларуская мова, на якой размаўляла сялянскае насельніцтва, ды і тая ж самая дробная шляхта, лічылася "простай", "мужыцкай", вартай толькі для штодзённага ўжытку ў сялянскім жыцці, а не для навукі. А галоўным было тое, што сяляне Беларусі ў XIX ст. ужо і маліліся на польскай мове і слухалі на ёй казанні ў цэрквах. Пасля паўстання 1863 г. месца польскай мовы пачала

паступова займаць расійская, для чаго вялізныя намаганні прыкладалі дзяржаўныя ўлады.

Стан пісьменнасці жыхароў Скідзеля на той час быў вельмі нізкі. Паводле дадзеных губернскай адміністрацыі, у 1869 г. у Скідзелі ўмелі чытаць і пісаць па руску 8 мужчын і 5 жанчын, а толькі чытаць – 15 мужчын і 6 жанчын [НГАБ у Гродне. Ф. 14. В. 3. С. 83]. Праўда, тут трэба ўлічваць той факт, што да рэформаў 1860-х гадоў навучанне грамаце ў Беларусі пераважна ажыццяўлялася на польскай мове. Таму, напэўна, рэальная колькасць пісьменных людзей у мястэчку была ўсё ж значна вышэйшай. Асабліва квітнела яўрэйская адукацыя. Паводле дадзеных губернскай адміністрацыі, у 1870 г. у Скідзелі налічвалася 10 настаўнікаў яўрэйскай граматы, у якіх навучаліся 58 дзяцей [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 27. С. 2387. Арк. 235]. Для яўрэйскага насельніцтва Беларусі ўжо на той час характэрнай была амаль усеагульная граматнасць.

Народная адукацыя ў другой палове XIX ст. дасягнула значных поспехаў. У 1886 г. у Скідзелі дзейнічала народнае вучылішча, дзе выкладаў Закон Божы мясцовы святар Дзмітры Някрасаў, а ў воласці налічвалася 12 царкоўна-прыходскіх школ, у якіх настаўнічалі мясцовыя сяляне [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 17. С. 978. Арк. 5-7]. Напрыклад, у Раўках настаўнікам быў Фёдар Навіцкі, у Русінаўцах – Іван Кніга, у Глінянах – Пётр Парай.

Прыкладна каля 1878 г. настаўнікам народнага вучылішча ў Скідзелі стаў Канстанцін Восіпавіч Крышэнь. Нарадзіўся ён, як можна меркаваць на падставе пасямейнага спіска, каля 1852 г., паходзіў з сялян Гродзенскага ўезда, скончыў настаўніцкую семінарыю [Звесткі пра настаўніка Канстанціна Крышэня ўзятыя намі з дакументаў сямейнага архіва яго праўнука Канстанціна Сяргеевіча Федаровіча, які ласкава дазволіў імі карыстацца]. Канстанцін Крышэнь кіраваў Скідзельскім народным вучылішчам аж да першай сусветнай вайны. 30 верасня 1908 г. ён атрымаў віншавальны ліст ад дырэктара Свіслацкай настаўніцкай семінарыі М.Сакалова ў сувязі з 30-гадовай настаўніцкай працай. У гэтым лісце былі такія радкі: “Приветствуем и как учителя, подготовившего немало питомцев для нашей семинарии, которые никогда не роняли достоинства своего учителя и молим Бога, чтобы они в любви и преданности делу народной школы шли путем своего первого учителя”. Такім чынам, паводле гэтага лісту, нямала вучняў скідзельскай школы пайшлі ў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю і сталі народнымі настаўнікамі. За сваю працу ў якасці народнага настаўніка Крышэнь атрымаў званне спадчыннага ганаровага грамадзяніна, якое перадавалася і яго дзецям.

Канстанцін Крышэнь быў руплівым і гаспадарлівым кіраўніком вучылішча. Ён ажаніўся на дачцы мясцовага святара Еве. Дзякуючы гэтаму шлюбу атрымаў ва ўласнасць ад цесця добры пляц і хату на беразе рэчкі Скідлянкі. Там жа арганізаваў агранамічны ўчастак для

сваёй школы. Крышэнь быў аматарам садаводства і гароднiцтва, разводзiў пчолаў. Калi ў часе першай сусветнай вайны лiнiя фронта наблiжалася да Скiдзеля, 9 жнiўня 1915 г. сям'я Крышэня накiравалася ў бежанства. Тады настаўнiк, як i iншыя бежанцы, склаў падрабязны вопiс сваёй рухомай i нерухомай маёмасцi. Гэта надзвычай цiкавы дакумент, якi пралiвае святло на асаблiвасцi жыцця i побытку местачковай iнтэлiгенцыi таго часу. Нерухомую маёмасць сям'i Крышэняў складалi: 1) Сядзiба памiж Новай вулiцай i ракой Скiдлiцай – 183 саж. i памiж сядзiбамi Амбрушкевiча i Рэкеця 18 саж. – 5000 руб. 2) Драўляны дом – 1500 руб. 3) Каменны склеп – 200 руб. 4) Амбарны склеп – 100 руб. 5) Сарай з трыма аддзяленнямi – 1000 руб. 6) Сарай для дроў – 50 руб. 7) Драўляны плот з трох бакоў сядзiбы: пры вулiцы, пры сядзiбах Амбрушкевiча i Рэкеця с абодвух бакоў да ракi – 400 руб. 8) Фруктовы сад па абодвух баках ад дому – 200 руб. 9) Вольхi каля ракi – 200 руб. 10) Драўляны плот каля двору – 100 руб. Уся нерухомасць Крышэняў ацэньвалася сумай 10034 руб.

Да нерухомай маёмасцi належалi: карова (150 руб.), цялё (30 руб.), 2 свiннi (50 руб.), 18 парасятаў (90 руб.), 10 курэй (5 руб.), 4 качкi (2 руб. 40 кап.), а таксама мэбля, адзенне (на 80 руб.), посуд, кнiгi (на 75 руб.) i прылады працы. Уся рухомая маёмасць Канстанцiна Крышэня ацэньвалася сумай 1234 руб. 55 кап. Несумненна, што сям'я настаўнiка належала да лiку заможных сем'яў мястэчка.

Школа пачынала адыгрываць усё болей значную ролю ў жыццi скiдзельцаў. Дзякуючы набытай адукацыi многiя сяляне атрымлiвалi новыя прафесii, станавiлiся настаўнiкамi, паштовымi, тэлеграфнымi i чыгуначнымi служачымi, палiцэйскiмi i дробнымi дзяржаўнымi чыноўнiкамi. Такiм чынам, школа давала добрую магчымасць сацыяльнага поспеху.

На пачатку ХХ ст. у Скiдзелi дзейнiчалi ўжо два народных вучылiшчы. Тады ж у мястэчку з'яўляюцца i кнiгарнi. У 1908 г. хатняя настаўнiца Далiнская хадайнiчала перад губернскiм начальствам аб дазволе адчынiць у мястэчку прыватны кнiжны магазiн i бiблiятэку. Дазвол быў дадзены з умовай продажу толькi дазволенай цэнзурай лiтаратуры на рускай мове. Але пазней Далiнскай дазволiлi гандляваць таксама кнiгамi на нямецкай, французскай, польскай, яўрэйскай i лацiнскай мовах, а таксама ўсiмi тымi кнiгамi, якiя неабходныя для навучання ў школьных установах.

### Скiдзельскiя яўрэi

У XIX ст. галоўную ролю ў гаспадарчым жыццi Скiдзеля пачала адыгрываць местачковая яўрэйская супольнасць. Паводле дадзеных рэвiзii 1816 г. (напэўна занiжаных) у мястэчку налiчвалася 229 яўрэяў (99 мужчын i 130 жанчын) [НГАБ у Гродне. Ф. 24. В. 7. С. 32. Рэвiзскiя сказкi Гродзенскага павета за 1816 г.]. У 1829 г. у Скiдзелi налiчвалася ўжо 127 яўрэйскiх дамоў i 997 жыхароў-яўрэяў [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В.

3. С. 536. Арк. 105, 118. Выказваем падзяку за гэтыя дадзеныя гродзенскаму гісторыку Іне Соркінай]. Чатырохразовае павелічэнне яўрэйскай папуляцыі мястэчка тлумачыцца тым, што расійскі ўрад загадаў перасяліць усіх яўрэяў з вёсак у гарады і мястэчкі. У 1849 г., паводле дадзеных дзяржаўнай адміністрацыі, у Скідзелі налічвалася 70 сем'яў (з іх 69 мяшчан-домаўладальнікаў і 1 земляроб) і 480 яўрэяў мужчынскага полу [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 13. С. 352. Арк. 64 адв – 65]. У 1901 г. губернская адміністрацыя налічвала ў Скідзелі ўжо 2866 яўрэяў. Такім чынам, на працягу XIX ст. яўрэйская папуляцыя Скідзеля вырасла больш чым у дзесяць разоў.

Ужо ў 1830-х гадах скідзельскія яўрэі пачалі ствараць у мястэчку гарбарныя прадпрыемствы. У канцы XIX – на пачатку XX ст. гарбарні сталі асновай мясцечковай прамысловасці. Яны давалі большую частку грашовых абаротаў мястэчка, забяспечвалі працай шмат яўрэйскіх і беларускіх беднякоў. Хаця яўрэі, у адрозненне ад беларусаў, не ведалі паншчыны і жылі з вольнай працы, але яны вымушаныя былі выплочваць вялікія падаткі як дзяржаве, так і ўладальнікам Скідзеля Чацвярцінскім. 26 чэрвеня 1834 г. міністар фінансаў імперыі пісаў гродзенскаму губернатару, што давераная асоба Скідзельскай яўрэйскай грамады Шая Абрамаў Эпштэйн скардзіўся яму на "непомерные поборы, взимаемые с жителей сего местечка владелицею онаго Княгинею Четвертинскою, под названием торгового от сьестных припасов и о прочих сего рода налогах" [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 10. С. 1097. Арк. 2. Скарга Скідзельскай яўрэйскай грамады на княгіню Чацвярцінскую. 1834 г.]. Гродзенскае губернскае праўленне на той час ужо прыняло пастанову, спасылаючыся на царскі ўказ ад 9 снежня 1831 г., каб такія зборы "впредь ни под каким предлогом не существовали". Міністр загадаў аб'явіць Эпштэйну, што з прычыны выхаду азначанай пастановы "просьба его не подлежит моему разсмотрению".

У 1867 г. скідзельская і луненская яўрэйскія грамады скардзіліся на тое, што акцызнае ўпраўленне не выдала ім патэнт на права гандляваць алкагольнымі напоямі [НГАБ у Гродне. Ф. 2. В. 34. С. 1642. Аб нявыдачы патэнта на гандаль спіртнымі напоямі яўрэям мястэчка Скідзель. 1867 г.]. А шынкарства з'яўлялася адной з галоўных крыніц даходу для яўрэйскага насельніцтва. Канфлікт распачаўся ў 1866 г., калі ўладальнікі Скідзеля і Лунны Чацвярцінскія і Чахоўскія адмовіліся выдаць яўрэям дазвол трымаць шынкі на іх зямлі. Паводле закона, без такога дазволу акцызнае ўпраўленне не магло выдаваць патэнту. Яўрэі скардзіліся ў Сенат, але нічога не дамагліся. Напэўна, землеўладальнікі патрабавалі ад яўрэйскіх шынкароў значнай грашовай сумы за дазвол на шынкарства.

Адносіны паміж беларусамі і яўрэямі ў Скідзелі былі, наколькі можна меркаваць на падставе архіўных дакументаў і ўспамінаў доўгажыхароў, прыязнымі і добрасуседскімі. Хаця, безумоўна, існавалі

забабоны і падазрэнні, характэрныя для кожнага традыцыйнага аграрнага грамадства. Прыкладам могуць паслужыць падзеі, якія адбыліся ў Скідзелі ў 1828 г. Вясной таго году яўрэйскія жанчыны Чэрня Беркава і Фэйга Хаімава знайшлі на грэблі пасля паводкі чалавечыя косці невядомага тапельца і вырашылі забраць іх, каб выкарыстаць для лячэння ад ліхаманкі маленькай дачкі Чэрні. Такія забабоны на той час былі пашыраныя як сярод яўрэяў, так і беларусаў.

Гэта ўбачыла мяшчанка Анастасія Станкевіч, якая паведаміла царкоўным братчыкам. Апошнія разам са святаром тут жа прыйшлі ў дом Чэрні і зрабілі там вобыск. Справай заняўся Гродзенскі гродскі суд. Аказалася, што чэрап тапельца быў прынесены вадой у часе паводкі. Яго бачылі таксама скідзельскія мяшчане Бенядыкт Шань і Клімент Жук, якія ішлі за дровамі ў лес. Яўрэйкі прызналіся, што хацелі выкарыстаць чэрап для лячэння маленькай дзяўчынкі: “Мельника жена Марианна Сенкевичова и еврейка Мария Иоселева по выполнению присяги показали в допросах: что действительно дочь Черни трех лет по имени Сарка на четыре или пять недель пред минувшим пейсаком по сие время одержима болезнью лихорадкой, а мещане скидельские полагают, что череп сей где найден, принесен быть мог разлитою с весны водою, которой довольно много в том месте сего года было. Наконец из повального обыска из достаточного числа лиц христиан и евреев учиненного, ничего худого за оговоренными еврейками не открыто” [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 3. С. 352]. Яўрэйскія жанчыны былі прыгавораны за свой ўчынак да біцця 20 розгамі.

Рэформа 1861 г. і змаганне скідзельцаў за зямлю прывяло да ўзнікнення канфлікту паміж местачковымі беларусамі і яўрэямі. 5 мая 1864 г. скідзельскія яўрэі падалі губернскім уладам скаргу на местачкоўцаў-беларусаў, якую падпісалі ад імя грамады Гірш Розенштэйн, Гершен Вайнштэйн, Моўша Шапіра, Давід Бейраховіч і Кадзет Лом [НГАБ у Гродне. Ф. 10. В. 14. С. 69. Арк. 2 - 2 адв. [Скарга яўрэяў м.Скідзель на забарону ім сялянамі пасвіць жывёлу на агульным выгане. 1864 г.]. Праз месяц, 15 чэрвеня таго ж году, была пададзена наступная скарга, у якой яўрэі пісалі: “Еще эти пастбища и за прежними помещиками как равно и нынешним Князем Четвертинским от дедов были наделенными совместно для пастьбы скота как Евреям так и крестьянам, ибо за оныя уплачивается чинш; между тем за увольнением помещичьих крестьян от барщинной повинности на оброчную, крестьяне местечка Скидля с самого начала угнетали нас, а в настоящем году вовсе воспретили пастбище, так что скот Еврейский пришел к падежу; хотя Г.Мировой Посредник прибывши на место для спокойствия желал сделать раздел как крестьянам так и Евреям выгонов, но крестьяне к совершению сего дела недопустили по своему упрямству сами одни пользуются по сие время; с какового поводу общество наше пришло к крайнему разорению и нищете”. Яўрэі сцвярджалі, што сяляне агарадзілі гэтую супольную пашу пад назвай

„Звярынец“ плотам. Міравы ж пасярэднік прапаноўваў мірна падзяліць гэтую пашу паміж дзвюма местачковымі абшчынамі. Як справа вырашалася далей, нам невядома, паколькі ніякіх дакументаў на конт гэтага нам не патрапіла. Але, трэба меркаваць, што местачкоўцы знайшлі шлях да паразумення.

На пачатку XIX ст. яўрэі мелі ўласнае самакіраванне – кагал. Кагал быў непарыўна звязаны з рэлігійнай арганізацыяй яўрэйскіх абшчынаў, а сярод яўрэйскага насельніцтва вялізным аўтарытэтам карысталіся духоўныя асобы – рабіны. Усе спрэчкі і канфлікты паміж яўрэямі разглядаліся і вырашаліся ўнутры кагала, які таксама выпрацоўваў стратэгію і тактыку паводзінаў адносна ўладаў і акаляючага хрысціянскага насельніцтва. У 1844 г. расійскі ўрад афіцыйна забараніў кагал, а яўрэі павінны былі выбіраць сваіх прадстаўнікоў, прычым паводле дыскрымінацыйных для іх правілаў, у органы саслоўнага мяшчанскага самакіравання. У Скідзелі такім органам з'яўлялася мяшчанская ўправа. На працягу 1870-1890-х гадоў яе галавой абіраўся Гірш Разэнталь. Кагал, зрэшты, нікуды, не знік, а неафіцыйна працягваў кіраваць жыццём яўрэйскай грамады.

У XIX ст. яўрэйскае насельніцтва ўжо пераважна засяляла цэнтральную частку Скідзеля, а беларусы з большага жылі па ўскраінах. Яўрэйскія гандляры таксама імкнуліся паставіць свае крамы на цэнтральнай плошчы мястэчка, што часам прыводзіла да канфліктаў паміж гандлярамі і праваслаўным духавенствам. Напрыклад, каля праваслаўнай царквы ў Скідзелі знаходзіліся старыя драўляныя крамы мясцовых яўрэяў. Мітрапаліт Літоўскі Іосіф у 1857 г. скардзіўся гродзенскаму губернатару, што гэтыя крамы перашкаджалі багаслужэнню ў “тарговыя” дні. Акрамя таго, закон не дазваляў будаваць ніякіх пабудоў каля царквы. Губернатарам было зроблена распараджэнне аб пераносе гэтых крам у іншае месца, але ці было гэтае распараджэнне выкананае, нам невядома, паколькі яўрэі ўмелі вельмі добра абараняць свае інтарэсы.

З ростам насельніцтва цэнтар мястэчка ўсё больш цесна забудоўваўся. Гэта таксама стварала новыя праблемы. Напрыклад, у Скідзелі каля Гродзенскай вуліцы дзейнічала сельская бальніца. У 1902 г. было вырашана адрамантаваць яе і ачысціць ад старых пабудоў бальнічны двор. Адразу за бальніцай знаходзілася неабгароджанае пустое месца. Вясной на гэтым месцы жыхары рабілі агароды. Падводы наведвальнікаў заязджалі ў двор бальніцы, і таму ўвесь дзень былі адчынены вароты. З гэтай прычыны каля бальніцы заўседы блукалі шматлікія свінні і козы, якія стваралі там беспарадак. Паводле ж плана мястэчка на гэтым месцы павінна была быць вуліца шырынёю 18 аршынаў. Але, каб зрабіць яе, патрэбна было аднесці платы і сарайчыкі жыхароў, якія гэтаму ўсімі сіламі праціўліся. Таму справа з добраўпарадкаваннем тэрыторыі ля шпіталя пасоўвалася вельмі марудна.

У 1909 г. паўстала пытанне аб пабудове дома для ўрача скідзельскай бальніцы. Дзеля гэтага неабходна было зрабіць адпаведны праект. Але знайсці вольны плац аказалася таксама справай надзвычай складанай, паколькі паўсюдна былі пабудаваны хлявы і сарайчыкі жыхароў мястэчка, якія ўпарта працівілся іх зносу.

Як і ўсе местачковыя яўрэі, скідзельскія таксама вызначаліся неверагодным спрытам і кемлівасцю ва ўсім, што датычыла камерцыі і гандлю. У іх можна было набыць усё, што толькі патрэбна было кожнаму чалавеку. Натуральна, што квітнеў таксама незаконны гандаль і кантрабанда. У 1866 г. жандарскі унтэр-афіцэр Спірыдон Клачко вырашыў вызначыцца па службе ўдалай справай. Ён падгаварыў 13 студзеня таго года селяніна вёскі Карашава Луку Іоскевіча, каб той купіў порах і зарады ў мясцовага яўрэя Гіршы Эпштэйна [НГАБ у Гродне. Ф. 1. В. 34. С. 3437. [Аб продажы пораха Г.Эпштэйнам. 1866 г.]. Натуральна, што такі гандаль быў забаронены, паколькі на беларускіх землях яшчэ дзейнічала ваеннае становішча, уведзенае пасля паўстання 1863 г. Калі ж Іоскевіч набыў порах і зарады, Клачко разам з паліцэйскім прыставам 4-га стана, скідзельскім тысяцкім унтэр-афіцэрам Лапышом і казакамі Платонам Брызгайлавым і Цімафеем Шэрстабітавым зрабілі ў Эпштэйна вобыск і знайшлі 4 фунты шроту, 500 пістонаў і ¼ фунта пораху. Была распачатая крымінальная справа. Эпштэйн прызнаўся, што пістоны купіў у мясцовага купца Шлёмы Лапіна, а дакладней – у яго жонкі Саркі. У выніку Эпштэйн і Лапін былі аштрафаваныя на 50 руб. кожны, а гэта была вялізная сума для местачкоўцаў. А ўжо 19 студзеня таго ж году Лука Іоскевіч пайшоў у рэкруты па найму замест сям'і Ігната Мазалеўскага. Магчыма, што на гэта яго падштурхнула гісторыя з порахам, паколькі абсалютная большасць жыхароў мястэчка і воласці, як яўрэяў, так і беларусаў, была зацікаўленая ў існаванні гэтага незаконнага гандлю.

Асновай прамысловасці Скідзеля ў канцы XIX ст. сталі гарбарні. У 1886 г. у мястэчку налічвалася 9 гарбарных прадпрыемстваў [НГАБ у Гродне. Ф. 77. В. 1. С. 49. [Ведамасці пра гарбарні і бібліятэкі. 1886 г.]. Гарбарня Карпеля Сухаўлянскага знаходзілася пры Татарскай вуліцы і перавулку, што вёў на Дворную вуліцу. Размяшчалася яна ў аднапавярховым драўляным доме. Побач з будынкам знаходзіліся гурбы адыходаў. Сярод жылых дамоў быў пабудаваны гарбарны завод Моўшы Льва. На двары таксама знаходзіліся вялікія гурбы скур і скураных адкідаў і тым самым забруджвалі ўсё наваколле. Гарбарня Гіршы Габовіча таксама была размешчаная сярод жылых дамоў пры Татарскай вуліцы.

Гарбарня Моўшы Баланскага размяшчалася ў мураваным аднапавярховым доме пры Гродзенскай вуліцы. На гэтым прадпрыемстве працаваў толькі сам гаспадар. Кепскую скуру і адкіды выкідваў на падворак, таму вакол стаяў “невыносны пах скуры”. Завод Янкеля Разэнталя быў пабудаваны ў 1876 г. на Татарскай вуліцы ў

драўляным 1-павярховым доме Абрама Сарнацкага. Непатрэбная скура і адкіды выкідваліся на падворак каля самой вуліцы. У 1884 г. у драўлянай аднапавярховай пабудове быў заснаваны гарбарны завод І.Дайхаса. Найноўшы завод належаў Янкелю Разэнталю і Адаму Лямперту, ён быў пабудаваны ў 1886 г. пры Базарнай плошчы ў сучасным драўляным доме. У адрозненне ад іншых заводаў гэты меў два электрычныя венцілятары, таму на падворку "не адчувалася смуроду".

Дзве гарбарні ў Скідзелі належалі мясцовым татарам. Завод Сцяпана Муявы быў наладжаны ў Гродзенскім завулку ў другой частцы жылога дому. Гарбарня Восіпа Мількамановіча была пабудаваная прыкладна ў 1870 г. і таксама функцыянавала ў другой палове жылога драўлянага дому. Да другой сусветнай вайны гарбарні з'яўляліся асновай скідзельскай прамысловасці і забяспечвалі працай і заробкам нямала жыхароў Скідзельшчыны.

Яўрэі складалі большасць і сярод местачковых рамеснікаў. Яны пашыралі новыя тэхналогіі і прылады працы, засноўвалі сучасныя майстэрні. Абвастралася і канкурэнцыя паміж імі. У лютым 1909 г. гродзенскі губернатар атрымаў ананімны ліст нібыта ад сялян вёскі Хваты Скідзельскай воласці, аўтар ці аўтары якога прасілі начальніка губерні выселіць з Хватоў яўрэя Перната Янкеля: "...обращаемся к стопам Ваше Высокопревосходительство избавить нашей деревни Хваты от несчасция которое находится вблизи нас и наш хозяйственный труд истекает со дня 1) вблизи нашей деревни Хваты высадился еврей, которы погубил нас и губит наших детей. Еврей Янкель Тевелев Пернат который происходит из мещан местечко Скиделя посадился на крестьянскую землю выходившее из черты местечка Скиделя без всякого разрешения и где евреям не разрешено жить, он Янкель Тевелев Пернат губит нас и занимается продажею разными напитками без никакого разрешения и научивает нагаваривает детей наших воровать разного, как семена с гумнах так и из дому без никакого сожаления и несть к нему и за етого он их награждает разными напитками" [НГАБ у Гродне. Ф. 2. В. 30. С. 929. Прашэнне сялян вёскі Хваты аб высяленні Перната Янкеля. 1909 г.]. Далей невядомы аўтар скаргі пісаў, што ў выніку такой злачыннай дзейнасці Перната "мы находимся в крайнем бедстве что мы не можем ясно заявить от испуга... что ему ничего страшного нету и может нас убить совсем что даже жизнью мы можем истребить потому что он часто говорит что если он узнает что кто либо на его заявит жалобу то он поджогами истребит нас". Менавіта страхам перад помстай грознага Тэвеля ён тлумачыў нежаданне падпісваць свой ліст: "...чтобы не сгубил нас и наших молодых детей...". Па загаду губернатара ў Хватах 25 сакавіка 1909 г. быў праведзены сход сялян, на якім "крестьяне показали, что Янкеля Перната хорошо знают, он человек безукоризненно честного поведения, занимается кузнечным ремеслом", і выказалі меркаванне, "что анонимный донос подан кем-нибудь из

скидельских кузнецов по злобе к Янкелю Пернату, так как последний недавно начал заниматься кузнечным ремеслом, свои работы исполняет особо добросовестно”. Такім чынам, невядомы аўтар гэтай ананімкі, хутчэй за ўсё канкурэнт Перната па кавальскаму рамяству, спрабаваў выкарыстаць антыяўрэйскія фобіі расійскай улады ва ўласных эканамічных інтарэсах.

НЕЗВЫЧАЙНЫ ЛЁС ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ СКІДЗЕЛЬСКІХ

Скідзельскія карані меў славуты род яўрэйскіх прадпрымальнікаў Скідзельскіх. Заснавальнікам яго быў Лявонці Саламонавіч Скідзельскі (1845-1916). У 1871 г. ён ажаніўся на мяшчанцы з Ваўкавыска Гільдзе Гродзенскай. Маладыя жылі спачатку ў Ваўкавыску, а потым перабраліся ў Екацярынаслаў. У 1891 г. Лявонці стаў купцом першай гільдыі. У той час ішло актыўнае асваенне Далёкага Ўсходу, і Скідзельскі падаўся туды. Стаў адным з уладальнікаў Усурыйскай чыгункі, адным з найбагацейшых жыхароў Уладзівастока. Займаўся буданіцтвам, лясным промыслам, вуглездабычай. І сёння ва Ўладзівастоку захаваліся будынкі, узведзеныя ў свой час Л.Скідзельскім. Яго маёмасць ацэньвалася сумай 9,5 млн руб. – на той час гэта былі вялізарныя грошы. Лявонці Скідзельскі падтрымліваў Таварыства вывучэння Амурскага краю, даваў грошы на краявы музей. Памёр Лявонці Скідзельскі ў 1916 г. Магутная прамыслова-фінансавая імперыя дасталася па спадчыне яго сынам. Аднак пасля рэвалюцыі маёмасць Скідзельскіх была нацыяналізаваная савецкай уладай, а самыя прадпрымальнікі падаліся ў Маньчжырую, у Харбін. Аднак і тут некаторых з іх дастала савецкая ўлада. Пасля разгрому Японіі ў 1945 г. сыны Лявонція Саламон і Сямён былі арыштаваныя і рэпрэсаваныя. Іх пасмяротна рэабілітавалі ў канцы мінулага стагоддзя. Сям'я Скідзельскіх рассыпалася па ўсяму свету. Большасць з іх апынулая ў Англіі і ЗША. Да нашчадкаў гэтага роду належыць прафесар Роберт Скідзельскі, які з'яўляецца адным з самых вядомых у свеце эканамістаў, старшыней Цэнтра глабальных даследаванняў, членам Палаты лордаў Брытанскага парламента. Ён не забыў зямлю продкаў і наведаў Скідзель.

*Мікалай Дзелянкоўскі*

## Раздзел 3

# СКІДЗЕЛЬ У МІЖВАЕННАЙ ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАВЕ (1918 – 1939)

Першая сусветная вайна кардынальна змяніла звыклую хаду жыцця скідзельцаў. Летам 1915 г., калі лінія фронту пачала набліжацца да Беларусі, большасць беларускага насельніцтва мястэчка і навакольных вёсак пад уплывам антынямецкай прапаганды ўладаў і праваслаўнага духавенства накіравалася ў далёкае бежанства на ўсход. Мясцовыя яўрэі і каталікі засталіся ў сваіх дамах, што і выратавала іх ад многіх цяжкіх выпрабаванняў. Хаця полымя вайны шуганула і па Скідзелю.

Пасля захопу крэпасці Гродна (3 верасня 1915 г.) кайзераўская армія працягвала свё наступленне на ўсход. Руская 10-я армія адышла на рубеж Азёры – рака Котра – рака Нёман, дзе заняла абарону. Гэтая пазіцыя ўтрымлівалася рускімі войскамі на працягу тыдня. Асабліва ўпартыя баі ішлі ў раёне Скідзеля (9-11 верасня) і, паводле нямецкіх крыніц, былі даволі жорсткія. Толькі ў выніку начных атак немцы здолелі 11 верасня захапіць мястэчка Скідзель, вёскі Некрашы і Лаўна [Der große Krieg. Eine Chronik von Tag zu Tag. Urkunden, Depeschen und Berichte der Frankfurter Zeitung. 32. Heft. Druck und Verlag der Frankfurter Societäts-Druckerei G.m.b.H. Frankfurt am Main. 1915. S. 3064]. Баі ў раёне Лаўна канчаткова скончыліся толькі 13 верасня. Больш дакладных і падрабязных звестак пра гэтыя баі ў нас няма.

Паводле ўспамінаў доўгажыхароў, пасля адыходу расійскіх войскаў казакі, схаваўшы сваіх коней у Бару, зрабілі засаду ў мястэчковай царкве, а потым нечакана наляцелі на немцаў, якія ўвайшлі ў Скідзель, і перабілі шмат нямецкіх салдат. Магчыма, што менавіта гэтых салдат і пахавалі на вайсковых могілках каля вёскі Хваты. Паводле запісаў скідзельчаніна Пятра Сяўрука, у 1923 г. стан могілкаў быў дрэнным, агароджа і крыжы паламаныя. Аднак ужо ў 1924-1925 гг. польскія ўлады аднавілі іх. На магілу кожнага забітага былі пакладзены спецыяльна зробленыя з бетону тыпавыя пліты ў выглядзе крыжа, з прозвішчам салдата, прыналежнасцю да вайсковай часткі і датай смерці. Зараз вельмі цяжка сказаць – колькі забітых немцаў было пахавана ў Хватоўскім бары – могілкі былі знішчаныя ў пасляваенныя гады.

На пачатку 2000-х гадоў магільныя пліты былі знойдзены пры будаўнічых работах на скідзельскім масласырзаводзе. Магчыма, у першыя пасляваенныя гады адчуваўся востры недахоп у будаўнічых матэрыялах, таму мясцовыя ўлады вырашылі разбурыць могілкі (тым больш, што толькі скончылася вайна супраць фашызму і немцы ўспрымаліся як ненавісныя ворагі) і выкарыстаць пліты пры будаўніцтве. Працу па пераносу плітаў з памяшканняў завода і ачыстку для выяўлення прозвішчаў загінуўшых па ўзгадненню з кіраўніцтвам прадпрыемства ажыццявілі вучні 10 класа МНС (Міністэрства Надзвычайных Спраў), які быў створаны пры школе № 1 горада Скідзеля пад кіраўніцтвам настаўніка гісторыі Дзмітрыя Люціка. Дзякуючы гэтай знаходцы стала вядома, якія нямецкія часткі ўдзельнічалі ў баях за мястэчка Скідзель у верасні 1915 года. Гэта былі 27-ы і 90-ы пяхотныя палкі 54-й пяхотнай дывізіі і 94-ы і 95-ы Цюрынгскія пяхотныя палкі 38-й пяхотнай дывізіі. Менавіта на долю гэтых палкоў, калі меркаваць па колькасці пахаваных, выпаў асноўны цяжар баёў. Удалося таксама ўстанавіць прозвішчы 40 нямецкіх салдат, загінуўшых на Скідзельшчыне: 1) Clauss Heinr (UTFF Z 2 IR 95 18.9.1915R) 2) Nieznany arm niem. (IR 95. 915R) 3) Ross Theodor (Musk T. IR 95 8.9.915R) 4) Ortlepp Karl (Musk 17 IR 95 9.9.915R) 5) Will Bernhar (Musk. I.IR 94 10.9.1915R) 6) Schmidt Karl (LDST. I. IR 94 18.9.1915R) 7) Schneider Otto (Musk. M.C.K. IR 94 11.9.1915R) 8) Muller Alfred (Musk. II (12-?) IR 94 20.9.1915R) 9) Lehnann Alfr (Musk 2 (Z-?) IR 94 20.9.1915R) 10) Sonntag Robe (Musk 10 IR 94 11.9.1915R) 11) Frenzel Otto (LDST 3 1 IR 94 18.9.1915R) 12) Muller Ernst (Musk 8 IR 94 15.9.1915R) 13) Schneider Richard (CEFB 11. IR 94 18.9.1915R) 14) Reinhard Fritz (Musk 12 IR 94 12.9.1915R) 15) Nieznany Arno arm niem (LDST 10 IR 94 13.9.1915R) 16) Rossmann Eduard (CEFR 5 IR 94 11.9.1915R) 17) Syring Otto (LDST 10 IR 94 11.9.1915R) 18) Rommel Ernst (UTFFZ 5 IR 94 11.9.1915R) 19) Woite Paul (Musk 1 IR 94 11.9.1915R) 20) Schneider Hilm (Musk 10 IR 94 11.9.1915R) 21) Knobl…och Otto (LDST 9 IR 94 11.9.1915R) 22) Volrich Walt (Musk 9 IR 94 10.9.1915R) 23) Schneider Richard (CEFR 11 R IR 94 18.9.1915R) 24) Leithold Wal (Musk 19 IR 94 11.9.1915R) 25) Scherzberg Willi (Ers Res 8 R IR 94 11.9.1915R) 26) Schmi…cha… … (Fusl 9 R IR 27 10.9.1915R) 27) Bot… Wilhel (ER… PFS 9 R IR 27 10.9.1915R) 28) Hilmann Heinr (Res 4 R IR 27 11.9.1915R) 29) Storch Theod (Musk I (1-?) IR 27 12.9.1915R) 30) Lanc Richard (Res IR 27 11.9.1915R) 31) Hunger Andre (Musk. 6 R IR 27 10.9.1915R) 32) Becker Alber (HNS 9 R IR 27 10.9.1915R) 33) Maudt Ludwik (Musk 8 R IR 27 11.9.1915R) 34) Waldminghaus Hermann (Schv TZE MGK IR 90 9.9.15R) 35) Maac Hans (Musk 1 IR 90 10.9.1915R) 36) Leser August (Musk. 12 IR 96 10.9.1915R) 37) Nicke I Paul (Cren 51 CR R 22.9.1915R) 38) Hoffmann (Ers res 11.9.1915R) 39) Vissmann Frie (Wehrm 2 LDW IR 61 10.9.1915R) 40) Porpart Erns (Ers Res 4 LDW IR 61 10.9.1915R).

Лёс раскідаў скідзельскіх бежанцаў па розных губернях велізарнай імперыі ад паўднёвага Крыму да далёкай Сібіры. Толькі ў 1918 г. яны пачалі паступова вяртацца дадому. Тады ж на Скідзельшчыне ва ўмовах нямецкай акупацыі зараджаецца беларускі нацыянальны рух. У самім Скідзелі быў утвораны валасны камітэт, паўстала беларуская школка. Нацыянальная свядомасць пачала абуджацца сярод скідзельцаў ужо ў бежанстве. Менавіта ў далёкіх ад роднага мястэчка краях яны больш выразна адчулі асаблівасці свае мовы і культуры. Жыццё на чужыне прывучыла гуртавацца паводле нацыянальнай прыналежнасці, дапамагаць землякам.

Калі ў канцы 1918 г. нямецкія войскі пакінулі беларускія землі, дык Гродзеншчына была занятая вайсковымі аддзеламі нядаўна абвешчанай польскай дзяржавы. Новая ўлада варожа паставілася да беларускага руху, у якім бачыла небяспеку для польскай дзяржаўнасці. Напрыклад, паводле карэспандэнцыі газеты "Беларуская думка", быў арыштаваны і ў поўным складзе вывезены ў Кракаў Скідзельскі валасны камітэт [Беларуская думка. № 17. 04.06.1919]. На жаль, нам невядома, хто ўваходзіў у склад гэтага камітэта, і што хацелі і паспелі зрабіць гэтыя людзі, што сталася з імі пазней.

Не мінулі Скідзельшчыну і падзеі савецкай-польска вайны 1919-1921 гг. У сярэдзіне лютага 1919 г., па дамоўленнасці з нямецкімі войскамі, якія яшчэ знаходзіліся тут, польскія аддзелы былі прапушчаны праз нямецкі кардон каля Гродна і занялі абарону па рацэ Нёман ад Скідзеля на Масты, а далей па рацэ Зяльвянка на Ружаны і Кобрын. У выніку далейшых баявых дзеянняў польскія войскі перайшлі ў наступленне на ўсход, і Скідзель трапіў пад польскую ўладу.

У выніку паспяховага наступлення Чырвонай Арміі летам 1920 г. перад бальшавіцкім кіраўніцтвам Савецкай краіны адкрывалася заманлівая магчымасць перакінуць полымя рэвалюцыі ў Еўропу. Распачаўся вядомы “паход на Варшаву” камандуючага Заходнім фронтам Міхаіла Тухачэўскага. 3-ці конны корпус Г.Гая ўжо 19 ліпеня з віленскага накірунку штурмам узяў Гродна. Пасля заняцця горада кавалерыйскія дывізіі корпуса прасунуліся ў паўднёвым (на Кузніцу) і ўсходнім (на Скідзель) накірунках. М.Тухачэўскі пісаў, што ўжо 19 ліпеня перадавыя раз’езды савецкай кавалерыі (яны належылі 10-й кавалерыйскай дывізіі) ўвайшлі ў мястэчка Скідзель [Тухачевский М.М. Избранные произведения / В 2-х т. М.: Воениздат, 1964. Т.1 (1919-1927 гг.). С. 144]. Ніякай інфармацыі пра сутычкі з польскімі жаўнерамі ў самім мястэчку няма, таму верагодна, што яно было занятае без бою. 4-я савецкая армія наступала ўслед за кавалерыстамі з поўначы і падыходзіла да Азёр. З усходу рухаліся дывізіі 15-й савецкай арміі. Яшчэ 18 ліпеня гэтыя падраздзяленні атрымалі загад выйсці да ракі Нёман на лініі Гродна – Скідзель. Такім чынам, польская армія, якая знаходзілася ў раёне Ліды і Наваградка, магла трапіць у акружэнне. У

гэты момант палякі яшчэ адступалі ад Ліды на мястэчка Скідзель і далей на Гродна. Захоп Гродна савецкімі войскамі стаўся для іх нечаканасцю.

Каб выправіць гэтую сітуацыю, польскае камандаванне арганізавала атаку на Скідзель. У бой былі кінутыя 8-я, 10-я і 5-я польскія дывізіі. Камандаванне гэтымі сіламі ажыццяўляў генерал Жэлігоўскі [Какурин М.Я., Вацетис И.И. Гражданская война. 1918-1921. СПб.:Полигон, 2002. С.453]. Раніцай 20 ліпеня польскія жаўнеры сутыкнуліся ў раёне Скідзеля з савецкімі кавалерыйскімі часткамі, загаддзя выдзвінутымі камандаваннем 3-га савецкага кавалерыйскага корпусу [Киенко Д. Общее наступление советских войск на польском фронте. Гродненская операция [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: edu.grsu.by/rubon]. Палякі мелі перавагу сілаў і рашуча рваліся на Гродна. Чырвоныя кавалерысты вымушаны былі адступіць. Баі ішлі цэлы дзень, і ў іх разгар пачалі падыходзіць з боку Азёр дывізіі 4-й савецкай арміі (53-я і 12-я). З накірунку Ліды набліжаліся часткі 15-й савецкай арміі. Сумеснымі контратакамі наступ генерала Жэлігоўскага быў спынены. 53-я савецкая дывізія атакавала "Скідзельскую групу" (8-я, 10-я і 5-я польскія дывізіі) з правага фланга, а 12-я дывізія – падтрымала яе атаку. Польскія дывізіі маглі, такім чынам, трапіць у акружэнне. "Скідзельская группа" адступіла на поўдзень, дзе пачала фарсіраваць Нёман у раёне мястэчка Лунна. Па словах М.Тухачэўскага: "Яны (палякі – аўт.) былі змятыя, раздаўленыя і ў поўным беспарадку адкінутыя на поўдзень..." [Тухачевский М.М. Избранные произведения / В 2-х т. Т. 1 (1919-1927 гг.). М.: Воениздат, 1964. С. 145]. Фарсіраванне ракі "Скідзельская группа" правяла ў ноч з 20 на 21 ліпеня. Пасля гэтага польскія дывізіі працягвалі адступаць у накірунку на Беласток.

Хуткае ўварванне савецкай арміі М.Тухачэўскага ў Польшчу не прынесла бальшавікам перамогі, і планам сусветнай рэвалюцыі не дадзена было ажыццявіцца. У жніўні 1920 г. на рацэ Вісле войскі М.Тухачэўскага былі разбітыя і пачалі цяжкае адступленне на ўсход. У савецкага ваеннага кіраўніцтва быў план наладзіць абарону па рацэ Нёман і затрымаць наступленне палякаў. Польскі генштаб распрацаваў вайсковую аперацыю, якая ўвайшла ў гістарычную літаратуру як "Нёманская бітва". Яе мэтай было фарсіраванне ракі Нёман і авалоданне гарадамі Гродна, Масты і Ліда. Выкананне гэтага плану даручалася генерал-паручніку Э.Рыдз-Смігламу, які камандаваў 2-й польскай арміяй. Адным з эпізодаў гэтай бітвы сталі баі на Скідзельшчыне ў верасні 1920 г.

Наступленне польскіх войскаў на поўдзень ад ракі Нёман было даволі паспяховае. Яны выйшлі з раёна гарадка Супрасля пад Беластокам да мястэчка Індура і пры паспяховай пераправе праз раку маглі адсекчы адступаючыя савецкія войскі 3-й і 15-й армій, якія яшчэ займалі Гродна. Згодна з загадам па 2-й польскай арміі, 2-я дывізія гэтай арміі павінна была захапіць пераправы праз раку Нёман каля вёскі Коматава. Наступаючы на ўсход дывізія дзейнічала ўздоўж шашы

Гродна – Скідзель. Пасля заняцця палякамі Гродна, сілы дывізіі павінны былі ўтрымліваць пазіцыі у раёне Скідзеля з мэтай адрэзаць шлях да адступлення тым часткам Чырвонай арміі, якія ішлі з боку Гродна [Wyszczelski Lech. Operacja Niemeńska 1920 roku. Warszawa, 2003. S. 97].

У ноч з 25 на 26 верасня 1920 г. у раёне вёскі Коматава фарсіраваў раку Нёман на пантонах 4-ы Падхалянскі горнастралковы полк 21-й польскай горнай дывізіі генерала Анджэя Галіцы. Нечаканай атакай палякі захапілі савецкія старажавыя пасты на беразе ракі. Пасля паспяховай пераправы перадавы 2-гі батальён пачаў наступаць у накірунку Абуховічы – Абухава з мэтай перарэзаць шашу Гродна – Ліда і гэтым самым акружыць савецкія войскі, якія адступалі з гродзенскага накірунку на мястэчкі Скідзель, Жыдомлю і Азёры. Калі б гэта ім удалося, у акружэнне трапілі б адразу некалькі савецкіх дывізій (5-я, 6-я і 56-я). Яны пешшу адступалі з Гродна, занятага палякамі 25 верасня.

Гэтыя чырвонаармейцы зусім не былі падрыхтаваныя да нечаканых атак у сваім тыле. Нягледзячы на гэта, ужо раніцай 26 верасня яны змаглі арганізаваць шэраг моцных контрудараў па наступаючых з боку Нёмана польскіх войсках. Баі ў раёне вёскі Абухава распачаліся зранку на ўзвышшах на ўсход ад вёскі Абуховічы, у 10 км ад Скідзеля. Пачаўшы наступ, 2-гі польскі батальён на чале з маёрам Касцецкім ударыў па 48-му савецкаму пяхотнаму палку 6-й стралковай дывізіі (камандаваў дывізіяй А.А.Старажэнка, камісарам быў Ф.М.Чарноў). Атака прывяла да поўнага разгрому савецкага палка. Пасля гэтага пад удар польскага батальёна трапілі абозы 56-й савецкай дывізіі [IV PSP w wojnie polsko-bolszewickiej [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: www.militariacieszyn.republika.pl]. На выніку няўдалага для савецкага боку боя паўплывала адсутнасць артылерыі і баяпрыпасаў, а таксама значная дэмаралізацыя войскаў, якія з цяжкімі баямі адыходзілі ад самой Варшавы. Праўда, палякі таксама не здолелі пераправіць праз Нёман сваю артылерыю.

Тым часам савецкія войскі прывялі сябе ў парадак і паўтарылі атакі. Да іх падыходзілі ўсё новыя часткі чырвонаармейцаў. Польскі батальён 4-га Падхалянскага палка аказаўся ў цяжкім стане. Ён проста быў бы знішчаны ў выніку атак савецкіх дывізій. Але сітуацыю для яго выратавалі польскія сапёры. Яны наладзілі хуткую пераправу праз Нёман астатніх частак 4-га і 3-га палкоў той жа дывізіі [Wyszczelski Lech. Operacja Niemeńska 1920 roku. Warszawa, 2003. S.219]. Савецкія атакі працягваліся да 11-ай гадзіны дня 26 верасня. Паводле польскіх дадзеных, у гэтых атаках у палон да іх трапілі савецкія камандзір і камісар, якія узначальвалі атаку 48-га палка, а таксама 300 чырвонаармейцаў, адна гармата і абоз. 2-я брыгада (3-ці і 4-ты палкі) 21-й польскай дывізіі распачала наступленне на Скідзель.

Каля 13 гадзін дня 26 верасня камандаванне 2-й брыгады паслала ў Скідзель конныя патрулі. Яны павінны былі разведаць становішча ў мястэчку. Галоўныя сілы брыгады ў гэты момант знаходзіліся ў раёне

вёскі Струпіна (у 5 км на захад ад Скідзеля). На чале сілаў брыгады наступаў 4-ты польскі полк, якім камандаваў падпалкоўнік Барута-Спяховіч. Нечакана полк трапіў пад удар 1-га савецкага кавалерыйскага палка, падтрыманага часткамі 56-й савецкай дывізіі. 2-гі батальон 4-га польскага палка, спрабуючы перарэзаць шляхі адступаючым савецкім войскам, быў абстраляны, акружаны і часткова знішчаны. Вось як апісваў гэты бой хранікёр 4-га палка: "Камандзір батальёна маёр Касцецкі, спрабуючы прабіцца, быў цяжка паранены і ўзяты ў палон. У палон трапіў таксама пасечаны шаблямі камандзір узвода 37-мм гармат падпаручнік Бенцар і падпаручнік Скірпірупа. Падпаручнік Баярскі, камандзір другой кулямётнай роты, акружаны казакамі, не жадаючы трапіць у рукі ворага пакончыў з жыццём выстралам рэвальвера" [Wyszczelski Lech. Operacja Niemeńska 1920 roku. Warszawa, 2003. S.220].

4-ты польскі полк фактычна быў разбіты. Яго выратаваў сваёй атакай 3-ці полк 2-й брыгады. Рэшткі 2-га батальёна вырваліся з акружэння, дзякуючы наступу батальёна 3-га палка падхалянскіх стралкоў. Савецкія часткі прарваліся праз польскія заслоны і адступілі за раку Котра. Аб інтэнсіўнасці баёў паміж Абуховічамі і Скідзелем сведчыць тое, што самі палякі прызнавалі свае страты даволі вялікімі (толькі 4-ты полк згубіў некалькі дзясяткаў забітых і столькі ж былі паранены). Усяго 2-я польская брыгада страціла ў баях 26 верасня больш за 200 забітымі і параненымі. Пра страты савецкіх войск дакладных дадзеных няма. Польскія дакументы гавораць, што толькі палоннымі Чырвоная Армія страціла ў гэтых баях каля 700 чалавек. Гэтыя баі далі магчымасць савецкім войскам адступіць у накірунку на Котру – Скідзель. Не спыняючыся ў Скідзелі, і знішчыўшы за сабой масты, два праз Котру і адзін праз Скідлянку, яны адступілі далей на ўсход.

Каля 16 гадзін 26 верасня 21-я польская горная дывізія ў поўным складзе фарсіравала Нёман і пачала наступленне на Скідзель [Bitwa Niemeńska 29.VIII – 18.X.1920. Dokumenty operacyjne. Część II. Warszawa, 1997. S. 305]. Вечарам таго ж дня палкі 2-й брыгады выйшлі на раку Котра. Фарсіраванне яе заняло ў польскіх жаўнераў даволі шмат часу. Гэта дало чырвонаармейцам магчымасць адступіць. 1-я брыгада 21-й польскай дывізіі вечарам 26 верасня заняла вёску Галавачы, што на поўнач ад Скідзеля.

Толькі ў сярэдзіне дня 27 верасня 2-я брыгада польскай 21-й дывізіі фарсіравала раку Котра і заняла Скідзель. Пра баі ў самім мястэчку нічога не вядома. Тут быў размешчаны штаб 21-й дывізіі. Адразу пасля заняцця Скідзеля, палякі пачалі рамонт мастоў праз раку Котра, якія былі неабходны ім для падцягвання цяжкай артылерыі і боепрыпасаў – у польскіх войсках ужо востра адчуваўся іх недахоп. Так, каля 20 гадзін вечара 27 верасня, пасля 5-ці гадзін працы, сапёрная рота адбудавала мост праз раку Котра даўжынёй 48 метраў. Да канца

дня палякі занялі вёскі Бубны і Стральцы ў 5 км на ўсход ад Скідзеля. Польскае наступленне імкліва пакацілася далей на ўсход, ужо 15 кастрычніка быў заняты Мінск, а стабілізавалася лінія фронту па рацэ Пціч. Пасля гэтага пачаліся Рыжскія мірныя перамовы, па выніках якіх беларуская зямля была падзелена папалам паміж Польшчай і Савецкай дзяржавай.

Такім чынам, Скідзельшчына апынулася ў складзе польскай дзяржавы, а сам Скідзель стаў цэнтрам гміны (так называліся самыя дробныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі) у Гродзенскім павеце Беластоцкага ваяводства. У 1921 г. новыя ўлады праводзяць перапіс насельніцтва, паводле дадзеных якога ў Скідзелі налічвалася 388 будынкаў і 2907 жыхароў (1371 мужчына і 1536 жанчын) [Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników pierwszego powszechnego spisu ludności z września 1921 r. i innych żródeł urzędowych. T.V. Województwo Białostockie. Warszawa, 1924. S.30]. Большасць у мястэчку складалі яўрэі – 1996 асобаў, палякаў налічвалася 504 чалавека, беларусаў – 359, расіян – 35, татараў – 11, літоўцаў – 1, русінаў (так у міжваеннай Польшчы афіцыйна называлі ўкраінцаў) – 1. Вынікі перапісу патрабуюць крытычнага разгляду. Беларусы, яўрэі і татары нярэдка запісваліся палякамі ці з прагматычных меркаванняў, ці блыталі нацыянальную прыналежнасць з дзяржаўнай. Такая з'ява ў Заходняй Беларусі была даволі пашыранай. А дзяржаўныя ўлады з палітычных мэтаў імкнуліся завысіць колькасць палякаў на "крэсах", і мясцовыя ўрадоўцы на практыцы дамагаліся рэалізацыі гэтага імкнення.

Паводле веравызнання ў Скідзелі пераважалі іўдзеі – 2231 чалавек, праваслаўных было 464, каталікоў – 122, мусульманаў (да іх належалі мясцовыя татары, якія спрадвеку жылі ў Скідзелі) – 89, евангелістаў – 1.

У Скідзельскай гміне (без уліку Скідзеля) колькасць жыхароў у 1921 г. складала 5921 чалавек. Паводле нацыянальнасці пераважалі беларусы – 4465, палякаў было 1395, расіян – 39, яўрэяў – 21, русінаў (украінцаў) – 1. Паводле веравызнання структура вясковага насельніцтва гміны выглядала наступным чынам: праваслаўных – 5124, каталікоў – 742, іўдзеяў – 51, евангелістаў – 4.

Матэрыяльныя ўмовы жыцця ў Заходняй Беларусі ў пасляваенныя гады былі надзвычай цяжкія. Мясцовыя жыхары, якія вярталіся з Расіі, звычайна знаходзілі спаленыя і разрабаваныя сядзібы, зарослыя пустазеллем палеткі. Камендант скідзельскага пастарунка польскай паліцыі адзначаў у 1921 г., што бежанцы "з прычыны адсутнасці сродкаў да жыцця вымушаны жабраваць па навакольных вёсках, апроч таго, многія паміраюць ад знямогі і голаду" [Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (далей – ДАГВ). Ф. 17. В. 1. С. 3. Арк. 8]. Пры гэтым ён адзначаў, што ў цэлым стаўленне насельніцтва да польскіх уладаў даволі добрае. У справаздачы за снежань 1921 г. камендант

напісаў, што “не заўважыў ніякай варожай да дзяржавы агітацыі, толькі сярод тутэйшага насельніцтва пануе антаганізм у стасунку да маёнткаў”. Буйнейшым памешчыцкім валоданнем на Скідзельшчыне заставаўся маёнтак Скідзель Чацвярцінскіх, плошча якога складала 2790 дз. зямлі, у тым 967 дз. ворыва, 210 дз. лугоў і 1613 дз. лесу. На другім месцы паводле памераў зямельнай уласнасці былі нашчадкі Рыгора Мазалеўскага: маёнтак Каўшова Івана Мазалеўскага складаў 790 дз., у тым 587 дз. ворыва, 45 дз. лугоў і 158 дз. лесу, Андрэю Мазалеўскаму належаў маёнтак Мількаўшчына – 630 дз. [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 41. Арк. 158-159].

У справаздачы за чэрвень 1922 г. скідзельскі камендант паліцыі Караль Вронскі адзначыў, што ў гміне на той час каля 5 тысяч чалавек вярнулася з бежанства з Расіі. Тут жа ён ўпершыню запісаў, што ў вёсцы Гліняны 25 чэрвеня 1922 г. былі раскіданыя антыдзяржаўныя ўлёткі. Вронскі пісаў: “У гміне Скідзель знаходзіцца шмат даволі інтэлігентных расіян, якія вярнуліся з Расіі, людзі гэтыя ў царскія часы займалі розныя пасады, а зараз сядзяць без занятку. Усё гэта ўплывае на іх незадавальненне і нават варожасць” [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 3. Арк. 33]. Расіянамі паліцыянт называў мясцовых беларусаў – настаўнікаў, дробных чыноўнікаў, паліцэйскіх, якія атрымалі адукацыю ў часы Расійскай імперыі, дамагліся пэўнага сацыяльнага статуса, а цяпер адчувалі сваю непатрэбнасць у новых палітычных рэаліях. Усе гэтыя людзі, як было сказана ў паліцэйскай справаздачы, знаходзіліся пад тайных наглядам.

Цяжкае матэрыяльнае становішча і палітыка польскіх уладаў, якая абсалютна ігнаравала нацыянальныя памкненні беларусаў, узмацнялі радыкальныя настроі сярод мясцовага насельніцтва. Гэтае насельніцтва да таго ж знаходзілася пад моцным уплывам рэвалюцыйных ідэй, прывезеных з Савецкай Расіі, многія мужчыны ваявалі ў Чырвонай арміі. Тайны інфарматар паліцыі з суседняй са Скідзелем вёскі Саволеўка паведамляў, што сярод мясцовых жыхароў “ходзяць чуткі, быццам неўзабаве мае быць вайна, быццам паўстане беларуская рэспубліка” [Дзяржаўны архіў у Беластоку (далей – ДАБ). Пракурор акруговага суда. 86. К. 137]. У кастрычніку 1922 г. у Скідзель прыехаў беларускі нацыянальны дзеяч Сяргей Баранаў, які на тайных сустрэчах з мясцовай моладдзю агітаваў яе (зноў жа, паводле інфармацыі паліцэйскага канфідэнта) уступаць у беларускія партызанскія аддзелы [ДАБ. Пракурор акруговага суда. 86. К. 137]. Тады у Гарадзенскай і Белавежскай пушчах разгарнуўся партызанскі рух, які падтрымліваўся сродкамі і зброяй праз літоўскую мяжу. Стасункі паміж Польшчай і Літвой былі тады скрайне варожыя. Скідзельскі хлопец Пётр Сяўрук запісаў у сваім дзённіку, што паўсюдна былі раскіданыя нумары нелегальнай газеты “Беларускі партызан”.

Трэба адзначыць той факт, што актыўная частка мясцовага беларускага насельніцтва хутка змагла арганізавацца да палітычнай

дзейнасці. У часе першых усеагульных выбараў у склад польскага парламента ў 1922 г. у Скідзелі быў створаны аддзел Беларускага выбарчага камітэту, які агітаваў за Блок нацыянальных меншасцяў № 18 (у гэтым блоку аб'ядналіся беларусы, немцы, украінцы і яўрэі). На жаль, нам не вядома, хто ўваходзіў у склад скідзельскага камітэта. Толькі ў газеце "Беларускі звон" за кастрычнік 1922 г. пісалася пра арышт у Скідзелі настаўніка Каялы [Беларускі звон. № 25(50). 11.10.1922]. Магчыма, гэты арышт быў неяк звязаны з палітычнай дзейнасцю.

У самім Скідзелі большасць галасоў на выбарах атрымаў спісак Польскай сялянскай партыі "Вызваленьне" (*PSL „Wyzwolenie")* – 245, на другім месцы быў Блок нацыянальных меншасцяў, за які агітаваў Беларускі выбарчы камітэт – 183 галасы, на трэцім – камуністы (102 галасы). Актывістамі выбарчай кампаніі *PSL „Wyzwolenie"* на Скідзельшчыне былі аграном Яўген Атаназевіч са Скідзеля і Рыгор Гуліда з Глінянаў [ДАГВ. Ф. 59. В. 1. С. 4. Арк. 34]. Затое на Скідзельскім вясковым участку, дзе большасць выбаршчыкаў складалі праваслаўныя сяляне-беларусы, за Блок нацыянальных меншасцяў аддалі галасы 615 чалавек, а за пракамуністычны спіс № 5 – 222. Іншыя партыі і блокі набралі ўсе разам на гэтым участку ўсяго 38 галасоў. Такім чынам, беларускія палітыкі атрымалі пераканаўчую перамогу ў вёсках Скідзельскай гміны. Дэпутатамі польскага сейму ад Гродзеншчыны сталі беларусы Сяргей Баран і Сымон Якавюк.

Займацца палітычнай дзейнасцю, нават і легальнай, было ў той час справай небяспечнай. 9 кастрычніка 1923 г. Пётр Сяўрук напісаў у сваім дзённіку: "Никогда, никогда не мог ожидать, что бы найстрожайшая польская власть могла продержать меня за дверями единственно за то, что хотел жить культурной жизнью, читать книги, творить и мыслить. Но книг негде достать. Ограничился выпиской газеты. Конечно, газету выбрал более правдивую, белорусскую и вот за это тюрьма". Пётр Сяўрук таксама пачаў пісаць "Скидельская летопись", у якой спрабаваў адлюстраваць падзеі, што адбываліся ў Скідзелі і яго ваколіцах, а таксама саму атмасферу свайго часу.

**Скидельская летопись. 1923 год.**

14 октября. – То что я хочу написать относится в сущности ни к одному дню и даже не к одному году. Для прошлых лет это имело большее значение, но начиная летопись теперь, я так поздно вписываю в свои записки жизнь нашей местности.

Скидель видал бои 1915-16 года. Возле Скиделя в т.н. Хватовском бору находится огромное военное кладбище, свидетель, или лучше говоря,

памятник войны. Это кладбище устроено немцами и имеет вид немецкой аккуратности. К сожалению этот памятник кровавой бойни после... значительно испорчен. Живописные ворота столярского искусства поломаны; ограда уничтожена, часовня снесена. Стоит только один большой крест, да на могилах каких-то начальников кресты более целы. На остальных же солдатских крестах с малым исключением оторваны горизонтальные поперечки, на которых были надписи каждого убитого.

Скидельские жители – крестьяне белорусы – бежали от войны, а евреи-торговцы промышленники и рабочие почти все остались. Бежали также крестьяне всех соседних деревень за малым исключением. Два года тому назад были везде на полях следы былого запустения – заросшие дёрном, иногда и лесом некогда паханные нивы. Теперь же почти все они «выдраны» за небольшим исключением.

Скидельское население начало возвращаться с бегства ещё в 1918 году и к 1922 году почти все возвратились за небольшими недочётами. Удивительно то, что более рано возвратились всякие приезжие в Скидель фабричные рабочие и батраки. Наверное водка манила их к себе своим очаровательным дурманом. Более степенные и трудящиеся крестьяне воротились в последнюю очередь. Есть такие которые воротились невольно под страхом горькой смерти или по неизвестным причинам. Не будь этого они никогда не воротились бы, потому что жить здесь тяжело до невозможности.

В Скиделе когда то существовала русская школа, даже три: две народные мужские и одна церковная женская. Теперь существуют польские школы. Крестьяне ими недовольны, и если некоторые посылают туда детей, то ради того, чтобы сбыть их на несколько часов с глаз. Науки нет никакой. И вот в течении четырёх лет растут невежи в большем количестве чем до войны.

Скидельские крестьяне все малоземельные, за исключением 2-х трёх накупивших земли, поэтому все стремятся на заработки, или, что сейчас в обычае, берут «на часть» землю в соседних деревнях, у крестьян, которые её сами не обрабатывают.

Заработки в настоящее время исключительно лесные. Лес рубят беспощадно, так что страшно, чтобы страна наша не стала безлесной украиной. На станции Скидель десятки десятин станционной площади и крестьянской земли завалены лесом. Каждую неделю приходят вагоны под погрузку. Иногда эшелонами.

Погрузка в настоящее время, единственный почти заработок. Прежде шли кожевенные фабрики, но сейчас по случаю быстрого взроста дороговли они все прекратили действия. Поэтому все стремятся к погрузке. Но здесь встречается одно обстоятельство позорящее скидельскую молодёжь. Молодёжь как будто сорганизовалась, но эта организация вредит здешнему пролетарию. Организация – «компания грузчиков» в которую входит молодёжь, занимает в первую очередь всякую работку при погрузке. Если она всей работы не сможет занять, то она остаётся на долю иных рабочих, которым надо прокормить семью. Но это бывает редко. Некоторые члены этой компании могли бы даже обойтись вовсе без заработков.

Летом настоящего года над нашим округом повисла гроза. Начала прекращаться рубка леса. Это конечно, было бы хорошо, но тогда не было бы заработков. Ввиду этого некоторым семьям пришлось бы умирать с голоду. Сейчас же рубка леса принимает угрожающие размеры, но она не спасает от безработицы. Работа есть, но ничего нельзя заработать. И чем дальше падает марка, чем выше дорожают товары, тем ничтожнее оплата труда, тем тяжелее покупать кусок хлеба.

И никакого улучшения. Белорусов никуда не берут на службу. Нет земельной реформы, но всякий чувствует, что так не должно быть. И чем больше растёт дороговля, тем скорее идёт дело к развязке.

Скидель этой развязки ждёт с напряжением! Но скоро ли?

1 ноября. – Ужасно жить, – ужасно думать о будущем. Каждый день надо добыть кусок хлеба дневным заработком и каждый день надо поискать работы. Голодных много, но работы нет. Пользуясь этим буржуа-эксплуататоры не дают никакой цены за труд. За ничтожные тысячи должен человек работать, а заработавши должен подумать, что купить: картофеля, хлеба, соли или лапти? Нужда равняет во всём. О сапогах

думать не приходится. Каждый день приносит новую подвышку в ценах на продукты и новую ничтожность заработков. Заработки сокращаются. Одновременно и сокращается заработная плата. По сравнению с 1921 годом заработок сократился на 90%, а заработная плата понизилась до 20 % заработной платы 1921 года.

Каждый день не обеспечен и одновременно следующий день грозит большим голодом. Под этой грозой проходит жизнь скидельского пролетариата. Но богачи вовсе не относятся сюда. Вот на днях открыто звено бандитизма, в доме суховлянского кулака. Множество ворованных вещей. Так вот каковы плоды нашей жизни. Живёшь под страхом голода и холода и то ничтожное, что обеспечивает тебя на минуту нельзя удержать, ибо каждую ночь может кто либо отнять его у тебя, несмотря на то, что оно <u>признаётся, даже правом твоей неотъемной</u> (!) (неприкосновенной) <u>собственностью</u>. Не лучше ли было бы отбросить это право <u>неотъемной</u> (увы?!) собственности, которая даёт возможность одному грабить другого и барствовать, а другого оставляет открытым под опасностью ограбления и голода. И лучше бы признать право <u>всеобщего</u> труда, чтобы «не трудящийся <u>не мог</u> есть».

Да, это только мечтания. И я здесь вижу как пара сытых лошадей везут грузную тушу какого-то мироеда, а худая тощая лошадёнка, с пустым животом еле волочёт воз дров на станцию. Мужик за это получит наверное 200 тысяч марок, т.е. на 3 фунта керосину (может быть на 4). А завтра он заработает (дай Бог, чтобы найти какую трущобу с дровами) на 15 фунтов соли. И если «пошихуе» то послезавтра наверное заработает на ½ пуда хлеба. А лошадке что же? Да шут ея не возьмет. Погода теперь теплее весенней, так на ночлег травы (сухой) наберётся.

Вот какова жизнь здешней бедноты. Хорошо если кто нажил коп десять ... да коп пять овса, хотя солома будет на резку, а на отруби может быть как либо в недели две денёчек удастся, то заработается.

Кроме того между беднотой нет единения. Наиболее разрушающим элементом являются евреи, которые захватывают лучшие работы. Несомненно, что их положение хуже крестьянского, потому что им надо

покупать всё от картофеля до одеяния, но надо поддержать и крестьян, не понижать им трудовую плату.

В Варшаве идёт борьба за лучшую жизнь. Может быть это борьба даст новые формы и нашей многотерпеливой бедностной жизни, а если дальше будет идти всё в таком же направлении, то придётся помирать с голоду.

Ещё погрожает война. Страшно, чтобы не смобилизовали последней лошади и не перервали последнего волоска, на котором мы висим.

Пётр Севрук

*Рукапіс «Скидельской летописи» П.Сяўрука захоўваецца ў асабістым архіве Д.Люціка*

У верасні 1924 г. у Скідзелі быў арыштаваны за раскідванне камуністычных улётак Іван Гайдук з Глінянаў. Прычым пры арышце яго спрабавалі адбіць у паліцыі Іван Шань, Аляксандр Мазалеўскі і Мікалай Міхно [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 41. Арк. 629.]. Паводле ўспамінаў камуністычнага дзеяча Віталя Сытага, першыя ячэйкі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі пачалі ўтварацца на Скідзельшчыне ў 1923 г. У 1924 г. паўстала ячэйка КПЗБ у вёсцы Бандары, у якую ўвайшлі сам Віталь Сыты і яго будучая жонка Л.Зорка.

У 1924 г. у Скідзелі налічвалася, паводле дадзеных мясцовай адміністрацыі, каля трох з паловай тысяч жыхароў. Большасць складалі яўрэі – 2754 чалавека, беларусаў было 362, палякаў – 124, татараў – 103 [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 10.]. Ва ўсёй гміне (апроч мястэчка) налічвалася каля 8 тысяч жыхароў, з іх 90 % складалі беларусы.

Палітычная сітуацыя, паводле звестак паліцыі, заставалася напружанай, хаця партызанскі рух быў падаўлены. Тайны інфарматар паліцыі са Скідзельшчыны паведамляў: "... настрой беларускага насельніцтва, асабліва ў ваколіцах Скідзеля і Азёр у стасунку да польскай дзяржаўнасці ёсць ненавісны. Антыпольская агітацыя праводзіцца да гэтага часу, як відаць, без сістэмы – хатнім спосабам, цяперашняе яе ўзмацненне мае выразны намер выклікаць неспакой і паніжэнне аўтарытэту Дзяржавы (...) З размоваў з людзьмі ўдаецца заўважыць пэўнае расчараванне з прычыны невыступлення Літвы, ад якой чакалі большай ваеннай авантуры. Калі пытаеш пры нагодзе, ці не ўлічваюць пры гэтым матэрыяльныя знішчэнні, якія прыносіць вайна, то адказваюць, што знішчэнні і так непазбежныя з прычыны надмерных падаткаў і ўвогуле з прычыны панавання палякаў".

Галоўнай прычынай адмоўнага стаўлення беларускага насельніцтва да польскай дзяржавы з'яўлялася палітыка нацыянальнай асіміляцыі і дыскрымінацыі беларусаў, якую паслядоўна праводзілі ўлады. З бегам часу сітуацыя не змянялася ў лепшы бок, чаму не спрыялі паводзіны

дзяржаўных ураднікаў, у большасці сваёй прысланых з этнічнай Польшчы, не ведаўшых беларускай мовы і не знаёмых з мясцовымі звычаямі. У газеце “Сялянская праўда” у кастрычніку 1924 г. быў надрукаваны ліст невядомага карэспандэнта, які напісаў пра канфлікт мясцовай моладзі з польскімі паліцыянтамі. Апошнія ў пьяным выглядзе ўварваліся на вечарыну, а пасля таго, як хлопцы іх выкінулі адтуль, арыштавалі некалькі некалькі мясцовых юнакоў нібыта за антыдзяржаўную дзейнасць” [Сялянская праўда. № 5, 10.10.1924].

Незадаволенасць людзей стварала спрыяльную глебу для пашырэння камуністычнай агітацыі. У 1925 г. у Скідзелі была створана раённая арганізацыя КПЗБ, якая кантралявала тэрыторыю Скідзельскай і Азёрскай гмінаў. У верасні таго ж году каля Пяшчанкі быў вывешаны плакат з заклікамі барацьбы супраць “капіталістычнай эксплуатацыі”. Дэфензіва прыйшла да высновы, што арганізатарам камуністычнага падполля на Скідзельшчыне быў местачковы яўрэй Янкель Лямперт, а пасля яго арышту ў лютым 1925 г. лідэрам камуністаў стаў Файвель Лямперт. Дэфензіва тасама даведалася, што камуністычная ячэйка ўзнікла ў вёсцы Пяшчанка, і ў яе склад уваходзяць Ілля Мышко і Фёдар Бубен. Сходы камуністаў звычайна адбываліся ў Скідзелі ў хаце Ёдлы Кац на вуліцы Татарскай 19, дзе зачытваліся рэфераты і прыносілася тайная літаратура. Туды часцяком прыходзілі Ілля Мышко з Пяшчанкі і Пётр Варановіч з вёскі Пыра. Апошні быў кіраўніком Азёрскага падраёна КПЗБ. Ён перавозіў камуністычную літаратуру са Скідзеля ў мястэчка Азёры.

15 верасня 1925 г. быў прызначаны чарговы сход у хаце Едлы Кац, але якраз у гэты момант паліцыя правяла масавыя арышты. На допыце Фёдар Бубен прызнаўся, што вывешваў камуністычныя транспаранты, а Ілля Мышко, што ўдзельнічаў у камуністычным сходзе, які праходзіў каля вёскі Хваты пад старшынствам Файвеля Лямперта. Аднак на судзе яны ўжо адмовіліся ад сваіх паказанняў. Увогуле, трэба адзначыць той факт, што ні Бубен, ні Мышко, нікога не выдавалі ў сваіх паказаннях, у адрозненне ад многіх іншых членаў падпольнай арганізацыі. Усе камуністы сцвярджалі на судзе, што давалі пад час следства паказанні пад прымусам. Файвель Лямперт прызнаў сваю дзейнасць і назваў сябе перакананым камуністам.

Усяго па гэтай справе ў Гродзенскім павеце было арыштавана 65 чалавек. Сярод іх былі жыхары Скідзеля і гміны: Янкель і Файвель Лямперты, Аўсей Кажушок (жыў на вуліцы Базарная 4), Бераль Шушан (Татарская 9), Зайдэль і Ёдла Кац (Татарская 19), Шмуэль Высокер (Скідзельская 2), Іцка Вініцкі (Каменская), Зэйдэль Шэшкель (Шпітальная 4), Янкель Біхвід, Калман Пела, Нотэ Каўфман (усе Базарная 32) Гірш Васерман (Базарная 26), Фёдар Бубен і Ілля Мышко (Пяшчанка). Чым завершыўся судовы працэс па гэтай справе, нам невядома.

Увогуле, многія скідзельцы цікавілся палітычным жыццём і чыталі беларускія газеты, хаця гэта і было небяспечна, а таксама дасылалі ў рэдакцыі газет свае лісты. Напрыклад, 9 студзеня 1926 г. у газеце "Беларуская Ніва" быў надрукаваны допіс карэспандэнта са Скідзеля пад псеўданімам М.Навабранец, у якім крытыкаваўся скідзельскі магістрат за тое, што ўвёў "маставы" падатак па 20 грошай з гаспадара [Беларуская Ніва. № 2(15). 09.01.1926.]. Аўтар нават даслаў верш на гэтую тэму:

*Гэй панове, будуць грошы*
*Бо жыве яшчэ мужык*
*Вось дзе выхад наш харошы*
*Вось падмога, ён прывык!*

З "Беларускай Нівай"супрацоўнічаў Пётр Мышко са Скідзельшчыны. Пра гэта сведчыла інфармацыя ў газеце, што ён даслаў у рэдакцыю 5 злотых. У чэрвені 1926 г. у газеце "Беларуская справа" з'явіўся допіс са Скідзельшчыны пад назвай "Сцеражэцеся правакатараў" [Беларуская Справа. №25. 21.07.1926].

Летам 1926 г. на абшары Скідзельскай гміны пачалі імкліва арганізоўвацца гурткі новай партыі – Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. Гэтую партыю заснавалі ў 1925 г. беларускія паслы ў польскім сойме, якія прытрымліваліся прасавецкай палітычнай арыентацыі – Браніслаў Тарашкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Павел Валошын і інш. У 1926 г. распачаўся проста маланкавы рост гэтай партыі, якая налічвала ў канцы года ўжо болей за 100 тысяч сяброў. У Скідзельскай гміне першым, 1 жніўня 1926 г. паўстаў гурток у Баброўні, 2 жніўня – у Стральцах і Ханевічах, 8 жніўня – у Хвайнянах, 10 жніўня – ў Раўках, 15 жніўня – у Глінянах, 17 жніўня – у Русінаўцах, 19 жніўня – у Скідзелі, 20 жніўня – у Бубнах, 29 жніўня – у Карашава, 31 жніўня – у Пузавічах [Народная Справа. № 9. 18.08.1926; № 11. 26.08.1926; № 13. 31.08.1926; № 17. 15.09.1926]. 21 жніўня 1926 г. быў створаны гмінны камітэт БСРГ у Скідзелі. Да канца года гурткі БСРГ былі ўтвораны ў кожнай вёсцы Скідзельскай гміны, апрача, хіба, каталіцкай Котры. Пётр Сяўрук так пісаў пра паўставанне Грамады на Скідзельшчыне ў сваім дзённіку: "Я не могу сочувствовать доктринам "Грамады", которые меня оттолкнули сразу, как только я прочитал их, но тем не менее самое движение связанное с "Грамадой" меня восхищает. Меня радует та солидарность, которая начинает родиться в народе в связи с организацией "Грамады", и только неприятно действует служение тем доктринам, которые выдвинуты "Грамадой" и которые являются чем-то наподобие церковных догматов о троице, о рае, о сотворении мира и т. п. в прекрасном христианском учении" [Рукапіс дзённіка Пятра Сяўрука захоўваецца ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі. КП – 85095].

У сакавіку 1927 г. у Мінску пры разведупраўленні АДПУ быў складзены падрабязны спіс гурткоў БСРГ Гродзенскага павета з указаннем імёнаў і прозвішчаў іх актыву. Гэтыя дадзеныя адпавядалі стану рэчаў на 28 снежня 1926 г. Усяго на той час у Гродзенскім павеце налічвалася 213 гурткоў Грамады, а ў Скідзельскай гміне – 30. Мэта складання спіску невядомым нам чэкістам (подпіс яго неразборлівы) была сфармуляваная такім чынам: "Списки нужно об'единить и использовать пока по проверке убегающих из Польши членов Громады, а в будущем можно будет использовать для работы нашей и разведуправления" [НА РБ у Мінску. Ф. 882. В. 2. С. 186. Арк. 156]. Відавочна, што спіскі былі перакладзеныя з беларускай мовы на рускую. Як нам уяўлецца, іх складальнікі выкарыстоўвалі інфармацыю з грамадоўскіх газетаў, дзе падаваліся звесткі пра заснаванне новых гурткоў і склад іх актыву. На падставе гэтых чэкісцкіх спіскаў мы склалі табліцу актыву гурткоў БСРГ Скідзельскай гміны (табл. 15).

*Табліца 15*

**Актыў гурткоў БСРГ у Скідзельскай гміне на снежань 1926 г.**

| п/п | **Месцазнаходжанне гуртка** | **Старшыня** | **Сакратар** | **Скарбнік** |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Агароднікі | Кірыла Мельнічак | Рыгор Мельнічак | Міхал Радзюк |
| 2 | Ахрымаўцы | Ян Шостак | Якуб Міхно | Мікалай Бубен |
| 3 | Баброўня | Ян Таранка | Міхал Касцевіч | Рыгор Касцевіч |
| 4 | Белякоўшчына | Каст. Саўка | Тодар Сеўка | Пётр Васюкевіч |
| 5 | Бірулічы | Ал.Скварнюк | Мікалай Неўгень | Васіль Скварнюк |
| 6 | Бубны | Міхал Гнідка | Мікалай Бубен | Лаўрэн Бырда |
| 7 | Галавачы | Міхал Пік | - | Міхал Батура |
| 8 | Гліняны | Янка Літвін | Андрэй Літвін | Янка Гайдук |
| 9 | Гушчыцы | Янка Брукіш | Мікалай Дзяніщчык | Сцяпан Каролік |
| 10 | Карашава | Ул.Фурман | Платон Варвноўскі | Даніла Кузьміцкі |
| 11 | Каўшова | Мікалай Лапіцкі | Улад. Банула | Андрэй Дашкевіч |
| 12 | Кашубінцы | Васіль Макарчук | Пётр Мышка | Мікалай Стокіш |
| 13 | Лазы | Каст. Балтрыкевіч | Іван Балтрыкевіч | Гальяш Балтрыкевіч |
| 14 | Лаўна | Сцяпан Рэкець | Ул. Клочка | Ул. Жук |
| 15 | Мазанава | Піліп Мікуліч | Фёдар Капыцкі | Васіль Капыцкі |
| 16 | Некрашы | Міхась Гуліда | Васіль Даўгун | Юры Даламбоўскі |
| 17 | Осьнікі | Пётр Саладоўнік | Міхал Шостка | Дзмітры Каскевіч |
| 18 | Пузавічы | Павел Лазоўскі | Даніла Скварнюк | Ян Кастоўскі |
| 19 | Пяшчанка | Фёдар Бубен | Мышка Гальяш | Мышка Павел |
| 20 | Раўкі | Васіль Салей | Юры Лобан | Васіль Костка |
| 21 | Рыскі | Сцяпан Рэкець | Ал. Рэкець | Рыгор Касарэвіч |
| 22 | Русінаўцы | Ар. Самойла | Антон Дубенскі | Вас. Кавалевіч |
| 23 | Скідзель | Язэп Мазалеўскі | Рыгор Мазалеўскі | Вера Сяўрук |
| 24 | Стральцы | Фёдар Якусевіч | Міхал Кізевіч | Аляксандр Сідаровіч |
| 25 | Сухаўляны | Алек. Стальбоўскі | Міхаіл Войташ | Мікалай Сеўка |
| 26 | Ханявічы | Сцяпан Васілевіч | Андрэй Крышаловіч | П.Крышаловіч |
| 27 | Харціца | Янка Манкевіч | Янка Манкевіч | Сцяпан Жук |
| 28 | Хвайняны | Вальд. Сіткевіч | Рыгор Сіцко | Янка Лазовіч |
| 29 | Хваты | Рыгор Хмыска | Кастусь Каяла | Ул.Неўгень |
| 30 | Чарлёна | Андрэй Бобча | Андрэй Шчасны | Іван Лара |

Крыніца: НА РБ. Ф. 882. В. 2. С. 186. Арк. 156-166.

Грамадоўцы актыўна ўмешваліся ў грамадскае жыццё, крытыкавалі мясцовыя ўлады. У газеце “Наша Справа” за снежань 1926 г. чытаем, што солтыс вёскі Гліняны распусціў 540 злотых быццам на направу маста, а вясковы гурток Грамады пастанавіў расследаваць гэтую справу. Раз’юшаны солтыс пагражаў “усіх упякчы ў астрог” [Наша Справа. № 3. 04.12.1926].

На пачатку 1927 г. дзяржаўныя ўлады арыштавалі кіраўнікоў БСРГ, а саму партыю афіцыйна забаранілі. У Скідзельскай гміне 30 студзеня 1927 г. ў вёсцы Галавачы прайшоў сход грамадоўцаў, які асудзіў забарону БСРГ. Паліцыя не змагла выявіць яго арганізатараў, паколькі “шматлікія сведкі ў часе расследавання адмаўляліся даваць паказанні... баючыся помсты з боку камуністычных элементаў” [ДАБ. Упраўленне беластоцкага ваяводы. С. 36. Арк. 12 адв.].

Сапраўды, пасля разгрому Грамады ўплыў КПЗБ на Скідзельшчыне толькі ўзрастаў. У маі 1926 г. камуністы правялі мітынг ля скідзельскага кінатэатра, на якім выступіў яўрэй Лазар Пачымок, і які завершыўся сутычкамі з паліцыяй. Паводле ўспамінаў Віталія Сытага, у 1927 г. на Скідзельшчыне налічваліся ўжо 22 ячэйкі КПЗБ.

Увосень 1926 г. у Скідзельскай гміне таксама распачаўся працэс заснавання гурткоў Таварыства беларускай школы. Паводле беларускай газеты “Народная Справа”, першыя лакальныя гурткі ТБШ у Заходняй Беларусі паўсталі ў Скідзелі, Любчы і Міры [Народная Справа. № 22. 07.10.1926]. Скідзельскі гурток ТБШ быў заснаваны 23 верасня 1926 г., старшынём якога абралі Пятра Сяўрука, сакратаром стаў Іван Дзелянкоўскі, скарбнікам – Іван Цывінскі. У гурток таксама ўступілі Андрэй Літвін з Глінянаў, Вера Сяўрук, Пётр Бежац, Аляксандр Мазалеўскі, Іван Шыла (працаваў парабкам ў маёнтку Скідзель), Ірына Карповіч з засценка Доўгі лес, Вольга Сяўрук, Марыя Шань, Захар Босы, Андрэй Мазалеўскі. Усяго ж спіс гурткоўцаў налічваў 36 сяброў [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 18. Арк. 229]. Выключную ролю ў стварэнні скідзельскага гуртка адыграў Пётр Сяўрук.

9 лістапада 1926 г. быў заснаваны гурток ТБШ у прынёманскай вёсцы Каўшова. Яго старшынём быў абраны Сцяпан Шыла, сакратаром Уладзімір Спас, скарбнікам Восіп Дашкевіч. Усяго ж гэты гурток аб’ядноўваў 65 чалавек, альбо амаль кожнага чацвёртага жыхара вёскі. 10 снежня быў утвораны гурток у вёсцы Раўкі. Яго старшынём стаў Васіль Салей, сакратаром Юры Лобан, скарбнікам Васіль Костка. Усяго ў гурток запісаліся 27 сяброў. 18 снежня паўстаў гурток ТБШ у Хвайнянах, у які ўступілі 26 вяскоўцаў, у тым ліку 9 дзяўчат. Старшынём хвайнянскага гуртка стаў Павел Лазовік, скарбнікам Ціцко Рыгор, а сакратаром Іосіф Чобат. 23 снежня быў заснаваны гурток у Хватах, які налічваў 10 сяброў. 7 студзеня 1927 г., якраз на Каляды, быў заснаваны гурток ТБШ у Пузавічах. Яго старшынём абралі Уладзіслава Саву, сакратаром Рыгора Быцкевіча (у паліцэйскім спісе ён быў пазначаны, як былы камуніст), скарбнікам Марыю Варона. Усяго ж

уступілі ў гурток 32 асобы. А на наступны дзень утварыўся гурток у Пяшчанцы, дзе старшынём стаў Дзяніс Лойша, сакратаром Мікалай Шмойла, скарбнікам Міхал Каскевіч. Усіх сяброў ТБШ у Пяшчанцы налічвалася 15.

І ўжо вясной, 13 красавіка 1927 г. паўстаў гурток ТБШ у Галавачах. У склад яго ўвайшлі 11 сяброў: Васіль Жук (старшыня, 45 г.), Мікалай Пракаповіч (сакратар, 28 г.), Макар Батура (скарбнік, 28 г.), Захар Батура (49 г.), Вера Батура (26 г.), Мікалай Пік (23 г.), Сяльвестр Куцко (39 г.), Язэп Жук (21 г.), Пётра Сакалінскі (35 г.), Аляксандр Міхалковіч 22 г.), Аляксандр Кандрашук (36 г.).

Усяго ж агульная колькасць сяброў Таварыства беларускай школы на Скідзельшчыне вясной 1927 г. дасягнула лічбы 195 чалавек [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 10. Арк. 134]. Пераважна гэта былі маладыя людзі ва ўзросце ад 20 да 30 гадоў, але сустракаліся і старэйшыя. Напрыклад, у Галавачах у гурток уступіў Захар Батура, які меў 49 гадоў. У гурткі ўступала і шмат дзяўчат. Напрыклад, у Хвайнянскім гуртку з ліку 26 сяброў дзяўчат было 9. А ў Пузавіцкім гуртку скарбнікам абралі Марыю Варона.

Галоўнай мэтай дзейнасці гурткоў з’яўлялася стварэнне беларускамоўных школаў. Ужо ўвосень 1926 г. Пётр Сяўрук і яго аднадумцы пачалі збіраць дэкларацыі ад бацькоў дзяцей школьнага ўзросту з патрабаваннем адчыніць у Скідзелі беларускую школу. Асабіста Пётр Сяўрук сабраў у Скідзелі 22 дэкларацыі на 34 дзіцяці. У Пяшчанцы Пётр Мышко сабраў 18 дэкларацый на 24 дзяцей, у Сухаўлянах Мікалай Войташ – 24 дэкларацыі на 37 дзяцей, у Глінянах Захар Кемяжук – 33 дэкларацыі на 48 дзяцей, у Некрашах Міхась Гуліда – 33 дэкларацыі, у Хватах было сабрана 14 дэкларацый [ДАГВ. Ф. 87. Воп. 1. С. 83. Арк. 178-200]. Але дзяржаўныя ўлады ігнаравалі гэтыя патрабаванні, чым яшчэ болей абвастралі і так напружаную палітычную сітуацыю. Калі сяляне вёскі Раўкі прынеслі ў гміну дэкларацыі на беларускую школу, дык нехта Замшыцкі са Скідзельскага маёнтка і пісар гміны Вялічка пагражалі ім: “За краты вас пасадзіць, а не даць вам беларускую школу” [Наша Справа. № 6. 15.12.1926].

Другім кірункам дзейнасці ТБШ стала культурна-асветная праца. Амаль кожнае свята сябры гурткоў ладзілі ў Скідзелі і ў вёсках гміны тэатральныя імпрэзы. Вось як газета “Праца” распавядала пра пастаноўку п’есы Францішка Аляхновіча “Дрыгва” сябрамі гуртка ТБШ з Пяшчанкі ў вёсцы Раўкі ў лютым 1927 г.: “Перад пачаткам спектакля выступіў хор. Як толькі паднялася заслона глядзельнікі былі зачараваны выглядам нацыянальных вопратак. Прапяялі: “Не пагаснуць зоркі ў небе”. Пяючы гэту песню кожны з глядзельнікаў адчуваў у сэрцы нейкі жаль і спачуцьцё да свайго роднага” [Праца. № 3. 12.11.1927]. Гурткоўцы Пяшчанкі пасля вечарыны заклікалі моладзь з Бубнаў і Белякоўшчыны “прачнуцца і ўзяцца за працу”.

У красавіку 1927 г. газета “Наша Праўда” надрукавала пастанову гуртка ТБШ у вёсцы Хвайняны Скідзельскай воласці. Яе змест быў наступным: “Дзеля таго, што мы, беларусы, з-прадаўна засяляем наш Родны Край Беларусь – мы, сучаснае пакаленьне, дасталі ад дзядоў і прадзедаў сваіх, як спадчыну, цэлы акіян гора і мук, якія яны пераносілі ад веку... Мы пэўны ў тым, што няшчасці гэтыя будуць вісець над намі да таго часу, пакуль будзе жыць між намі цемра-няпісьменнасць. Дзеля гэтага мы дамагаемся сваёй роднай беларускай школы, у якой бы мы вучыліся на сваёй – беларускай мове” [Наша Праўда. № 8. 28.04.1927]. На сходзе, які прыняў гэтую пастанову, жыхары Хвайнян сабралі 28 злотых на адкрыццё беларускай бібліятэчкі ў сваёй вёсцы.

10 красавіка 1927 г. адбыўся акруговы з’езд ТБШ у Гродне, на якім выступаў вядомы беларускі дзеяч сенатар Аляксандр Уласаў. Пётр Сяўрук быў абраны старшынёй акруговай управы. Скарбнікам стаў Пётр Кізевіч, ураджэнец вёскі Стральцы Скідзельскай гміны, які на той час ужо жыў у Гродне. А ў наглядную раду ўвайшоў Пётр Мышко з Кашубінцаў [Наша Праўда. № 7. 22.04.1927].

Гурткі ТБШ на Скідзельшчыне амаль кожны тыдзень арганізоўвалі беларускія вечарыны. Напрыклад, 24 красавіка 1927 г. у Ханявічах скідзельскі гурток зладзіў тэатральную пастаноўку “Птушка шчасця” [Наша Праўда. № 8. 04.05.1927], на наступны дзень у Галавачах была пастаўлена пьеса “Дрыгва” Францішка Аляхновіча, а ў Каўшове – “Раскіданае гняздо” Янкі Купалы. 8 мая ў Скідзелі ў памяшканні местачковага тэатра была пастаўлена пьеса “Страхі жыцця”, 15 мая ў Пяшчанцы – пьесы “Міхалка” і “Модны шляхцюк” [Наша Праўда. № 15. 25.05.1927]. 28 мая Пётр Сяўрук прачытаў рэферат з нагоды 10-годдзя смерці Максіма Багдановіча ў Гродне ў клубе Яўрэйскіх акадэмікаў [Наша Праўда. № 19. 08.06.1927]. А на наступны дзень памінальны вечар, прысвечаны Максіму Багдановічу, адбыўся ўжо ў Скідзелі [Наша Праўда. № 23. 22.06.1927]. 24 ліпеня 1927 г. адбыўся сход акруговай управы ТБШ у Гродне, на якім выступіў з дакладам Пётр Сяўрук. На гэтых сходзе прысутнічаў вядомы беларускі дзеяч, пасол польскага сейма Ігнат Дварчанін [Наша Праўда. № 33. 27.07.1927].

11 верасня 1927 г. скідзельскі гурток ТБШ адсвяткаваў свае ўгодкі. У справаздачы яго старшыні Пятра Сяўрука было, напрыклад, адзначана, што гурток за гэты час адчыніў бібліятэку, якая налічвала 280 кніг. З гэтай лічбы больш 100 кніг гурток купіў, каля 60 было ахвяравана рознымі асобамі і каля 100 пазычана. Сядзіба ТБШ і бібліятэка месціліся якраз у хаце Пятра Сяўрука. Хаты-чытальні былі адчынены ў суседніх вёсках Пяшчанка і Пузавічы. Агульныя выдаткі скідзельскага гуртка за год склалі 260 злотых, а прыбытак – 400 злотых. Складкі сяброў далі ў бюджэт гуртка 145 злотых, а спектаклі – 112. На сходзе, які завершыўся спевам песні на словы Янкі Купалы "Не пагаснуць зоркі ў небе", было вырашана назваць скідзельскі гурток іменем паэта Максіма Багдановіча [Праца. № 4. 16.11.1927].

У вёсцы Стральцы мясцовым гуртком ТБШ была заснавана бібліятэка-чытальня імя беларускага дзеяча Антона Луцкевіча. Гэтая бібліятэка налічвала 70 беларускіх, расійскіх і польскіх кніг. Прычым тры кнігі для яе ахвяраваў сам А.Луцкевіч. Загадчыкам бібліятэкі працаваў Фёдар Якусевіч, "з ліку найвыдатнейшых змагароў-беларусаў нашае вёскі і гміны", як пісаў пра яго карэспандэнт газеты "Наша Праўда" [Наша Праўда. №7. 22.04.1927].

Летам таго ж 1927 г. беларускія актывісты дасягнулі значных поспехаў на выбарах у мясцовае самакіраванне. Праўда, выбары ў скідзельскі магістрат беларускім дзеячам поспеху не прынеслі, а выбарчы спісак прыхільнікаў КПЗБ быў забаронены. Раднымі магістрата сталі 8 яўрэяў, 2 палякі, 1 татарын і 1 "прадажны беларус", як назвала яго газета "Наша Праўда" [Наша Праўда. № 33. 27.07.1927]. А вось на выбарах ў гмінную раду, як пісала "Наша праўда", 3 жніўня 1927 г. былі абраныя 13 "сьвядомых беларусаў" і 1 мясцовы шляхціц Гамулецкі, які лічыў сябе палякам [Наша Праўда. № 38, 13.08.1927]. Паводле ж інфармацыі каменданта паліцыі, у скідзельскую гмінную раду прайшлі 2 кандыдаты польска-беларускага блоку, 11 беларусаў і 1 кандыдат ад "Блоку гаспадарчай направы" [ДАБ. Упраўленне беластоцкага ваяводы (УБВ). 37. К. 153]. На першым паседжанні гміннай рады, якое адбылося 9 кастрычніка 1927 г., былі прыняты наступныя пастановы: 1) выдаткаваць з гміннага бюджэта сродкі на ўтварэнне пры гміне беларускай бібліятэкі; 2) разглядаць усе справы наведвальнікаў гміны вусна і пісьмова на беларускай мове; 3) інфармацыйная дошка павінна быць на беларускай мове. Войтам Скідзельскай гміны стаў былы грамадовец Рыгор Ціцко, якога да таго ж абралі ў Гродзенскі павятовы сеймік.

Сярод радных вялікі ўплыў мелі сябры КПЗБ. Пра гэта сведчыць дакумент, які захоўваецца ў Нацыянальным архіве Беларусі ў Мінску – справаздача аб дзейнасці Скідзельскага камітэта КПЗБ за 1930 г. Невядомы нам аўтар гэтай справаздачы – напэўна жыхар Скідзельшчыны – крытыкуе дзейнасць радных гміны: "В начале своей деятельности Рада Гминная стояла целиком под руководством партии и старалась провести в жизнь те лозунги, которыми можно было оперировать в легальных условиях работы; это – о белоруссизации, о снятии податков с малоземельных, о более правильном распределении повинностей в натуре, о субсидировании культурно-просветительных организаций и т. п., в то же время не соглашаясь с теми требованиями, которое выставляло правительство". Але з цягам часу "деятельность рады гминной сошла на линию полной соглашательской работы с фашистским правительством" [Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь у Мінску. Ф. 242-п. В. 1. С. 271. Арк. 381 (Выказваем падзяку за прадастаўленне гэтага дакумента мінскаму гісторыку Алесю Пашкевічу)]. Аўтар справаздачы сцвярджаў, што члены рады ігнаравалі ўсе дырэктывы райкама КПЗБ, таму камітэт пастанавіў выключыць іх з

партыі. Тут варта падкрэсліць, што кіраўніцтва КПЗБ па заданні савецкай разведкі прымушала выконваць ролю палітычных агітатараў, падштурхоўваць масы любымі сродкамі да ўсебаковага і поўнага байкоту дзяржаўнай улады. Але такая палітыка адмоўна адбівалася на беларускім культурным жыцці, давала ўладам падставы для ліквідацыі гурткоў ТБШ і беларускіх сельскагаспадарчых каапературываў. Тых жа скідзельскіх радных, якіх кэпэзэбоўцы лічылі ледзь не здраднікамі, мясцовыя дзяржаўныя чыноўнікі разглядалі якраз як "антыдзяржаўнікаў". Калі 21 лістапада 1929 г. на войта Скідзельскай гміны быў выбраны Павел Лапыш, дык камендант паліцыі паведаміў у Гродна, што той "падазраваецца ў антыдзяржаўнай дзейнасці" [ДАБ. УБВ. 50. К. 113].

У выніку паліцэйскіх рэпрэсій слабела актыўнасць гурткоў ТБШ. Камендант скідзельскага пастарунка паліцыі паведамляў у Гродна ў студзені 1928 г.: "У мінулым месяцы дзейнасць таварыства беларускай школы значна аслабла і не пашыралася так інтэнсіўна, як у папярэднім месяцы, калі кожнае свята іх кіраўніцтва арганізоўвала тэатральныя паказы, на якія збіралася шмат гледачоў і ня выключана, што на тых зборках праводзілася антыдзяржаўная праца. Зараз у сувязі з узмоцненым наглядам за дзейнасцю таварыства з боку паліцыі і солтысаў дзейнасць іх заўважна зменшылася" [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 172. Арк. 48].

У 1928 г. у польскай дзяржаве праводзіліся чарговыя парламенцкія выбары. У студзені ўлады ствараюць у Скідзельскай гміне Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам Пана Маршалка Пілсудскага (ББСУ), які павінен быў забяспечыць перамогу праўрадавых сілаў. 7 лютага 1928 г. у памяшканні "Стшэльца" ў Скідзелі адбыўся сход прыхільнікаў ББСУ, на які сабраліся 200 чалавек. У склад гэтага блоку ўступілі і некаторыя былыя актывісты Грамады і ТБШ.

Камендант паліцыі пісаў у справаздачы за студзень 1928 г., што варожае стаўленне да Польшчы мясцовага насельніцтва можа быць зменена на лепшае разам з паляпшэннем матэрыяльных умоваў жыцця. Ён адзначаў, што балючым пытаннем застаецца вайсковае асадніцтва, ва ўмовах, калі мясцовыя жыхары адчуваюць востры недахоп зямлі. У Скідзельскай гміне на той час налічвалася 9 вайсковых аснадікаў, якія мелі 132 гектары зямлі, а таксама 11 панскіх маёнткаў.

Напярэдадні выбараў актывізавалася КПЗБ. У лютым 1928 г. прыхільнікі камуністаў сабралі ў Скідзелі і ў Каўшове каля 70 подпісаў за кандыдатаў свайго блоку. З увагі на тое, што ўлады маглі забараніць камуністычны спіс, прыхільнікі КПЗБ вылучалі адразу некалькіх спісаў. Так, на Скідзельшчыне збіралі подпісы за "Беларускае сялянска-работніцкае аб'яднанне", у якім кандыдатамі былі Міхал Баран (меў 34 гады ўзросту, жыў у Скідзелі на вул.Татарскай) і Макар Батура з Галавачаў, а паўнамоцнікам з'яўляўся Пётр Мышко з Кашубінцаў [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 170. Арк. 42 адв.]. Быў таксама выбарчы спісак

“Радыкальных Работнікаў і Сялянаў”, кандыдатамі ў якім ад Скідзельшчыны з’яўляліся Міхал Кізевіч са Стральцоў (меў 26 гадоў) і шавец Шлома Варабейчык (меў 26 гадоў) са Скідзеля. Агітацыю на карысць Блока нацыянальных меншасцяў праводзіў у Скідзелі лекар-яўрэй Даніэль Сарнацкі.

А ў часе праведзення парламенцкіх выбараў 4 сакавіка 1928 г. у Скідзелі адбыліся масавыя хваляванні насельніцтва. Абураныя тым, што ім не даюць магчымасць прагаласаваць (а ўлады штучна стварылі такую сітуацыю, ведаючы, што мясцовыя выбаршчыкі ў большасці аддадуць свой голас за камуністаў і іх прыхільнікаў), сяляне спрабавалі штурмаваць выбарчы ўчастак, павыбівалі ў ім шыбы. Камендант паліцыі толькі занатаваў у справаздачы, што ў будынку “Стшэльца” адбылося хваляванне тых, хто не паспеў прагаласаваць [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 171. Арк. 150]. З Гродна быў прысланы на грузавіках спецыяльны аддзел паліцыі, які без разбору збіваў усіх, хто ім трапляў на вочы. Быў збіты паліцыяй і арыштаваны таксама кіраўнік гуртка ТБШ Пётр Сяўрук.

На двух выбарчых участках у мястэчку Скідзель былі атрыманыя наступныя вынікі галасаваньня: спісак № 1 “Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам” (*Bezpartyjny Blok Współpracy z Rządem*) – 812, № 2 “Польская сацыялістычная партыя” (*Polska Partia Socjalistyczna*) – 1, № 13 “Работніцка-сялянскае адзінства” (*Jedność Robotniczo-Chłopska*) – 725, № 18 “Блок нацыянальных меншасцяў” (*Blok Mniejszości Narodowych*) – 585, № 20 “Рускае нацыянальнае аб’яднанне” – 1, № 25 “Польская партыя хрысціянскай дэмакратыі” (*Polskie Stronnictwo Chrzescjańskiej Demokracji*) – 123, № 33 “Агульнажыдоўскі нацыянальны выбарчы блок да Сейма і Сената” (*Ogólno-Zydowski Narodowy Blok Wyborczy do Sejmu i Senatu*) – 39 [ДАГВ. Ф. 63. В. 1. С. 5]. Такім чынам, вынікі выбараў для беларускіх нацыянальных актывістаў выглядалі значна горшымі ў параўнаньні з выбарамі 1922 г. Найбольш галасоў набраў у Скідзелі праўрадавы Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам Пана Маршалка Пілсудскага.

У сакавіку 1928 г. павятовы падкамісар Міцінскі загадаў гмінным камендантам паліцыі падаць яму тайныя спісы тых, хто агітаваў за камуністаў і прыкласці падрабязныя звесткі пра іх маёмасны стан. Адначасова прапаноўвалася падаць і спісы тых, хто паказаў сябе лаяльным да дзяржаўнай улады. Звесткі пра матэрыяльны стан беларускіх дзеячоў Скідзельскай гміны, сабраныя паліцыяй, сведчаць, што сярод іх сустракаліся як бednякі, так і заможныя гаспадары. Напрыклад, у вёсцы Пяшчанка кіраўнікамі беларускага руху былі дастаткова багатыя сяляне. Міхал Каскевіч, які быў сакратаром гуртка ТБШ, меў 6 дзесяцін зямлі, добрую забудову, трымаў 2 коней, 3 кароў, звыш 10 галоў дробнай жывёлы. Пётр Мышко меў 10 дзесяцін, добрую забудову, трымаў каня і 2 кароў. Былы старшыня гуртка ТБШ у Хвайнянах Павел Лазовік меў 12 дзесяцін зямлі, што з’яўлялася на той

час для Скідзельшчыны вялікім надзелам [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 20. Арк. 54-57].

Пасля парламенцкіх выбараў 1928 г. актыўнасьць гурткоў ТБШ пайшла на спад. У красавіку 1928 г. камендант скідзельскага пастарунка адзначаў: "...гурткі знаходзяцца ў стадыі распаду, бо не выклікаюць такой вялікай цікавасці ў мясцовага насельніцтва, як раней. Галоўныя актывісты гурткоў у выніку рэпрэсій з боку пастарунка пакідаюць свае пасады і гурткі без апекі" [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 173. Арк. 77 адв.]. На 14 кастрычніка 1928 г. у Гродне быў прызначаны акруговы з'езд ТБШ, у якім збіраліся браць удзел 26 дэлегатаў да мясцовых гурткоў. Прычым сярод іх было 11 прадстаўнікоў Скідзельскай гміны: Каскевіч Міхал (Пяшчанка), Ціцко Рыгор (Хвайняны), Войтас Міхал (Сухаўляны), Сяўрук Пётр (Скідзель), Кізевіч Міхал (Стральцы), Касцевіч Міхал (Баброўня), Цывінскі Сцяпан (Скідзель), Байкоўскі (Харціца), Чобат Фёдар (Хвайняны), Сіткевіч А. (Хвайняны), Стальбоўскі М. (Пузавічы), Ківейша І. (Харціца). Але гэты сход быў забаронены павятовым старастам.

У лістападзе 1928 г., паводле паведамлення каменданта паліцыі, у Скідзельскай гміне былі вывешаны два чырвоныя сцягі. Ён таксама адзначыў у справаздачы, што "з існуючых на тэрыторыі гміны таварыстваў толькі Т-ва Беларускай Школы, якое месціцца ў Скідзелі, праяўляе адзнакі жыцця, іншыя ж ніякай дзейнасці не праяўляюць і існуюць толькі на паперы" [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 176. Арк. 115]. Рэпрэсіі супраць актывістаў гурткоў ТБШ дзяржаўныя ўлады заўсёды апраўдвалі неабходнасцю барацьбы з камунізмам.

На пачатку 1929 г. на тэрыторыі Скідзельскай гміны працягвалі актыўна дзейнічаць толькі гурткі ў Скідзелі і Каўшове. Гэта выклікала незадавальненне павятовага каменданта паліцыі Міцінскага, які пісаў у скідзельскі пастарунак: "Ужо ва ўсім павеце, апроч пастарунка Скідзель, дзякуючы зацікаўленасці камендантаў пастарункаў, зліквідаваныя гурткі ТБШ, а ў даверaным Пану раёне яны яшчэ існуюць: у вёсцы Каўшова і ў самым мястэчку Скідзель. Рэкамендую Пану распачаць адпаведныя крокі ў духу шматразовых павучэнняў Пана Старасты, скіраваныя да іх ліквідацыі. Зразумелая рэч, сродкаў яўных, адкрытых і легальных ужываць Пан не можа. Аднак у распараджэнні Пана, як каменданта пастарунка, ёсць тысячы спосабаў, з дапамогай якіх можа Пан, пры адпаведным спрыце і такце, ускосна ўплываць на сяброў актыву ТБШ, зняхочваючы іх да далейшай працы ў Т-ве і схіліць да развязання гурткоў" [ДАГВ. Ф. 24. В.1. С. 24].

У лістападзе 1927 г. была праведзена рэвізія Скідзельскага гуртка ТБШ, пад час якой паліцыянты канфіскавалі пячатку гуртка, усе канцылярскія паперы, некаторыя кнігі, у тым ліку "Гісторыю беларускай літаратуры" Максіма Гарэцкага [Наша Праўда. №1. 30.03.27]. Камендантам Скідзельскага пастарунка ў той час стаў нехта Нойбаўэр, які ў кастрычніку 1929 г. наступным чынам ахарактарызаваў мясцовае

насельніцтва: “Беларусы так упартыя ў выкананні ўсялякіх распараджэнняў, як і ў выплаце падаткаў, вечна незадаволеныя, аддаюцца п’янству і бойкам. Варожа адносяцца да ўсяго, што польскае, а найвялікшай нянавісцю палаюць да асаднікаў. Такое становішча не ўдасца паправіць настолькі доўга, наколькі гмінная рада будзе складацца з антыдзяржаўнікаў” [ДАГВ. Ф.17. В. 1. С. 203. Арк. 64]. Адносна абвінавачвання мясцовых жыхароў у п’янстве цікава будзе прывесці зварот павятовага паліцэйскага падкамісара Міцінскага да самаго Нойбаўэра ў лістападзе 1929 г.: “Дайшлі да мяне звесткі, што Пан ад часу да часу напіваецца. Папярэджваю, што калі гэты факт у будучым сканстатую, адразу будзе Пан зняты са сваёй пасады” [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 24. Арк. 42].

Скідзельскі камендант пісаў у верасні 1928 г.: “Галоўныя дзеячы ТБШ, як-то Касцевіч Міхал з вёскі Баброўня, Сяўрук Пётр са Скідзеля, а таксама радны Кізевіч Міхал з вёскі Стральцы ўсімі сіламі стараюцца ўжываць сваіх уплываў, каб захаваць гурткі, аднак напатыкаюцца ў сваёй працы на абыякавасць шырокіх масаў” [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 176].У чэрвені 1929 г. камендант паліцыі занатаваў у сваёй справаздачы: “Сцверджана, што асобныя дзеячы Таварыства беларускай Школы ўсімі сіламі робяць намаганні сярод мясцовай люднасці, каб Т-ва той школы стаялі на адпаведным узроўні і пасяхова развіваліся, аднак шырэйшыя масы насельніцтва ніякага ўдзелу ў гэтым руху не бяруць, зусім не цікавяцца той акцыяй”.

У верасні 1929 г. гурток ТБШ у Скідзелі налічваў ужо ўсяго 12 сяброў [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 24. Арк. 75]. 26 верасня яго кіраўнік Пётр Сяўрук уласнаручна склаў на запатрабаванне мясцовых уладаў спіс сяброў гуртка: “Пётра Сяўрук, сын Якуба, 24 гады (старшыня), Міхал Войтас, 22 г. (сакратар) (на той момант быў ужо ў польскім войску – аўтары), Сцяпан Цывінскі, 26 г. (скарбнік), Вера Сяўрук, дачка Андрэя, 23 г., Вера Карповіч, д. Міхала 23 г., Вольга Сяўрук, д. Якуба, 22 г., Захар Босы, с. Мікіты, 26 г., Язэп Мазалеўскі, с. Канстанціна, 27 г., Рыгор Мазалеўскі, с. Канстанціна, 27 г., Міхал Гуліда, 25 г., Васіль Фурман, 26 г., Даніла Скварнюк 26 г.”

Кіраўнік скідзельскага гуртка Пётр Сяўрук вельмі адмоўна ставіўся да палітызацыі ТБШ, на якую штурхалі гэтую арганізацыю актывісты КПЗБ. Удзел гурткоўцаў у палітычных акцыях станавіўся для ўладаў зручнай падставай для ліквідацыі гурткоў. У чэрвені 1929 г. Сяўрук даслаў у Галоўнае праўленне ТБШ у Вільні і акружное праўленьне ў Горадні пратэст на рэзалюцыю, прынятую на з’ездзе дэлегатаў Таварыства беларускай школы у Вільні. Ён лічыў, што гэты дакумент, прасякнуты нянавісцю да ўсіх нязгодных з камуністычнай ідэалогіяй, толькі кампрамітаваў ТБШ і культурна-асветную дзейнасць беларусаў. Цікава, што канспект гэтага ліста Пётры Сяўрука ўвайшоў у тэкст справаздачы беластоцкага ваяводы за чэрвень 1929 г. [ДАБ. УБВ. 49. К. 37]. Значыцца, польскія ўлады ведалі, што Сяўрук і многія яго сябры-

гурткоўцы не падзяляюць радыкальныя камуністычныя погляды, але працягвалі ціснуць на гурток і абвінавачваць яго сяброў у камунізме.

Упарта трымаўся ў Скідзельскай гміне таксама гурток ТБШ у Каўшове. У справаздачы за люты 1929 г. скідзельскі камендант паліцыі адзначаў: "З усіх існуючых на тэрыторыі гміны гурткоў толькі гурток у вёсцы Каўшова дае пра сябе знаць, арганізоўваючы час ад часу сходы, абмяркоўваючы асветныя справы... Душой гэтых сходаў бывае нейкі Сцяпан Шыла – асоба палітычна падазроная, які ў сваім часе праводзіў арганізацыйную працу ў Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамадзе" [ДАГВ. Ф. 38. В. 1. С. 200. Арк. 71-71 адв.]. У ліпені таго ж года камендант зноў піша ў сваёй справаздачы: "Толькі пры гуртку таварыства ў вёсцы Каўшова існуе драматычнае колка, якое час ад часу арганізоўвае аматарскія прадстаўленні... што з'яўляецца адзінай крыніцай прыбытку" [ДАГВ. Ф. 38. В. 1. С. 201. Арк. 148].

Смерць Пятра Сяўрука ў кастрычніку 1929 г. сталася непапраўнай стратай для беларускай культурна-асветніцкай справы на Скідзельшчыне. Камендант паліцыі адзначыў у сваёй справаздачы: "У мястэчку Скідзель дзейнасць Т-ва зменшылася пасля смерці Пятра Сяўрука, выбітнага дзеяча" [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 203]. Кіраўніком Скідзельскага гуртка ТБШ пасля смерці Пятра стала яго родная сястра Вольга Сяўрук. Праўда, у канцы студзеня 1929 г. камендант пастарунка пісаў у сваёй справаздачы, што скідзельскі гурток ТБШ самараспусціўся, а гурток у Каўшова не дзейнічае з прычыны страты кантактаў са Скідзелем [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 201. Арк. 174]. Але гэтая інфармацыя аказалася заўчаснай. У студзені 1930 г. камендант ужо падае звесткі, што скідзельскі гурток функцыянуе, хаця налічвае усяго 11 сяброў [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 29]. У той час у Скідзелі дзейнічала яшчэ некалькі культурна-асветных арганізацый: польская арганізацыя "Мацеж Школьна" налічвала 15 сяброў, яўрэйскія арганізацыі "Тарбут" і "Культура" – адпаведна 150 і 70 сяброў. Але рэпрэсіі паліцэйскіх уладаў абрушваліся менавіта на беларусаў. Пры гэтым камендант паліцыі сцвярджаў, нібыта ТБШ "у камуністычным духу ўплывае на беларускае насельніцтва". Неўзабаве скідзельскі гурток спыніў фармальнае існаванне. За 1931 г. у матэрыялах мясцовай паліцыі намі не знойдзена ніякіх звестак пра яго дзейнасць.

Але антыдзяржаўныя настроі сярод мясцовай моладзі не згасалі, а хутчэй наадварот. Камендант Скідзельскага пастарунку паліцыі пісаў у лістападзе 1929 г.: "Беларусы настроены варожа (да дзяржавы – аўт.), толькі не хапае ім арганізацыі і літаратуры, затое яўрэі ўжо амаль ад наймалодшых знаходзяцца ў арганізацыях, адныя ў спартовых, ва ўзросце дапрызыўным у арганізацыях антыдзяржаўных, але галоўным чынам у прафесійных" [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 203. Арк. 101]. 28 лютага 1931 г. скідзельскія хлопцы Міхал Стальбоўскі, Міхал Трусь, Уладзімір Шань і Аляксандр Фурман прыйшлі на паседжанне мясцовага аддзела Стралецкага Звяза і праспявалі там беларускі гімн "Ад веку мы спалі"

[ДАБ. УБВ. 58. К. 56]. Інфармацыя пра гэты ўчынак дайшла нават да беластоцкага ваяводы. Нам невядома, чым скончылася справа, але толькі за спяванне гэтай патрыятычнай беларускай песні тады часта саджалі ў турму, а тут яшчэ хлопцы праспявалі яе на сходзе шавіністычнай ваенізаванай арганізацыі, якой быў Стралецкі Звяз.

Некаторыя маладыя хлопцы са Скідзельшчыны ў той час вучыліся ў беларускіх гімназіях, якія з'яўляліся галоўнымі асяродкамі нацыянальнай культуры ў Заходняй Беларусі. Напрыклад, восенню 1930 г. у Віленскай беларускай гімназіі вучыліся Анатоль Мышко і Уладзімір Лабко са Скідзельшчыны. У тым жа годзе з гэтай гімназіі за палітычную дзейнасць быў выключаны Міхал Літвін з Глінянаў, які перавёўся ў Клецкую беларускую гімназію, дзе таксама актыўна браў удзел у палітычных акцыях.

У 1931 г. у Скідзелі, паводле дадзеных дзяржаўнай адміністрацыі, налічвалася 4500 жыхароў, з іх 70 % яўрэяў, 16 % беларусаў, 8 % палякаў і 6 % татараў. У гміне налічвалася 9792 жыхараў, з іх 89 % беларусаў, 10 % палякаў і 1% прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 39. Арк. 175]. Тэрыторыя гміны складала 206 км$^2$. У Скідзелі і ў вёсках Карашава, Пузавічы, Сухаўляны, Гліняны і Хваты дзейнічалі сельскагаспадарчыя кааператывы. З фінансавых устаноў у Скідзелі працавалі банк *"Стэфчыка"*, "Яўрэйскі народны банк" і "Яўрэйскі купецкі банк". У Скідзелі і гміне дзейнічала даволі шмат грамадскіх аб'яднанняў: *"Польска мацеж школьна"*, Яўрэйскае культурнае таварыства *"Тарбут"*, Аб'яднанне яўрэйскіх школ, суполкі *"Стралецкага звязу"* ў Скідзелі і ў вёсцы Котра, яўрэйскі спартыўны клуб *"Крафт"*, яўрэйская скауцкая арганізацыя *"Хамашэр-Хацанір"*, таварыства *"Ютшэнка"*, суполкі добраахвотнай пажарнай варты ў Скідзелі, Галавачах і Хвайнянах, Саюз настаўнікаў агульнаадукацыйных школ *"Агніска"*, Таварыства грамадскай апекі *"Пшыстань"*, Таварыства аховы здароўя яўрэйскага насельніцтва *"Тог"*, філія Беластоцкага таварыства апекі над яўрэйскімі сіротамі, суполка Яўрэйскай сацыялістычнай рабочай партыі *"Паалей Сіон"*, Саюз дробных гандляроў, Яўрэйская рабочая бібліятэка *"Культура"*, Саюз уладальнікаў нерухомасці. У Скідзелі і гміне налічвалася 12 агульнаадукацыйных дзяржаўных школ і 4-класная яўрэйская школа. З дзяржаўных устаноў і органаў мясцовага самакіравання ў Скідзелі, апроч пастарунка паліцыі, дзейнічалі магістрат, гміна, гродскі суд, пошта і тэлеграф. Па-ранейшаму на Скідзельшчыне існавалі буйныя памешчыцкія маёнткі (Скідзель Канстанціна Чацвярцінскага, Кашубінцы Мар'яна Блаўзевіча, Котра Вацлавы Даманскай, Зброшкаўшчына Хелены Керсноўскай, Міхайлаўка Леона Кнобельсдорфа, Каўшова сям'ї Мазалеўскіх, Чарлёна Марыі Любамірскай, Мількаўшчына Андрэя Мазалеўскага) і фальваркі (Фенькава К.Чацвярцінскага, Лаўна Сафіі Багнеўскай, Каўшова Івана Мазалеўскага, Лагеры Андрэя Мазалеўскага).

Пасля задушэння беларускіх легальных арганізацый цікаўнасць масаў беларускага насельніцтва да легальнай палітычнай дзейнасці і палітычнага жыцця ўвогуле моцна знізілася. Але адначасова ў 1930-ыя гады сярод скідзельскай моладзі папулярнасць камуністычных ідэй, нягледзячы на ўсе рэпрэсіі паліцыі і шматлікія арышты, толькі ўзмацнялася. Ячэйкі КПЗБ і КСМЗБ дзейнічалі ў самім Скідзелі і ў многіх навакольных вёсках.

**ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ**

**Успаміны Чабатарэвіча Паўла Фёдаравіча (1918 г.н.)**

Нарадзіўся я ў 1918 г. у Ніжнім Ноўгарадзе, дзе наша сям'я была ў бежанстве. Потым вярнуліся на радзіму ў Скідзель. Наша сям'я мела чацвяртак зямлі, гэта менш за два гектара. З такога надзела пражыць было немагчыма. Таму ўсе ў сям'і, нават дзеці, мусілі цяжка працаваць, усе стараліся зарабіць капейку. Хадзілі ў маёнтак за жаткай падбіраць снапы, я калоў дровы яўрэям. Але грошай усё роўна не хапала. Каб заплаціць падаткі, маці часам пазычала грошы ў яўрэяў. Памятаю, каб пастрыгчыся, я заносіў яўрэю-цырульніку яйко, і ён амбамберваў мяне нагола.

Маці ўсё бедавала, як дзеці будуць жыць з такога малога надзела, усё думала, як прыкупіць зямлі. Нас у бацькоў было пяцёра дзяцей: 3 браты і 2 сястры. І наша сям'я дакупіла 5 гектараў. Гадавалі мы ў гаспадарцы свіней і прадавалі мяса, часам трымалі да дваццаці свіней, бывала, што выкармлівалі вагой за 500 кг. Але мяса елі не многа. А некаторыя тады ў Скідзелі і не бачылі мяса. Можна было, праўда, купляць каніну па дзяшоўцы. Тады вельмі многа білі коней на скуры для гарбарняў. Не бачылі мы, як былі дзецьмі, і канфет. Замест канфет у нас былі грушкі-гнілушкі.

Вучыўся я ў польскай школе. Настаўніцу звалі Ванда Станіславаўна. Вучыўся я добра, а за тое, што выдатна прадэкламаў верш “На вавельскай гужэ”, нават атрымаў у падарунак кнігу ад магістрата. У хаце Пятра Сяўрука на Фабрычнай ці, як яе яшчэ называлі, Сабачай вуліцы была беларуская бібліятэка. Я хадзіў туды браць кнігі.

У 1936 г. я пайшоў вучыцца на шаўца да майстра. Тады ж далучыўся я да скідзельскіх камсамольцаў. У нашу падпольную ячэйку ўваходзілі шэсць чалавек: Коля Барысаў, Міхал Карніла, Валодзя Юрэвіч, Міша Юрэвіч, Сцяпан Быль і я. Актыўны ўдзел у рабоце ячэйкі прымаў яўрэй

Майсей Лайт. Свае сходы мы праводзілі звычайна ў гумнах майго бацькі Фёдара Андрэевіча Чабатарэвіча і Сцяпана Юрэвіча, у лясным урочышчы Бор і іншых месцах. Абмяркоўвалі, як лепш праводзіць падпольную работу, правілы канспірацыі і іншыя пытанні. Камуністычную літаратуру прывозіў з вёскі Стральцы Рамановіч Іван, які меў падпольны псеўданім "Кравец", бо ён і сапраўды быў краўцом. Ён да канца свайго жыцця застаўся верны Савецкай уладзе... Падпольная літаратура прывозілася канём, хавалася ў кошыку пад саломай, на рынку воз заставаўся без людзей. Тады ціхенька падыходзіў падпольшчык, браў гэтую літаратуру, лістоўкі і праклямацыі і сыходзіў так, каб застацца незаўважаным. Сустрэчы незнаёмых паміж сабой падпольшчыкаў адбываліся з дапамогай пароля. Напрыклад, газета ў кішэні, рука за пазухай, прыколатая кветка і г.д. Камсамольцы актыўна збіралі грошы на дапамогу рэвалюцыянерам. Прычым збіралі нават ад асобаў заможнага стану. Вывешвалі чырвоны сцяг на святы. Арганізоўвалі страйкі і не пускалі ў Скідзель штрэйкбрэхераў. Маці на мяне крычала за гэта, але я не слухаў. Праўда, мяне ў пастарунак ні разу не забіралі.

*Запісаў Сяргей Токць 07.06.2008 г. Захоўваецца ў асабістым архіве С.Токця*

**Воспоминания Юревича Владимира Степановича (1919 г.р.)**

Родители мои были крестьяне бедняки. Отец – Юревич Степан Андреевич, 1886 года рождения, уроженец гор. Скидель. Мать – Ватыль Ольга Степановна родом из дер.Глиняны. Родители имели земельный надел в два гектара. В семье было семеро детей – две дочери и пять сынов. Поэтому, чтобы как-то обеспечить семью материально отец и мать вынуждены были идти работать по найму до помещиков и фабрикантов, поскольку два гектара земли не могли удвлетворить даже самые скудные потребности многодетной семьи.

В 1934 году, то есть в пятнадцатилетнем возрасте я начал работать кожевником на кожзаводе у фабриканта Гаркавого. Завод размещался в то время по улице 17 сентября. Кожевником работал до 1939 г., до воссоединения Западной Белоруссии с Советской.

В члены КСМЗБ вступил в 1935 г., тогда и начался мой путь нелегкой

подпольной работы. В комсомольской ячейке, которую возглавлял Николай Борисов, состояли Михаил Корнило, Иосиф Быль, Павел Чеботаревич, Михаил Юревич. Активное участие в работе найшей ячейки принимали Мойсей Лайт, Яков и Григорий Пельцы.

В 1936 г. по поручению комсомольской ячейки я организовал сбор денежных средств в фонд помощи борущейся Испании среди рабочих кожзавода. Деньги давали кто сколько мог, сдавал их Моисею Лайту. Куда он их девал, мне неизвестно. Вспоминается мне случай. Кто-то доложил полиции, что я собираю деньги среди рабочих. На завод прибыл полицейский Маевский, который тщательно расследовал мою агитационную работу среди рабочих по оказании денежной помощи республиканской Испании. Обошлось тем, что он меня избил, нанося удары по лицу.

Под воздействием членов КПЗБ и КСМЗБ на кожзаводе проводилась забастовка, основные цели которой были сокращение рабочего дня с 10 до 8 часов, которая увеньчалась успехом, так как рабочий день стал 8 часов. Выполнял комсомольские поручения по распространению подпольной литературы среди рабочих завода и населения, которую доставлял из дер. Стрельцы Иван Романович по кличке «Кравец». Ее доставлял на повозке, обычно в базарные дни. Заранее уславливались, где поставить повозку, возле которой никого не было. Незаметно подходил и забирал литературу, которую уносил к себе домой и прятал в надежном месте. Литература долго не залеживалась, ее быстро пускали в дело, распространяли среди населения Скиделя и окрестных деревень.

В 1937 г. я с братом Мишей приобрели радиоприемник, который работал на питании. Слушали постоянно радиопередачи из Советского Союза. Послушать правду о стране Советов собиралось периодически не мало людей, в основном комсомольцы и молодежь. За прослушивание радиопередач из Советского Союза польские буржуазные власти преследовали, поэтому иногда подсылали своих информаторов-доносчиков, чтобы они выследили, кто собирается в доме возле приемника, что слушаем. Таким осведомителем был Михаил Телеш по уличной кличке

«Цетлик», который часто в темное время незаметно подкрадывался к дому и через окно старался увидеть, кто дома собралася и на какую волну настроен радиоприемник.(...)

С воссоединением Западной Белоруссии с Советской в 1940 году я стал работать заведующим столовой, которая размещалась в доме бывшей пивнушки Койнера... В этом же году вступил в комсомол. В октябре 1940 года был призван на действительную службу в Красную Армию, зачислен в артиллерию 207 КАП, дислоцировавшегося в гор. Орджденикидзе на Кавказе. С первых дней Великой Отечественной войны находился на фронте. В 1942 г. в боях под Ростовом на Дону попал в плен. Там была окружена и разгромлена наша армия около 600 тысяч. В лагере военнопленных находился в гор. Киеве, из которого отпускали домой украинцев. Я тоже записался украинцем, и меня отпустили. Когда прибыл домой комендант полиции Ян Ошурко таскал долго, как это я мог уйти из плена, но затем успокоился. Дома работал вместе с отцом на личном хозяйстве, а с освобождением кожевником на кожзаводе. Затем, в 1944 г. был призван в армию и через две недели попал на фронт. Часть, в которой я воевал, прошла с боями левее гор. Данцига, участвовал в штурме гор. Штутгарта, в боях на реке Одер, под Берлином и закончил войну на реке Эльба. За участие в боях награжден орденом Славы 3 степени, медалями «За боевые заслуги» и «За взятие Берлина».

*Записал 8 июня 1989 г. И.А.Борисов. Успаміны захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці. Ф. 239. В. 9. Спр. 34. Арк. 1-3*

Савецкі Саюз уяўляўся для камуністычна настроенай моладзі сапраўдным раем на зямлі. Нямала маладых актывістаў, калі іх пачынала моцна пераследаваць дэфензіва, уцякалі праз мяжу ў СССР. А некаторыя ішлі туды ў пошуках таго шчаслівага жыцця, пра якое распавядалі камуністычныя агітатары і савецкае радыё. На жаль, толькі праз гады скідзельцы даведаліся, што многія перабежчыкі былі ў Савецкім Саюзе расстраляныя як польскія шпіёны, альбо патрапілі ў сталінскія лагеры. Напрыклад, такі трагічны лёс спасцігнуў глінянскага кэпэззэбоўца Уладзіміра Лабко, які ратаваўся ад пераследу дэфензівы. Уладзімір скончыў пяць класаў беларускай гімназіі ў Вільні, адкуль быў выключаны за палітыку. У 1932 г. быў асуджаны ўладамі на 1,5 года турмы. Пасля пераходу мяжы ў СССР яго абвінавацілі ў шпіянажы і ў

чэрвені 1938 г. расстралялі. А Івану Дзелянкоўскаму са Скідзеля, як успамінае яго сын Мікалай Дзелянкоўскі, пашанцавала. Яго затрымалі польскія памежнікі і патрымаўшы некаторы час у турме вярнулі ў роднае мястэчка.

*ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ*

*Успаміны Малышэвіча Івана Антонавіча*

Лобко Владимир Ильич, уроженец д.Глиняны, родился в бедной крестьянской семье, состоял в членах КПЗБ, был руководителем подпольной коммунистической ячейки, в которой состоял и я. За распространение подпольной коммунистической литературы был арестован в 1932 г. и осужден к тюремному заключению. С деятельностью революционного подполья связал свою жизнь еще будучи гимназистом Вюльнюсской белорусской гимназии. Будучи под надзором полиции, работал на сельском хозяйстве отца. Как-то в один день 1936 г., по моему в августе месяце В.И.Лобко читал произведения К.Маркса и Ф.Энгельса, за этим и застал его полицейский Кшак. В книге находились партийные документы ячейки. Но Кшак не умел читать на русском и белорусском языках, поэтому изьятую литературу и партийные документы доставил в полицейский участок в Скидель, где детально разобрались и В.И.Лобко грозил немедленный арест и пытки признаний, кто состоит в подпольной коммунистической организации. Выдать, значит предать товарищей по партии и подполью. В день изьятия книги и партийных документов В.И.Лобко перешел на нелегальное положение. Скрывался в лесном урочище Дуброва, деревнях Глиняны у Паенко, в Горошках у А.Ф.Горошко, в Ревках у С.И.Мышко. Так продолжалось до конца 1937 г.

Я состоял в подпольной коммунистической ячейке, которую возглавлял В.И.Лобко, подпольная моя кличка была “Овсик”. Выдать товарищей по партии Лобко не мог, иначе ему грозила смерть от своих же за предательство. Поэтому он и перешел на нелегальное положение. В Россию я ходил, потому что хотел очень учиться. Осталя сиротой в 3 года, а возможностей в панской Польше не было. Когда переходил границу узнал, что там нельзя было говорить, что ты комсомолец или член партии, иначе гибель. Поскольку зачисляли в шпионы, или говорили иди и работай в

подполье. Однажды две недели пробыл в Советском Союзе. Нас собрали более 70 человек перебежчиков, затем по 5 человек переправляли в разных местах обратно в Польшчу. Я хорошо изучил границу и охрану, знал где можно ее перейти. Вот почему ко мне и обратились родители В.Лобко и упросили, чтобы я его перевел через границу в Советский Союз. Ведь он почти 1,5 года скрывался от полиции, сильно измучился, был истощен до предела, бледным как бумага, потому что мало был на солнце. Итак я стал агентом по переправке Лобко за границу. В конце декабря 1937 г. мы сели на станции Черлена в поезд и доехали да станции Мосты где нужно было ждать очередного поезда. Мы пошли в город, зашли в закусочную, взяли булочки и пошли. Вдруг по улице навстречу нам идет полицейский, которы обратил внимание на Володю, потому что тот был бледен. Я шепнул ему, чтобы он ел булочку и сам тоже стал есть. В то время есть на ходу считалось большим позором и бескультурьем. Полицейский подумал, что мы какие-то вахлаки и прошел мимо.

Поездом от Мостов мы доехали до местечка Красное. Переходил Володя границу на новый год, когда пограничники праздновали. Снега было очень много, Володя ослаб и мне пришлось нести его на плечах. Видимо сказалось и то на его здоровье, что за 1,5 года он стал пугливый.

Когда я возвращался назад, зашел в один дом высушить сапоги. Хозяин сказал мне, что если он не сообщит пограничникам, то ему грозит выселение с конфискацией земли и дома. Меня арестовали, допрашивали, разбили нос, но потом отпустили.

Когда я раставался с Володей, он сказал, что сразу же заявит пограничникам, чтобы не посчитали его шпионом. Мне известно после стало, что его арестовали и судили. По приговору суда расстреляли. Жалко мне его. Видимо Володя признался на первом допросе, что является коммунистом. Поэтому его посчитали как польского шпиона. В деле, как-будто я фигурирую, как солтыс и агент дефензивы, хотя солтысом в Глинянах тогда был Платон Ковшель. Но так было сфабриковано под пытками дело о шпионаже Володи Лобко.

Те, кто переходил польско-советскую границу мало кому

посчастливилось остаться в живых, большинство были расстреляны или погибли в лагерях. Длительное время провел в лагерях Михаил Литвин, отчество которого я не помню. Жена его живет в Хватах в доме где раньше проживала семья Заблоцкого, первый дом справа от шоссейной дороги. Не знаю реабилитировали Михаила или нет, но его уже нет в живых. Он умер.

*Записал И.А.Борисов 24 января 1990 г. ДАГВ. Ф. 239. В. 8. Спр. 19. Арк.12-14.*

**Воспоминания Лобко Николая Ильича (1929 г.р.)**

Наша семья проживала почти в центре дер.Глиняны. На хутор переселились где-то в 1938 г. Володю из гимназии исключили за революционную деятельность, после возвращения он работал на сельском хозяйстве отца. Это было в 1936 г., в августе, когда овсы жали, в дер. Глиняны как-то незаметно прибыли Сломчинский – начальник Скидельского полицейского участка с Модельчиком – полицейски. Они застали Володю за оформлением каких-то партийных документов, возможно протоколов собрания КПЗБ или КСМЗБ. Некоторые Володя сумел проглотить, спрятать под рядом лежащий кирпич, а некоторые попали в руки полиции, которые они сразу же не смогли расшифровать... Володя знал, чем это будет пахнуть, если в полиции расшифруют документы, поэтому немедленно ушел в лес на "Дуброву". Так и посоветовал отец. Некоторое время скрывался в деревне Стрельцы, затем переправили в д.Обухово к Варьке и Ивану, по фамилии как-будто Панасевичи... С Обухово перешел в Ревки, скрывался у А.Ф.Горошко, С.И.Мышко и других. Родители и старшие за меня брат и сестра встречались с Володей в лесном урочище "Бор". Носили ему одежду, еду.

Знаю, что Володя был секретарь партийной ячейки, в которой состояло около 15 человек. Некоторых я помню. Это Литвин Александр Гаврилович, Фурман Александр (убит возле Феньково в 1940 г.). Барановский Гриша (убили поляки в 1939 г.), его закололи штыками, Варя и Иван с Обухово, Мышко Анатолий, Литвин Саня... Литвины Михаил и Николай...

Володя скрывался от преследования и ареста с августа 1936 г. па 31 декабря 1937 г. По совету родных и товарищей по подпольной борьбе решил уйти в Советский Союз. Содействие в переходе границы должен был оказать И.А.Малышевич из дер.Глиняны, который и помог ему перейти границу, где охрану вели воины пагарничники заставы В.Усова. Когда перешел границу, зашел к старикам и сказал, что я перебежчик, сообщите пограничникам, чтобы меня взяли. Арестовывал сам В.Усов. Судили Володю в апреле 1938 г. касацию о помиловании отклонили. Когда он перешел границу, арестовали его посадили в Минскую тюрьму, жестоко пытали, чтобы признался, что является польским агентом. Под пытками вынужден был подписать то, что нужно было следователям...

Земли у нас было всего 2,8 гектара... надел хуторной взяли ближе к Скиделю и к пойме реки Спушанка, чтобы лучше было вести Володе подпольную работу, встречаться с подпольщиками, проводить собрания, а с возникновением опасности скрываться. Часто к нам приходили братья Пельц, Гриша и Яков, а также Муня, поскольку состояли в одной парторганизации.

Литвин Михаил Иванович работал первоначально, как установилась советская власть, директором школы в Скиделе, затем инструктором райкома или обкома комсомола, к началу войны его отправили учиться в гор.Белосток. В Белостоке он встретил Сломчинского, который работал в Скиделе в полиции и сразу же об этом заявил органам, но там М.Литвину сказали, что он у нас работает осведомителем и самый лучший работник.

Когда началась война, и войска фашистов оккупировали Белосток, М.И.Литвина выдал гитлеровцам Сломчинский и его расстреляли в районе Белостока во рву...

*Записал 24 января 1990 г. И.А.Борисов. ДАГВ. Ф. 239. В. 8. Спр. 19. Арк. 9-11.*

**Успаміны Георгія Георгіевіча Папрукайлы**

Нарадзіўся я ў сялянскай сям'і ў вёсцы Некрашы. Дзяцінства прыйшлося на першую сусветную вайну, быў бежанцам. Вярнуўся дамоў,

жылі ўсе шасцёра разам, мелі 9 гектараў зямлі. Нас было трое братоў, і калі б бацькі падзялілі зямлю, пакінуўшы і сабе крыху, збяднелі б усе. І тады мы з аднавяскоўцам Мікалаем Бедысам падаліся ў Савецкі Саюз. Былі ўпэўнены, што там людзі жывуць лепш, чым у панскай Польшчы. Чаму ўпэўнены? Ды таму, што той, хто туды падаўся, назад ужо не варочаўся.

Узялі мы з Колям 50 долараў і падаліся ў бок польска-савецкай мяжы. Нам абодвум ішоў тады 21 год. Мяжу пераадолелі без усякіх перашкод. На начлег уладкаваліся пад сасной. Калі прачнуліся, дык на нас было на два пальцы снегу. Мы, змучаныя працяглай дарогай, спалі так, што не адчувалі холаду, прыкрыўшыся цёплай курткай. Ноччу падаліся далей на ўсход. Па дарозе наткнуліся на адрыну з сенам, у якой і правялі час да ранку. Коля прапаноўваў ісці далей ад мяжы. Я не згадзіўся і параіў лепш шукаць пагранічнікаў, бо нас могуць палічыць за польскіх шпіёнаў. Шукаючы іх, бачылі сялян, якія жывуць у бядноце. Дастаткова было ўбачыць іх адзенне і худыя постаці. “Вось мы і знайшлі шчасце”, – сказаў я Колю. Рушылі далей у пошуках, як нечакана наткнуліся на пагранічнікаў. Нас праверылі, дэталёва абмацаўшы кішэні і адзенне. Пад арыштам пратрымалі да самага вечара, затым павялі на заставу, якая была ў пяці кіламетрах. Там закрылі ў казематку. Праз непрацяглы час прапанавалі аднаму з нас выйсці. Першы пайшоў Коля. Але, калі ён вярнуўся з допыту, размаўляць з ім мне не дазволілі і загадалі выходзіць.

За сталом сідзеў сівы ў сталых гадах начальнік заставы, які пачаў дапытвацца, чаму я вырашыў перайсці мяжу, як жывецца людзям ў Польшчы. Раптам як грымнуў кулаком па стале, прыпадняўся і зароў: “Што, бацькоўскага хлеба наеўся і захацеў чагосці лепшага, сапляк!”. Я зусім спалохаўся. Потым, ужо панізіўшы тон голасу, начальнік сказаў, што ён пераправіць нас праз мяжу на польскі бок. Так і зрабіў.

Праз некаторы час мы даведаліся, што тыя, хто пайшоў шукаць шчаслівага жыцця ў Саюзе, трапілі на Калыму як польскія шпіёны і згінулі там. Я і сёння ўдзячны таму начальніку заставы за тое, што выратаваў нам жыццё.

*Запісаў Ілья Барысаў 9 верасня 1998 г. Захоўваецца ў асабістым архіве І.А.Барысава*

Чорнай старонкай у жыцці тагачаснай заходнебеларускай вёскі стала змаганне кэпэзэбоўцаў з правакатарамі-канфідэнтамі. Ва ўмовах беднасці сяляне часам за колькі злотых згаджаліся даносіць дэфензіве на сваіх аднавяскоўцаў. Камуністы ж у сваю чаргу спрабавалі супрацьставіць гэтаму тэрор, забіваючы даносчыкаў. Але часам з-за адных толькі падазрэнняў гінулі невінаватыя людзі. У Скідзельскай гміне стаў працаваць на паліцыю жыхар вёскі Гліняны, адзін з былых актывістаў ТБШ, які ў свой час сабраў мноства подпісаў на адкрыццё беларускай школы. У ліпені 1929 г. ён напісаў у павятовую паліцыю ліст на дрэннай польскай мове з просьбай выплаціць яму 70 злотых за тое, што дапамог высачыць мясцовых хлопцаў-падпольшчыкаў Тамаша Сароку і Івана Каскевіча. Сароку паліцыянты пры арышце застрэлілі. Між іншым канфідэнт адзначыў: “Прыходзіцца мне вельмі кепска, за кожным крокам чагосці асцерагацца. Увесь час знаходжуся ў хаце, нават адлучыцца на гаспадарку для работы няма як…” [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 24. Арк. 89]. Ён таксама прасіў паліцыю выдаць яму рэвальвер для самаабароны. Зрэшты, грошы яму так і не выплацілі, ды і рэвальвера не далі. Пазней гэты чалавек з’ехаў у Польшчу, дзе і пражыў усё сваё астатняе жыццё.

У чэрвені 1929 г. дэфензіва здабыла інфарацыю, што скідзельскія кэпэзэбоўцы рыхтуюцца забіць канфідэнта з вёскі Галавачы. Нібыта, яны правялі сход у памяшканні ТБШ, дзе кінулі жэрабя, каму выканаць прысуд. І выпала зрабіць гэта Васілю Салею з вёскі Раўкі [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 24. Арк. 114]. Зрэшты, мясцовы камендант паліцыі гэтаму запярэчыў. Нам таксама здаецца, што гэтая гісторыя была вынікам фантазіі нейкага канфідэнта. Часам даходзіла да проста неверагодных сітуацый. У вёсцы Стральцы адзін з сяброў ячэйкі КПЗБ, які, як аказалася, адначасова быў і канфідэнтам паліцыі, атрымаў у 1933 г. партыйнае даручэнне застрэліць правакатара. Натуральна, што ён паведаміў паліцыю, якая, у сваю чаргу, папярэдзіла свайго канфідэнта. Апошні хуценька з’ехаў у Гродна [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 70. Арк. 119]. Але ў Стральцах працягвалі працаваць на паліцыю яшчэ два канфідэнты. 28 мая 1934 г. паліцэйскі камендант пісаў, што “канфідэнт Язерскі пасля выпадку забойства Паўла Сыралевіча адмовіўся даваць інфармацыю, баючыся дэканспірацыі і тым самым помсты з боку выўратовых элементаў”.

Тыя ж сябры былога ўжо скідзельскага гуртка ТБШ, што падзялялі погляды П.Сяўрука і захапляліся ідэямі “талстоўства”, успрымаліся мясцовым насельніцтвам, як своеасаблівая рэлігійная сэкта. Іх называлі то “малаканамі”, то баптыстамі. Яны адмаўляліся ад царкоўных абрадаў, ад ужывання мяса ў ежу, ад тытуню і алкаголю. Чуткі пра ідэі і дзейнасць скідзельскіх талстоўцаў распаўсюджваліся па Заходняй Беларусі. У 1937 г. у Скідзель прыехаў аж з-пад Карэлічаў на ровары малады Янка Брыль – будучы класік беларускай літаратуры. Ён перапісваўся са сваімі скідзельскімі аднадумцамі. Даніла Скварнюк, які

гераічна загінуў у час вайны разам з сваёй жонкай Вольгай, роднай сястрой Пятра Сяўрука, і з іншымі жыхарамі вёскі Пузавічы, паслужыў прататыпам галоўнага героя ў вядомым апавяданні Янкі Брыля "Memento mori". Яшчэ адзін скідзельскі талстовец Аляксандр Мазалеўскі прынцыпова адмовіўся служыць у польскім войску, за што шмат гадоў правёў у турме. Ён памёр неўзабаве пасля таго, як выйшаў на волю. А.Мазалеўскі перапісваўся з многімі замежнымі прыхільнікамі пацыфісцкага руху, у яго дзённіку таксама былі перапісаныя ад рукі беларускія вершы Пятра Сяўрука і Міхала Касцевіча (Міхася Васілька) [Дзённік Аляксандра Мазалеўскага захоўваецца ў хатнім архіве Маргарыты Францавай, дачкі Марыі Якаўлеўны Сяўрук-Мазалеўскай]. Жонка Аляксандра Мазалеўскага Марыя, малодшая сястра Пятра Сяўрука, усё жыццё старанна захоўвала рукапісы свайго брата Пятра і мужа Аляксандра.

Не збылася мара сяброў гуртка ТБШ пра беларускую мову ў школе. У 1930-х гадах у дзяржаўных школах Скідзельшчыны адукацыя ажыццяўлялася выключна на польскай мове. У 1934 г. у Скідзельскай гміне ў розных дзяржаўных і прыватных школах працавалі 34 настаўнікі, якія падзяляліся паводле нацыянальнасці: палякі – 21, яўрэі – 10, расіяне – 1, беларусы – 1, украінцы – 1 [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 70. Арк. 21]. Пра настаўніка з вёскі Бубны Уладзіміра Држэвецкага, які паходзіў з Валыні, мясцовы паліцэйскі камендант пісаў: "Мае скрытны характар, але выдае непрыязнасць да Дзяржавы, праяўляе салідарнасць з беларускім рухам, а нават горача яго падтрымлівае, мае вялікую папулярнасць сярод мясцовай люднасці, якая непрыхільная да Дзяржавы, і ўвогуле, як у школе, так і па-за школай прапагандуе беларускую мову" [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 70. Арк. 118]. У вёсцы Стральцы настаўнічаў Васіль Сіткевіч, які паходзіў з заможнай сялянскай сям'ї з суседняй вёсачкі Мастаўляны. Сіткевіч прымаў актыўны ўдзел у працы Таварыства беларускай школы. Мясцовы паліцэйскі камендант пісаў пра яго: "...з увагі на тое, што паходзіць з тутэйшага абшару і з'яўляецца ўласнікам зямлі, мае сярод ваколічных мяшканцаў, якія з палітычнага пункту гледжання ўяўляюць элемент для Дзяржавы непрыхільны, вялікі давер". А таму, падсумоўваў камендант: "...школа ў вёсцы Стральцы, да таго часу, пакуль кіраўніком яе з'яўляецца Сіткевіч, як пляцоўка страчаная [ДАГВ. Ф. 24. В. 1. С. 70. Арк. 21]. У 1934 г. улады перавялі Сіткевіча ў іншае месца працы, а потым і зусім дачасна адправілі на пенсію.

Што ж датычыцца гаспадарчага жыцця скідзельцаў, дык заставалася нявырашанай самая вострая праблема беларускага сялянства – катастрафічнае малазямелле. Купіць зямлю было вельмі цяжка. Напрыклад, калі ў 1925-1926 гг. распрадаваўся маёнтак Галавачы, дык гектар зямлі каштаваў ад 270 да 351 злотага. Гэта былі на той час вельмі вялікія грошы, зарабіць якія было надзвычай цяжка. У крызісныя гады на "ўсходнія крэсы" наплывалі масамі беспрацоўныя з

цэнтральнай Польшчы. Гаспадарчая дэпрэсія ў Паўночнай Амерыцы таксама моцна абмежавала паток мігрантаў з Беларусі. У канцы 1929 г. камендант скідзельскага пастарунка пісаў, што “беларускае насельніцтва, шукаючы паправы свайго становішча, масава эмігруе да Бразіліі, прадаючы ўвесь набытак” [ДАГВ. Ф. 17. В. 1. С. 201. Арк. 174]. Ё таксама адзначыў, што павялічылася і колькасць маладых яўрэяў, якія ад’язджалі да Аргентыны і Палястыны.

У цэлым станоўча ўплывала на гаспадарчы стан вёсак правядзенне палітыкі камасацыі ці пераносу гаспадарак на калоніі (хутары). Праўда, значная частка сялянства працівілася гэтай палітыцы. Гэтым супрацівам кіравалі мясцовыя кэпэзэбоўцы. Сяляне верылі, што хутка прыйдуць бальшавікі і дадуць ім панскую зямлю без усялякай камасацыі, якая вымагала цяжкай працы па пераносу хатаў і гаспадарчых пабудоў.

Канешне, было ў Скідзелі ў той час і нямала багатых людзей, паспяховых прадпрымальнікаў. Найбольшыя грашовыя прыбыткі, як можна меркаваць на падставе дакументаў фінансавых устаноў, у 1929 г. мелі рэстаўратар Ізраэль Клачкоўскі, уладальнікі гандлёвых крамаў Ізраэль Крынскі і Нохім Альшэўскі, млынар Хаім Бычкоўскі, уладальнікі гарбарняў Шлома Крамер і Якуб Рубін [ДАГВ. Ф. 96. В. 1. С. 1. Арк. 46-70]. Вельмі добра зараблялі лекары. Але большасць насельніцтва, як беларускага, так і яўрэйскага, мусіла лічыць кожны грош, які даваўся вельмі цяжкай працай, ды яшчэ трэба было гэтую працу знайсці.

## Раздзел 4

# СКІДЗЕЛЬСКАЕ ПАЎСТАННЕ 1939 г.

Верасень 1939 г. прынёс крутыя змены ў жыццё Скідзеля. Пачатак Другой сусветнай вайны апаліў сваім подыхам лёсы многіх яго жыхароў. Вераснёўскія падзеі 1939 г. у Заходняй Беларусі належаць да найбольш трагічных старонак у гісторыі беларуска-польскіх узаемаадносінаў. Адначасова з тым, як Чырвоная армія перайшла дзяржаўную мяжу паміж СССР і польскай дзяржавай, распачаліся масавыя ўзброеныя выступленні супраць польскіх вайскоўцаў і цывільных уладаў, арганізатарамі якіх найчасцей выступалі актывісты падпольнай камуністычнай партыі. Шырокую вядомасць набыло “Скідзельскае паўстанне”, пра якое шмат пісалі ўжо розныя аўтары [Годы испытаний и мужества. Минск, 1973. С. 382-385.; Дзелянкоўскі М. Скідзель. Дакументальна-лірычна нарыс. Мінск, 1987; Севрук М. // Сельская новь. 1989. № 108 ад 9 верасн.; Ён жа. Скидельское восстание // Советская Белоруссия. 1989. № 261. ад 11 ліст.; Борисов И. Освобождение // Гродненская правда. 1989. № 215. ад 8 ліст.; Ён жа. Свобода добывалась кровью // Сельская новь. 1989. № 260. ад 11 ліст.; Ён жа. Второй выход на балкон // Сельская новь. 1990. ад 18 верасн.; Памяць. Гродзенскі раён (гістарычна-дакументальная хроніка Гродзенскага раёна). Мінск, 1993. С. 108-109; Wierzbicki M. Powstanie skidelskie 1939 r. // Białoruske Zeszyty Historyczne. 1997. № 7. S. 75-99].

Узброенае выступленне ў Скідзелі, паводле ўспамінаў кэпэзэбоўца Іосіфа Шагуна і артыкулаў краязнаўцы Міхала Сяўрука, распачалося 17 верасня 1939 г. пасля таго, як мясцовыя актывісты распушчанай ужо на той час Камінтэрнам КПЗБ пачулі па савецкаму радыё выступленне народнага камісара замежных спраў СССР Вячаслава Молатава і распаўсюдзілі гэтую вестку сярод насельніцтва. Праўда, савецкія крыніцы [Архіў грамадскіх арганізацый Гродзенскай вобласці. Ф. 1695. В. 1. С. 91. Арк. 5.] падаюць дату пачатку паўстання 18 верасня, гэтай жа даты прытрымліваецца польскі даследчык М.Вежбіцкі. Даведаўшыся пра пераход Чырвонай арміяй савецка-польскай мяжы, мясцовыя камуністы сабраліся ў хаце Хаіма Шведскага, а камсамольцы ў хаце Майсея Лайта, каб абмеркаваць і выпрацаваць план дзеянняў. У гэты час на вуліцах мястэчка падзеі разгортваліся з маланкавай хуткасцю. Маладыя хлопцы Міхал Сарока і Іосіф Лапіцкі адабралі карабін у паліцыянта Лася. Хутка вакол іх сабраўся натоўп людзей і хтосьці кінуў

заклік разброіць паліцыю. Якраз у гэты момант у Скідзель прыйшла група з прыкладна дваццаці ўзброеных сялян з вёскі Галавачы на чале з сябрам КПЗБ Міхалам Пікам. Атрад Піка заняў магістрат. Узброеныя сяляне арыштавалі бурмістра Скідзеля, а шэраговых служачых разагналі. Камуністычныя актывісты Міхал Літвін і Георгі Шагун з групай узброеных людзей занялі паліцэйскі пастарунак. Майсею Лайту даручылі заняць электрастанцыю. Міхал Карніла, Фёдар Гапон і Іван Кот кіравалі захопам пошты і тэлеграфа. Паўстанцы наладзілі сувязь з суседнімі мястэчкамі Лунна і Азёры, дзе таксама ўлада перайшла ў рукі кэпэзэбоўцаў. Быў заняты маёнтак князя Канстанціна Чацвярцінскага, уладальніка якога паўстанцы арыштавалі і канфіскавалі яго зброю. У Скідзель падышлі ўзброеныя групы сялян з суседніх вёсак Гліняны і Пясчанка.

Паўстанцы пастанавілі стварыць рэвалюцыйны камітэт, у склад якога ўвайшлі Міхал Іванавіч Літвін, Георгі Іосіфавіч Шагун, Ілля Фаміч Мышко, Фёдар Восіпавіч Бубен, Аляксандр Канстанцінавіч Мазалеўскі, Іван Георгіевіч Дзелянкоўскі, Барыс Мендзелеў Олех, Пётр Цярэшка, Майсей Лайт [Михаил Севрук. Скидельское восстание // Советская Белоруссия. № 261. 11.11.1989.]. Міхал Літвін з балкона магістрата абвесціў сабраўшамуся народу, што ўлада ў Скідзелі і воласці пераходзіць у рукі рэўкама і заклікаў насельніцтва разбройваць паліцыю, “стшэльцаў” і аб’ядноўвацца ва ўзброеныя атрады, але пры гэтых захоўваць дысцыпліну і не дапускаць беззаконня і гвалту. З прамовамі выступілі таксама камуністы-яўрэі Барыс Олех, Лазыр Пачымок і Майсей Лайт. Аляксандр Мазалеўскі пад радасныя воклічы прысутных залез на дах магістрата, скінуў бела-чырвоны польскі сцяг і замест яго прымацаваў чырвоны – савецкі.

Неўзабаве рэўкам перамясціўся ў будынак паліцэйскага пастарунка, які месціўся непадалёку шашы Гродна-Ліда. Праўда, паліцыянты Радзевіч і Вайцэхоўскі, як вынікае з матэрыялаў пазнейшага савецкага следства, уцяклі ў Гродна і паведамілі там, што адбываецца ў Скідзелі. Паўстанцы таксама разброілі атрад польскіх вайскоўцаў, які адступаў са Шчучына ў кірунку Гродна. Паводле успамінаў Г.Шагуна, тры салдаты з кулямётам, вінтоўкамі і патронамі з гэтага атрада дабраахвотна далучыліся да паўстанцаў.

Рэўкам паслаў узброены атрад на чале з Сцяпанам Каскевічам, Міхалам Сарокам і Андрэем Чаменкай на чыгуначную станцыю, дзе паўстанцы раззброілі цягнік з вайскоўцамі і паліцэйскімі, якія ехалі з боку Мастоў да Гродна. Пасля разбраення цягнік прадоўжыў свой шлях. Паводле дадзеных польскага гісторыка Марэка Вяжбіцкага, у Скідзелі было арыштавана каля 15 афіцэраў Войска Польскага на чале з палкоўнікам Зыгмунтам Шафраноўскім. Акрамя таго, былі яшчэ арыштаваныя 5 афіцэраў вайсковай разведкі на чале з маёрам Тадэушам Мюлерам. Нават генерал Ёзаф Ольшына-Вільчынскі, які ехаў у бок Гродна на легкавым аўтамабілі, ледзь не трапіў у рукі паўстанцаў.

Генерала выратавала тое, што ён загадаў свайму шафёру ні ў якім разе не спыняцца і на вялікай хуткасці прамінуць мястэчка [Wierzbicki M. Powstanie skidelskie 1939 r.... S. 79]. Пасля гэтага паўстанцы паклалі на мосце пра Скідлянку пры ўездзе ў Скідзель дошкі з набітымі цвікамі, каб аўтамабілі прабівалі сабе шыны, калі не пагадзяцца спыніцца. Краязнавец Міхал Сяўрук пісаў, што скідзельцы ўвогуле стварылі барыкады: “С энергией и энтузиазмом все население Скиделя строило баррикады. Пожилые мужчины и подростки тащили бревна, катили колоды, тянули старые телеги, несли бороны” [Михаил Севрук. Скидельское восстание // Советская Белоруссия. № 261. 11.11.1989]. Узброеныя заслоны паўстанцаў былі выстаўленыя пры ўездах у Скідзель з боку Гродна на пачатку вуліц Гродзенская і Фабрычная, а таксама на шашэйным і чыгуначным мастах праз рэчку Котра.

Група кэпэзэбоўцаў з вёскі Хвайняны на чале з Фёдарам Чобатам захапіла дзяржаўны гарбарны завод каля вёскі Лаўна. Напачатку гэтая група складалася з 8 чалавек. Яны разброілі шасцёх паліцыянтаў, адміністрацыю і ахову завода, захапілі шмат зброі, якую пачалі раздаваць дабраахвотнікам з вёсак Лаўна і Харціца. Неўзабаве атрад складаўся ўжо прыкладна з 25 узброеных партызанаў. Яны звязаліся па тэлефону са Скідзелем і пасля даставілі туды арыштаваных [ДАГВ. Ф. 9. В. 39 а. Арк. 6].

Увогуле, як можна меркаваць на падставе вядомых нам фактаў, польскія вайскоўцы і паліцыя ў Скідзелі не аказвалі супраціву і на пачатку паўстання людскіх ахвяр не было. Арыштаваных афіцэраў і прадстаўнікоў дзяржаўнай адміністрацыі паўстанцы трымалі ў памяшканні кінатэатра “Аполла”. Некаторыя польскія вайсковыя аддзелы, сутыкнуўшыся з заслонамі паўстанцаў, абыходзілі Скідзель ці з поўдня, каля вёскі Пузавічы, ці паварочвалі на поўнач у бок літоўскай мяжы. Магчыма, што першыя людскія ахвяры здарыліся тады, калі група паўстанцаў пад кіраўніцтвам Іллі Мышко выехала на пажарным грузавіку па шашы Гродна-Шчучын насустрач аддзелу польскага войска, які з усходу набліжаўся да мястэчка. З сабой яны ўзялі кулямёт, а грузавік умацавалі мяхамі з пяском. Адступаючых вайскоўцаў паўстанцы сустрэлі каля шляхецкай ваколіцы Сікорыца. Ілля Мышко звярнуўся да салдат з прамовай. Дакладныя акалічнасці таго, што адбылося далей, нам невядомыя. Праўдападобна, што афіцэры адмовіліся раззбройвацца. Успыхнула сутычка, у выніку якой загінуў малады хлопец Андрэй Кузміцкі. Тады ж, верагодна, былі забітыя і некалькі польскіх афіцэраў, якія аказалі супраціў. Салдаты ж склалі зброю і былі адпушчаныя паўстанцамі.

Між тым звесткі пра падзеі ў Скідзелі напльвалі ў Гродна. Там ўзнікла ідэя арганізаваць супраць паўстанцаў карную экспедыцыю. Узброены атрад выехаў з Гродна 19 верасня пад камандаваннем капітана Пілецкага на некалькіх грузавых аўтамабілях і неўзабаве дабраўся да вёскі Котра. У яго склад уваходзілі каля 100 чалавек –

вайскоўцы, паліцыянты і “харцэжы” (вучні старэйшых класаў гродзенскіх гімназій, якія ўступілі ва ўзброенае апалчэнне). Каля Скідзеля да іх далучылася група (10-12 чалавек) ўзброеных ляснікоў.

Як мы ўжо вышэй адзначылі, на мосце праз рэчку Котра паўстанцы выставілі ахову. Праўда, мы не ведаем, колькі там было людзей і з якім узбраеннем. Польскі атрад выслаў у Скідзель свайго парламенцёра – солтыса Котры Яна Гамулецкага. Апошні сустрэўся з лідэрамі паўстаўшых, але з кім дакладна, нам невядома. Як сцвярджалі сведкі пазнейшага савецкага расследавання, Гамулецкі праследаваў мэту выведаць сітуацыю ў Скідзелі, а таксама палохаў паўстанцаў, што ў Котры сабралася 5 тыс. польскіх салдат. Пасля яго вяртання з мястэчка польскія вайскоўцы прыступілі да актыўных баявых дзеянняў. Найперш была збітая з моста праз Котру яго ахова. Пасля гэтага грузавікі з жаўнерамі рушылі да Скідзеля. Напасрэдным сведкам падзей стаў Мікалай Дзелянкоўскі, які тады быў малым хлопчыкам.

*ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ*

**Успаміны Мікалая Іванавіча Дзелянкоўскага**

Мне было тады каля васьмі гадоў. Я ўжо скончыў першы клас польскай школы. Бацька ў свой час быў сакратаром скідзельскага гуртка ТБШ, членам КПЗБ, праследаваўся паліцыяй. Уцякаў у Саветы, здаецца ў 1936 г. Але яго затрымалі на мяжы і патрымаўшы трохі ў турме вярнулі назад. З першага верасня заняткі ў школе адмянілі. Сказалі нам: “Вайна!”. Скончылася трывожнае яе чаканне, яно даўно ўжо, як кажуць, вісела ў паветры. А 17 верасня Чырваная армія перайшла савецка-польскую граніцу. Падпольшчыкі – былыя члены КПЗБ, БСРГ, ТБШ – ажывіліся. Мой бацька і яго брат Грыша былі з імі. У той дзень бацька толькі зрэдку прыбягаў дахаты – праведаць нас. Расказваў, што паўстанцы захапілі пастарунак, магістрат, пошту.

- У нашых руках усё!

- То колькі вас там? – спытала маці.

- Уся гміна паднялася. Вайскоўцаў, што ўцякаюць ад Чырвонай арміі, не прапускаем.

Пазней бацька расказваў мне, як гэта рабілася. На мосце праз рэчку Скідлянку шашу з Ліды на Гродна перагарадзілі дошкамі з набітымі ў іх цвікамі. Таму машыны з жалнежамі не маглі праехаць і іх разбройвалі.

- Глядзіце, Ваня, а то яшчэ можна не так павярнуцца, - з жаночай

асцярожнасцю гаварыла маці.

- Не бойся! Вунь каля Верасоў (лясны масіў на ўсход ад Скідзеля – аўтары) цэлы эшалон войска затрымалі. Салдат разброілі і адпусцілі, а афіцэраў затрымалі.

А пад вечар пачалося нечаканае для нас. Муж цёткі Валі, бацкавай сястры, адстаўны польскі афіцэр Янэк, усклікнуў:

- Едуць! Жалнежы!

Наша хата была самай крайняй ад захаду. Мы ўбачылі некалькі грузавікоў, якія спыніліся за Омшарам – невялікім азярцом, за кіламетар ад нас. Было добра відаць, як салдаты хутка пасаскоквалі і пабеглі па полі ўправа, расцягваючыся ў ланцуг.

- А то ж Ваня! – паказала маці рукой у бок шашы. За шашой – бацька з некалькімі мужчынамі з кулямётам. Секанулі з яго і пабеглі на ўсход і кірунку Бору (невялікі лясны масіў каля мястэчка – аўтары)

- Надзя! Валя! Хавайце дзяцей, самі хавайцеся: страляць будуць, - камандаваў Янэк. Ён кінуў на падлогу ў спальні падушкі: - Тут сценка, у кухні сценка ды пухавікі – кулі не праб'юць.

У гэтую загародку Янэк схаваў мяне з сястрой, сваіх двух хлопцаў, цётку Валю і сам лёг на падлогу.

- Надзя! - Крыкнуў ён маці – Лажыся на падлогу!

Ён схапіў маці за руку і паваліў на падлогу. І своечасова. Бо наступаючыя пачалі страляць. Адна куля прабіла падаконнік нашай хаты. Каб маці стаяла каля вакна, выглядваючы, дзе яе Іван, то куля якраз патрапіла б у яе. Мусіць, і зараз тая куля сядзіць у дзірачцы.

Тут страляніа заціхла, і мы нават не ўбачылі, як з хаты знік Янэк. Раптам на падворку пачуўся тупат, галасы. Салдаты выгналі нас з хаты.

- Дзе мэншчызны? – дапытваліся. Цётка Валя нешта ім тлумачыла. Адзін закрычаў: "Вось ён!". Салдаты выцягнулі Янэка з ямы для бульбы, пачалі біць. Цётка Валя залямантавала, што ён польскі афіцэр. Тыя абурыліся, маўляй, Польшча ў небяспецы, а ён хаваецца. "Вальчыць" – закрычалі і пацягнулі з сабой. Цётка Валя зноў пачала даказваць салдатам: "Ён жа хворы, у яго сухоты". Салдаты пакінулі Янэка і пабеглі ў цэнтр

Скідзеля.

З-пад Бору чулася страляніна, крыкі. Там ішоў бой. На сутонні ён сціх. А над цэнтрам Скідзеля ўскінуўся вогненны сполах.

- Пажар! Палякі падпалілі, - здагадалася маці.

- Пільнуй, Валя, дзяцей, - і кінулася туды.

А агонь, здавалася, ахапіў паўнеба. Неўзабаве вярнулася маці: “Што там творыцца – страх! Гарыць увесь рог каля школкі, дамоў, можа дзесяць. Салдаты не дазваляюць тушыць. Яны ловяць людзей, кладуць тварам уніз, б’юць, загадваюць: “Цалуй польска земя!”. Знайшлі польскую зямю!— злавалася маці.— І партызанаў злавілі шмат, кажуць – павялі расстрэльваць”.

Назаўтра я пабег паглядзець на пажар. Галавешкі яшчэ дыміліся. Ад пажарышча цягнула цяплом. Нечакана я ўбачыў абгарэлага сабаку. Мне стала млосна і ледзь не вырвала. Доўга яшчэ мяне муціла, калі паўставала перад вачыма аблезлае сабачае цела.

Так запомнілася мне паўстанне. Яно хутка абрастала рознымі фактамі, звесткамі, чуткамі. Я слухаў расказы бацькі, дзядзькі Грышы, іншых удзельнікаў. Яны нярэдка збіраліся ў нашай хаце, і тады наплывалі ўспаміны”.

Можна сцвярджаць, што польскі атрад увайшоў у Скідзель без асаблівага супраціву. Рэўкам не здолеў належным чынам арганізаваць абарону на заходнім ускрайку мястэчка, а паўстанцы часткай адступілі ў лясны масіў Бор на ўсходняй ускраіне, а часткай разбегліся і пахаваліся. Што адбывалася ў Скідзелі пасля таго, як мястэчка занялі карнікі, найбольш грунтоўна апісана ў працы М.Вяжбіцкага, а таксама ў матэрыялах судовай справы, заведзенай пазней ужо савецкімі судовымі ўстановамі [АГАГВ. Ф. 1695. Воп. 1. Спр. 91]. Паводле польскага аўтара, карны атрад з Гродна прабыў у Скідзелі адносна кароткі адрэзак часу. Уварваўшыся ў мястэчка, вайскоўцы кінуліся шукаць пахаваўшыхся паўстанцаў. У кватэры кіраўніка скідзельскіх “стшэльцаў” Станіслава Новака быў размешчаны іх штаб. Мясцовыя паліцыянты і актывісты “Стшэльца” выконвалі ролю праваднікоў. Яны паказвалі хаты, дзе жылі самыя актыўныя, на іх думку, удзельнікі паўстання і асобы камуністычных перакананняў. Паводле паказанняў сведкаў, інструктар стшэльцаў Віктар Белакоз прывёў карнікаў да хаты паўстанца Грыгаровіча, якога збілі і павялі расстрэльваць, але таму

ўдалося ўцячы. В.Белакоза абвінавачвалі таксама, што ён кідаў гранаты ў хаты паўстанцаў і падпальваў іх. Чыноўнік-секвестратар Казімір Цыдзік страляў разам з іншымі карнікамі ў дом Рыгора Каскевіча. Пад час гэтай страляніны быў забіты цесць Каскевіча Міхал Трусь. У краязнаўца Іллі Барысава, які быў 14-гадовым юнаком, урэзаўся ў памяці эпізод таго трагічнага дня.

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ

**Успаміны Чабатарэвіча Паўла Фёдаравіча (1918 г.н.)**

Усе скідзельскія камсамольцы былі актыўнымі ўдзельнікамі паўстання ў верасні 1939 г. Разбройвалі салдат і афіцэраў, некаторых арыштоўвалі, некаторых адпускалі. Мой атрад ахоўваў мост праз Скідлянку пры ўездзе з боку Шчучына. Адзін атрад польскіх салдат ішоў на Скідзель, але мы яго не пусцілі, тады яны пайшлі на Пузавічы. Напачатку ў мяне была вінтоўка. Але потым яе забралі і перадалі старэйшаму партызану, а мне даручылі насіць станок ад кулямёта. Кулямётчыкам быў хлопец з вёскі Стральцы, былы капрал польскага войска, прозвішча яго не памятаю. Калі польскі атрад з Гродна захапіў Скідзель, то мы адступілі ў Бор. Польскі кулямёт над намі страчыў. Некаторыя кідалі вінтоўкі і ўцякалі, а некаторыя гатовы былі ісці ў атаку. Той капрал са Стральцоў хацеў падыйсці бліжэй, каб падавіць польскі кулямёт. Яўрэй наш заплакаў: “Пусці мяне, у мяне малое дзіця”. Пастралялі мы ў бок Скідзеля, але хутка закончыліся патроны. Стральцоўскі хлопец нас адпусціў, а сам забраў кулямёт і пайшоў у лес сваёй дарогай. Больш я яго не бачыў. Я пераначаваў у адрыне ў Мастаўлянах, а адтуль ранкам пайшоў да Мількаўшчыны, дзе сустрэў савецкіх салдат.

Пасля ўстанаўлення Савецкай улады я больш за два месяцы працаваў у народнай міліцыі. Праўда, за гэтую работу нам амаль нічога не плацілі. Мы з братам Васілём хацелі паехаць у Мінск вучыцца на шафёраў. Мне вельмі хацелася стаць шафёрам. Але паехаць у Мінск у нас не атрымалася, а паехалі мы вучыцца на трактарыстаў у Ваўкавыск. Кармілі там дрэнна, але можна было з’ездіць дахаты за прадуктамі. З вясны 1940 г. я працаваў на трактары да пачатку восені. А 20 верасня 1940 г. мяне прызвалі ў Чырвоную армію.

*Запісаў Сяргей Токць 07.06.2008 г. Захоўваецца ў асабістым архіве С.Токця*

**Успаміны Іллі Аляксандравіча Барысава**

Карнікі не абмінулі і нашу маленькую хату. Спачатку яе абстралялі, а затым чацвёра салдат з'явіліся на падворку. Бацьку, маці, мяне, брата Валодзю і сястру Маню паставілі ў шарэнгу перад ручным кулямётам, даўшы паверх галоў чаргу стрэлаў, каб запалохаць. Затым уважліва правялі вобыск, шукаючы брата Мікалая, які прымаў удзел у паўстанні. Нікога больш не знайшоўшы, вывелі бацьку з шарэнгі і сталі збіваць прыкладамі, пытаючыся, дзе хаваецца сын-камуніст. На абарону бацькі кінулася мая 16-гадовая сястра Марыя, хапаючы салдат за рукі і карабіны.

- Мы з'явімся да вас яшчэ, калі не выдадзіце сына, дык расстраляем усіх, - сказаў старшы групы.

Але, на шчасце, з'явіцца да нас ім ужо не давялося. Савецкія танкі ўвайшлі ў наша мястэчка і сарвалі іх чорны намер. Неўзабаве і брат Мікалай вярнуўся дамоў – з перабітай рукой. Аказалася, у навакольным бары ён выпадкова натрапіў на двух карнікаў і тыя адкрылі па ім агонь, але не патрапілі. Пасля таго, як у карабінах закончыліся патроны, яны дагналі брата і пачалі збіваць. Але Мікалаю ўсё ж удалося вырвацца і ўцячы. А вось другому ўдзельніку паўстання 26-гадоваму Уладзіміру Мышко з вёскі Кашубінцы не пашчасціла застацца ў жывых. Ад карнікаў яго схаваў адзін з рабочых маёнтка, але яго выкрылі і закалолі штыкамі. Аднавяскоўцы пазней пахавалі У.Мышко на Юрьеўскіх могілках і паставілі помнік з шэрага граніту.

*Советская Белоруссия. 2006. ад 16 верасня. С. 16.*

Адзін скідзельскі татарын, які ў савецкіх дакументах акрэслены, як "патрыёт польскага ладу", паказаў вайскоўцам склеп пад хатай заможнага яўрэя Еліна, дзе хавалася асабліва шмат народу. Што адбывалася далей, апісаў у сваіх паказаннях савецкаму суду яўрэй Гірша Лазовік: "Находившихся в подвале Белорусов и евреев каратели зверски избивали (в том числе и меня), а затем вывели на площадь и положили на землю вниз лицом. В таком положении мы пролежали

несколько часов. После этого нас направили в арестное помещение, где также избивали. Туда-же доставили партизана Почимка Лазаря, которого вскорости вывели и зверски растерзали, все остальные арестованные избежали смерти в связи с тем, что в Скидель вступили части Красной Армии и каратели бежали” [АГАГВ. Ф. 1695. Воп. 1. Спр. 91. Арк. 13]. Сведчанні Гіршы Лазовіка выглядаюць недакладнымі. Паводле звестак з артыкула Міхала Сяўрука, арыштаваных паўстанцаў і іх прыхільнікаў (каля 100 чалавек) павялі пад канвоем у вёску Котра, дзе паклалі на зямлю ў будынку школы, а затым пачалі канваіраваць у бок Гродна. Пад час гэтага пераходу нібыта з’явіўся савецкі вайсковы самалёт, які на малой вышыні пачаў лятаць на калонай. Вартаўнікі разбегліся, і вязні аказаліся вольнымі. Такую версію падзей Міхалу Сеўруку распавёў адзін з затрыманых, малады хлопец Анатоль Зелянкоўскі, які ў 1942 г. быў расстраляны фашыстамі разам з ішымі камсамольцамі-падпольшчыкамі.

З тых дакументальных звестак, што мы маем, дакладна вядома пра забойства польскімі вайскоўцамі ў Скідзелі чатырох палонных паўстанцаў. Гэта яўрэі-камуністы Лазар Пачымок і Муня Каток, беларус-кэпэзэбовец з вёскі Кашубінцы Уладзімір Мышко і невядомая асоба – нядаўні вязень турмы ў Гродне. Георгі Шагун пісаў у сваіх успамінах: “Зверски были убиты наши товарищи Почимок, Лойша, Малиновский, Пельц, комсомольцы Тулинский и Мышко. Всего погибло 18 человек”.

Няма амаль ніякай інфармацыі пра тое, што рабілася ў Скідзелі адразу пасля таго, калі польскі атрад пакінуў Скідзель. Паводле дадзеных М.Вяжбіцкага, каля гадзіны ночы ў мястэчка з усходу ўступіў ўжо атрад рэгулярнага польскага войска пад камандаваннем ротмістра Вішаватага. Ён складаўся з 4 эскадронаў кавалерыі, дывізіёну коннай артылерыі (але без гарматаў і снарадаў), а таксама вялізнага абозу, што налічваў 880 вазоў [Wierzbicki M. Powstanie skidelskie 1939 r.... S. 86]. Магчыма, Вішаваты ўжо ведаў пра падзеі ў Скідзелі. Скідзельскі яўрэй Самуіл Левін сведчыў у савецкім судзе, што тэлефонны майстар Канстанцін Літоўскі паехаў у мястэчка Каменка (дзесяць кіламетраў на ўсход ад Скідзеля) і заклікаў камандзіра польскай вайсковай часткі хутчэй накіроўвацца ў Скідзель: “К одному полковнику польской армии подошел Скидельский телефонный мастер, фамилия кажется Литовский, и обращаясь к полковнику говорил: “В Скиделе евреи и коммунисты подняли бунт, обезоружили нашу армию. Немедленно езжайте на помощь” [АГАГВ. Ф. 1695. Воп. 1. Спр. 91. Арк. 15].

Ротмістр Вішаваты намерваўся, не затрымліваючыся ў Скідзелі, рухацца да Гродна. Але каля 4 гадзін ночы атрымаў адтуль загад арганізаваць абарону супраць Чырвонай арміі ў ваколіцах Скідзеля. Ротмістр мусіў выконваць гэты загад. Праўда, ён прасіў прысылаць яму хаця б адну супрацьтанкавую гармату і боепрыпасы, але нічога так і не дачакаўся. Каля 7 гадзін раніцы загучалі стрэлы. Паручнік Васілеўскі

паведаміў свайму камандзіру, што ў горадзе цывільныя асобы абстрэльваюць яго жаўнераў.

А каля 10 гадзін раніцы да Скідзеля падыйшлі з боку Шчучына савецкія танкі. Гэта была матарызаваная група камбрыга Розанава. Міхал Сяўрук пісаў у сваіх артыкулах, што паўстанцкі рэўкам паслаў сваіх людзей насустрач Чырвонай арміі, каб яны паведамілі пра падзеі ў Скідзелі, але пацверджанняў гэтаму няма. Група Розанава была сфарміраваная раніцай 19 верасня 1939 г. пры 16-м стралковым корпусе, які знаходзіўся ў раёне мястэчка Крэва (сучасны Смаргонскі раён Гродзенскай вобласці). Група складалася з танкавых батальёнаў 100-й і 2-й стралковых дывізій, а таксама з роты бронеаўтамабіляў разведывацельнага батальёна 2-й дывізіі [Мельтюхов М.И. Советско-польские войны... С. 308]. Мэтай яе было фарсіраваным маршам наступаць у накірунку Ліды, а заняўшы гэты горад, рухацца далей на Шчучын, Скідзель і Гродна. Ужо каля 23 гадзін вечара матагрупа была ў Лідзе. Раніцай 20 верасня камбрыг Розанаў атрымаў загад наступаць на Гродна, рухаючыся па шашы ў накірунку Скідзеля. Якраз у Скідзелі адбыўся бой яго групы з жаўнерамі ротмістра Вішаватага.

Захаваліся два апісанні гэтага бою: рапарт ротмістра Вішаватага і справаздачы камандзіраў савецкіх аддзелаў [Российский государственный военный архив. Ф. 35086. Воп. 1. Спр. 18.1.210, 275, 486; Польскі інстытут і Музей ген.Уладыслава Сікорскага (Instytut Polski i Muzeum gen.Władysława Sikorskiego). B I 70. A. Ł. B. 3192]. Вішаваты свярджаў у сваім рапарце, што сілы савецкага аддзела складалі 6 вялікіх і 8 малых танкаў, а таксама бронемашыны. Але амаль не было пяхоты, што з'яўлялася вельмі істотным фактарам ва ўмовах вулічных баёў. Тады, як сцвярджаў польскі камандзір, на дапамогу савецкаму аддзелу прыйшлі паўстанцы, якія хаваліся ў лясах пад Скідзелем.

Савецкія і польскія крыніцы па-рознаму апісваюць ход бою. Ротмістр Вішаваты пісаў, што бой працягваўся з дзесяці гадзін ранку да шостай гадзіны вечара. У савецкіх рапартах сцвярджалася, што бой распачаўся каля гадзіны дня ў ваколіцах Скідзеля і завершыўся праз тры гадзіны. Паводле звестак польскага камандзіра, яго жаўнеры аказалі моцны супраціў і падбілі ўжо на пачатку боя два танкі. Але каля дзвюх гадзінаў дня загінуў паручнік Лішэўскі, а яго эскадрон коннай артылерыі пакінуў сваю пазіцыю пры ўездзе ў мястэчка з боку Шчучына. Тады савецкія танкі і мясцовыя паўстанцы ўварваліся ў Скідзель, і распачаліся вулічныя баі. Вішаваты пісаў, што ў польскіх жаўнераў скончыліся патроны, іх абстрэльвалі з усіх бакоў, таму пачалося адступленне ў бок вёскі Котра, якое неўзабаве перарасло ва ўцёкі, паколькі танкі пераследавалі і абстрэльвалі адступаўшых. Пад камандай Вішаватага засталіся толькі 18 чалавек, якія больш-менш арганізавана адступілі ў бок Гродна.

Жадаючы спыніць атаку савецкіх танкаў, польскія жаўнеры падпалілі мост праз Скідлянку, набраўшы саломы ў суседніх жыхароў.

Але танкі праскочылі праз мост хутчэй, чым ён згарэў і разваліўся [Паводле ўспамінаў скідзельца Івана Багушэвіча, мост разваліўся, калі праз яго спрабаваў пераехаць савецкі грузавік з салдатамі, некаторыя з якіх былі ў выніку пакалечаныя]. Другая група танкаў камбрыга Розанава, наступаўшая з поўдня, фарсіравала рэчку ўплаў [У складзе савецкага аддзела былі плаваючыя лёгкія танкі Т-38, прынятыя на ўзбраенне Чырвонай арміі ў 1936 г. Экіпаж такога танка складаўся з 2 чалавек, узбраенне – 7,62 мм кулямёт ДТ, таўшчыня брані – 9 мм, маса – 3,2 т. На той час падобнага па характарыстыкам танка не было ні ў воднай арміі свету]. Негледзячы на адсутнасць артылерыі, польскі атрад на працягу паўтарох гадзінаў аказваў супраціўленне савецкай матарызаванай групе на вуліцах Скідзеля. Танкі не здолелі хутка ачысціць мястэчка. Сказвалася адсутнасць пехацінцаў, якім зручней было б весці баявыя дзеянні ў гарадскіх умовах. Але савецкія танкі ў гэты момант атрымалі падтрымку скідзельскіх паўстанцаў, якая аказалася вельмі важнай. Каля 18 гадзін вечара бой сціх, а польскія жаўнеры адступілі ў Гродна. У гэтым баі матагрупа Розанава панесла такія страты: 1 паранены салдат, падбітая бронемашына, падбіты і пашкоджаны танк Т-38 [Мельтюхов М.И. Советско-польские войны... С. 309]. Савецкія рапарты паведамляюць таксама пра свае трафеі: 2 кулямёты, 48 карабінаў і 50 коней.

Ротмістр Вішаваты пісаў у сваім рапарце, што яго аддзел страціў забітымі 45 чалавек, у тым ліку 4 афіцэраў. У рапарце камбрыга Розанава да 10 кастрычніка 1939 г. прыведзеныя прозвішчы 26 партызанаў, якія ўдзельнічалі ў баі за Скідзель і атрымалі ад яго афіцыйны дазвол на нашэнне зброі і выкананне міліцэйскіх функцый: 1) Шмуйла Іван, камандзір партызанскага атрада, жыхар вёскі Пяшчанка 2) Сіткевіч Фёдар, вёска Мастаўляны 3) Гольман Ілья, Мастаўляны 4) Курчэўскі Емельян, Мастаўляны 5) Бубен Філіп, Бубны 6) Бубен Іван, Бубны 7) Мышко Андрэй, Пяшчанка 8) Сямашка Мікалай, Хваты 9) Мышко Пётр, Пяшчанка 10) Шмойла Мікалай, Пяшчанка 11) Ратомскі Сямён, Гліняны 12) Ліс Дмітры, Стральцы 13) Якусевіч Максім, Стральцы 14) Гнідко Міхал, Бубны 15) Курчэўскі Аляксей, Мастаўляны 16) Шостка Аляксей, Мастаўляны 17) Шур Іцка, Скідзель 18) Навінскі Абрам, Скідзель 19) Каскевіч Рыгор, Пяшчанка 20) Сіткевіч Пётр 21) Сіткевіч Мікалай 22) Масюкевіч Іван 23) Багушэвіч Пётр 24) Лазоўскі Карней 25) Мышко Ілля, Пяшчанка 26) Лобань, Хваты [Ліст памочніка камандзіра 16 стралковага корпуса камбрыга Разанава да начальніка штабу 11 арміі ад 08.10.1939. Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 35986. В. 1. С. 113. Арк. 17-18. Гэтыя звесткі перадрукаваныя ў выданні: Jasiewicz Krzysztof. Pierwsi po diable. Elity sowieckie o okupowanej Polsce. 1939-1941 (Białostocczyzna, Nowogródczyzna, Polesie, Wilenszczyzna). Instytut studiów politycznych PAN. Warszawa, S. 1176. Выказваем падзяку за гэтую інфармацыю гродзенскаму гісторыку Андрэю Чарнякевічу]. Можна меркаваць, што ў апошнім баі стратаў

сярод паўстанцаў не было, прынамсі няма ніякай інфармацыі пра гэта. Захаваўся таксама калектыўны фотаздымак 27 паўстанцаў, зроблены праз некалькі дзён пасля паўстання. Такім чынам, у другой палове дня 20 верасня 1939 г. баі канчаткова скончыліся і скончылася кароткая, але вельмі драматычная гісторыя Скідзельскага паўстання. 21 верасня праз Скідзель двума калонамі па Гродзенскай і Зялёнай вуліцах увесь дзень ішлі савецкія войскі на Гродна, якіх мясцовыя жыхары віталі кветкамі. А на наступны дзень адбылося пахаванне ахвяраў паўстання. На плошчы мястэчка ў адзінай брацкай магіле, паводле звестак М.Сяўрука, пахавалі Лазара Пачымка, Якава Пельца, Івана Праўко, Васіля Сакалінскага, Пятра Цярэшку, Якава Барушака, Сямёна Гожэня, А.М.Фурмана, Андрэя Кузьміцкага, М.Маліноўскага, К.Тулінскага, Р.Бараноўскага. Уладзіміра Андрэевіча Мышко з вёскі Кашубінцы родныя пахавалі на Юрьеўскіх могілках каля вёскі Гушчыцы.

У верасні 1939 г. мясцовыя людзі, якія ўзяліся ў Скідзелі за зброю, кіраваліся рознымі праўдамі. Паўстанцы былі ўпэўненыя, што ўзняліся супраць польскіх акупантаў, супраць шматгадовага нацыянальнага ўціску. Іх ворагі таксама былі перакананыя, што змагаюцца за сваю айчыну, супраць здраднікаў, якія ўдарылі ў спіну ваюючай арміі. У той страшэнны час не было ніякай магчымасці паразумення. Жыхары Скідзельшчыны напэўна павінны былі перажыць такі жорсткі досвед, каб назаўсёды засвоіць цяжкі ўрок.

Эпілогам вераснёўскага паўстання стаў судовы працэс над тымі, хто дапамагаў гродзенскаму атраду падаўляць паўстанне. Усяго было аддадзена пад суд 15 асобаў. Сярод іх пераважалі прадстаўнікі былой дзяржаўнай адміністрацыі, сябры польскіх патрыятычных арганізацый. Паліцыянт Міхал Радзевіч (1888 г.н.) у свой час дабраахвотнікам уступіў у польскае войска, быў узнагароджаны за ўдзел у баях з Чырвонай арміяй, з 1923 г. знаходзіўся на службе ў паліцыі. Ян Пуцілоўскі (1883 г.н.) быў у мінулым камендантам пастарунка паліцыі, разам з ім пад суд была аддадзена яго дачка Часлава (1919 г.н.). Расіянін Цімафей Абідоўскі (1894 г.) служыў афіцэрам у белага генерала Врангеля, у міжваенны час працаваў у Скідзельскім лясніцтве. Былы унтэр-афіцэр царскай арміі Казімір Цыдзік працаваў чыноўнікам-секвестратарам (арыштоўваў у жыхароў маёмасць за нявыплачаныя падаткі). Для ўсіх гэтых асобаў падзеі верасня 1939 г. сталі жыццёвай трагедыяй. Большасць была прыгавораная савецкім судом да вышэйшай меры пакарання, некалькі чалавек атрымалі вялікія тэрміны зняволення і болей ужо ніколі не вярнуліся ў Скідзель, а далейшы іх лёс нам невядомы.

Трагічна склаўся лёс і апошняга ўладальніка маёнтка Скідзель Канстанціна Чацвярцінскага. Паводле ўспамінаў доўгажыхароў, быў ён чалавекам нядрэнным і не выклікаў у скідзельцаў асаблівай нянавісці. Як пазней даведалася яго родная сястра Караліна Чацвярцінская, Канстанціна арыштавалі супрацоўнікі НКУС і ён загінуў дзесці на

Камчатцы. Караліна Чацвярцінская таксама сцвярджала, спасылаючыся на ўладальніка фальварка Кашубінцы Мар'яна Блаўдзевіча, што ад рук паўстанцаў загінуў яе сваяк Андрэй Чацвярцінскі, уладальнік маёнтка Жалудок, а таксама некалькі польскіх афіцэраў. Але дакументальных пацверджанняў гэтай інфармацыі ў нас няма [У 1990-х гадах Караліна Чацвярцінская перапісвалася з ксяндзом Скідзельскай каталіцкай парафіі. Копіі яе лістоў захоўваюцца ў фондах Скідзельскай гарадской бібліятэкі]. Ва ўспамінах Г.Шагуна гаворыцца, што пад час сутычак было забіта некалькі афіцэраў [Памяць. Гродзенскі раён (гістарычна-дакументальная хроніка Гродзенскага раёна). Мінск, 1993. С. 109]. У пазнейшых дакументах савецкага судовага працэсу прысутнічаюць ўзгадкі сведак пра забітага польскага капітана [АГАГВ. Ф. 1695. Воп. 1. Спр. 91. Арк. 12].

Трэба ўзгадаць яшчэ адзін важны момант з гісторыі верасня 1939 г. Многія скідзельцы, мабілізаваныя ў польскую армію, прынялі ўдзел у баях супраць гітлераўскай арміі. Яны першымі са скідзельцаў уступілі ў бой з фашызмам. Ужо на пачатку 1990-х гадоў 16 жыхароў Скідзельшчыны атрымалі ганаровыя польскія медалі ўдзельнікаў абарончай вайны 1939 г.: Сяргей Горбач, Васіль Чабатарэвіч, Платон Бодак, Аляксандр Манкевіч, Уладзімір Сяўрук, Васіль Неўгень, Павел Цярэшка, Аляксандр Паўлоўскі, Мікалай Праўко, Мікалай Гарноўскі, Сяргей Курчэўскі, Пётр Шостка, Міхал Мышко, Цімафей Жук, Рыгор Шымчук, Іван Рэмша [ДАГВ. Ф. 239. В. 9. С. 47. Ветэраны Войска Польскага на Скідзельшчыне].

Многія скідзельцы патрапілі тады ў нямецкі палон. Сярод іх быў вядомы паэт з вёскі Баброўня Скідзельскай воласці Міхась Васілёк. У палоне з ім пазнаёміўся будучы класік беларускай літаратуры Янка Брыль, які, пра што мы ўжо вышэй пісалі, наведваў Скідзель яшчэ ў 1937 г. Янка Брыль пазней пісаў, што вяртаўся з палону разам з Анатолем Мышко з вёскі Раўкі Скідзельскай воласці. Лёс гэтага чалавека таксама склаўся надзвычай складана і цікава.

**ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ**

**Успаміны Анатоля Сцяпанавіча Мышко**

Нарадзіўся я 17 лютага 1917 г. у горадзе Петраградзе. Бацька быў родам з вёскі Раўкі, паходзіў з малазямельных сялян, пакінуў родныя мясціны ў канцы XIX ст., калі яму толькі споўнілася шаснаццаць гадоў, у пошуках лепшай долі. Спачатку ўладкаваўся на працу ў г. Архангельску, а потым у Пецярбургу. Але грошай ледзве хапала на жабрацкае існаванне. Нарадзіўся ж мой бацька Сцяпан Іванавіч ў 1881 г. У 1905 г. ён быў прызваны ў царскую армію і служыў машыністам на кацеры Чарнаморскага флоту. Быў сведкам

паўстання на крэйсеры “Пацёмкін”.

Бацька яшчэ да службы на флоце атрымаў спецыяльнасць шафёра і па гэтай спецыяльнасці працаваў пасля службы. У 1922 г. ён надумаў прыехаць у родную вёску, але назад вяртацца яму не дазволілі. У сям’і было трох дзяцей. Маці памерла ў 1924 г., яна была родам з вёскі Гліняны. Гаспадарка бацькі была падзелена на дзве часткі, кожнаму засталося па два гектары зямлі.

З камсамолам Заходняй Беларусі я звязаў свой лёс з 1933 г., калі вучыўсяў у Віленскай беларускай гімназіі. Тады я быў піянерам. У гімназіі разам са мной вучыліся Валянцін Таўлай, Якуб Міско, Максім Скурко (Танк), Бурсевіч і інш. Скончыў 4 класы (усяго было 8 класаў), бо выключылі за ўдзел у пахаванні вязняў, замучаных у турме Лукішкі. Іх хавалі на могілках Русы. Са мной разам выключылі Міхала Літвіна і Уладзіміра Фурмана са Скідзельшчыны. Яны разам са мной і сідзелі ў турме.

Калі выключылі з гімназіі, дык займаўся сельскай гаспадаркай у доме бацькі. У КСМЗБ уступіў у 1935 г., а ў КПЗБ – у 1937 г.

Уладзімір Ілліч Лабко з Глінянаў уцёк ад начальніка паліцыі, быў судзімы па справе Браніслава Тарашкевіча доўга хаваўся ад паліцыі, яго хацелі пераправіць у Францыю, але ён пайшоў у Савецкі Саюз і быў расстраляны, як контррэвалюцыянер.

У 1933 г. я спрабаваў перайсці ў Саюз, але на мяжы мяне затрымалі. Такіх спробаў я зрабіў дзве, за што адседзеў па два месяцы ў турме.

Камсамольскія сходы праводзілся ў Глінянах у Валодзі Фурмана, а таксама ў Карашаве, Раўках і Стральцах. Сакратаром Скідзельскага райкама партыі да роспуску КПЗБ і КСМЗБ быўІван Кравец (сапр. Рамановіч).

У 1937 г. актывістамі КПЗБ і КСМЗБ у Скідзелі і ваколіцах былі У.Юрэвіч, М.Карніла, М.Барысаў, М.Лайт, М.Юрэвіч, П.Чабатарэвіч, У.Фурман, А.Літвін, М.Патап. Многія з іх былі ў тым жа годзе арыштаваныя і патрапілі ў турму. Я таксама пабываў у Гродзенскай турме з 8 кастрычніка па 23 лістапада 1937 г. Тады судзілі за арганізацыю страйка М.Карнілу, М.Літвіна, А.Літвіна, М.Барысава. Другі раз М.Карнілу і М.Барысава арыштавалі за збіццё канфідэнта паліцыі Ф.Савы. Канспіратыўныя кватэры

падпольшчыкаў былі ў вёсках Раўкі у Аляксандра Фёдаравіча Гарошкі і Сяргея Фёдаравіча Гарошкі (яны не былі роднымі братамі).

У сакавіку 1939 г. мяне прызвалі ў польскую армію, у складзе якой я і ваяваў супраць фашысцкай Германіі і патрапіў у палон, дзе быў разам з Янкам Брылём, Міхасём Васільком і Мікалаем Патапам. Усе разам мы і ўцяклі з палону ў 1941 г.

Працаваў на гаспадарцы ў роднай вёсцы. У 1942 г. вывезлі мяне ва Ўсходнюю Прусію на работу. Адтуль я ўцёк дахаты. У 1943 г. мяне зноў арыштавалі, але я зноў уцёк. У 1944 г. арыштавалі ў чарговы раз за сувязь з партызанамі і антыфашысцкім камітэтам. Пабываў у канцэнтрацыйных лагерах Гросгрозен, Люсенбург і інш.

Пасля вайны працаваў на гаспадарцы бацькі, а з 1946 па 1977 г. быў білетным касірам на чыгуначнай станцыі Скідзель.

*Запісаў І.А.Барысаў 10 сакавіка 1987 г. Успаміны захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці. Ф. 239. В. 9. Спр. 19. Арк. 1-9.*

Некалькі жыхароў Скідзельшчыны былі разброеныя разам са сваімі вайсковымі часткамі Чырвонай арміяй, а пазней патрапілі ўжо ў савецкі лагер для польскіх ваеннапалонных, працавалі на шахтах Украіны, пазней былі накіраваныя на поўнач будаваць чыгунку ў далёкай Варкуце. Там іх уключылі ў склад польскай арміі генерала Уладыслава Андэрса, якая была перапраўленая праз Сярэднюю Азію і Блізкі Ўсход на Заходні фронт. Скідзельцы ваявалі супраць фашыстаў у Італіі, бралі ўдзел у славутай бітве ля кляштару Монтэ-Касіна. Вярнуліся ў родны Скідзель пасля вайны з арміі генерала Андэрса Павел Чабатарэвіч, Аляксандр Паўлоўскі і Пётр Станкевіч, а Вільгельм Голяс і Міхаіл Размыслевіч так і засталіся жыць за мяжой. 1 красавіка 1951 г. усіх андэрсаўцаў разам з сем'ямі ў адну ноч пагрузілі на цягнік і павезлі ў Сібір. Іх маёмасць была канфіскаваная. Толькі ў 1957 г. ім дазволілі вяртацца дахаты.

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ

**Успаміны А.Я.Паўлоўскага**

Нарадзіўся я ў беднай сялянскай сям'і, дзе зямельны надзел лічыўся не гектарамі, а соткамі. Таму беднасць прымусіла бацькоў ісці на заробкі да гарбарнага фабрыканта Брэнэра, каб хоць як здабыць грошы на

кавалак хлеба для сям'і, якая складалася з шасці душ. Нялёгка склалася жыццё і ў мяне. Дзяцінства як такога і не было, дапамагаў бацьку і маці працаваць на фабрыканта, пасвіў сялянскую скаціну. У трыццаць шостым ажаніўся на такой жа беззямельнай сялянцы як я – Яўгеніі Сцяпанаўне Юрэвіч. Разам з ёй дзялілі радасць і гора, жылі дружна і ў згодзе. З цяжкасцю, адрываючы ад свайго малога заробку, змаглі сабраць грошы і купіць каня. Пачалі будаваць хату, а конь якраз і быў вялікім памочнікам у будаўніцтве і матэрыяльным забеспячэнні сям'і. Працаваць прыходзілася ўвесь светлы дзень на вывазцы лесу і пагрузцы яго ў вагоны. Акрамя гэтага, стаў браць у арэнду зямлю і працаваў на ёй так, каб давала добрую аддачу, бо ад гэтага залежаў мой заробак. А налічвалі яго вельмі проста. Адзін вырашчаны сноп мне, а два – гаспадару зямлі. Больш снапоў вырасціш, больш і атрымаеш. Жыццё і матэрыяльны дабрабыт сям'і паціху наладжваліся. Глядзіце самі: у нядзелю заробак на вывазцы лесу і пагрузцы ў вагоны складаў 90-100 злотых. А каб параўнаць, што сабой гэтыя грошы ўяўлялі, прывяду такі прыклад. Пуд зерня каштаваў два злотых, кілаграм цукру 50 грошай, боты – 10-12 злотых. Так што матэрыяльна можна было жыць някепска. Але ўсяму перашкодзіла вайна, якую фашысцкая Германія развязала з Польшчай і якая стала трагедыяй у маім далейшым жыцці.

У другой палове жніўня трыццаць дзевятага года я быў прызваны ў польскую армію і залічаны ў 6-ю дывізію, у складзе якой і ваяваў супраць фашыстаў пад Люблінам і іншымі гарадамі. Скажу чэсна, польскія салдаты, якія складаліся з палякаў і беларусаў, змагаліся адважна. Многа раз наша дывізія добра патрапала наступаючыя нямецкія войскі. Але сілы былі вельмі няроўныя, як па колькасці войскаў, так і па ўзбраенні. У нас бракавала нават вінтовак і патронаў да іх, тэхніка амаль адсутнічала. Цяжка было стрымаць узброеныя да зубоў фашысцкія войскі. У адным жорсткім баі загінуў мой сусед Аляксей Тоўкач, гінулі і іншыя землякі.

У другой палове верасня наша дывізія выйшла на тэрыторыю Заходняй Беларусі, дзе была разброеная наступаючай Чырвонай Арміяй, якая выконвала вызваліцельную місію, каб абараніць заходнебеларускі і заходнеўкраінскі народы. У першы дзень нас пастроілі, а потым перад

строем з’явіўся нейкі высокага чыну камандзір і заявіў: “Кто жители из Западной Белоруссии, всех отпускаем домой, а остальных задерживаем»

Не чуючы ад радасці пад сабой ног, разам з іншымі вырушыў у накірунку дома, але гэтае адчуванне радасці было памылковым. У раёне Брэста нас затрымалі.

- Куда вы идете? – спытаў камандзір

- Домой – адказалі мы яму.

- Не в ту сторону идете.

Нас загналі ў «телячьи» вагоны, якія ўжо былі запоўнены такімі ж былымі польскімі «жалнежамі», як і мы, а потым адправілі пад Сарны, дзе і кінулі за калючы дрот. Жылі ў бараках, спалі на голых нарах, харчаванне было кепскае. Так мы сталі ваеннапалоннымі, якіх налічвалася ў нашым лагеры да 8000 чалавек. Выкарыстоўвалі нас на будаўніцтве шашэйных дарог і аэрадрома. Выканаеш дзённую норму, атрымаеш 600 грамаў хлеба і гусцейшай баланды, не выканаеш – 400 грамаў хлеба і пустой баланды. Але жыць было можна, выручала дапамога, якую прысылалі з дому. Калі скончыцца наш палон, ніхто не тлумачыў. На чарговае патрабаванне адміністрацыі лагера падпісаць нейкае працоўнае пагадненне мы катэгарычна адмовіліся. Аднак адсутнасць нашага подпісу на дакуменце не выратавала ад лагернага жыцця за калючым дротам.

Калі пачалася вайна з фашысцкай Германіяй, нас таксама дахаты не адпусцілі. А з набліжэннем фронту пастроілі ў калону і пад узмоцненым канвоем рушылі на ўсход. Па дарозе да нашай калоны далучаліся калоны ваеннапалонных з іншых лагераў. І так, нас няшчасных, аказалася каля трох тысяч. Спачатку мы рухаліся днём, пасля ноччу, паколькі фашысцкія самалёты на брыючым палёце бамбілі калону і палівалі свінцом з кулямётаў. Многа палегла нашых жалнераў па дарозе не толькі ад бамбёжак, але і ад голаду. Харчаваннем адзіным нашым было некалькі грамаў крупы, каторую хто атрымае, а хто і не. Выратоўвалі буракі, каласы збожжа, лісце дрэваў і трава. На 28-ы дзень аказаліся каля горада Старая Беліца, да якога з 800 чалавек з нашага лагера дабрылі добра калі палавіна. Тут нас пагрузілі на адкрытыя таварныя платформы і адправілі ў

Архангельскую вобласць на лесапавал. Праца была рабская, ад цямна да цямна, а харчаванне – адна баланда. Ад непасільнай працы, холаду і голаду і тут загінула шмат нашых ваеннапалонных.

І раптам, нечакана для нас, у сорак другім годзе нас абмундзіравалі ў савецкую ваенную форму і пачалі абучаць ваеннай справе. Патлумачылі, што мы з'яўляемся салдатамі польскай арміі эмігранцкага ўрада Сікорскага, што ў Лондане, і рыхтуемся да баёў з фашысцкімі войскамі. Але так працягвалася нядоўга. Хутка нас перадыслацыравалі на поўдзень у Сярэднюю Азію. З цяжкасцю мы, простыя салдаты, даведаліся пра тое, што нашыя 5-ю і 6-ю дывізіі польскай арміі, збіраюцца адправіць за межы СССР. Ды нас ніхто і да таго часу не пытаў: хочаш ці не хочаш быць салдатам польскай арміі. А ўсіх залічылі агулам. Многія беларусы не жадалі пакідаць краіну, прасілі залічыць іх у Чырвоную Армію. Але ніхто нас слухаць не хацеў, адказ быў адзін: заходнікаў у Чырвоную Армію не бярэм. І так нашыя дзве дывізіі пад камандаваннем генерала Андэрса аказаліся за межамі Савецкага Саюза і ваявалі супраць фашыстаў у Італіі. Калі фашысцкія войскі былі разгромленыя, нас адправілі як польскіх салдатаў у Англію, бо там знаходзіўся польскі эмігранцкі ўрад. Хто быў з Польшчы, адразу ж атрымаў дазвол на ўезд у сваю краіну, а мы, выхадцы з Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў СССР, атрымалі дазвол на вяртанне толькі ў сорак сёмым. Але мы тады і не здагадваліся, што чакае нас дома, хоць і хадзілі чуткі, што нас могуць рэпрэсіраваць. Але сум па роднаму дому і сям'і аказаўся мацнейшы за страх перад небяспекай, якая магла нас напаткаць. Праўда, некаторыя так і засталіся на чужыне, баючыся вяртацца на радзіму, да сям'і. Можа яны зрабілі і правільны выбар, не прыйшлося ім паспытаць той трагедыі, што выпала на маю долю пасля вяртання

І вось я нарэшце дома, сярод сям'і, родных, блізкіх і землякоў. Радасці майму вяртанню, здавалася, няма канца. Восем доўгіх гадоў блуканняў! Уладкаваўся на працу грузчыкам лесу на чыгуначную станцыю Скідзель. Жыццё пачало неяк наладжвацца. Але нечакана для мяне і маёй сям'і, у пяцьдзесят першым прыйшла бяда. Мяне разам з сям'ёй вывезлі ў

горад Чарамхова Іркуцкай вобласці, а дом і большую частку маёмасці канфіскавалі. Там я працаваў на цагляным заводзе. У пяцьдзесят сёмым дазволілі вярнуцца, але дом і маёмасць не аддалі. Так і прыйшлося туляцца па кватэрах. Праўда, з уладкаваннем на працу праблем не ўзнікла. Працаваў грузчыкам на прамкамбінаце. І толькі ў 1971 г. мне вярнулі канфіскаванае – дом, а за маёмасць аплацілі 775 рублёў, хаця гэтая сума і не пакрывала затратаў на яго набыццё. На патрабаванне аплаціць за 20 гадоў эксплуатацыі дома адмовілі, хаця ўсе гаспадарчыя пабудовы за два дзясяткі гадоў былі даведзены да развалу, прыйшлося аднаўляць іх за свой сціплы заробак

Але ўсё перажытае засталося ў мінулым, мне вернута добрае імя. Зараз мне 82 гады, пенсія 213 рублёў, жыву з сям'ёй дачкі. Здавалася б, жыві ды радуйся. Але гэта не так. Мучае крыўда за тое, што нас, франтавікоў, якія ваявалі з фашыстамі ў Італіі, Іспаніі, Францыі, Нарвегіі і іншых краінах Еўропы за нашу і іхнюю свабоду не адносяць да ўдзельнікаў вайны. А жыццё нашае набліжаецца да свайго завяршэння

*Илья Борисов. Трагические зигзаги // Гродзенская праўда. 1981. № 82. 30 крас.*

Большасць жыхароў Скідзельшчыны з вялікім энтузіазмам і надзеямі вітала прыход Савецкай улады. Хутка пачаліся доўгачаканыя сацыялістычныя пераўтварэнні. Мясцовыя прыватныя прадпрыемствы неўзабаве былі нацыяналізаваныя і перайшлі ў кіраванне работнікаў. Канфіскавала новая ўлада і памешчыцкія землі. Пачалі стварацца калгасы, у якія першымі звычайна ўступалі былыя кэпэзэбоўцы. Найбольш яскравай перавагай новага грамадскага ладу ў вачах мясцовай моладзі стала тое, што яна атрымала такія магчымасці вучыцца, якіх раней не мела. Многія паступілі ў тэхнікумы, на розныя курсы шафераў, трактарыстаў і г.д. Скідзельская моладзь ахвотна ўлівалася ў шэрагі камсамолу. Вясной 1941 г. у Скідзельскім раёне налічвалася ўжо 700 камсамольцаў [ДАГВ. Ф. 239. В. 9. С. 20. Арк. 19]. Моладзь вёскі Пузавічы пад кіраўніцтвам сакратара мясцовай камсамольскай арганізацыі Данілы Скварнюка збудавала плаціну праз рэчку Доўжыцу і стварыла, такім чынам, штучнае вадасховішча. Цікава, што былы сябра скідзельскага гуртка ТБШ Даніла Скварнюк шмат гадоў з'яўляўся перакананым "талстоўцам", а тут уступіў у камсамол, ваяўнічая ідэалогія якога моцна рознілася ад талстоўскага

пацыфізму. Відавочна, што эмацыйны парыў масавага энтузіазму ахапіў большасць мясцовай люднасці.

Аднак, неўзабаве выявіліся і змрочныя бакі савецкай рэчаіснасці. Пачалася высылка на ўсход самых заможных гаспадароў, якіх запісвалі ў катэгорыю кулакоў. Больш прадбачлівыя з іх дабраахвотна адмаўляліся ад сваёй зямлі і такім чынам ратавалі сябе і свае сем'і. Часам ахвярамі рэпрэсій станавіліся ні ў чым не вінаватыя людзі.

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ

**Успаміны Іллі Аляксандравіча Барысава**

Праз пяць мінут ад нашага дому на былой Фабрычнай вуліцы жыла Ганна Каяла ў дабротным драўляным доме разам з дачкой Галінай, вельмі прыгожай, але хворай на сухоты дзяўчынай. Мы, блізкія суседзі, стараліся чым маглі аблегчыць яе мукі. І да нас яна прыходзіла, каб адведаць кубачак свежага малака толькі што з-пад каровы. Многія сцвярджалі, што яно можа пазбавіць ад сухотаў. Але ж цуда не здарылася. Галіна памерла ў росквіце маладосці штосьці ў 17 гадкоў. Ганна Каяла лячыла многіх, а вось сваю дачушку вылечыць не змагла. Яна прымала роды і ў маёй матулі, калі паяўляўся на Божы свет мой брат Валодзя.

У доме Ганны Каяла жыў на кватэры палкоўнік Войска Польскага ў адстаўцы, прозвішча якога з вулічных жыхароў ніхто не ведаў, магчыма, толькі сама ўладальніца дома. Ніхта не ведаў, чаму ён спыніўся ў Скідзелі. Жыхары вуліцы называлі яго “Пан палкоўнік”, такім ён і застаўся ў памяці местачкоўцаў. “Пан палкоўнік” быў чалавек культурны, ветлівы, просты і зносны з людзьмі, як з дарослымі, так і з дзецьмі, з беднымі і з багатымі. Заўжды адгукаўся на чужую бяду, прыходзіў на дапамогу.

Да статнай фігуры палкоўніка вельмі пасавала вайсковая форма. Усім здавалася, што палкоўнік так і будзе дажываць свой век сярод скідзельцаў. Але, калі ў верасні 1939 г. у Скідзелі пачалося паўстанне, дык актывісты пачалі арыштоўваць польскіхураднікаў, паліцэйскіх і ўсіх людзей, каго яны лічылі апорай былой улады. Арыштавалі і “пана палкоўніка” і разам з іншымі змясцілі ў залу кінатэатр “Апола”, якая аказалася набітая бітком. Лёс кожнага арыштанта вырашала ўтвораная рэўкамаўцамі тройка. Калі Скідзель заняў карны атрад з Гродна, дык гэтых

арыштантаў выпусцілі на волю. Але “Пан палкоўнік” застаўся ў мястэчку. Напэўна, яму не было куды ісці. З усталяваннем савецкай улады ён зноў быў арыштаваны органамі НКУС. І далейшы яго лёс скідзельцам застаўся невядомы.

А ў 1940 г. супрацоўнкі НКУС прыйшлі ў хату Ганны Каялы, на кватэры ў якой жыў “Пан палкоўнк”, і загадалі ёй рыхтавацца ў дарогу. Яна папрасіла іх на хвілінку выйсці, каб перапрануцца, а пасля перарэзала сабе горла загаддзя падрыхтаваным лязом. Вырашыла, што лепей быць пахаванай побач са сваёй дачкой, чым згінуць дзесьці ў Сібіры.

А памяць пра ветлівага і добразычлівага “Пана палкоўніка” жыла ў сэрцах скідзельцаў. Родная сястра Ганны Каяла ўвесь час у памінальныя дні ставіла па ім свечку і ў ліку памерлых родных прасіла святара памаліцца і за яго душу.

*30.08.2004. Захоўваецца ў прыватным архіве Іллі Барысава.*

У канцы кастрычніка 1939 г. у Беластоку адбыўся Народны сход Заходняй Беларусі, які прыняў Дэкларацыю пра абвяшчэнне Савецкай улады і ўз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Дэлегатам гэтага сходу ад Скідзельшчыны стаў былы кэпэзэбовец Георгі Шагун. У студзені 1940 г. Скідзель стаў раённым цэнтрам у Беластоцкай вобласці. У склад Скідзельскага раёна ўвайшлі 11 сельскіх саветаў: Абухаўскі, Азёрскі, Глінянскі, Дубнаўскі, Жыліцкі, Жытамлянскі, Лаўненскі, Луненскі, Русінаўскі, Скідзельскі, Стралецкі (у канцы 1940 г. былі далучаны яшчэ Берштаўскі і Навагрудскі сельсаветы са складу скасаванага Парэцкага раёна). У Скідзелі былі створаны органы раённай улады, да якіх належалі райкам камуністычнай партыі і раённы выканаўчы камітэт. У гэтыя структуры ўвайшлі, як прысланыя з усходу БССР партыйныя работнікі і дзяржаўныя служачыя, так і мясцовыя ўраджэнцы – а найперш актывісты камуністычнага падполля. Першым сакратаром Скідзельскага райкама стаў Ціхан Канашонак, другім – Савелі Яцкевіч, трэцім – Паліна Мельнікава. Старшынём райвыканкама прызначылі Бераснева, сакратаром Чайку. Загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі стаў Шыдлоўскі, а аддзела школ і піянераў – Ядвіга Яцкевіч, прысланая з Полацка. Сакратаром райкама камсамола абралі Фёдара Аўчыннікава. Былы кіраўнік рэвалюцыйнага камітэта ў мястэчку Лунна Вікенці Мікула ўзначаліў аддзел камунальнай гаспадаркі раёна. Георгі Шагун заняў пасаду старшыні Скідзельскага пасялковага савета [ДАГВ. Ф. 239. В. 9. С.20. Арк. 13-14].

У лістападзе 1939 г. савецкай уладай былі складзеныя спісы былых сяброў КПЗБ. Нагадаем, што гэтая партыя не мела фармальнага членства, і пацвердзіць сваю партыйную прыналежнасць можна было толькі праз паказанні сведкаў – сяброў сваёй ячэйкі і сувязных. Паводле гэтых спісаў у Скідзельскай воласці налічваліся 22 кэпэзэбоўцы беларускай нацыянальнасці і 24 яўрэйскай [АГАГВ. Ф. 6196. Воп. 1. Спр. 294. Арк. 35 - 37]. Да кэпэзэбоўцаў-беларусаў належалі наступныя асобы: 1) Літвін Міхаіл Іванавіч (1914 г.н.) У КПЗБ з 1937 г. Тры гады быў ў турме. Ураджэнец вёскі Гліняны. 2) Бедыс Мікалай Міронавіч (1906 г.н.) У КПЗБ з 1929 г. Жыхар вёскі Некрашы. 3) Кізевіч Мікалай Сцяпанавіч (1905 г.н.) У КПЗБ з 1925 г. Чатыры гады адсідзеў у турме. Ураджэнец вёскі Хвайняны. Рабочы. 4) Сыты Віталь Антонавіч (1902 г.н.). У КПЗБ з 1925 г. Сідзеў у турме. Жыхар вёскі Бандары. 5) Зорка Любоў Іванаўна (1905 г.н.) У КПЗБ з 1926 г. Жыхарка вёскі Бандары. 6) Кузьміцкі Фёдар Васільевіч (1910 г.н.). У КПЗБ з 1929 г. Тры гады адсідзеў у турме. Жыхар вёскі Карашава. 7) Цярэшка Іван Барысавіч (1913 г.н.). У КПЗБ з 1937 г. Жыхар вёскі Галавачы. 8) Быль Іван Сямёнавіч (1902 г.н.). У КПЗБ з 1924 г. Сем гадоў адседзеў у турме. Жыхар вёскі Залясяны. 9) Стокіш Міхаіл Мацвеевіч (1897 г.н.) У КПЗБ з 1925 г. Сем гадоў адседзеў у турме. Жыхар вёскі Кашубінцы. 10) Юрэвіч Міхаіл Сцяпанавіч (1914 г.н.). У КПЗБ з 1934 г. Жыхар Скідзеля. Рабочы. 11) Самойлаў Рыгор Пракопавіч (1887 г.н.) У КПЗБ з 1928 г. Два месяцы адседзеў у турме. Жыхар вёскі Русінаўцы. 12) Мышко Пётр Андрэевіч (1905 г.н.). Сябра КПЗБ у 1925-1929 гг. Дзевяць месяцаў правёў у турме. Жыхар вёскі Кашубінцы. 13) Каханоўскі Рыгор Рыгоравіч (1896 г.н.). Сябра КПЗБ з 1925 г. Сем гадоў адседзеў у турме. Жыхар вёскі Залясяны. 14) Лук'янчыкаў Мікалай Міхайлавіч (1907 г.н.) У КПЗБ з 1928 г. Жыхар вёскі Каўшова. 15) Мазалеўскі Іосіф Канстанцінавіч (1900 г.н.) Сябра КПЗБ з 1923 па 1926 г. Жыхар Скідзеля. 16) Маліноўскі Аляксей Панцялеевіч (1904 г.н.). Сябра КПЗБ з 1925 па 1929 г. Жыхар вёскі Галавачы. 17) Мышко Ілля Аронавіч (1898 г.н.). Сябра КПЗБ з 1924 па 1933 г. Пяць гадоў адседзеў у турме. Жыхар Скідзеля. 18) Губарэвіч Канстанцін Іосіфавіч (1905 г.н.). Сябра КПЗБ з 1927 па 1931 г. Пяць гадоў адседзеў у турме. Жыхар вёскі Кашубінцы. 19) Шагун Георгі Іосіфавіч (1903 г.н.). У КПЗБ з 1924 г. Восем гадоў адседзеў у турме. Жыхар Скідзеля. Рабочы. 20) Бубен Фёдар Іосіфавіч (1894 г.н.). Сябра КПЗБ у 1924-1937 гг. Год адседзеў у турме. Жыхар вёскі Пясчанка. 21) Чамерка Андрэй Андрэевіч (1911 г.н.). Сябра КПЗБ з 1929 па 1933 г. Жыхар вёскі Хвайняны. 22) Сыты Міхаіл Антонавіч (1912 г.н.). У КПЗБ з 1933 г. Жыхар вёскі Бандары

Сябрамі КПЗБ яўрэйскай нацыянальнасці ў Скідзелі з'яўляліся: Олех Берка (1908 года нараджэння), Новенскі Іосіф (1911), Лайт Майсей (1917), Шув Хане (1907), Пельш Гірша (1911), Верабейчык Шлёма (1901), Лямперт Якаў (1899), Габовіч Рыва (1912), Пагілюк Зэйдэль (1904), Запалянская Блюма (1911), Кустын Рахіля (1913), Шведская Геся (1909), Каўфман Ізраэль (1912), Эпштейн Ісаак (1913), Міхалевіч Хаім (1913), Цонах Міндэль (1892), Лазоўскі Якаў (1906), Есялевіч Янкель (1910), Шведскі Хаім (1904),

Новінскі Абрам (1913), Пачымок Дора (1912), Банукевіч Нафтолі (1905), Шальшук Мерка (1911), Каўфман Нота (1907). Усяго ж, калі ўлічыць загінуўшых пад час Скідзельскага паўстання, можна свердзіць, што колькасць камуністаў на Скідзельшчыне складала прыкладна каля паўсотні чалавек. Да актывістаў камуністычнага падполля належалі таксама і камсамольцы, якія ўтваралі рэзерв КПЗБ. Але іх колькасць нам невядомая. Гэтыя людзі складалі апору новай савецкай улады.

## Раздзел 5

# У ПОЛЫМІ ВАЙНЫ
# (1941-1945)

### Пачатак вайны: гераічная абарона Скідзеля

Неўзабаве пасля ўсталявання савецкай улады ў Скідзелі былі размешчаны часткі ваенна-паветраных сіл Чырвонай арміі, кіраванне якімі ўскладалася на 39-ю авіябазу. Яе штаб размяшчаўся ў самім мястэчку. На паўночным ўскрайку Скідзеля ў раёне вёскі Некрашы быў дыслацыраваны 127-ы авіяполк знішчальнікаў. Там ужо восенню 1939 г. пачалося будаўніцтва вайсковага аэрадрома. Першымі самалётамі, якія прыляцелі на гэты аэрадром, былі шэсць чатырохматорных бамбардзіроўшчыкаў. Самалёты садзіліся проста на поле, размяшчаліся без ангараў і карысталіся грунтовай паласой. У будынку зачыненага скідзельскага касцёла размясцілі склад для авіяцыйнай фарбы (яе ўсю скарысталі на свае патрэбы мясцовыя жыхары на працягу нямецкай акупацыі). Як успамінае Мікалай Дзелянкоўскі, салдаты выкінулі з фамільнага склепу астанкі Чацвярцінскіх і спалілі іх.

У 1940 г. на аэрадроме пачалося будаўніцтва бетоннай узлётна-пасадачнай паласы (цягнулася ад вёскі Некрашы ў бок ракі Котра, насупраць вёскі Кашубінцы). Аэрадром атрымаў назву аб'ект № 337. Па ўспамінах доўгажыхароў, гэта было самае маштабнае будаўніцтва на іх памяці, на якое мабілізавалі ўвесь Скідзельскі раён. Паводле ўспамінаў Уладзіміра Рыгоравіча Гуліды, для гаспадарак, якія мелі коней, вызначылі спецыяльную норму падвозу камянёў. Звозілі іх з усіх навакольных вёсак і палеткаў [Успаміны У.Р.Гуліды, 1929 г.н. Жыхар в.Глиняны. Асабісты архіў Д.Люціка].

На пабудове аэрадрома быў задзейнічаны 446-ы будаўнічы батальён, сфарміраваны 16 красавіка 1941 года. Паводле архіўных дадзеных, у гэты батальён было мабілізавана 940 чалавек. Усе яны з'яўляліся ўраджэнцамі Вілейскай вобласці БССР, а камандны састаў быў прызваны з запаса з Віцебскай вобласці [Гродненщина накануне и в годы Великой Отечественной войны (1939-1945): (по док. гродн. архивов). Гродно. 2005. С. 297]. Рассялілі салдат па трох навакольных вёсках. Як сведчаць дакументы, батальён быў вельмі дрэнна забяспечаны харчаваннем, вайсковай формай і абуткам, што ўплывала на настрой байцоў [Гродненщина накануне и в годы Великой Отечественной войны (1939-1945): (по док. гродн. архивов). Гродно.

2005. С. 298]. З-за кепскай арганізацыі будаўніцтва ўзлётнай паласы пачалося толькі з 13 мая 1941 г. Як адзначаў камандзір батальёна маёр Зосік, амаль усе прызваныя на службу ў батальён з’яўляліся сялянамі паводле сацыяльнага паходжання. Не было ніводнага прафесійнага муляра ці бетоншчыка. Таму будаўніцтва ішло вельмі марудна. Аэрадром складаўся з двух шырокіх бетонных палосаў, даўжыня якіх дасягала некалькі сот метраў. Будаўніцтва так і не было завершана да пачатку вайны, а ў гады акупацыі мясцовыя жыхары здолелі амаль цалкам разабраць недабудаваную бетонную паласу для сваіх гаспадарчых мэтаў.

У раёне старога скідзельскага касцёла пабудавалі пяць трохпавярховых дамоў для лётнага састава 127-га палка (так званы авіягарадок). Непадалёку ад вёскі Некрашы (за рэчкай Скідлянка) былі размешчаны вялізныя склады для боепрыпасаў. На супрацьлеглым баку ўзлётнай паласы размясцілі 50-тонныя ёмкасці для авіяцыйнага бензіна. Мясцовыя жыхары ўспаміналі, як іх цягнулі некалькі гусенічных трактароў ад чыгуначнай станцыі Скідзель.

На ўзбраенні 127-га палка стаялі ўжо даволі састарэлыя на той час самалёты – знішчальнікі-біпланы І-153 “Баявая чайка” і манапланы І-16. Агульная колькасць самалётаў перавышала 70 баявых машын [Иринархов Р.С. Западный особый... Мн., 2002. С. 72]. Полк лічыўся добра падрыхтаваным да вайны. Камандаваў ім падпалкоўнік А.У.Гардзіенка. Перад самай вайной увесь полк пераляцеў з асноўнага скідзельскага аэрадрома на запасны палявы аэрадром “Лесішчы”, які размяшчаўся паміж вёскамі Сікорыца і Пратасаўшчына.

Па вайсковаму штату на 30 мая 1941 г. у Скідзелі, акрамя 127-га палка знішчальнікаў, размяшчалася для прыкрыцця аэрадрома 46-я зенітная батарэя супрацьпаветранай абароны. Тэхнічным абслугоўваннем авіяпалка займаліся 169-ы батальён аэрадромнага абслугоўвання, 139-я рота сувязі, 153-я аэрадромна-тэхнічная рота [Дислокация частей Западного особого военного округа на 30.05.1941 г. Тыловые части и учреждения ВВС [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: http://www.rkka.ru/handbook/disl/z12.htm]. Акрамя гэтага ў Скідзелі размяшчаліся харчовыя і фуражныя склады для забеспячэння 3-й арміі, якая дыслацыравалася ў раёне Гродна.

Калі раніцай 22 чэрвеня пачалася вайна, дык па ўспамінах жыхара Глінянаў І.С.Вітко ў вёсцы якраз было вяселле. Моладзь гуляла да раніцы 22 чэрвеня. А каля 4-х гадзін пачуліся далёкія выбухі [Успаміны І.С.Вітко, 1924 г.н. Жыхар вёскі Гліняны. Архіў Д.Люціка]. Каля 7 гадзін раніцы немцы пачалі бамбіць чыгуначную станцыю Жытомля. Рэха ад выбухаў добра чулася ў Скідзелі. Але ўсур’ез аб пачатку вайны жыхары яшчэ не здагадваліся – спадзяваліся, што ўсё абыйдзецца, што гэта манёўры, якія любіла праводзіць Чырвоная армія.

Па ўспамінах М.Дзелянкоўскага, пасля абеду, з дзясятак нямецкіх самалётаў зрабілі налёт на скідзельскі аэрадром, дзе яшчэ чатыры дні

таму размяшчаўся 127-ы полк знішчальнікаў. Такім чынам, гэты ўдар не дасягнуў сваёй мэты. На аэрадроме "Лесішчы", дзе знаходзіўся ў гэты час полк, самалёты былі добра схаваныя – у высечаных сярод лесу нішах для кожнага знішчальніка. Самалёты, якія знаходзіліся на лётным полі, былі разгрупаваныя і прыхаваныя галінамі ад дрэў (для прыкладу – на большасці іншых ваенных аэрадромаў на пачатку вайны самалёты былі проста расстаўленыя ў адзін шэраг на лётным полі). Гэтым і тлумачыцца той факт, што 22 чэрвеня 127-ы авіяполк сустрэў вайну падрыхтаваным, не панёс стратаў ад бамбёжак і здолеў, хаця б і на некаторы час, забяспечыць паветранае прыкрыццё Гродна.

У ноч на 22 чэрвеня дзяжурства несла эскадрылья І-153 старшага палітрука А.С.Данілава. Сігнал баявой трывогі раздаўся раніцай, калі яшчэ не ўзыйшло сонца. Савецкія лётчыкі падняліся ў паветра, нават не ведаючы, што ўжо пачалася вайна. Толькі над Гродна, убачыўшы шматлікія самалёты ворага, яны здагадаліся, што на самой справе адбылося. У першым сваім вылеце эскадрылья 127-га палка збіла тры варожыя самалёты. Адсутнасць радыёсувязі не дазволіла паведаміць полк аб пачатку вайны. Толькі вярнуўшыся на аэрадром, старшы палітрук А.С.Данілаў прынёс сваім аднапалчанам жахлівую навіну.

За першы дзень вайны лётчыкі палка здзейснілі 180 баявых вылетаў і рапартавалі аб 20 збітых самалётах праціўніка. Страты самога палка склалі 13 знішчальнікаў [Иринархов Р.С. Западный особый... Мн., 2002, С. 197]. Трое лётчыкаў у якасці апошняга сродка барацьбы з праціўнікам выкарысталі паветраны таран: старшы палітрук А.С.Данілаў, старшы лейтэнант Кузьмін і лейтэнант Пачын (двое апошніх пры гэтым загінулі). Толькі каля 19 гадзін вечара 22 чэрвеня немцам удалося ўстанавіць месцазнаходжанне аэрадрома "Лесішчы". Пасля бомбавага налёту на гэты аэрадром, полк панёс вялікія страты.

А што ж у гэты час адбывалася на скідзельскім аэрадроме? Раніцай 22 чэрвеня 1941 г. над аэрадромам праляцелі тры фашысцкія бамбардзіроўшчыкі. Спачатку не ўсе нават зразумелі, што гэта вораг. У першай палове дня на полі каля дамоў афіцэрскага састава 127-га палка здзейсніў вымушаную пасадку савецкі бамбардзіроўшчык. Самалёт быў падбіты і ледзь дацягнуў. На жаль, да нашага часу так і не ўдалося знайсці ніякай інфармацыі пра гэты самалёт. Хутчэй за ўсё гэта быў адзін з савецкіх самалётаў-разведчыкаў, якія пасылаліся з далёкіх тылавых аэрадромаў дзеля высвятлення становішча на фронце, паколькі сувязь вайсковых частак са штабамі амаль не функцыянавала.

На поле, адразу пасля пасадкі самалёта, падбеглі мясцовыя жыхары. Адзін з членаў экіпажа быў забіты (бортстралок), пілот – цяжка паранены. Штурман, які самастойна выбраўся з самалёта, не быў упэўнены, на якой тэрыторыі ён сеў – сваёй, ці нямецкай. Ён нікога не дапускаў да самалёта, пагражаючы пісталетам. Толькі калі хтосьці збегаў за пашпартам, лётчык паверыў, што знаходзіцца на савецкай

тэрыторыі. Праз некаторы час лётчыкаў забрала машына, якую выклікалі са скідзельскага аэрадрома [Успаміны І.С.Вітко, 1924 г.н. Жыхар вёскі Гліняны. Асабісты архіў Д.Люціка]. На працягу 23-24 чэрвеня пабудовы, паліва і баяпрыпасы скідзельскага аэрадрома пачалі знішчацца савецкімі вайскоўцамі. У выніку падрыву складоў загарэлася і вёска Некрашы, а пасля і Скідзель.

Выключнае значэнне для Скідзеля на пачатку вайны мела яго месцазнаходжанне на стратэгічнай трасе Гродна – Ліда, па якой вымушаны былі адыходзіць савецкія вайсковыя часткі з Гродна. Утрыманне абароны Скідзеля таксама дазваляла Чырвонай арміі кантраляваць масты праз Нёман у Лунне і Мастах.

У выніку здачы Гродна раніцай 23 чэрвеня па трасе Гродна – Ліда пачалі адступленне часткі 3-й арміі генерала В.І.Кузняцова, штаб якой пераехаў у мястэчка Лунна. На руку адступаючым савецкім вайскам было тое, што заняўшы Гродна, немцы не працягвалі адразу наступленне, а вырашылі замацавацца ў горадзе. Таму пры адступленні па лідскай трасе перашкодаў з боку войск ворага не было, не ўлічваючы паветраных атак. Паводле ўспамінаў вайсковага ўрача Д.З. Кагана з 59-га стралковага палка, нямецкія самалёты ўяўлялі найбольшую небяспеку: “Крыкі "Паветра!" ўсё часцей гучаць над расцягнуўшайся калонай. Нямецкія самолеты патрулююць няспынна, не ўпускаючы ні воднай рухомай мэты. Ніхто ім не перашкаджае, беспарадачная страляніна з вінтовак і пісталетаў ім не страшная”.

Большасць з адступаючых войскаў прыходзілася на 85-ю (59-ы стралковы полк) і 56-ю (37-ы і асобныя часткі 184-га стралковых палкоў) стралковыя дывізіі 3-й арміі. Акрамя гэтага ў кірунку Скідзеля адыходзіла і акруговая школа малодшага каманднага састава пагранічных войскаў Заходняй асобай вайсковай акругі пад кіраўніцтвам маёра Б.С.Зіноўева, якая была на зборах у Гродне. Менавіта гэтыя часткі і занялі 23 чэрвеня 1941 г. абарону перад Скідзелем. У якасці воднай перашкоды была выкарыстаная рака Котра. 59-ы стралковы полк палкоўніка З.З.Цярэнцьева заняў абарону на поўнач ад Скідзеля і на яго паўночных ускраінах. На поўнач ад яго заняла абарону школа малодшага камсастава і часткі 184-га стралковага палка падпалкоўніка Чугунова. На працягу паловы дня 23 чэрвеня і ў ноч на 24 чэрвеня савецкія войскі рыхтаваліся да баёў – капалі акопы, усталёўвалі пазіцыі для артылерыі і мінамётаў.

Пазіцыі каля маста праз раку Котра займалі пагранічнікі са станкакулямётнай заставы лейтэнанта Барыса Адырхаева. Паводле ўспамінаў малодшага сяржанта С.І.Мальцава: “Каля палудня дайшлі да ракі Котра. Тут нашай заставе было загадана заняць абарону каля шашэйнага маста на ўсходнім беразе ракі. Выкапаўшы акопы і ўстанавіўшы кулямёты, мы сталі чакаць праціўніка” [В июне 1941г. (Воспоминания участников первых боев на Гродненщине). Гродно, 1997].

Заняўшы Гродна, немцы накіравалі на Скідзель зводны батальён 8-й пяхотнай дывізіі. Яго мэтай было заняць і ўтрымліваць мост праз Котру да падыходу асноўных сіл дывізіі. Батальён гэты складаўся з 8-га батальёна разведкі, 1-й роты 8-га батальёна знішчальнікаў танкаў, 3-й роты 8-га сапёрнага батальёна, 1-й батарэі 184-га дывізіёна штурмавых гармат, 6-й батарэі 44-га артылерыйскага палка, паловы 5-й батарэі 48-га зенітнага палка [Unsere achte [Die Geschichte der 8] oberschlesisch-sudetendeutsche Infanterie/Jäger-Division 1935-1945, Villingen-Schwenningen 1979. S.68]. Такім чынам, гэты батальён уключаў мабільныя пяхотныя і артылерыйскія часці, што дазваляла яму хутка рухацца наперад і вытрымліваць баі з пераўзыходзячымі яго сіламі праціўніка.

Першыя сутычкі адбыліся ўжо каля 19 гадзін вечара 23 чэрвеня – нямецкі авангард з 8-га разведбата на роварах і матацыклах сілай да роты паспрабаваў сходу заняць Скідзель, але быў абстраляны байцамі 2-га батальёна 59-га палка і кулямётамі станкакулямётнай заставы і адступіў, панёсшы адчувальныя страты. Паводле ўспамінаў урача з медсанбата палка Д.З. Кагана, першае сутыкненне не напужала, а хутчэй развесяліла салдат: “Адзін з немцаў зачапіўся штанінай за ровар і не мог яе адарваць, так і поўз на карачках, цягнучы за сабой ровар” [В июне 1941г. (Воспоминания участников первых боев на Гродненщине). Гродно, 1997. С. 96 - 100]. Вось што ўспамінаў камандзір мінамётнай роты 59-га палка лейтэнант Б.С.Кірычэнка: “Свой 59-ы полк мы знайшлі надвячоркам за Котрай, дзе нядаўна ішоў бой, на паўночнай ускраіне дагараўшага Скідзеля. Там нашы ўжо паспелі выкапаць неглыбокія акопы, з якіх вялі агонь па пераправіўшамуся праз Котру праціўніку. Лявей, па беразе Котры, акапаліся курсанты пагранічнай школы, якія днем са станкавых кулямётаў нанеслі, як казалі, вялікі ўрон немцам”.

Супраць савецкіх войскаў на рубяжы Котры выступілі 28-ы (наступаў з поўдня ад шашы Гродна-Ліда) і 38-ы (наступаў з поўначы ад шашы) пяхотныя палкі 8-й нямецкай пяхотнай дывізіі. Раніцай 24 чэрвеня пачаліся моцныя баі за Скідзель. Пра гэтыя баі напісана, на жаль, яшчэ вельмі мала. У баявым данясенні камандуючага 3-й арміяй генерала Кузняцова ад 24 чэрвеня ўзгадваецца толькі адным сказам: “Зводныя часткі займаюць фронт па р. Котра, вядуць бой з праціўнікам на рубяжы Скідзеля”. А між тым, па сваёй упартасці, жорсткасці і гераізму баі гэтыя вартыя таго, каб пра іх больш ведалі і памяталі.

Немцы спрабавалі прарвацца ў мястэчка ўздоўж трасы Гродна – Ліда, але гэта ім не ўдалося. Менавіта па трасе ішоў у атаку зводны батальён 8-й нямецкай дывізіі. Нямецкі ваенны карэспандэнт Хорст Слезіна пісаў: “Перадавыя падраздзяленні прасунуліся прыблізна на 40 км ва ўсходнім накірунку без вялікіх баёў. Наша мэта – Скідзель, маленькі гарадок. Непадалёку перад Скідзелем маленькая рэчка Котра дыяганальна перасякае лінію нашага авангарда. Тут яны сустрэлі ўпартае супраціўленне вялікіх сілаў праціўніка, падтрыманых

артылерыяй” [Horst Slesina “Soldaten gegen Todt und Teufel. Unser Kampf in der Sowietunion. Eine soldatische Deutung”. Dusseldorf, 1942].

Баі 24 чэрвеня насілі вельмі жорсткі характар. Як успамінаў малодшы сяржант С.І.Мальцаў са школы малодшага камсастава пагранвойск: “На досвітку трэцяга дня вайны для нас пачаўся сапраўдны ад. Спачатку наляцелі пікіруючыя бамбардзіроўшчыкі. Услед за гэтым распачала агонь артылерыя. А затым ізноў з’явілася авіяцыя. Усё гэта працягвалася каля гадзіны. Але вось і з’явілася нямецкая пяхота. Калі варожыя салдаты падышлі зусім блізка, па камандзе Адырхаева дружна запрацавалі нашы кулямёты і аўтаматы. Прыцэльны агонь прыціснуў немцаў да зямлі. І тады начальнік заставы падняў нас у контратаку. У адзіным парыве з крыкам «Ура!» пагранічнікі кінуліся за сваім камандзірам. Вось мы ўжо на заходнім беразе Котры. Нарэшце пагранічнікі і немцы зышліся і перамяшаліся. Пачаўся бліжні бой, які пераходзіў у рукапашны. Страты неслі абодва бакі. Фашысты не вытрымалі, дрогнулі і пачалі адыходзіць. Мы гналі іх яшчэ метраў 300, а затым атрымалі загад спыніцца і вяртацца на свае пазіцыі” [В июне 1941г. (Воспоминания участников первых боев на Гродненщине). Гродно, 1997]. У адной з такіх атак загінуў кіраўнік абароны шашэйнага маста праз Котру ўраджэнец Асеціі лейтэнант Барыс Адырхаеў. На працягу дня нямецкія атакі паўтараліся неаднаразова. Месцамі Котра была поўнасцю запруджана трупамі савецкіх і нямецкіх салдат.

Падчас адной з атак немцы ўсё ж уварваліся ў Скідзель. Улічваючы, што гэта можа прывесці да прарыву фронту, савецкія часткі, а ў першую чаргу гэта былі пагранічнікі, перайшлі у контратаку і акружылі немцаў у мястэчку. Праўда, акружаных немцаў не ўдалося знішчыць – яны прарваліся назад, але і пазіцыі засталіся за чырвонаармейцамі. Фронт па рацэ Котра працягваў трымацца. У данясенні штаба Заходняга фронта № 008 ад 25.06.1941 г. адзначалася: “Зводныя часткі 56-й стралковай дывізіі ў 18.00 24 чэрвеня 1941 года вялі бой на рубяжы ракі Котра, маючы перад сабой да двух пяхотных палкоў з танкамі” [Иринархов Р.С. Западный особый... – Мн., 2002, С. 281].

Выдатна праявілі сябе ў баях за Скідзель артылерысты з 444-га корпуснага артылерыйскага палка. У першыя два дні вайны полк здолеў захаваць сваю тэхніку і ўзбраенне (на ўзбраенні палка стаялі 152-мм гаўбіцы з трактарнай цягай). На працягу 24 чэрвеня артылерысты з закрытых пазіцый, выкарыстоўваючы назіральны пункт, які размяшчаўся ў тыле немцаў, наносілі значныя страты варожай пяхоце, застаючыся амаль недасягальнымі для агня праціўніка [В июне 1941г. (Воспоминания участников первых боев на Гродненщине). Гродно, 1997. С.133]. Для таго, каб засекчы пазіцыі савецкай артылерыі, немцы нават выкарыстоўвалі дырыжабль, які цягнулі машынамі. Паводле ўспамінаў У.Р.Гуліды, адна батарэя гармат заняла раніцай пазіцыі каля хутароў вёскі Гліняны, на ўсходзе ад Скідзеля [Успаміны У.Р.Гуліды, 1929 г.н.

Жыхар в.Глиняны. Асабісты архіў Д.Люціка]. Дзве савецкія гарматы увесь дзень вялі агонь па наступаючаму праціўніку з пазіцый калі вёскі Пяшчанка.

У другой палове дня на нямецкія пазіцыі пад Скідзелем прыехаў камандзір 8-й нямецкай дывізіі генерал-лейтэнант Хохнэ. Улічваючы, што моцныя пазіцыі Чырвонай арміі перад Скідзелем і па рацэ Котра не ўдалося прарваць сходу і прызнаючы бесперспектыўнасць атак па фронту, ён прыняў рашэнне абыйсці іх з фланга. Вось словы таго загаду, якія запісаў нямецкі вайсковы карэспандэнт Хорст Слезіна: “Вораг пераўзыходзячымі сіламі і з моцнай артылерыяй акапаўся у раёне Котры, напэўна ўмацоўвае Скідзель моцнымі пунктамі абароны. Ён будзе спрабаваць утрымаць пазіцыі пры любых абставінах, каб дазволіць падцягнуць з усходу больш вялікія сілы. Дывізія (г. зн. 8-я пд – аўт.) да вечара падцягне два пяхотных палкі і большую частку артылерыі і возьме пазіцыі на Котры і ў Скідзелі сістэматычнымі атакамі. Адзін полк будзе атакаваць ворага з фронта, фарсіруючы Котру і адкідваючы ворага назад у Скідзель. На гэтым накірунку Скідзель будзе інтэнсіўна абстраляны артылерыяй. Другі полк будзе атакаваць Скідзель з правага фланга, адсякаючы адступленне атакаваных у лоб частак. Гэтыя падраздзяленні, сціснутыя на маленькай тэрыторыяй, будуць знішчаны ці будуць вымушаны здацца пад агнём нашай артылерыі... Вы атрымаеце максімальную падтрымку артылерыі. Баяпрыпасы падвезены. Абавязкова выкарыстоўвайце ўсё цяжкае ўзбраенне. Страляйце столькі, наколькі дазваляюць ствалы, але беражыце кроў маіх людзей! Атака пачнецца ў 18:00!” [Horst Slesina “Soldaten gegen Todt und Teufel. Unser Kampf in der Sowietunion. Eine soldatische Deutung”. Dusseldorf, 1942]. Дарэчы, немцы ацэньвалі супрацьстаячыя сілы Чырвонай арміі ў цэлую дывізію, ці ў некалькі разоў болей, чым з’яўлялася на самой справе.

З наступленнем ночы 28-ы нямецкі пяхотны полк абыйшоў пазіцыі пагранічнікаў з поўдня і ўварваўся ў Скідзель. Пачаліся цяжкія вулічныя баі. У выніку прарыву лініі фронта савецкія часткі вымушаны былі раніцай 25 чэрвеня адысці і здаць ворагу Скідзель. Адступленне школы малодшага камсастава засталіся прыкрываць кулямётчыкі пад камандай малодшага сяржанта А.А.Рэзаева. Ніхто з іх ужо не дагнаў сваю частку.

Нямецкія планы па акружэнні савецкіх войскаў у Скідзелі не спраўдзіліся. Перад адыходам аддзяленне У.Д.Аляксандрава з сапёрнай роты школы малодшага камсастава знішчыла чыгуначны мост праз Котру. Наколькі вядома, шашэйны мост знішчыць не ўдалося. А раніцай 25 чэрвеня рэшткі 59-га стралковага палка занялі пазіцыі перад мастом праз Нёман каля Лунна. Тут быў смяротна паранены адзін з арганізатараў абароны Скідзеля палкоўнік Цярэнцьеў. Увогуле, страты палка былі вельмі вялікія. Па колькасці байцоў ён не адпавядаў ужо і батальёну. Вельмі вялікія страты ў баях за Скідзель панеслі пагранічнікі.

3 800 чалавек яны страцілі больш за палову. Са Скідзеля пагранічнікі адступалі ўздоўж берага Нёмана на Масты.

На гэтым скончыліся крывавыя баі за Скідзель спякотнага чэрвеня 1941 года. Баі, якія забралі многія сотні людскіх жыццяў. Імёны салдат і афіцэраў, ваяваўшых і загінуўшых на беразе Котры і на вуліцах Скідзеля, у большасці сваёй так і засталіся невядомымі.

**ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ**

**Успаміны Сяргея Аляксандравіча Мазалеўскага**

Няпроста пісаць ад тым, што было 57 гадоў таму назад. Тым больш, падзеі, якія адбыліся ў чэрвені 1941 года, цяпер бачацца і тлумачацца ў многіх выпадках па-іншаму, чым 15-20 гадоў назад. Але ж скажу некалькі слоў аб тым, што запамяталася ў дзяцінстве (мне тады было каля 10 гадоў).

Старэйшыя жыхары нашага горада Скідзеля памятаюць, што побач з мястэчкам будаваўся вялікі аэрадром і на ім ужо базіраваўся 127-ы полк самалётаў-знішчальнікаў – двухкрылых І-15 (“Чаек”). Вельмі часта ў добрае сонечнае надвор’е малады лётны састаў выконваў вучэбна-баявыя задачы ў паветры – стральбу по конусу. Таму кулямётная стральба ў паветры стала звычайнай з’явай, да яе жыхары прывыклі.

У нядзельку 22 чэрвеня я збіраўся з дружбакамі яшчэ на світанку пайсці на рыбалку. І зусім было незразумела, чаму сябры не прыйшлі, таму что на двары быў амаль ужо дзень: ярка свяціла сонца, як надзвычай у небе чуліся кулямётныя чэргі. Мама з суседзямі была на вуліцы. Я з прэтэнзіямі сваімі звярнуўся да мамы: “Чаму не разбудзіла, як дамовіліся ўчора перад сном?”

- “Якая там рыбалка! Вайна пачалася! Паглядзі на неба, наш самалёт з нямецкім змагаецца”.

І сапраўды, у небе недалёка ад Скідзеля паміж вёскамі Пузавічы і Хваты круцілі карусель у паветры самалёты. Адзін наш І-15 і два нямецкіх. Колькі было радасці і шчасця, калі адзін з немцаў задыміў і “пацягнуў” на захад. Але ж тут раптам задыміў і штопарам пайшоў уніз і наш “ястрабок”. Пасля жыхары вёскі Чарлёна гаварылі, што наш лётчык застаўся жывы – выкарыстаў парашут.

Людзі на вуліцы, на падворках былі ўпэўненыя, што ворага разаб’ем

магутным ударам, пераможам малой крывёю і на яго тэрыторыі, як спявалася ў песні “Если завтра война”.

Пасля абеду па шашы на Гродна пайшлі танкі, машыны з салдатамі і гарматамі і ішлі амаль што ўсю ноч. Тады ўсім здавалася, што падыходзяць новыя сілы і вораг будзе разбіты ўшчэнт.

Неспакойна прайшла ноч. 23 чэрвеня у небе ўсё часцей пачалі з’яўляцца нямецкія самалёты, некаторыя ляцелі зусім нізка, але ж большасць была ледзь прыкметная высока ў небе. Пачалі распаўсюджвацца розныя чуткі: што немцы занялі Беласток і ўжо недалёка ад Гродна. Пайшлі па шашы першыя бежанцы з Захаду. 24 чэрвеня паток бежанцаў на шашы павялічыўся, пайшлі адзінокія, а то і цэлымі невялікімі калонамі вайсковыя машыны. Пад вечар мама дала мне торбу з мылам і запалкамі, яшчэ штосьці, і сказала ісці да цёткі Соні (старэйшая матчына сястра, якая жыла ў канцы вёскі Хваты). Перайшоўшы шашу, я направіўся на гасцінец у канец вёскі. Якраз у гэты момант з’явіліся пару машын з Гродзенскага напрамку, а ў небе – нямецкія самалёты. Іх было многа, можа больш дзесяці, большасць з іх пачалі бамбіць аэрадром. Некалькі самалётаў пачалі абстрэльваць машыны на шашы.

Бамбёжка, кулямётныя чэргі самалётаў у небе падналі ў мястэчку паніку. Мне запомніўся такі эпізод: усё поле (дамоў, як цяпер на гэтым месцы, у той час не было) ад перакрыжавання шашы з вуліцай Каменскай (цяпер К.Маркса) ужо было запоўненае жыхарамі, якія беглі з жахам на тварах, жанчыны плакалі, дзеці крычалі. Самалёты зрабілі некалькі заходаў над полем, запоўненым людзмі, стралялі з кулямётаў, што яшчэ больш узняло паніку і нагнала жах. Ужо каля цёткі Соні мяне дагнала мама са слязьмі і страхам на твары. Але ўбачыўшы мяне жывым і здаровым, яна ўзрадавалася. Мы вырашылі застацца ў цёткі Соні і больш нікуды не ісці. Мужчыны – дзядзькі Павел, Міхал і Іван – пачалі рыхтаваць сховішча на крутым, зарослым вольхамі беразе Скідлянкі.

На другі дзень, пасля абеду, па гасцінцы, а то і проста па полі пайшлі на ўсход чырвонаармейцы. Ішло іх вельмі многа да самога вечара, а можа і ноччу. Мужчыны пачалі гаварыць, што ў Бары акопваюцца салдаты,

рыхтуецца абарона і, што, мусіць, будзе бой.

Начавалі мы ў сховішчы. Уначы ўсіх разбудзіла моцная страляніна. Шквал агню, вінтовачныя і кулямётныя чэргі, часам нешта грымела і бліскала ў лесе і на лузе. Пад раніцу ўсё заціхла. Нас малых выпусцілі са сховішча. Скідзель ужо дагараў, а ў раёне аэрадрома чуліся моцныя выбухі, рваліся баяпрыпасы, гарэў паліўны склад. Асабліва ўражвала, як некаторыя цыстэрны з бензінам падымаліся ў паветра на некалькі дзясяткаў метраў і там узрываліся, утвараючы вялізныя клубы агню і дыму.

Сонца ўжо паднялося даволі высока, калі пайшлі чуткі, што ў Скідзелі немцы, там чуліся адзінокія стрэлы.

А праз пару гадзін немцы ўжо ішлі па гасцінцу: хто пешшу, хто на роварах, матацыклах, большасць на машынах. Зайшлі яны і да цёткі Соні папіць вады, але перш як папіць самім запатрабавалі, каб выпілі гаспадары – баяліся атруты.

Нас хлапчукоў цягнула ў лес паглядзець, што там робіцца, але старэйшыя не пускалі. Толькі пад вечар мы ўжо былі ў лесе, дзе пасля адыходу нашых засталося многа баяпрыпасаў, амаль у кожным акопе і вакол іх валяліся патроны, гранаты, ва ўпакоўках міны да мінамёту, трапляліся вінтоўкі і нават кулямёты “Дзегцярова”. На нямецкіх могілках было вельмі многа – цэлая гара – толавых шашак розных памераў і канфігурацый. На месцы, дзе цяпер у лесе паліклініка, было складзіравана многа (можа машын пяць, а то і болей) зенітных снарадаў калібру 75 мм. Так што нам хлапчукам было там чым заняцца.

Цяпер, як успомніш, дык валасы на галаве дыбам падымаюцца, а тады мы проста разбіралі міны, снарады, выкарыстоўвалі дынаміт і порах са снарадаў. Але гэта так дарэмна не прайшло. Пры разборцы снарадаў, мін і іншых баяпрыпасаў многія мае аднагодкі загінулі, або засталіся калекамі на ўсё астатняе жыццё.

Старэйшыя хлапчукі Міша Каяла, Міша Касперчык, Коля Касперчык прапанавалі абыйсці ўсю лінію абароны і ўсё добра агледзець, карацей – правесці разведку. Аказалася, што лінія абароны цягнулася ад ваеннага гарадка па бугру-ускрайку старой поймы Скідзелькі і ўскрайку лесу аж да

вёскі Мастаўляны. Акопы і дзе-нідзе траншэі ўсе былі выкапаныя ў чалавечы рост. Глыбіня абароны была ад 50 да 100 метраў у глыбіню лесу.

Пры абходзе лініі абароны пабывалі мы і на дзьвух магілках, у якіх былі пахаваныя чырвонаармейцы, адна з іх размяшчалася на бугарку, недалёка ад рэчкі, паміж хатамі сямей Хмыско і Каяла. Гаспадары гэтых хат сумесна з другімі суседзямі і пахавалі трох чырвонаармейцаў у гэтай магілцы. Хутчэй за ўсё, гэтыя чырвонаармейцы загінулі ў сутычцы з немцамі, якія знаходзіліся на нашых скідзельскіх могілках, таму што там, побач з царквой, як у яе ўваходзіць з правага боку, быў пахаваны адзін, ці два немцы.

Дарэчы ў самым Скідзелі на вуглу вуліцы Камунальнай і Школьнай (цяпер там дзіцячая бібліятэка) у двары дома таксама былі пахаваныя немцы.

Цяжкае ўражанне пакідаў тады наш родны Скідзель, большая частка якога згарэла. Быў знішчаны агнём увесь цэнтар горада, усе крамы, гандлёвы цэнтр, у тым ліку і царква, яўрэйскія школы і сінагога. Ад Скідзеля ацалелі толькі ўскрайкі.

Ішлі дні і месяцы, а фронт усё адыходзіў далей на ўсход; пачаліся доўгія дні акупацыі – жыцця складанага, цяжкага, вельмі небяспечнага

*Запісаў І.А.Барысаў 12 лютага 1998 г. Захоўваецца ў асабістым архіве І.Барысава.*

### Воспоминания Ивана Акимовича Богушевича

22 июня 1941 года после обеда вдоль рек Скиделька и Спушанка на их восточном берегу красноармейские части заняли оборону. Были вырыты траншеи и окопы. На вооружении солдат были винтовки, ручные пулеметы и гранаты. Артиллерия находилась где-то под дер. Песчанка. Возле моста через реку Скиделька был оборудован наблюдательный пункт, который находился в подвале дома Татьяны Рекеть. Возможно, был и штаб, поскольку туда были протянуты кабеля

На второй день велась интенсивная перестрелка со стороны противника, так и со стороны Красной Армии. От разрывов снарядов

видимо возник пожар в густонаселенном центре города.

На третий день, а это было во вторник 24 июня, возобновились бои между немецкой и советской пехотой. Бои носили локальный характер на западной окраине города. С обоих сторон были убитые и раненые. С боями немецкая пехота вышла на восточные окраины города, где встретила упорное сопротивление частей Красной Армии. В ста метрах от переднего края обороны на городском кладбище с ручным пулеметом засели немцы и вели интенсивный огонь по переднему краю нашей обороны. От прицельного огня противника погибло более десяти красноармейцев. Гибли они не только от пулеметного огня, но и от разрыва снарядов. Помню как сегодня, что одному красноармейцу осколок снаряда попал в голову. За торчащий конец красноармеец схватил руками и хотел вытащить, но смерть наступила почти мгновенно. Так руки и застыли на осколке. Этого красноармейца я похоронил на месте гибели и посадил на месте захоронения елку, но её срубили для маскировки власовцы в июле 1944 года. Перезахоранение солдата после окончания войны никто не делал.

Возле моста через реку Скидельку разорвало снарядом лейтенанта вдребезги. Всех погибших похоронили в братскую могилу, но спустя годы произвели перезахоранение в одну братскую могилу, что в старом парке города.

Перед началом боев за Скидель красноармейцы предлагали местным жителям покинуть дома и убраться подальше от передового рубежа. Многие это сделали, но часть осталась и пряталась в подвалах домов и ямах под картофель. Был и такой случай. Жители домов, что находились возле оборонительного рубежа, предлагали красноармейцам отступить, поскольку их мало и им не справиться с вооруженными до зубов немцами. На что один красноармеец произнес: «Россия велика, а нам отступать некуда».

Так героически сражалась горстка бойцов в гор. Скидель в июньские дни сорок первого года, многие из которых сложили головы на нашей земле.

*Запісаў І.А.Барысаў. Захоўваецца ў асабістым архіве І.Барысава.*

## У страшныя гады акупацыі

Перыяд фашысцкай акупацыі стаў адным з самых жахлівых у шматвекавой гісторыі Скідзельшчыны. Для большасці скідзельскіх яўрэяў трагедыя пачалася ў першы ж дзень вайны. Толькі адзінкам удалося эвакуавацца, паколькі падзеі разгортваліся так імкліва і нечакана, што многія жыхары Скідзеля нават і апамятацца не паспелі, як іх родныя мясціны былі захоплены нямецкай арміяй. Цэнтар горада, дзе і пражывалі пераважна яўрэі, ператварыўся ад выбухаў бомбаў і пажараў у суцэльныя руіны і папялішчы. Большасць яўрэйскіх сем'яў аказалася без даху над галавой. Іх прытулілі ў сябе местачковыя беларусы. Аднак гэта быў толькі пачатак жахлівых выпрабаванняў.

Праз некалькі дзён пасля ўстанаўлення акупацыйнай улады фашысты сагналі яўрэйскае насельніцтва на местачковую плошчу да помніка Леніну. Скульптуру звалілі з дапамогай танка, а затым пад пагрозай расстрэлу загадалі скідзельцам разбіваць яе на дробныя кавалкі. Кожны павінен быў узяць кавалачак помніка і ў шэрагах агульнай калоны ісці да Скідлянкі. Калі калона рушыла, прагучаў загад гучна плакаць. Калі людзі наблізіліся да рэчкі, ім было загадана кідаць у ваду кавалкі разбітага помніка. Пасля гэтых здзекаў усім стала зразумела, што чакае местачковых яўрэяў.

Праз некалькі месяцаў яўрэйскае насельніцтва Скідзеля сагналі ў гета, якое размясцілі ў двухпавярховых будынках былога ваеннага гарадка 127-га авіяпалка. У шасці драўляных дамах людзі не маглі ўсе змясціцца, а таму многія засталіся пад адкрытым небам. Ратаваліся ад голаду і восеньскіх дажджоў у наспех выкапаных зямлянках. Тэрыторыя вакол гета была абнесена калючым дротам. Выхад за яе межы караўся расстрэлам без папярэджання. На працу выводзілі калонамі. Вязні гета страшэнна галадалі, перабіваліся тым, што паспявалі перадаць ім землякі–беларусы. За кароткі час людзі былі даведзеныя да поўнага знясілення. Зімой 1941-1942 гг. тыя, хто начаваў у зямлянках, замярзалі ад холаду, а ў будынках людзі задыхаліся ад недахопу паветра ў бітком набітых памяшканнях. Адсутнічала ўсялякая медычная дапамога. Тых, хто паміраў, закопвалі на тэрыторыі гета. Колькі людзей тут было пахавана, цяпер ужо напэўна ніколі не будзе вядома.

У 1942 г. вязняў скідзельскага гета сагналі на местачковую плошчу, дзе ўжо стаялі падрыхтаваныя сялянскія падводы. На іх размясцілі рэчы, што засталіся ў яўрэяў, пасадзілі тых, хто ўжо не ў стане быў самастойна перамяшчацца – пераважна старых і малых дзяцей. Кожную групку людзей апаясалі вяроўкай, якую вязні трымалі ў апушчаных руках. Выхад за гэтую вяроўку лічыўся спробай уцёкаў і караўся расстрэлам без папярэджання. Тысячы знясіленых людзей, падобных на здані, рушылі ў канцлагер Калбасіна. Да варотаў сваіх падворкаў падыходзілі скідзельцы-беларусы. Яўрэі пазнавалі суседзяў і знаёмых, махалі рукамі на развітанне. Усе разумелі, што яны бачацца ў апошні раз. Так жахлівая працэсія выйшла за межы Скідзеля. Людзі,

якія многія стагоддзі жылі ў гэтым мястэчку, цяжкай працай якіх была збудаваная большая яго частка, пакідалі радзіму, каб ужо ніколі не вярнуцца.

Тым мясцовым жыхарам, якія спрабавалі дапамаць яўрэям, пагражала жорсткая расправа. Яны рызыкавалі не толькі сваім жыццём, але і жыццём сваіх родных. Хутаранін з вёскі Гліняны Фёдар Гайко схаваў і накарміў яўрэя, які ўцёк з гета. Але варта было таму пакінуць хутар, як па дарозе да лесу яго схапілі, жорстка збілі, а потым расстралялі. Уцекач не выдаў чалавека, які дапамог яму, і гэта выратавала жыццё Фёдару Гайко і яго родным. Яўрэйскія вязні не жадалі пакорліва чакаць смерці. У канцлагеры Калбасіно была створана падпольная група супраціву. Яе ўдзельнікі рыхтавалі вязняў да ўцёкаў. Некаторым удалося ўцячы і знайсці партызанаў. Яны, як скідзелец Арон Олех, адважна змагаліся з фашыстамі да канца вайны. Група яўрэйскіх уцекачоў з 26 чалавек здолела пратрымацца ў ваколіцах Скідзеля да зімы 1944 г. Але 24 студзеня іх высачылі ў закінутай леснічоўцы каля фальварка Канстанцінава мясцовыя паліцыянты пад кіраўніцтвам Яна Ашуркі і Вацлава Якімчука. Яўрэі спрабавалі супраціўляцца і адстрэліваліся з вакон, але былі перабітыя ў няроўным баі. За гэтую аперацыю паліцыянты Ашурка і Якімчук былі па хадайніцтву жандарскага каменданта Мюллера ўзнагароджаны медалямі.

У канцы 1942 г. і на пачатку 1943 г. фашысты пачалі падрыхтоўку да ліквідацыі калбасінскага гета. Тысячы людзей накіроўвалі ў страшныя лагеры смерці Асвенцім і Трэблінка. Камендант лагера Калбасіно Карл Рынтцнер абвесціў вязням, што зімаваць у гэтым лагеры немагчыма з прычыны холаду і хваробаў, а таму патрэбна пераехаць на новае месца, дзе быццам бы будуць створаны лепшыя ўмовы для жыцця і працы. Змучаныя людзі наіўна верылі ў гэта, пакорліва пагаджаліся пераязджаць. Вязняў па начах гналі пад узмоцненым канвоем з аўчаркамі да чыгуначнай станцыі Ласосна. Старых і хворых расстрэльвалі. На станцыі людзей запіхвалі ў біткам набітыя вагоны, якія везлі іх насустрач смерці ў крэматорыі. Так завершыўся ў 1943 г. пакутніцкі шлях скідзельскіх яўрэяў – 2330 з іх сталі ахвярамі Халакосту.

Прыкладам нязломнай мужнасці скідзельцаў стаў подзвіг камсамольцаў-падпольшчыкаў [Гл. падраб.: Верхась У.П., Гарелик А.Л. Это было в Скиделе / 3-е изд. Минск, 1973]. Скідзельскія юнакі Уладзімір Кізевіч, Мікалай Дзелянкоўскі, Анатоль Зелянкоўскі, Аляксей Ролік, Іван Шчасны, Іван Сініца, Іван Сяўрук, Фёдар Макарчук стварылі падпольную групу, якая наладзіла сувязь з іншымі падпольнымі групамі і партызанамі. Бацьку аднаго з камсамольцаў-падпольшчыкаў настаўніка Чарлёнскай школы Андрэя Фаміча Шчаснага фашысты расстралялі ўжо на пачатку акупацыі. Хлопцы збіралі і хавалі ў лесе зброю, расклейвалі лістоўкі. Але іх выдаў здраднік – муж сястры Мікалая Дзелянкоўскага, тэхнік-лейтэнант Фёдар Гарлачоў. Хлопцы даверыліся

яму, як савецкаму афіцэру, а Гарлачоў стаў тайным агентам гестапа. Арыштаваным юнакам прыйшлося прайсці праз страшныя катаванні. Але ніводны не зламаўся, не пачаў выдаваць іншых.

13 верасня 1942 г. на цэнтральную плошчу Скідзеля фашысты сагналі жыхароў горада і навакольных вёсак. На дахах бліжэйшых дамоў былі ўстаноўлены кулямёты. Натоўп убачыў, як на плошчу пад'ехала закрытая машына, за ёй – шэсць грузавікоў з салдатамі. Гітлераўцы пачалі выштурхоўваць з машыны збітых скідзельскіх падпольшчыкаў, а потым павялі да месца пакарання. Як узгадваюць многія сведкі, у жудаснай цішыні, якая свінцом навісла над людзмі, на ўсю плошчу прагучаў юнацкі голас: "Да здравствует Красная Армия! Да здравствует Сталин! Смерть фашыстам!". Гэта Ваня Сяўрук сабраў апошнія сілы і кінуў выклік ворагу. Яго падтрымалі астатнія героі. Фашысты нават не чакалі, што ў змучаных закатаваных юнакоў знойдуцца для гэтага сілы. Яны пачалі выбіваць дошкі з-пад ног камсамольцаў. У Фёдара Макарчука і Мікалая Дзелянкоўскага абарваліся вяроўкі. Немцы схапілі іх і адвезлі ў Бор, дзе расстралялі. Сведкі гэтага эпізоду распавядалі, што пад час расстрэлу хлопцы хапалі пясок і з нянавісцю кідалі ў твар ворагу. Пра подзвіг скідзельскіх падпольшчыкаў, дзякуючы партызанам, стала вядома тады ва ўсім Савецкім Саюзе.

**ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ**

**Успаміны Іллі Аляксандравіча Барысава**

З Мікалаем Дзелянкоўскім, Іванам Сеўруком, Анатолем Зелянкоўскім і Аляксеем Ролікам да пачатку Айчыннай вайны я вучыўся ў адной школе гор.Скідзеля. Аляксей Ролік быў маім аднагодкам, і адпаведна мы былі вучні аднаго класа. Аляксей быў старэйшы за мяне больш чым на 6 месяцаў, і таму яму пашанцавала паступіць у ФЗУ, а мне адмовілі па недахопу ўзроста. Гэта і разлучыла нас. А калі б я разам з Аляксеем стаў бы навучэнцам ФЗУ, дык магчыма і мой лёс склаўся б як ягоны.

Усе гэтыя гады пасля гібелі васьмі юнакоў у мяне ў памяцці захоўваўся адзін эпізод, які адбыўся ў жніўні 1942 г. Фашысты і іх паслугачы з першых дзён акупацыі былі вельмі напалоханыя ростам партызанскага руху. Таму, каб засцерагчыся ад нападу партызанаў, яны арганізавалі з мясцовых жыхароў варту. У начны час яна выстаўлялася з двух чалавек у канцы кожнай вуліцы, якая вяла ў мястэчка. У варту прызначалі солтыс і яго намеснік.

У канцы жніўня 1942 г. у вартавых аказаўся і я разам з Мікалаем Дзелянкоўскім, які быў старэйшы за мяне на чатыры гады. Яму было 18, а мне пайшоў 15-ы год. Мы пайшлі вартаваць замест бацькоў. Апоўначы Мікалай сказаў мне: "Ты пабудзь пакуль адзін, а я збегаю ў маёнтак". Калі ён вярнуўся, дык сказаў, што ў маёнтку партызаны і трэба паведаміць немцаў. Непадалёку знаходзіўся дот і траншэя для салдат гарнізона. Не паспеў ён туды дайсці, як з боку маёнтка пачуліся стрэлы, а з дота ў адказ ударылі з кулямёта і аўтаматаў. Неўзабаве стрэлы сціхлі. Пазней я здагадаўся, што Мікалай і невядомыя мне яго паплечнікі інсцэніравалі напад партызанаў, каб папалохаць немцаў і паліцаяў. Такі гэта быў адважны хлопец.

*7 кастрычніка 2007 г. Захоўваецца ў асабістым архіве І.А.Барысава.*

Ужо восенню 1941 г. на Скідзельшчыне афарміліся першыя антыфашысцкія групы. Актыўны ўдзел у іх стварэнні прымалі былы сябар КПЗБ і работнік Скідзельскага райвыканкама А.Ф.Манкевіч, былы супрацоўнік міліцыі А.Я.Мажэйка, былы кэпэзэбовец В.А.Сыты і яго жонка Л.Зорка, настаўнік С.І.Таранка і інш. 5 мая 1942 г. прайшла міжраённая антыфашысцкая канферэнцыя, на якой быў створоны Акружны антыфашысцкі камітэт Баранавіцкай вобласці на чале з Г.М.Картухіным. Галоўнымі задачамі ў дзейнасці камітэта з'яўляліся агітацыйная работа сярод насельніцтва і дапамога савецкім салдатам-акружэнцам, якія імкнуліся знайсці партызанаў. Праводзіліся таксама дыверсіі на чыгунцы, лініях тэлефонна-тэлеграфнай сувязі, прадпрыемствах і складах. Самай значнай акцыяй стаў разгром партызанамі пад камандаваннем лейтэнанта Іванова ў ліпені 1942 г. гарнізона ў мястэчку Азёры, у якім бралі ўдзел і скідзельскія антыфашысты.

У лістападзе 1942 г. быў створаны Скідзельскі раённы антыфашысцкі камітэт. У яго склад увайшлі М.М.Бедыс, І.С.Быль, А.Ф.Манкевіч, В.А.Сыты, С.І. Таранка, В.І.Таранка, А.Р.Ушкевіч, М.М.Чаравач [Памяць. Гродзенскі раён (гістарычна-дакументальная хроніка Гродзенскага раёна). Мінск, 1993. С. 156]. На той час на тэрыторыі раёна дзейнічалі ўжо 9 антыфашысцкіх груп. На пачатку 1943 г. у Скідзельскі раён з Міншчыны перaправілі групу А.В.Станкевіча, які да вайны працаваў у Скідзелі. На базе антыфашысцкіх груп 17 сакавіка 1943 г. быў створаны партызанскі атрад імя Ленінскага камсамола, камандзірам якога стаў А.В.Станкевіч. У верасні 1943 г. гэты атрад пераўтварылі ў аднайменную брыгаду, якая складался з трох атрадаў. У лістападзе 1943 г. была створана

партызанская брыгада імя Аляксандра Неўскага. Тады ж у Ліпічанскай пушчы зацвердзілі Скідзельскі падпольны райкам КП(б)Б у складзе І.М.Аўсейчыка (сакратар), М.П.Кожурава і А.Р.Паўлюткіна. Райкам базаваўся ў брыгадзе імя Аляксандра Неўскага і выдаваў газету “Красное знамя”. З верасня 1943 г. пачаў дзейнічаць Скідзельскі райком ЛКСМБ, які ўзначаліла Клаўдзія Чычкова. Пасля заканчэння спецшколы яна была закінутая на тэрыторыю Скідзельскага раёна, для арганізацыі антыфашысцкіх груп і камсамольскіх ячэек. Загінула К.Чычкова 11 мая 1944 г. у баі з карнікамі ў Сухініцкім лесе. Партызанкай стала скідзельчанка Марыя Барысава. Яна геройскі загінула восенню 1942 г. у Хойнікскім раёне.

КРОК У БЕССМЯРОТНАСЦЬ

Барысава Марыя Аляксандраўна нарадзілася 7 красавіка 1923 г. у вёсцы Гліняны Гродзенскага павета на другі год пасля вяртання бацькоў з вёскі Ключава Чамбарскага уезда Пензенскай губерні, куды яны эвакуаваліся ў гады першай сусветнай вайны. Бацькі яе мелі ў наяўнасці ўсяго 0,5 га ворнай зямлі, най якой пражыць на вёсцы нельга было, а пагэтаму падаліся ў мястэчка Скідзель, якое было побач, дзе ўладкаваліся працаваць на скураную фабрыку. Працавалі і па найму.

Жыццё Марыі ні чым не адрознівалася ад жыцця іншых дзяцей беднаты. Прыходзілася адначасна пасвіць кароў і вучыцца ў школе, таму атрымала адукацыю ўсяго тры класы польскай школы. Бацькі ўладкавалі вучыцца на швачку.

– Гэтая спецыяльнасць мне была не да спадобы – успаміналa пазней Марыя – але набываць гэтую спецыяльнасць і працаваць па ёй была вымушана, каб хоць некалькі аблегчыць жабрацкае жыццё сваёй сям’і.

З маленства Марыя далучылася да царкоўнага хора, створанага мясцовым дзячком Сінельнікавым. З юнацкіх гадоў таксама удзельнічала ў рабоце падпольнай камсамольскай арганізацыі, кіраўніком якой быў старэйшы брат Мікалай. Выконвала нязначныя даручэнні, назірала за вуліцай, каб знянацку не наляцелі паліцэйскія, калі камсамольцы-падпольшчыкі збіраліся ў нашым доме, які стаяў трохі наводдаль ад вуліцы.

Была Марыя актыўным чытачом бібліятэкі скідзельскага гуртка ТБШ.

Ды і ў бацькоў мелася свая бібліятэка, якая налічвала да сотні кніжак на беларускай, рускай і польскай мовах. Гэтымі кнігамі карысталіся многія местачкоўцы і жыхары навакольных вёсак. Бацькоўская бібліятэка перыядычна папаўнялася кнігамі, знойдзенымі на гарышчах, калі бацька рамантаваў дамы, і галоўным чынам у местачковых яўрэяў.

Калі ў верасні 1939 г. Заходняя Беларусь аб’ядналася з Савецкай, дык Марыя стала актыўна ўдзельнічаць у местачковым хоры, створаным Віжэўскім, выконвала сольныя песні. Працавала яна на пасадзе справавода ў Скідзельскім райвыканкаме, але гэтая праца таксама была Марыі не па душы. Яе прываблівала поле, хацелася стаць такой як Паша Ангеліна, знакамітая трактарыстка таго часу. І калі ў райкаме прапанавалі паехаць у Смаргонь вучыцца на трактарыстку, дык Марыя з радасцю пагадзілася, хаця сяброўкі па працы і адгаворвалі ехаць. За два тыдні да пачатку вайны яна стала курсанткай школы механізатараў. У першыя дні вайны скідзельцы, якія таксама былі ў той школе, вярнуліся да бацькоў, але Марыя не пажадала заставацца на акупаванай тэрыторыі. Яна падалася на Ўсход і аказалася ў Хілкаўскай МТС Тарбееўскага раёна Мардовіі, дзе ў кароткі час набыла навыкі працы на трактары і пачала самастойна працаваць у полі. Вайна патрабавала замены мужчын жанчынамі на гэтай працы.

– Марыя была вельмі працавітая, – успамінаў Пётр Юдзін, участковы аграном, – дысцыплінаваная, вясёлая, яе прыемны голас песні гучаў у наваколлі. Яна ў кароткі час змагла згуртаваць вакол сябе хор з мясцовай моладзі.

У красавіку 1942 г. Марыю запрасілі ў райкам партыі, дзе прапанавалі пайсці вучыцца на курсы Цэнтральнай спецшколы № 2 па падрыхтоўцы партызанскіх кадраў у Маскве. Пасля двухтыднёвай вучобы была накіраваная ў варожы тыл, дзе выконвала спецзаданне, рыхтуючы партызан. Так яна аказалася ў Хойніцкім раёне ва Ўсходняй Беларусі.

– У вёсцы Кажушкі, – успаміналa жыхарка гэтай вёскі Алёна Манюшка, у адзін з восеньскіх дзён 1942 г. зайшла да нас незнаёмая дзяўчына і прыпынілася на кароткі тэрмін, наведваючы некаторых

вяскоўцаў. Яны былі камсамольцамі. Пасля наведвання Марыі ў нас узнікла маладзёжная антыфашысцкая група. Надвячоркам Марыя пачала збірацца ў дарогу. Яе адгаворвалі, прапануючы застацца на начлег. Але яна адказала, што павінна тэрмінова наведаць яшчэ адну вёску. Так яна аказалася ў вёсцы Буда, дзе яе выдалі тыя, хто быў пакрыўджаны савецкай уладай. Некалькі сутак Марыю катавалі ў фашысцкім гарнізоне Тульгавічы, але яна ўпарта маўчала. Фашыстам не ўдалося зламаць моц яе духа. Вытрымаўшы жудасныя катаванні, Марыя зрабіла сапраўдны крок у бессмяротнасць.

Імя адважнай скідзельчанкі Марыі Барысавай увекавечана ў вёсцы Глінішчы, дзе на месцы яе пахавання ўстаноўлены гранітны чорны абеліск са словамі: “Отважной комсомолке-партизанке Борисовой Марии Александровне отдавшей жизнь за свободу и независимость нашей Родины. От благодарных жителей Хойникского района”.

Імя Марыі Барысавай занесеная таксама на сцяну памяці ля Брацкай магілы савецкіх воінаў, партызанаў і падпольшчыкаў у Скідзелі, яно ўвекавечана ў назве адной з вуліц нашага горада.

Марыя Барысава належыць да слаўнай кагорты скідзельскіх камсамольцаў-падпольшчыкаў, разам з імі яна ўступіла ў камсамол. І як яны здзейсніла подзвіг восенню 1942 г. Толькі яны на радзіме, а яна на Хойніцкай зямлі, не памяняўшы смерць на здрадніцтва.

*30.05.2008. І.А. Барысаў*

Фашысты, адчуваючы нарастанне супраціву, імкнуліся падавіць яго масавым бязлітасным тэрорам. На пачатку 1943 г. пачалі арыштоўваць і адпраўляць у канцэнтрацыйныя лагеры тых, каго мясцовая паліцыя лічыла нядобранадзейнымі і здольнымі да ўдзелу ў супраціўленні. У большасці гэта былі актывісты вызваленчага і камуністычнага руху.

**ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ**

**Успаміны Міхаіла Міхайлавіча Карнілы**

Бацька мой родам са Шчучынскага раёна, а маці з-пад Брэста, пажаніліся ў бежанстве, там я і нарадзіўся ў лютым 1917 г. у Гуляйпольскім

раёне Мікалаеўскай губерні. Пасля таго, як бацькі вярнуліся з бежанства і ўладкаваліся ў Скідзелі рабочымі, тут, лічы і прайшло ўсё маё жыццё. Працаваць стаў, калі яшчэ не было і 16 гадоў на скураной фабрыцы. Вучыцца, бадай, зусім не прыйшлося: два класы дзённай і тры вячэрняй школы. Вось і ўся мая адукацыя. Удзельнічаў у вызваленчым руху, быў членам падпольнай камсамольскай ячэйкі. Пасля аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР працаваў намеснікам старшыні арцелі. У 1940 г. мяне прызвалі на тры месяцы ў армію. 17 мая 1941 г. зноў прызвалі на 45 дзён. Заставалася дзевяць дзён, як пачалася вайна. Наш стралковы 284-ы полк прыняў бой у першыя хвіліны нападзення фашысцкай Германіі. Трапілі ў акружэнне, але змагаліся да апошняга на працягу двух тыдняў. Спрабавалі вырвацца, але не змаглі. У адным баі я быў цяжка кантужаны. У такім стане падабрала мяне польская сям'я Казіміра Косціка з вёскі Рафалаўка, што ў 17 кіламетрах ад Беластока. Косцікі мяне прытулілі і вылечылі, прапаноўвалі жыць у іх яшчэ. Але было ўжо небяспечна, пра мяне стала вядома мясцоваму солтысу. Казімір правёў мяне да Беластоку, а адтуль я ўжо рушыў да Гродна. Але каля Гродна мяне затрымалі немцы і адправілі ў лагер для ваеннапалонных. Выдаў сябе за рабочага, сказаў, што вяртаюся дахаты. Праз некаторы час мяне адпусцілі. Жыў дома ў Скідзелі і працаваў рабочым.

Але 25 студзеня 1943 г. мяне арыштавалі і кінулі ў Гродзенскую турму, а 25 сакавіка я быў ужо ў канцлагеры Штутгоф на тэрыторыі Польшчы. Разам са мной былі арыштаваныя і патрапілі ў Штутгоф Аляксандр Мазалеўскі, Іван Мазалеўскі, Іван Дзелянкоўскі, Канстанцін Мішук, Іван Кот, Пётр і Аляксандр Бурцы, Іван Пік, Андрэй Сяўрук. У канцы чэрвеня 1943 г. у наш лагер прывезлі скідзельчаніна Мікалая Юрэвіча, але ў верасні таго ж года яго перавезлі з многімі іншымі ў Шчэцын на ваенны завод, дзе ён, напэўна, загінуў пад час бамбёжкі. Умовы ў лагеры былі невыносныя. Выжыць маглі толькі моцныя духам, ды і то далёка не ўсе. Катаванні былі штодзённыя. Быў адзін час камендант, які любіў абыходзіць строй вязняў і ўглядвацца ў твары. Калі яму хто не падабаўся, ён ударам збіваў чалавека з ног, а потым станавіўся нагамі яму

на грудзі, пакуль няшчасны не сканае. Так мог за раз пазбавіць жыцця дзясяткі людзей. Харчаваннем быў кавалачак хлеба 150-200 грамаў з апілкамі і місачка баланды з адыходаў гародніны. Спаць дазвалялі толькі шэсць гадзінаў, а амаль увесь астатні час прыходзілася цяжка працаваць. Памёршых спальвалі ў крэматорыі. Ад пакутаў многія канчалі з жыццём самагубствам. Так зрабіў скідзельчанін Андрэй Восіпавіч Сяўрук.

Сярод заключоных узнікла падпольная арганізацыя, але яе выдаў здраднік. Бывалі спробы ўцёкаў, але ўцекачоў заўсёды лавілі і жорстка каралі. Некаторых заключоных немцы прызначалі старэйшымі, і тыя жорстка здзекваліся над іншымі. Быў такі Мішка Дзмітрыеў, які вызначаўся асаблівай лютасцю. За гэта яго аднойчы ноччу і прыдушылі. Сярод вязняў лагера былі людзі многіх нацыянальнасцяў: рускія, беларусы, украінцы, яўрэі, палякі і інш. У першую чаргу знішчалі яўрэяў. Аднойчы ў лагер прывезлі 2500 нямецкіх маракоў за тое, што яны ўзнялі бунт. Іх так марылі голадам, што праз два месяцы каля тысячы памерла. Пазней гэтых маракоў перавезлі на ваенны завод у Шчэцын. Аднаму з немцаў па прозвішчу Лайзніг я многім абавязаны, ён выратаваў мне жыццё, калі мяне пачаў збіваць старшы па бараку.

Калі да лагера набліжалася Чырвоная Армія калону вязняў пагналі пад канвоем пешшу ў напрамку Балтыйскага мора. Хто падаў у дарозе, таго дабівалі. З 2400 чалавек толькі каля 300 засталіся ў жывых. Нас вызвалілі савецкія танкісты, а ўсе астатнія загінулі. Пасля вызвалення я дабраўся да Гродна, дзе мяне затрымалі і накіравалі на пункт фільтрацыі. Адтуль мяне выручыла маці па выпадку смерці бацькі. Пасля вяртання дадому ўсё жыццё прапрацаваў пячнікам і муляром. З жыхароў Скідзельшчыны таксама выжылі ў Штутгофе П.Бурац, І.Кот, І.Пік, І.Дашкевіч.

*Запісаў І.А.Барысаў 22 сакавіка 1998 г. Захоўваецца ў асабістым архіве І.А.Барысава.*

Для беларускай моладзі страшнай пагрозай стала перспектыва вывазу на працу ў Германію. Уратавацца ад гэтага было вельмі цяжка. З тэрыторыі Скідзельскага раёна было вывезена ў рабства каля трох

тысяч чалавек, большая частка з якіх ніколі не вярнулася дадому. Многія адважваліся на ўцёкі, хаця гэта пагражала канцлагерам. Прыкладам можа паслужыць гісторыя маладога хлопца Мікалая Фурмана з вёскі Карашава, якога ў 1943 г. арыштавалі і адправілі ў працоўны лагер пад Беласток. Адтуль Мікалай разам з сябрам Іванам Бягуном з суседняй Белякоўшчыны здолелі ўцячы. Яны дабраліся да родных вёсак, дзе хаваліся да прыходу Чырвонай Арміі. А пасля вызвалення Скідзельшчыны Мікалай Фурман патрапіў на фронт, быў узнагароджаны медалём "За адвагу" і мабілізаваны пасля цяжкага ранення, атрыманага ў кастрычніку 1944 г. [Барысаў І.А. Вязень і франтавік // Сельская новь. № 20. 15 сакавіка 1995 г.]

**ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ**

**Успаміны Веры Міхайлаўны Босай**

Вясной сорак трэцяга года нечакана ў нашу вёску Бандары наляцелі немцы з паліцэйскімі і сталі хадзіць па хатах, выводзіць маладых хлапцоў і дзяўчат. Калі сабралі патрэбную колькасць, немцы з паліцаямі ўваліліся ў воз, а моладзі загадалі ісці ў бок мястэчка Азёры, папярэдзіўшы, што, калі хто паспрабуе ўцякаць, дык будзе расстраляны. З Азёраў завезлі ў Гродна і размясцілі ў турме. Першы раз у жыцці я ўбачыла турму з яе камерамі, яксьці жудасна стала і страшна, што нічога кепскага не зрабіла, а аказалася ў турме. Праз некалькі дзён нас пад аховай з сабакамі завялі на вакзал, загналі ў вагоны, забілі дзверы і павязлі ў Германію. Там, на зборным пункце выставілі ўсіх на продаж. Нас купіў адзін багаты ўладальнік маёнтка. У яго працавалі 14 дзяўчат і 12 савецкіх ваеннапалонных, якіх днём пад канвоем прыганялі на працу, а наначь – зноў за калючы дрот. Зімой, калі не было работы ў маёнтку, нас адпраўлялі на завод па вырабу якіхсьці дэталяў. Рабочы дзень працягваўся ад цямна да цямна. Жылі ў бараках, кармілі баландой з гнілых буракоў і бручкі, ахова здзекавалася. Некаторыя спрабавалі ўцякаць, але іх лавілі і пасля жорсткіх пабояў зноў прымушалі працаваць. Вызвалілі нас на пачатку сорак пятага, але дадому не адпусцілі, залічыўшы ў рабочы батальён. Працавалі на дэмантажы завадскога абсталявання, яго пагрузцы і адпраўцы ў СССР. Калі гэтыя работы скончыліся, нас завезлі на Ўкраіну на лесараспрацоўку. Праца была вельмі цяжкая, а кармілі вельмі дрэнна, людзі аслаблі. Невядома як закончыўся б мой лёс, калі б не ўцякла дахаты ў

1946 г. Праўда, праз некаторы час мяне дапытвалі супрацоўнікі КДБ, як я аказалася ў Германіі, як змагла ўцячы з лесанарыхтовак. Але болей не чапалі.

*Запісаў Ілля Барысаў. Друкаваліся ў газеце "Сельская Новь". № 96 ад 20.12.1995.*

Жудаснай трагедыяй Скідзельшчыны стала знішчэнне шматлюднай вёскі Пузавічы. Прычынай для карнай акцыі паслужыла дыверсія невядомых партызанаў на ўчастку чыгункі паміж вёскамі Пузавічы і Хвайняны. Лёс Пузавічаў, як лічылі жыхары Скідзеля і ваколічных вёсак, вырашыў начальнік паліцыі Ян Ашурка. Перад вайной яго зводнага брата Юзэфа Варэніка, які служыў лясніком у князя Чацвярцінскага, забіў жыхар Пузавічаў. Пасля гэтага здарэння хлопцы з Пузавічаў увесь час ламалі крыж, устаноўлены на месцы трагедыі. Такім чынам, Ян Ашурка прагнуў паквітацца з жыхарамі Пузавіч і скарыстаў гэтую нагоду, пераканаўшы немцаў, што менавіта яны вінаватыя ў дыверсіі [ДАГВ. Ф. 239. В. 9. С. 22. [Успаміны сведкаў пра знішчэнне в.Пузавічы, сабраныя І.А.Барысавым].

14 ліпеня 1943 г. карнікі ўварваліся ў Пузавічы ў 5 гадзін раніцы і распачалі дзікую расправу над сялянамі. Былі расстраляныя больш за 500 чалавек, з іх 230 дзяцей, спаленыя 80 двароў, будынак школы і вясковага клубу. Разам з Пузавічамі былі знішчаныя хутары Канстанцінава і Эйсманты. Прыгожая зялёная вёска над берагам жывапіснай Доўжыцы перастала існаваць. Расстраляныя жыхары былі пахаваныя непадалёку. Выратаваліся з вяскоўцаў толькі Н.А.Лапіцкі і С.Д.Каладзецкі. Амаль праз год, ужо рыхтуючыся да ўцёкаў, немцы зноў з'явіліся ў спаленых Пузавічах і загадалі савецкім ваеннапалонным раскапаць магілы, скласці трупы загінуўшых вяскоўцаў штабялямі, заліць газай і падпаліць. Такім чынам, ужо тады фашысты баяліся расплаты, якая няўхільна набліжалася разам з фронтам, і подла стараліся схаваць сляды сваіх страшэнных злачынстваў.

**ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ**

**Воспоминания Любови Константиновны Серкиной-Чеботаревич**

Было приказано женщинам с детьми собираться в один сарай, мужчинам во второй. Когда люди собрались в сарай, немцы закрыли их на замок. Тогда все поняли, что это не собрание. Немцы пригнали людей с лопатами и приказали вырыть ямы. Через щёлки сараев люди видели, что творилось вокруг, они поняли, что их ожидает смерть. Тогда женщины

спели святую песню и стали прощаться одни с другими. Стали выводить немцы по 20 человек с сарая и закомандовали людям прыгать в ямы. А затем пускали в них очередь из пулемета и присыпали землей. Когда женщины поняли, что выводят человек по 20, они стали садиться кучками по двадцать человек с родственниками. У кого не было родственников, садились с чужими. В первую очередь расстреливали мужчин, а затем женщин с детьми. Одна женщина видела, как выводят ее мужа, у нее получился разрыв сердца. Этой женщиной была Скворнюк Ольга. Из всех тех, кто был закрыт в сарае для расстрела, спаслись только супруги Козловские из Гродно, которые, когда их вывели на расстрел, предъявили свои немецкие документы, что они не местные жители. Затем немцы засыпали побитых людей сами, а тех, которые рыли ямы, послали уводить скот из д. Пузовичи в им. Лавно. Лучшие материальные ценности были розданы немецким приближенным, остальная часть продана людям.

В дер. Пузовичи погибла моя сестра Ольга Стальбовская и ее муж Иосиф и их двое детей: сын 9 лет и дочь 4 лет. Я пошла в полицию, когда продавали вещи, чтобы узнать и купить вещи сестры. Увидев, что вещи покупает мой сосед, я попросила его их мне уступить, но он только сообщил об этом жандраму, который избил меня и посадил в камеру.

*ДАГВ. Ф. 239. В. 9. С. 22. Арк. 20-21, 31. [Успаміны сведкаў пра знішчэнне в.Пузавічы, сабраныя І.А.Барысавым].*

**Вызваленне**

На пачатку лета 1944 г. савецкая армія распачала вялікую наступальную аперацыю ў Беларусі пад кодавай назвай “Баграціён”, якая прывяла да разгрому і акружэння буйнай групіроўкі нямецкіх войскаў у раёне Мінска, што стварыла перадумовы для хуткага прасоўвання на захад. На завяршальным этапе аперацыі войскі 2-га Беларускага фронту (камандуючы генерал-палкоўнік Г.Ф.Захараў) наступалі ў накірунку Гродна – Беласток ўздоўж шашы Ліда – Гродна. Мястэчка Скідзель і рака Котра маглі быць выкарыстаныя немцамі для стварэння зручнага рубяжа абароны на шляху да Гродна.

З усходняга накірунку да Скідзеля падыходзілі сілы 50-й савецкай арміі, пад камандаваннем генерал-лейтэнанта І.У.Болдзіна. Болдзін добра ведаў гэтыя мясціны, паколькі менавіта адсюль ён пачынаў адступаць на ўсход у чэрвені 1941 года. На момант апісваемых падзей у

склад 50-й арміі ўваходзілі: 69-ы стралковы корпус (камандзір генерал-маёр М.М.Мультан), 42-я Смаленская стралковая дывізія (палкоўнік. А.І Сліц), 153-я Смаленская стралковая дывізія (палк. А.А. Шчэннікаў), 70-ы стралковы корпус (генерал-маёр У.Г. Цярэнц'еў), 64-я Магілёўская стралковая дывізія (генерал-маёр Шкрылёў), 199-я стралковая дывізія, 81-ы стралковы корпус (генерал-маёр Ф.Д.Захараў), 95-я стралковая дывізія, 290-я стралковая дывізія (генерал-маёр Гаспаран), 121-й стралковы корпус (генерал-маёр Д.І.Смірноў), 139-я Чырвонасцяжная Раслаўльская стралковая дывізія (генерал-маёр І.К. Кірылаў), 238-я Карачаўская стралковая дывізія (генерал-маёр І.Д. Краснаштанаў), 330-я стралковая дывізія (палк. У.А.Гусеў) [Састаўлена па матэрыялах кнігі: Елисеев Е.П. На белостокском направлении. М., 1971. 230 с.]

У якасці ўзмацнення 50-й арміі ёй былі прыдадзены 43-я і 23-я асобныя танкавыя брыгады, 233-і асобны танкавы полк, 1444-ы, 1819-ы, 1434-ы самаходныя артылерыйскія палкі і 334-ы і 324-ы танкава-самаходныя артылерыйскія палкі [Журнал боевых действий 50 А. Центральный Архів Министерства Обароны РФ (далей – ЦАМО РФ). Ф. 50А. В. 9769. С. 323. Арк. 16]. Паветранае прыкрыццё ажыцяўлялі самалёты 4-й паветранай арміі пад кіраўніцтвам ген. К.А.Вяршыніна.

9 ліпеня 1944 г. камандуючы 2-м Беларускім фронтам генерал-палкоўнік Г.Ф.Захараў выдаў загад 50-й арміі, згодна з якім яна павінна была сіламі сваіх чатырох карпусоў выйсці да 12 ліпеня на рубеж Гродна – Індура і авалодаць горадам Гродна. Армія знаходзілася ў гэты момант у раёне Шчорсы – Карэлічы. Для выканання азначанага загада 50-й арміі Болдзіна трэба было пераадолець за двое сутак каля 140 км, узяць з боем мноства населеных пунктаў, што было вельмі цяжкай задачай. Камандуючы фронтам, несумненна, пераацаніў магчымасці 50-й арміі і адначасна недаацаніў сілу і жорсткасць нямецкага супраціўлення. Як сцвердзіў у сваёй манаграфіі Я.П.Елісееў: "…такі тэмп руху войскаў, устаноўлены камандуючым фронтам (да 60 км у суткі з пераадольваннем водных перашкод, ва ўмовах нарошчвання сіл і ўзмацнення супраціўлення праціўніка), для пяхоты быў завышаны і, як паказаў далейшы ход падзей, войскі… не здолелі выканаць пастаўленыя задачы ў намечаныя тэрміны".

Для таго, каб не даць праціўніку магчымасці адарвацца ад савецкіх войскаў і стварыць трывалую лінію абароны, наперадзе войск фронта камандаванне вырашыла выкарыстоўваць мабільныя сілы. Гэтыя сілы павінны былі складацца з бранетанкавых сродкаў, узмоцненых пяхотай на аўтамабілях і артылерыяй. Такія атрады ствараліся пры кожнай арміі фронта. Выкарыстоўваючы сваю хуткасць, мабільныя армейскія атрады імкліва праследавалі адступаючых немцаў і не давалі ім магчымасці правесці поўную эвакуацыю і адступіць на падрыхтаваную для абароны пазіцыю. Наперадзе 50-й арміі наступаў армейскі рухомы атрад пад камандаваннем намесніка камандуючага арміяй генерал-лейтэнанта А.А.Цюрына. У яго склад уваходзілі: 23-я

асобная танкавая брыгада (4 Т-34), 1444-й самаходны артылерыйскі полк (4 СУ-76), 1434-ы самаходны артылерыйскі полк (7 СУ-85), два палкі 5-й знішчальна-супрацьтанкавай артылерыйскай брыгады, дзве роты аўтаматчыкаў 238-й стралковай дывізіі, 4-ы батальён 1-й штурмавой інжынерна-сапёрнай брыгады.

Мэтай гэтага атрада было праследаванне нямецкіх войскаў, адступаючых перад фронтам 50-й арміі. 11 ліпеня войскі 50-й арміі фарсіравалі раку Нёман у раёне вёскі Беліца. Рухомы армейскі атрад пачаў наступаць у кірунку Шчучын – Скідзель. На працягу 12 ліпеня былі ўзяты мястэчкі Шчучын, Ражанка, Жалудок. Рухомы атрад атрымаў загад наступаць на мястэчка Скідзель, узяць яго і працягваць наступленне ў кірунку Гродна.

12 ліпеня атрад быў узмоцнены 398-м дывізіёнам 100-га мінамётнага палка. На ўзбраенні дывізіёна знаходзіліся рэакцыўныя ўстаноўкі БМ-13Н, якія атрымалі вядомую назву "кацюшы", зманціраваныя на базе амерыканскіх трохвосных грузавікоў "студэбеккер". Дывізіён складаўся з трох батарэй, па 4 пускавыя ўстаноўкі ў кожнай.

Адступаючыя перад фронтам 50-й арміі нямецкія сілы складаліся з рэштак 4-й нямецкай арміі. Камандаваў арміяй генерал К. фон Ціпельскірх. Па дадзеным польскага гісторыка Т.Савіцкага, пад час правядзення аперацыі "Баграціён" 4-я армія страціла (былі знішчаны ці разбіты) два штаба корпуса і 11 дывізій [Sawicki Tadeusz. Niemieckie wojska lądowe na froncie wschodnim. С. 174-175]. Найбольш баяздольнымі сіламі, якія супрацьстаялі рухомаму атраду генерала Цюрына, была 50-я пяхотная дывізія, перакінутая на ўсходні фронт з Германіі на пачатку ліпеня 1944 г. Камандаваў дывізіяй генерал-маёр Ф.Хохн. Акрамя гэтых сіл супраць войск І.У.Болдзіна дзейнічалі рэшткі 14-й матарызаванай пяхотнай дывізіі пад камандаваннем генерала Г.Флёрке. Гэта была адна з нешматлікіх дывізій, якая пазбегла поўнага разгрому на ўсходзе Беларусі і здолела арганізавана адступіць на захад [Hinze R. Das Ostfront-Drama. 1944. С. 172]. Магчыма, гэта адбылося з-за таго, што дывізія ўваходзіла ў рэзерв групы армій "Цэнтр". Гэтыя дзве дывізіі ўваходзілі ў корпусную групу Вэйдлінга [Дарэчы, генерал Вэйдлінг быў апошнім камендантам Берліна ў маі 1945 года. Менавіта ён падпісваў капітуляцыю берлінскага гарнізона]. З накірунка Ліды на захад адступалі таксама паліцэйскія сілы групы К. фон Готберга, які займаў пасаду забітага ў Мінску падпольшчыкамі гаўляйтэра Вільгельма Кубэ.

У авангардзе армейскага мабільнага атрада Цюрына рухаліся дзве самаходныя артылерыйскія устаноўкі СУ-85, некалькі батарэй 58-га знішчальна-супрацьтанкавага палка і аўтаматчыкі 238-й дывізіі. Камандзір рухомага атрада атрымаў інфармацыю, згодна з якой па шашы Ліда – Гродна адступала вялікае нямецкае злучэнне. Як пазней высветлілася, гэта была 50-я нямецкая пяхотная дывізія. Было

вырашана не даць сілам праціўніка адступіць у гродзенскім накірунку і перапыніць іх каля мястэчка Скідзель. Для гэтага рухомаму атраду патрэбна было перакрыць шашу Ліда – Гродна. Такім чынам, немцы апынуліся б у цісках паміж атрадам Цюрына з захаду і астатнімі часткамі 50-й арміі з усходу. Для выканання задуманай аперацыі армейскі рухомы атрад пачаў наступаць ад Шчучына ў накірунку на Зарэчча – Каменка – Прудцы па паралельнай да шашы дарозе, каб апярэдзіць немцаў і перарэзаць шашу.

Немцы рыхтавалі абарону Скідзеля і ракі Котра сіламі 14-й матарызаванай пяхотнай дывізіі. Паводле інфармацыі нямецкага гісторыка Р.Хінцэ, падраздзяленні 14-й дывізіі 12 ліпеня занялі наступныя пазіцыі: 5-я і 6-я роты 1069-га грэнадзёрскага палка занялі абарону на заходнім беразе ракі Котра, на поўдзень ад шашы Ліда – Гродна [Hinze R. Das Ostfront-Drama 1944. С. 171]. 7-я рота таго ж палка на грузавіках была перакінутая да пераправы праз раку Нёман каля вёскі Коматава. Гэта пераправа мела вырашальнае значэнне для адступаючых на захад войскаў 4-й нямецкай арміі, так як давала магчымасць хутка перакінуць свае сілы на паўднёвы бераг Нёмана. Гэтыя сілы праціўніка былі ўзмоцнены кулямётамі, мінамётамі і двумя артылерыйскімі батарэямі. На поўнач ад Скідзеля абарону займалі паліцэйскія палкі групы Готберга.

Першае сутыкненне рухомай групы Цюрына з нямецкай абаронай адбылося ў раёне вёскі Пратасаўшчына ў 18 км ад Скідзеля. Смелай атакай з ходу праціўнік быў збіты са сваіх пазіцый і адступіў. Праследуючы ворага рухомы атрад уварваўся ў вёску Ахрымаўцы. Аднак тут немцы перайшлі ў контратаку. Нечакана ім удалося знішчыць дзве машыны, якія рухаліся наперадзе атрада. Савецкія войскі вымушаны былі займаць абарону і адбіваць атаку. Толькі пасля залпаў рэактыўных мінамётаў БМ-13Н, якія накрылі пяхоту праціўніка, немцы адступілі.

Вечарам 12 ліпеня перадавы рухомы атрад Цюрына сутыкнуўся з арганізаваным супраціўленнем немцаў у раёне вёскі Пяшчанка ў 4 км на ўсход ад Скідзеля. Супрацьтанкавая артылерыя немцаў падбіла адну з двух самаходных установак (СУ-85), якія былі ў атрадзе Цюрына. Каля 22 гадзін вечара рухомы атрад заняў абарону на шашы Ліда – Гродна ў раёне вёсак Сікорыца – Прыступічы.

У той жа час на шашу выйшлі падраздзяленні 50-й нямецкай пяхотнай дывізіі (121-ы і 122-і грэнадзёрскія палкі). Гэта адбылося даволі нечакана для камандавання рухомага атрада. Немцы з'явіліся з лесу, які рос непадалёку ад шашы. У выніку рухомы атрад быў сціснуты праціўнікам з двух бакоў і заняў кругавую абарону. Гарматы былі разгорнуты на прамую наводку. Вось што ўспамінаў М.С.Навасёлаў, які служыў ў той час у 398-м мінамётным дывізіёне: "...немцы нечакана апынуліся ў тыле нашага дывізіёна і з ходу адкрылі кулямётны і аўтаматны агонь. За лічаныя хвіліны мы згубілі каля двух дзесяткаў

салдат і камандзіраў. Быў паранены камандзір дывізіёна майор Васільеў, але з бою не выйшаў. Разам з намі адбіваліся ад ворага салдаты і афіцэры падраздзяленняў ствольнай артылерыі і яшчэ нейкіх частак. Мы былі перашкодай на шляху адступаючых на захад немцаў. Узнікла парадаксальнае становішча: зараз адступаючыя немцы азвярэла наступалі на нас, а мы, наступаючыя, адступалі, падаваліся назад на захад. У нас не хапіла сіл стрымліваць іх, і мы вымушаны былі адвесці баявыя машыны ў бок ад шашы. Тым больш што выкарыстоўваць іх у сумяціцы, калі ўсё перамяшалася, было немагчыма. Ішла рукапашная схватка, некалькі баявых машын, з'ехаўшы з шашы, завязлі ў балоце. І каб яны не трапілі ў рукі да немцаў, іх спалілі і ўзарвалі. У гэтым баю я застаўся жывы, але згубіў добрага і вернага сябра Эпрыкяна, армяніна па нацыянальнасці. Ён здзейсніў гераічны ўчынак: засланіў сабою камандзіра ўзвода сувязі, лейтэнанта Аверкіна, застрэліў немца, які падскочыў з пісталетам амаль да камузвода, але іншы немец смяротна параніў Эпрыкяна" [Со святой верой в Победу. [Электронны ресурс] – Рэжым доступа: http://militeri.lib.ru.].

Баі з падраздзяленнямі нямецкай 50-й дывізіі працягваліся ўсю ноч. 58-ы знішчальна-супрацьтанкавы артылерыйскі полк панёс найбольш адчувальныя страты і вытрымаў асноўны цяжар баёў. Паводле данясенняў у 5-ю знішчальна-супрацьтанкавую брыгаду бой працягваўся на працягу 10 гадзін і неаднаразова пераходзіў ў рукапашны. Пад час гэтага бою 58-ы полк згубіў забітымі 8 афіцэраў і 66 сяржантаў і радавых. Акрамя таго былі знішчаны 5 установак БМ-13, 3 самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі і 5 аўтамабіляў з баяпрыпасамі [Журнал боевых действий 50 А. ЦАМО. Ф. 50А. В. 9769. С. 323. Арк. 69]. М.С.Навасёлаў успамінаў, што 398-ы Гвардзейскі дывізіён страціў 90 % сваёй тэхнікі.

Раніцай 13 ліпеня немцы ізноў распачалі атакі на пазіцыі рухомага атрада. Паводле інфармацыі Я.П.Елісеева, праціўнік распачаў атаку каля 6 гадзін раніцы. Нямецкія грэнадзёры рухаліся ў поўны рост, не хаваючыся ад агня савецкай артылерыі. Геройскі дзейнічаў экіпаж адзінай самаходнай устаноўкі, якая яшчэ заставалася ў рухомым атрадзе. Калі ў СУ-85 скончыліся баяпрыпасы, яна гусеніцамі давіла ворага. Пасля дзвюх гадзін бою ў атрадзе Цюрына скончыліся паліва і баявы запас. На шчасце, да месца бою пачалі падыходзіць сілы 23-й танкавай брыгады. Адначасова з поўдня падышоў рухомы атрад 121-га стралковага корпусу 50-й арміі. Немцы аказаліся пад пагрозай ахопу з поўдня. Яны атакавалі з асаблівай жорсткасцю і адчаем. Менавіта ў гэты момант А.А.Цюрын аддаў загад адступіць з шашы на поўнач. У выніку сілы 50-й нямецкай дывізіі здолелі прарвацца на захад.

Такім чынам, удала распачатая аперацыя ўсё ж не была канчаткова завершаная. Аднак, праціўнік панёс вельмі адчувальныя страты. Савецкае камандаванне ацэньвала іх у 700 чалавек забітых, 120 немцаў былі ўзятыя ў палон. Акрамя гэтага, савецкія войскі захапілі 16

гармат і да 150 конных падводаў. Разам з часткамі 50-й пяхотнай дывізіі прарваўся і 2-гі дывізіён 14-га нямецкага артылерыйскага палка (дзве лёгкіх і дзве цяжкіх батарэі). Гэты дывізіён, амаль у поўным складзе, з тэхнікай і боепрыпасамі, здолеў вырвацца з Мінскага катла і дайсці да Гродна [Hinze R. Das Ostfront-Drama 1944. С.171].

Пасля невялікага адпачынку і папаўнення палівам і боепрыпасамі рухомы армейскі атрад прадоўжыў сваё наступленне ў накірунку на Скідзель. Каля 13 гадзін дня 13 ліпеня 1944 г. Скідзель быў ўзяты. Немцам не ўдалося арганізаваць яго абарону – не хапіла часу і сродкаў. Радавы 830 стр. палка 238 с.д. Юлій Дзегцяроў успамінаў: "В Скидель мы вошли 13 июля ночью. Город был свободен от немцев. Утром мы вышли из города и пошли по направлению к реке. Вначале шли по полю, затем по склону холма. Внизу, на поляне немцы из минометов обстреляли нашу полковую артиллерию. Перейдя вброд реку, мы залегли возле реки...". Разам з рухомым атрадам у мястэчка уварваліся часткі 238-й стралковай дывізіі. Адразу ж пасля ўступлення ў Скідзель савецкіх войскаў, немцы пачалі яго абстрэл з-за ракі Котра. У небе з'явіліся нямецкія самалёты. Абстрэл Гродзенскай вуліцы, уздоўж якой рухаліся савецкія войскі, працягваўся да вечара. У адказ, з наступленнем цемры, з усходніх ваколіцаў Скідзеля (з раёну вёскі Гліняны) па нямецкіх батарэях адкрылі агонь "кацюшы" 398-га Гвардзейскага мінамётнага дывізіёна. Рухомы атрад Цюрына выйшаў да ракі Котра, фарсіраванне якой пачалося ў той жа дзень. Аднак далейшае прасоўванне наперад было спынена сіламі 14-й пяхотнай матарызаванай дывізіі праціўніка. На наступны дзень, 14 ліпеня, рухомы атрад быў расфарміраваны. Падраздзяленні, якія ўваходзілі ў яго склад былі ўлучаныя ў 81-ы стралковы корпус 50-й савецкай арміі.

УСПАМІНЫ МАЁРА АЛЯКСЕЯ СКАБЕЛЬЦЫНА

Стояла темная ночь, сгустились, тучи, движение совершалось без освещения. С выходом из леса (2-3 км) восточнее г.Скидель, колонна остановилась в 300-400 метрах от леса с высотой (в 1 км от г.Скидель). Ко мне подбежал встревоженный командир головного танка и доложил, что его танк стволом орудия уткнулся в ствол артиллерийского орудия неизвестной принадлежности. Вот здесь я был уверен, что мы догнали передовой отряд генерала Тюрина и пошел к месту столкновения танка с орудием. С командиром роты автоматчиков мы подошли к тягачу орудия, слышим храп из тягача и думали спят наши солдаты, а поднявшись на тягач и пощупав обмундирование, я понял, что в тягаче спят немцы.

Вернувшись к танку, выслали к тягачу группу захвата, сразу же нам

привели пленного, полусонного, который принял наши вопросы за шутку над ним его друзей немцев. После 2-3 минут попыток узнать от пленного обстановку раздался выстрел с немецкой стороны (из второго орудия немецкой колонны), тягач (последний в колонне немцев) загорелся и было хорошо видно, что до высоты с лесом (1 км от г.Скидель) стояла на шоссе колонна артиллерии и обоза. После артвыстрела со стороны немцев по нашей колонне была дана пулеметная очередь.

Мною была дана команда на развертывание в боевой порядок, а пункт управления был определен в отдельном домике – в хвосте нашей колонны, слева от дороги. Организовали свет и пытались связаться по радио с дивизией, корпусом и армией, но безуспешно. По карте было принято решение, запланировали огонь «Катюш», нанося основной удар по высоте с лесом и по колонне, что была перед нами. Организовали связь и в 3.30 была назначена атака.

Когда мы вышли из домика, вдруг радист мне доложил, что у аппарата Тюрин, который говорит открытым текстом. Взяв трубку радиостанции я услышал: «Я, Тюрин! Я, Тюрин! Отвечай из какой ты дивизии?».

Мой кодовый ответ его не устроил и он вторично запросил: «Из какой ты дивизии, это не ты ночью вел бой восточнее г.Скидель, что у тебя есть?»

Отвечаю – «Я Красноштановец (по фамилии командира 238 сд), бой ночью под Скиделем вел я, у меня есть все».

Вновь Тюрин: «Я нахожусь на высоте с лесу в 1 км восточнее Скиделя, «Катюши» сжег, обороняюсь катюшинцами, срочно действуй, если через 30 минут тебя не будет, то меня тоже не будет».

Я заверил генерала, что буду, срочно снял огонь «Катюши» с высоты с лесом и в 4 часа был дан огневой налет по колонне немцев, которая сдерживалась передовым отрядом 49 армии перед высотой с лесом.

После налета по колонне передовой отряд двинулся на машинах за танками к высоте, где был генерал Тюрин и имел большое счастье с ним встретиться. Во время движения я видел немцев с поднятыми руками, артиллерию, обозы, раненых немцев. Удар артиллерии вывел немцев из

ощущения и здравомыслия и они послушно шагали без конвоя в сторону домика, где мы ночью принимали решение. Было подсчитано нашими офицерами 238 сд, что пленных захвачено было более 250 человек, 12 орудий, более 200 лошадей. После доклада генералу Тюрину я направился с отрядом на Скидель.

В густой ржи бродили испуганные немцы, и мы им спокойно показывали куда идти, а сами остановились перед городом, так как мостик через речку был взорван. Немцы отступали вправо (на северо-запад), наш отряд шел на запад. За молзаводом у реки в долине мы остановились и заняли оборону, так как с гродненского направления (с запада) развертывалась дивизия, с которой после 2-х дневных боев нашей дивизии пришлось сражаться.

*Майор Алексей Васильевич Скобельцин был командиром передового отряда 121-го стрелкового корпуса, непосредственно освобождавшего Скидель. Воспоминания написаны в 1980 г. Хранятся в музее СШ № 1 г.Скиделя.*

14 ліпеня 238-я стралковая дывізія, 23-я асобная танкавая брыгада і 233-ці асобны танкавы полк пачалі баі за фарсіраванне ракі Котра ў раёне вёскі Котра. Артылерыйскую падтрымку аказвалі самаходныя ўстаноўкі з 1444-га і 1434-га самаходных артылерыйскіх палкоў, а таксама гарматы 16-га гаўбічнага палка. Баі былі даволі жорсткія. Сілы 14-й матарызаванай пяхотнай дывізіі праціўніка, якія занялі абарону па рацэ Котра, аказвалі упартае супраціўленне. Негледзячы на выкарыстанне значных бранетанкавых сілаў, часткам 50-й арміі не ўдалося сходу фарсіраваць Котру. Да вечара 14 ліпеня праз раку пераправіўся толькі адзін полк 238-й дівізіі. Два астатнія палкі дывізіі знаходзіліся на ўсходнім беразе ракі ў раёне вёскі Некрашы.

Пры пераправе праз Котру значную дапамогу аказвалі салдаты і афіцэры 3-га асобнага штурмавога інжынерна-сапёрнага батальёна. Яны падрыхтоўвалі сродкі пераправы, займаліся рамонтам мастоў праз Котру. Галоўную ўвагу надавалі рамонту чыгуначнага маста, які немцы ўзарвалі пры адступленні. Актыўную дапамогу сапёрам аказвалі і жыхары Скідзеля.

На поўнач ад Скідзеля немцы занялі абарону па рэчцы Пыра. Да гэтага часу ў раён мястэчка пачалі падыходзіць і астатнія сілы 50-й савецкай арміі. На поўнач ад яго – у раён вёсак Юрэвічы – Лакно выйшлі 42-я і 153-я дывізіі 69-га стралковага корпуса. У раён вёскі Пузавічы выйшлі падраздзяленні 718-га палка 139-й Чырвоназнамённай

Раслаўльскай стралковай дывізіі 121-га стралковага корпуса. Такім чынам, на працягу 12-14 ліпеня Скідзельшчына была вызвалена ад нямецкай акупацыі. Выключную ролю ў вызваленні Скідзеля адыгралі байцы 238-ай Карачаўскай стралковай дывізіі.

**238-ая Карачаўская, ардэноў Чырвонага Сцяга, Суворава, Кутузава ІІ-й ступені**

**стралковая дывізія.**

Састаў: 830-ы, 837-ы, 843-ы стралковыя палкі; 693-і артылерыйскі полк; 397 медсанбат; 409 асобны знішчальна-супрацьтанкавы дывізіён; 74-ы асобны знішчальна-супрацьтанкавы дывізіён, 312 асобная разведка, 616 батальён сувязі.

Камандзір дывізіі: генерал-маёр І.Д.Краснаштанаў. Начальнік палітаддзела: Вірычаў У.П.

У маі 1942 г. у Горкаўскай вобласці была сфарміравана 238-ая стралковая дывізія, якая прыняла свой першы бой у г.Белы Калінінскай вобласці. У пачатку 1943 г. пасля працяглых пераходаў і цяжкіх баёў дывізія была выведзена з бою для дакамплектавання і адпачынку. Але вайна рыхтавала дывізіі новыя выпрабаванні. Летам 1943 г. яе перакінулі на Курскую дугу. Наперадзе былі баі за г.Карачаў Бранскай вобласці, які быў моцным апорным пунктам у абароне гітлераўцаў на Арлоўскім выступе Курскай дугі. Вораг упарта супраціўляўся, але не вытрымаў націску і адступіў. 15 жніўня 1943 г. Карачаў быў вызвалены. За гераізм і мужнасць, праяўленыя пры вызваленні горада, 238-ай дывізіі была прысвоена назва “Карачаўская”.

Восенню 1943 г. дывізія ўступіла на беларускую зямлю. У складзе 50-й арміі 2-га Беларускага фронту дывізія прымала ўдзел у вызваленні г.Магілёва. Восем месяцаў яна прастаяла на р.Проні пад пастаянным абстрэлам ворага. З успамінаў ветэрана дывізіі А.М.Федарэнкі: “У такія хвіліны, калі пад абстрэлам гібель здаецца непазбежнай, а нервы напружаны, прыходзіць незразумелы спакой, які магчымы толькі на мяжы жыцця і смерці”.

Летам 1944 г. з цяжкімі баямі дывізія фарсіравала Днепр у межах горада і штурма авалодала цэнтральнымі кварталамі Магілёва. За

праяўленую мужнасць, адвагу і ваеннае майстэрства дывізія была ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцягу. Далей быў Мінскі “кацёл”. Пасля вызвалення сталіцы Беларусі шлях 238-ай дывізі прайшоў праз Койданава, Любчу, Навагрудак, Шчучын, Скідзель. Скідзель вызваляў 13 ліпеня 1943 г. перадавы атрад з састава 238-й сд пад камандаваннем маёра А.В.Скабельцына. Непасрэдна праз горад прайшоў узвод аўтаматчыкаў гэтага палка.

Затым шлях дывізіі пралягаў праз Гродна, Ломжу, Хелм, Гданьск да ракі Эльба. Арзамас-Эльба... Такога маршрута няма ні на адной геаграфічнай карце. Паміж гэтамі назвамі няма амаль нічога агульнага. Першая абазначае горад у Расіі, другая – раку ў Германіі. Але, каб яны, аддаленыя на тысячы кіламетраў, сталі побач у гісторыі 238-ай дывізіі спатрэбіліся тры доўгія гады. У 1942 г. у Арзамасе дывізія была сфармаваная, а ў 1945 г. на Эльбе – расфарміраваная.

За мужнасць і адвагу многія салдаты і афіцэры дывізіі былі ўзнагароджаныя ардэнамі і медалямі: 13-ці прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, 21 стаў поўным кавалерам вышэйшай салдацкай узнагароды – трох ступеняў ордэна Славы. Жыхары Скідзеля свята берагуць памяць тых, хто прынёс радасць перамогі на шматпакутную зямлю Скідзельшчыны. У старым парку горада знаходзіцца брацкая магіла. Тут пахаваныя 1138 савецкіх воінаў. Сярод іх чатыры Героя Савецкага Саюза.

Многія гады Савет ветэранаў Скідзеля і гурток “Пошук” СШ № 1 вядуць перапіску з ветэранамі Карачаўскай дывізіі. У 1986 г. і 1989 г. ветэраны дывізіі прыязджалі ў Скідзель. Госці наведалі брацкую магілу, ушанавалі памяць аднапалчанаў, праехалі па месцах былых баёў, сустрэліся з вучнямі школ і жыхарамі горада. Старшыня савета ветэранаў дывізіі С.С.Абрамаў сказаў: “Самыя светлыя, цёплыя ўспаміны застаюцца ў нас ад гэтай паездкі, ад сустрэчы з вашымі працавітымі добрасумленнымі людзмі... Менавіта аб такім жыцці мы марылі ў агні баёў. А бачыў я вашу зямлю зусім другой”. Па запрашэнні ветэранаў 238-ай дывізіі група вучняў гуртка “Пошук” разам з настаўніцай гісторыі Міхальчук З.У. у 1987 г. да 45-годдзя ўтварэння дывізіі наведала г.Арзамас. Сустрэча была вельмі

цёплай. Значкі, сувеніры і фотаздымкі захоўваюцца ў школьным музеі.

Ідуць гады. Там, дзе было пажарышча, выраслі дамы, на месцы варонак і акопаў каласяцца нівы. Амаль нішто не нагадвае пра жудасную вайну. Пройдзе час, і на кліч нашага сэрца не адгукнецца ні адзін франтавік. Яны згасаюць, нібы знічкі. Але вечнай будзе памяць пра іх подзвіг, яна бязмежная і святая.

*З.А.Сямашка, настаўніца гісторыі СШ № 1 г.Скідзеля*

Пасля вызвалення многія скідзельцы былі прызваныя ў Савецкую армію і прынялі ўдзел у баявых дзеяннях восені 1944 г. – вясны 1945 г. Пасля вельмі кароткага навучання асновам вайсковага майстэрства навабранцаў звычайна накіроўвалі ў вайсковыя часткі, што вялі кравапралітныя баі ва Ўсходняй Прусіі і Польшчы. Скідзельцы паказалі сябе добрымі салдатамі, многія былі ўзнагароджаныя самымі паважанымі салдацкімі ўзнагародамі – ордэнам Славы і медалём “За адвагу”. Медалём “За адвагу” быў узнагароджаны і малады хлопец Міхал Сяўрук, малодшы брат Пятра Сяўрука, кіраўніка гуртка ТБШ і перакананага пацыфіста, якога немцы ў 1942 г. адным з першых вывезлі на працу ва Ўсходнюю Прусію. Адразу пасля вызвалення ў 1944 г. ён добраахвотна ўступіў у Чырвоную армію, ваяваў кулямётчыкам. Пасля разгрому Германіі яго вайсковая частка была перакінута на Далёкі Ўсход, каб ваяваць супраць Квантунскай арміі японцаў. Пад страшэнным дажджом рабілі пераход праз пустыню Гобі, якая ператварылася ў суцэльнае болота. Некалькі гадоў Міхал Сяўрук праслужыў у легендарным Порт-Артуры. Калі вярнуўся на радзіму, паступіў у Гродзенскі педінстытут, атрымаў прафесію настаўніка матэматыкі. Быў у яго жыцці яшчэ адзін выпадак, які сведчыць пра мужнасць і сумленнасць гэтага чалавека. Міхал закахаўся ў дзяўчыну Людмілу з Ваўкавыска, сваю будучую жонку, а яе разам з сям’ёй выслалі ў Казахстан, як высылалі тады мноства заможных сялян з Заходняй Беларусі. І Сяўрук паехаў разам з імі, паставіўшы пад пагрозу сваю магчымую кар’еру

Нельга не ўзгадаць і ваеннаначальнікаў – ураджэнцаў Скідзельшчыны. З вёскі Белякоўшчына паходзіў генерал Іван Фёдаравіч Іоскевіч (1898-1964), які ў час вайны камандаваў дывізіяй, быў намеснікам камандзіра корпуса, удзельнічаў у вызваленні Беларусі.

**ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ СКІДЗЕЛЬЦАЎ**

**Воспоминания Юревича Владимира Степановича (1919 г.р.)**

В октябре 1940 г. я был призван на действительную службу в Красную Армию, зачислен в артиллерию 207 КАП, дислоцировавшегося в

гор. Орджаникидзе на Кавказе. С первых дней Великой Отечественной войны находился на фронте. В 1942 г. в боях под Ростовом на Дону попал в плен. Там была окружена и разгромлена наша армия около 600 тысяч. В лагере военнопленных находился в гор. Киеве, из которого отпускали домой украинцев. Я тоже записался украинцем, и меня отпустили. Когда прибыл домой комендант полиции Ян Ошурко таскал долго, как это я мог уйти из плена, но затем успокоился. Дома работал вместе с отцом на личном хозяйстве, а с освобождением кожевником на кожзаводе. Затем, в 1944 г. был призван в армию и через две недели попал на фронт. Часть, в которой я воевал, прошла с боями левее гор. Данцига, участвовал в штурме гор. Штутгарта, в боях на реке Одер, под Берлином, и закончил войну на реке Эльба. За участие в боях награжден орденом Славы 3 степени, медалями «За боевые заслуги» и «За взятие Берлина».

*Записал 8 июня 1989 г. И.А.Борисов. Успаміны захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці. Ф. 239. В. 9. Спр. 34. Арк. 1-3.*

**Успаміны Паўла Фёдаравіча Чабатарэвіча**

20 верасня 1941 г. мяне прызвалі ў Чырвоную армію і накіравалі ў Адэскую ваенную акругу. На пачатку вайны мы ахоўвалі аэрадром у Бендэрах, лавілі шпіёнаў і дыверсантаў. Потым нас накіравалі на ліквідацыю дэсанта пад станцыю Раздзельная. Калі немцы ўзялі Кіеў і пайшлі на Херсон, пагражаючы акружэннем Адэскай ваеннай групіроўцы, наша часць павінна былі выйсці ад ст. Раздзельная на Днепрапятроўск. Двойчы мы траплялі ў акружэнне, але з баямі выйшлі на горад Умань, а потым на Днепрапятроўск. Вельмі дакучала нам нямецкая авіяцыя, але страляць з вінтовак па самалётах нам камандзіры забаранялі. А я ўсё роўна страляў, не мог стрымацца. У мяне была вельмі добрая дзесяцізарадная паўатаматычная вінтоўка. Укладваў праз адзін трасіруючыя і бранябойныя патроны, каб было відаць, ці папаў па самалёту.

Пасля перафарміроўкі зноў пачалі адступаць праз Данбас аж да самога Растова, а з Растова на Каменск. Пад Данецкам давялося пабачыць вельмі дзіўную рэч: мільёны мышэй адступалі разам з намі на Ўсход.

Немагчыма было прайсці па зямлі, каб не наступіць на іх, цэлае мышынае мора.

Потым мы ад Немца Растоў адбівалі. Знаходзіліся ў Растове да канца зімы 1942 г., а потым усіх заходнікаў, хто да вайны жыў у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, знялі з фронта і павезлі на ўсход. Завязлі за 200 км за Казань. Валілі там лес і больш нічога не рабілі. Кармілі вельмі дрэнна, умовы жыцця былі жахлівыя. Мы з земляком Фларыянам Канановічам з Бераставіцы вырашылі ўцякаць на фронт. Даехалі да Разані, дзе нас затрымаў камендант горада і выкарыстоўваў па свайму прызначэнні. Маглі нас і сурова пакараць за самавольнае астаўленне часці, але пасля бітвы за Маскву і цяжкіх людскіх стратаў салдаты былі вельмі патрэбныя. У Маскве мы з Канановічам разлучыліся, і больш ужо я яго ніколі не бачыў. Мяне, як сяржанта, накіравалі вывучаць мінамёт. Рыхтавалі з нас ударную дывізію. Але я захварэў васпаленнем лёгкіх, а потым яшчэ і тыфам. Быў у такім безнадзейным стане, што ўрач загадаў медсястры выносіць мяне ў морг. Але яна заўважыла, што я яшчэ жывы, і пакінула ў палаце. Крызіс прайшоў, і я пачаў папраўляцца. Пасля гэтага патрапіў я ў пехоту на Арлова-Бранскім накірунку. Хаця мы стаялі ў абароне, я не мог спакойна сідзець. Увесь час назіраў за праціўнікам, вывучаў яго ўмацаванні і агнявыя кропкі. На наш пярэдні край часта прыходзіў старшына-артылерыст. Ён заўважыў мяне  і забраў да сябе ў артылерыю. Наш дывізіён 45-міліметровых гармат быў далучаны да 31-й гвардзейскай дывізіі. Наш старшына на самой справе быў разжалаваным за дробную правіннасць афіцэрам. Ён быў добрым ваякам і хацеў рэабіліціравацца за свой праступак. На жаль, я ўжо забыўся яго прозвішча. Мы падбіраліся на некалькі сотняў  метраў да нямецкіх дотаў і дзотаў і хутка выпускалі дзесятак ці два снарадаў. Ва ўмелых руках саракапятка была грознай зброяй. Раззлаваныя немцы пачыналі лупіць па нас і з кулямётаў, і з пушак, і нават з дальнабойнай артылерыі. За гэта на нас злавалася пяхота, бо ёй часам нямала даставалася.

Але потым я захварэў і пакуль быў у госпіталі, нашу дывізію перакінулі пад Сталінград. Я зноў патрапіў у пяхоту. Калі немцаў гналі ўжо

па ўсяму фронту, а наша армія наступала ў раёне горада Рагачова, толькі ўваходзіла ў Беларусь, мяне моцна кантузіла. Ачухаўся я ў нейкім хляве сярод параненых і абгарэлых танкістаў, якія ляжалі проста ў навозе, і пачаў абмацваць сябе, каб даведацца, ці цэлыя рукі і ногі. Тут пачулася нямецкая мова, і я зразумеў, што патрапіў у палон. Нямецкія санітары бралі параненых за рукі і за ногі і закідвалі ў грузавік. У грузавіку я зноў страціў прытомнасць, а ачуняў ужо ў госпіталі для ваеннапалонных. Так восенню 1943 г. я апынуўся ў палоне.

Наш лагер знаходзіўся на захадзе Германіі. Трэба сказаць, што ў апошнія гады вайны немцы ўжо не мучылі так савецкіх ваеннапалонных голадам, як напачатку. Ім не хапала рабочых рук. У нашым лагеры палонныя ад галоду не паміралі. Я ж працаваў сапожнікам, таму меў яшчэ дадатковае харчаванне. Працавалі мы ў нямецкага майстра, які рамантаваў абутак для вермахта. Рабілі за дзень па сорак пар. Рамеснік меў шмат старога неразпроданага абутку, асабліва жаночага, які збіраўся паліць. Я скупляў у яго па 2 маркі за пару, а ў лагеры гэта быў вельмі ходавы тавар. Можна было выменяць на “шайны” і набыць хлеб, масла, іншыя прадукты, адзенне, што дапамагала зберагчы сілы і здароўе. Я жыў у бараку ў адным памяшканні з Гаўрушыным і Фецісавым. Гаўрушын быў перакананым, цвёрдым камуністам, паходзіў з Разані, хаця нейкі час жыў у Маскве, дзе загадваў чайной. А Фецісаў, наадварот, не любіў камуністаў. Ён быў выдатным майстрам-сапожнікам, да вайны меў у Кіеве некалькі сваіх майстэрняў.

Калі да нашага лагера пачалі набліжацца амерыканцы, то ваеннапалонных пастроілі і кудысці павялі. Пачалі людзі шаптацца, што нас хочуць знішчыць, атруціць газам. Мы ўтрох з Гаўрушыным і ленінградцам Мішкам вырашылі ўцякаць. Калі калона ўзыйшла на парослую ляском гару, мы сiганулі ўніз. Хаваліся ў лесе два дні, пакуль не ўбачылі амерыканскія танкі, якія здалёк былі падобныя на маленькія каробачкі. Калі амерыканцы наблізіліся, то Гаўрушын і Мішка адправілі мяне, як самага малодшага, патлумачыць, што мы савецкія ваеннапалонныя. Я пабег па полю насустрач амерыканцам, якія наставілі на мяне аўтаматы. Пачаў спрабаваць

тлумачыць, хто я такі. Сярод амерыканскіх салдат аказаўся адзін, які гаварыў па-польску. Я сказаў яму, што мяне чакаюць яшчэ двое таварышаў. Пакуль я хадзіў за Гаўрушыным і Мішкам, уся рота амерыканцаў чакала, скіраваўшы аўтаматы ў наш бок. Нас накіравалі да камандзіра танкавай часці, які аказаўся рускім па паходжанні, жыў калісці ў Маскве. Яны з Гаўрышыным пагаварылі пра Маскву, і той даў нам шмат кансерваў і цыгарэт, патлумачыў, як дайсці да зборнага пункта для савецкіх ваеннапалонных. Але папярэдзіў, каб мы не займаліся марадзёрствам і грабежніцтвам, каб не нападалі на мірных нямецкіх жыхароў, бо тады намі займецца ваенная паліцыя, і ўсё можа скончыцца для нас вельмі дрэнна. Так я быў вызвалены з палону, а адбылося гэта 1 красавіка 1944 г. У лагеры для былых ваеннапалонных рабілася ўсялякае. Нягледзячы на ахову, некаторыя палонныя выбіраліся за межы лагера, рабавалі немцаў і ўчынялі розныя бязчынствы. Аднойчы нават адабралі амерыканскі танк ад чорнаскурых танкістаў, праўда, на шчасце, нікога не падавілі. У лагеры таксама часта выкрывалі былых уласаўцаў, паліцэйскіх і здраднікаў, якія спрабавалі замаскіравацца пад савецкіх ваеннапалонных. Тады ўсе кідаліся іх біць. А тыя ж, перакуляючыся ад удараў, усімі сіламі імкнуліся дабегчы да аховы, якая ратавала іх ад непазбежнай смерці.

Калі амерыканцы перадалі нас савецкаму боку, дык адразу адчулася нядобразычлівае да нас стаўленне. Многія ў вочы называлі нас здраднікамі, што было вельмі крыўдна. Я два тыдні прабыў у фільтрацыйным пункце, двойчы мяне выклікалі на допыты, дзе я расказаў пра свой баявы шлях, пра камсамольскую падпольную дзейнасць і ўдзел у Скідзельскім паўстанні. Я быў сапраўдным савецкім чалавекам. Летам 1945 г. мяне зноў залічылі ў Савецкую армію ў асобны зенітны батальён, які, праўда, хутка расфарміравалі, а мяне перавялі ў аўтамабільны полк, дзе я праслужыў да ліпеня 1946 г., калі быў дэмабілізаваны. За удзел у баявых дзеяннях я быў узнагароджаны медалямі “За отвагу” і “За боевые заслуги”, хаця мяне прадставілі да ордэну Чырвонай Зоркі, калі быў артылерыстам.

08.06.2008 г.

*Запісаў 07.06.2008 г. Сяргей Токць. Захоўваецца ў асабістым архіве С.Токця*

Адразу пасля вызвалення Скідзеля з ліку мясцовай моладзі і партызанаў быў створаны знішчальны батальён, задачай якога была барацьба з бандамі і ахова мірнага насельніцтва. У гэты батальён уступілі сем маладых хлопцаў са Скідзеля дапрызыўнога ўзросту: Іван Чабатарэвіч, Мікалай Сямашка, Расціслаў Баранаў, Мікалай Пляскач, Ілля Навіцкі, Міхал Трусь, Ілля Барысаў, Аляксандр Жук.

БАТАЛЬОН ЗАЩИТЫ НАРОДА

В июле 1944 г., как вспоминала бывшая партизанка М.И.Яковлева, командир отряда Александр Аношин получил задание в срочном порядке сформировать батальон защиты народа из бывших партизан и местных жителей для обеспечения законности и порядка на только что освобожденной территории Скидельского района. В считанные дни батальон был сформирован, он сыграл важную роль в становлении и укреплении советской власти, в организации мобилизации военнообязанных в ряды Красной Армии, в борьбе с дезертирством и бандитизмом, разоружении групп немецких солдат, оказавшихся в тылу и пробивающихся к линии фронта. Батальон успешно справился с поставленными задачами. При выполнении боевых задач погибли бойцы-истребки батальона Николай Юрченко, Дмитрий Прудникович и Иосиф Клюйко.

В батальон защиты народа Скидельского района входило семь жителей Скиделя, костяком его были призывники 1927 г. рождения, которые в любой момент могли стать солдатами Красной Армии. Командовал батальоном А.Аношин, а затем командование перешло в руки начальника райотдела милиции и его заместителей.

30.05.2008 г. И.А.Борисов

Усяго ж з 1941 г. па 1945 г. загінулі на фронце, у партызанскіх атрадах, у фашысцкіх канцлагерах 50 жыхароў Скідзеля: Аніська І.Р., Быль І.М., Быль М.М., Барысава М.А., Варганаў М.А., Гайко М.Г., Грысюк І.П., Дзяшко М.М., Дзелянкоўскі Р.Г., Дзелянкоўскі І.Г., Дзялюкін І.І., Каскевіч А.А., Лобань В.В., Мажэйка А.А., Мазалеўскі А.К., Мазалеўскі І.К., Мазалеўскі К.П., Маркевіч М.Н., Мартынчук М.Д., Мількамановіч А.А., Мількамановіч С.І., Мількамановіч С.Я., Міхно С.М., Мішук І.Д., Мішук К.А., Мухарскі А.А., Мухарскі І.А., Мухля А.С., Неўгень І.Т., Неўгень В.І., Ролік К.А., Смалкоўскі І.А., Сяўрук А.І., Стачкоўскі Г.І.,

Трусь А.П.,Трусь І.П., Трусь І.Г., Трусь І.М., Фурман П.С., Хмыско Д.Г., Хмыско Р.Ф., Цярэшка С.М., Чабатарэвіч М.А., Чабатарэвіч І.Г., Шань П.Ф., Юрэвіч А.С., Юрэвіч М.С., Юрэвіч С.І., Юрэвіч М.І., Язэпчык І.М. Памяць пра іх свята захоўваецца ў Скідзелі.

## ЗАМЕСТ ЭПІЛОГУ: кароткі нарыс навейшай гісторыі Скідзеля

Вайна прынесла Скідзелю страшэнныя страты. Загінула большасць даваеннага насельніцтва мястэчка, якое ляжала ў руінах. Мноства людей было вывезена на прымусовыя работы ў Германію. Але Скідзель хутка адбудоўваўся, людзі жылі верай у лепшае жыццё, радаваліся таму, што перажылі жахлівую навалу. Вярталіся дадому салдаты, вязні фашысцкіх канцлагераў, вывезеныя фашыстамі ў працоўнае рабства. Пасляваеннае жыццё было вельмі цяжкім, напаўгалодным. У ваколічных лясах доўга яшчэ дзейнічалі антысавецкія ўзброеныя групы, звычайныя банды. Дзейнічала таксама жорсткая рэпрэсіўная сістэма сталінскай улады, ахвярамі якой часта станавіліся невінаватыя ні ў якіх злачынствах людзі. Жорсткімі метадамі праводзілася калектывізацыя прыватных сельскіх гаспадарак. Але людзі пераадольвалі цяжкасці, нястомнай працай адбудоўвалі родны Скідзель. Для моладзі адкрываліся новыя перспектывы вучобы ў Мінску і Гродне, перспектывы набыцця новых прафесій.

Скідзель зноў атрымаў статус раённага цэнтра, цяпер ужо ў складзе Гродзенскай вобласці. Гэты факт адыграў істотную ролю ў яго развіцці ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі. Галоўнай дамінантай гісторыі Скідзеля стала дынамічная індустрыялізацыя, якая прывяла да пераўтварэння напаўаграрнага мястэчка ў важны прамысловы цэнтр Гродзеншчыны.

Імкліва павялічвалася і насельніцтва мястэчка. Паводле дадзеных перапісу 1957 г., першага ў пасляваенныя гады, у Скідзелі налічвалася 4813 жыхароў. Большасць жыхароў складалі беларусы – 3300 (69 %), на другім месцы ішлі рускія – 804 (16,7 %), затым палякі – 379 (7,9 %), украінцы – 184 (3,8 %), яўрэі – 28, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў – 118 (2,45 %). Такім чынам, Скідзель захаваў сваё шматнацыянальнае аблічча, характэрнае для яго на працягу ўсёй гісторыі. Толькі нацыянальная структура насельніцтва вельмі істотна змянілася ў параўнанні з даваеннымі гадамі.

У 1962 г. быў зліквідаваны Скідзельскі раён, а сам Скідзель увайшоў у склад Гродзенскага раёна. Страта статуса раённага цэнтра не затрымала істотна яго развіцця. Адыграла станоўчую ролю блізкая адлегласць да абласнога цэнтра і месцазнаходжанне на важным транспартным шляху Гродна-Мінск, што раней часта служыла прычынай разбурэння Скідзеля ў часы ваеннага ліхалецця. У 1973 г. насельніцтва былога мястэчка (у савецкія часы Скідзель атрымаў назву

пасёлак гарадскога тыпу) складала ўжо 8,6 тыс. жыхароў. А 30 студзеня 1974 г. Скідзель афіцыйна атрымаў прававы статус горада, праўда, аднаго з самых маленькіх у Беларусі. Вялікую ролю ў гэты адыграў тагачасны кіраўнік Скідзеля Павел Архіпавіч Алейнікаў.

Перапіс 1999 г. зафіксаваў колькасць насельніцтва 11,5 тыс. жыхароў. Скідзель моцна змяніў свой выгляд, разросся новымі мікрараёнамі, у горадзе налічваліся 102 вуліцы. На мяжы тысячагоддзяў у Скідзелі дзейнічала звыш дзясятка прамысловых прадпрыемстваў: Адкрытае акцыянернае таварыства "Цукровы завод", ААТ "Масласырзавод", ААТ "Гроднахлебапрадукт", завод медыцынскіх прэпаратаў, ППР "Юбілейны", Дарожнае рамонта-будаўнічае ўпраўленне № 117, пякарня, камбінат будаўнічых матэрыялаў, ААТ "Мэблябудканструкцыя", Прамысловы камбінат абласнога спажывецкага саюза, каўбасны цэх. У горадзе функцыянавалі 3 сярэднія школы, спартыўная і музычная школы, прафесійна-тэхнічнае вучылішча, 5 дзіцячых садкоў, 5 бібліятэк, два дамы культуры, паліклініка і бальніца, 2 аптэкі, ветэрынарная лячэбніца, філіялы Беларусбанка і Аграпрамбанка.

Вялізную ролю ў працэсе індустрыялізацыі Скідзеля адыграла будаўніцтва цукровага камбіната. Яно распачалося ў 1946 г., пасля таго, калі 10 лютага наркам харчовай прамысловасці СССР А.Мікаян падпісаў загад пра пачатак будаўніцтва. Паводле т.зв. рэпарацыі (кампенсацыі з боку Германіі тых стратаў, якія яна нанесла ў часе вайны СССР) з нямецкага горада Рызэнбург у Скідзель перавезлі абсталяванне тамтэйшага цукровага завода. Пад будаўніцтва было выдзелена 412 гектараў зямлі вёсак Лагер, Котра і Пузавічы. Напачатку не хапала матэрыялаў, таму выкарыстоўвалі цэглу з разбураных у часе вайны скідзельскіх будынкаў, даставалі металічныя канструкцыі ўзарваных мастоў і разбітага ваеннага аэрадрома. Спецыялістаў для камбіната рыхтавалі на заводах Расіі, Украіны і Літвы. Першы беларускі цукар быў выраблены 2 сакавіка 1951 г. Паступова каля камбіната сфармаваўся пасёлак, які неўзабаве стаў самым вялікім і сучасным раёнам Скідзеля, была створана неабходная інфраструктура – магазіны, школа, садок, дом культуры і г.д. Першым дырэктарам камбіната быў Міхаіл Цяцерын. З 1967 г. дырэктарам на шмат гадоў стаў Уладзімір Каханоўскі, мясцовы ўраджэнец з вёскі Залясяны. Камбінат увесь час нарошчваў аб'емы вытворчасці, абнаўляў абсталяванне. На сённяшні дзень цукровы камбінат застаецца адным з буйнейшых прадпрыемстваў Скідзеля, якое дае працу і добрыя заробкі значнай частцы яго жыхароў.

Старэйшым прадпрыемствам горада з ліку існуючых на сённяшні дзень з'яўляецца масласырзавод. Яго гісторыя пачынаецца з 1938 г., калі на ўскрайку Скідзеля ў невялікім драўляным будынку арганізавалі збор і перапрацоўку малака. Ужо ў часе вайны ў 1942 г. быў пабудаваны цагляны корпус прадпрыемства, які захаваўся і па сённяшні дзень. А ў 1943 г. завод выпускае першыя прадукты: масла,

тварог, смятану. У савецкія часы масласырзавод шматразова абнаўляўся, закуплялася новае абсталяванне, будаваліся новыя карпусы. Увесь час узрасталі аб'ёмы вытворчасці. Напрыклад, у 1999 г. было выраблена 1053 тоны масла і 669 тон тлустых сыроў. На пачатку 2000-х гадоў завод пачаў пастаўляць сваю прадукцыю за межы Беларусі. Сёння масласырзавад з'яўляецца адным з самых паспяховых прадпрыемстваў Скідзеля.

З 1963 г. адлічвае сваю гісторыю Скідзельскі завод жалезабетонных вырабаў. У 1990-х гадах на заводзе выраблялася больш за 100 відаў прадукцыі. У 1995 г. быў заснаваны мэблевы цэх, пачаўся выпуск мяккай мэблі. У 1980 г. у Скідзелі пачалося будаўніцтва бройлернай птушкафабрыкі, якая стала адным з буйнейшых прадпрыемстваў горада. Разам з фабрыкай паўстаў цэлы рабочы пасёлак з школай і дзіцячым садком. Адным з найноўшых прамысловых прадпрыемстваў Скідзеля стаў завод медыцынскіх прэпаратаў. Гэтае прадпрыемства было пабудаванае ў рамках праграмы дапамогі саюзных дзяржаў раёнам, пацярпеўшым ад Чарнобыльскай катастрофы. Першая чарга завода была здадзеная ў студзені 2001 г. Прадпрыемства выпускае прадукцыю, якая з'яўляецца важнейшым кампанентам дыятычнага харчавання, жыццёва неабходнага для арганізацыі рацыянальнага харчавання. Скідзельскі завод стаў адным з першых прадпрыемстваў на постсавецкай прасторы ў галіне вытворчасці высокаачышчаных амінакіслот.

З чэрвеня 1967 г. пачынаецца біяграфія камбіната хлебапрадуктаў, які на сённяшні дзень стаў буйнейшым прадпрыемствам Скідзеля. Першапачаткова праектная магутнасць складала 200 тон камбінiраваных кармоў для адкорму буйной рагатай жывёлы ў суткі. Цяпер жа камбінат прадукуе да 420 тон 15 відаў камбікармоў у суткі, а таксама да 300 тон мукі.

Прадаўжальнікам аграрных традыцый Скідзельшчыны з'яўляецца калгас "Скідзельскі", які быў утвораны ў 1949 г. у ходзе рэалізацыі палітыкі суцэльнай калектывізацыі Заходняй Беларусі. У наш час да калгаса належаць вёскі Некрашы, Карашава, Белякоўшчына, Бубны, Ахрымаўцы, Пяшчанка, Гліняны, Тарасюкі, Прыступічы, Оснікі. Калгас спецыялізуецца на вытворчасці зерня, бульбы, цукровых буракоў, малочных і мясных прадуктаў. Агульная зямельная плошча складала ў канцы 1990-х гадоў 8758 га, а пасяўныя плошчы – 5790 га.

Няпростыя і супярэчлівыя рэформы 1990-х гадоў усё ж адкрылі магчымасці для рэалізацыі прыватнай эканамічнай ініцыятывы скідзельцаў. Скідзель, як і кожнае старадаўняе беларускае мястэчка, можа пахваліцца багацейшымі традыцыямі ў развіцці сярэдняга і дробнага прадпрымальніцтва. І многія скідзельцы адважыліся на адкрыццё сваёй справы, ствараючы гандлёвыя і абслугоўваючы фірмы, альбо працуючы ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў. У 1990-х

гадах прыватная сфера эканомікі пачала адыгрываць істотную ролю ў жыцці горада.

Такім чынам, у другой палове XX ст. Скідзель пераўтвараецца з пераважна аграрнага традыцыйнага мястэчка ў важны індустрыяльны цэнтар Гродзенскага раёна, аднаго з найбольш эканамічна развітых у Беларусі. Сённяшнія скідзельцы на пачатку 3-го тысячагоддзя ўжо выразна адчуваюць праявы надыходу постсучаснай інфармацыйнай эпохі. Моладзь не ўяўляе сабе жыцця без інтэрнэту, лічбавага тэлебачання і мабільнай сувязі. Змены адбываюцца так хутка, што ў сучаснага чалавека ўзмацняецца імкненне знайсці трывалы падмурак для самаўсведамлення ў гэтым дынамічным свеце. І такім падмуркам становіцца гісторыя, і ў вельмі вялікай ступені якраз гісторыя сваёй малой радзімы. Пазнаючы яе кожны чалавек усведамляе тую здавалася б простую ісціну, што ён удзельнік вялікага творчага праекта жыцця, змагання і стваральнай працы і цяпер нясе на сябе цяжар адказнасці перад тымі, хто жыў да яго на гэтай зямлі, і перад тымі, хто яшчэ будзе жыць і вучыцца на яго поспехах і памылках.

*Дадатак 1*

## Край паэтаў

Ціхі, спакойны, зялёны гарадок на сутоку невялікіх рэчак Скідлянкі і Спушанкі. Для мяне ён асабліва дарагі – гэта мая радзіма. Помнячы, добра ведаючы яго яшчэ даваенным, пазнаючы яго па архіўных крыніцах, па літаратуры, ведаючы многіх землякоў, расказы старажылаў, я з цягам часу ўявіў яго жыццё на працягу паўтысячагоддзя. Найбольш грамадска актыўным, змагарным яно было ў канцы 19 – на пачатку 20 стагоддзяў. Гэта натуральна: менавіта тады пачала абуджацца нацыянальная свядомасць беларускага народа. На Скідзельшчыне і ў самім Скідзелі таксама.

Скідзельскі край – вельмі прыгожы. Прырода надзяліла яго непаўторнай красой. Нёман, Котра, Пыранка, Скідлянка, Спушанка, азёры, лясы, дубровы, бары... На Скідзельскай раўніне, на ўрадлівай глебе, здаўна пасяліліся людзі, выраслі паселішчы. Яны цягнуліся да мястэчка Скідзеля, з якім былі звязаныя эканамічна, культурна і духоўна.

На Скідзельшчыне адбылося шмат важных, значных падзей. Яна дала шмат знакамітых людзей, якія ўнеслі важкі ўклад у нацыянальнае адраджэнне беларусаў, развіццё беларускай культуры – пісьменнікаў, тэатральных дзеячаў, мастакоў...

**Эліза Ажэшка** нарадзілася ў маёнтку Мількаўшчына непадалёку ад Скідзеля. Дзявочае прозвішча яе Паўлоўская. Гэтае прозвішча сустракаецца таксама сярод карэнных жыхароў Скідзеля. У Гродне нарадзіўся вядомы военачальнік генерал-палкоўнік Мікалай Паўлоўскі, які таксама меў скідзельскія карані. У часе паўстання 1863 г. Эліза Ажэшка падтрымлівала сувязі з паўстанцамі. Яе мужа за ўдзел у паўстанні выслалі ў Сібір, а маёмасць канфіскавалі.

Хаця Э.Ажэшка пісала на польскай мове, уплыў на яе творы беларускага народнага жыцця відавочны. Яна часта бывала ў наднёманскіх вёсках, гасцявала ў сваіх сяброў і знаёмых, яе творчасць прасякнута гуманізмам, спагадай да чалавека працы. Месца дзеяння лепшага рамана выдатнай пісьменніцы “Над Нёманам” – вёска Багатырэвічы на Скідзельшчыне. Пра яе жыхароў Э.Ажэшка напісала: “Гэта быў народ пакрыты загарам, багата абмыты потам, з агрубелай скурай твару і рук, але затое ў гэтых людзей прамая спіна, якая ні перад кім не гнулася і, нягледзячы на вузкі кругагляд, праніклівы і смелы погляд”. У рамане ўслаўляецца праца хлебароба, асабліва ў цудоўнай легендзе пра ўзнікненне вёскі Багатырэвічы.

Эліза Ажэшка на ўсё жыццё засталася верная ідэям паўстання 1863 г. Яна падтрымлівала сувязь з многімі рэвалюцыйнымі дзеячамі. Сябравала з Францішкам Багушэвічам. Апошні зборнік навэлаў пісьменніцы “Gloria vietis” прысвечаны падзеям паўстання 1863 г.

Для мяне **Міхась Васілёк** – паэт асаблівы. Нічыя творчасць так не спалучаецца з маёй роднай Скідзельшчынай. У многіх вершах паэта бачу я дарагія мне пейзажы, рэальных людзей, сапраўдныя падзеі, пра якія ён сам мне расказваў. Яшчэ з дзяцінства помняцца мне сямейныя вечары паэзіі ў дзедавай хаце; першая сустрэча з “жывым” паэтам у яго вёсачцы Баброўні за сем кіламетраў ад Скідзеля: ездзіў да яго паказаць свае першыя вершы; сустрэча Новага, 1951 года ў нашай хаце. Не буду тут падрабязна апісываць іх, бо пра гэта напісана ўжо ў маёй кнізе “Сяброўствы. Знаёмствы. Сустрэчы.”

Нарадзіўся Міхасць Васілёк у 1905 г., памёр у 1960 г.. Вярнуўшыся з сям'ёй з бежанства ў 1922 г. актыўна ўключыўся ў змаганне за ўз’яднанне беларусаў у адзінай дзяржаве. За рэвалюцыйную дзейнасць польскія ўлады арыштоўвалі яго, канфіскавалі яго першы зборнік вершаў “Шум баравы”. Друкаваўся Васілёк у беларускіх выданнях у Вільні. Вершы яго былі вельмі папулярныя ў Заходняй Беларусі. У 1939 г. мабілізаваны ў польскую армію, удзельнічаў у баях з гітлераўцамі, трапіў у палон. У жніўні ўцёк з палону, падтрымліваў сувязь з партызанамі, быў сакратаром Скідзельскага падпольнага антыфашысцкага камітэта.

Міхась Васілёк перш за ўсё паэт-змагар. Чалавек, які прысвяціў сябе адной запаветнай мары – вызваленню Заходняй Беларусі. Народны рух за ажыццяўленне гэтай мэты быў шырокі, масавы, магутны. Васілёк ішоў у першых шэрагах барацьбітоў.

*Мы барацьбой гарым, мы – сіла.*
*У нас жыве бунтарны дух.*
*На барыкады пойдзем смела,*
*Далоў ярмо, прыгон-ланцуг*

Гэты верш “У бой на акупанта” стаў песняй, яе спявалі паўсюдна, з ёй сапраўды ішлі на барыкады. Паэт верыў, што народ пераможа, дасягне сваёй мэты.

*Не пацяшайцеся, панове,*
*Што нас вы ў путы закулі.*
*Здабудзем мы сваёй крывёю*
*Свабоду роднае зямлі*

Вось такая бунтарная паэзія, народжаная прагай народнага шчасця, скідзельскай зямлёй, моцнай любоўю да яе. А даспелі паэтычныя радкі ў сэрцы паэта.

Шмат вершаў прысвечана прыродзе, мясцінам, да якіх прыкіпеў душой. Паэт радаваўся песні жаўрука, звону ручая, красе бору, рэчкі Котры, возера Можнева, кожнай пары года.

Вясна ў паэта асацыіруецца з надзеяй на светлы лёс. На лепшую долю. Да гэтага вобраза ён вяртаўся ня раз. І наогул, прырода ў Васілька цесна спалучаная з яго роздумам, з назіраннямі над жыццём. Вось хаця б у гэтай невялічкай сцэнцы:

*Падкраўшыся разорамі*
*З палёў, дзе была схована,*
*Сыпнула ночка зорамі,*
*Як з рэшата вясковага.*

*Пустую грыву звесіла,*
*К старэнькім хатам туліцца*
*Ды песню з ветрам весела*
*Прысвіснула на вуліцы*

*І вечарына хмеліцца –*
*Сабраліся ўсе родныя:*
*Мароз, сцягі, мяцеліца*
*Ды злыбеда галодная*

У жыцці паэту не шанцавала. Памерла жонка. За вершы яго цягалі па пастарунках, здзекваліся, забіралі рукапісы. Але Міхась Васілёк не здаваўся. Ён быў актывістам Таварыства беларускай школы, уступіў у КПЗБ, актыўна ўдзельнічаў у грамадскім руху за ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Аднак памятнага верасня 1939 г. на радзіме не сустрэў. У гітлераўскім палоне пісаў:

*Эх, дзе вы, дзе, любімыя прасторы,*
*Па вас душой сумую сёння я…*
*Гараць агнём баварскай ночы зоры,*
*Але мой боль грудзей ім не суняць*

*У ціхім небе месяц зажурыўся,*
*Стаю з задумай горкаю да слёз…*
*А за калючым дротам гор абрысы,*
*Сады брыльянтамі ўбраў мароз.*

Душа паэта не вытрымала: уцёк ён з палону. У час акупацыі друкаваў вершы ў газеце падпольнага абкама партыі пад псеўданімам Язэп Гром. У 1942 г. заклікаў:

*Браты, дарагія, за зброю!*

*Ўзнімайце на катаў нажы!*
*Мы іхняй крывёй іх напоім,*
*Навучым, як трэба, чужых!*

У савецкі час выдадзена пяць кніг Міхася Васілька. Многія пасляваенныя вершы пазбаўлены той лірычнасці, чуласці, якая была ў паэта раней. Яго паэзію, як і іншых яго калег з усіх савецкіх прастораў крануў налёт сталіншчыны, якая патрабавала апяваць яе. Але ў вершах аб прыродзе ён заставаўся ранейшым Васільком. А з якой тугой выказаныя пачуцці ў вершы “Мы не забудзем іх імён”.

*Зрывае вецер жоўты ліст,*
*Над пусткаю галосіць,*
*Да сонца нівы, як калісь,*
*Не шапацяць калоссі.*

*Замоўк птушыны звонкі хор,*
*Адно паміж сасонкаў,*
*Панурым крыкам кліча ў бор*
*Глухую восень сойка.*

*Ляжыць імшарамі мая*
*Далёкая дарога,*
*Па ёй хадзіў калісці я*
*У падполлі з асцярогай.*

Прыязджаючы на радзіму, я заўсёды бываю у мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю Міхася Васілька. У Скідзелі, як гаворыцца, яго памятае кожны камень, тут сустракаў нямала людзей, якія ведалі яго, сябравалі з ім. Марыя Якаўлеўна Мазалеўская, мая цётка – сястра паэта Пятра Сяўрука, прыгадвала свайго брата, расказвала, як хадзіла з ім у Баброўню да Васілька, як той пасля спектакля самадзейных артыстаў у вясковай адрыне чытаў, босы, свае вершы. Анатоль Мышко расказваў, як быў у нямецкім палоне, як з Васільком і Янкам Брылём разам уцякалі з яго.

А ў гэтым доме размяшчалася рэдакцыя раённай газеты, у якой ў 1944-1946 гг. працаваў Васілёк. Рэдактар газеты Ф.Ганчар таксама згадваў Міхася Восіпавіча. А ў гэтым састарэлым будынку – тады доме культуры – Васілёк сустракаўся са сваімі землякамі. Пра гэта расказаў пісьменнік Аляксей Карпюк, які таксама быў запрошаны на сустрэчу. Сабралася шмат народу, зала была біткком набітая, стаялі і каля клуба. Старшыня райвыканкама першым даў слова А.Карпюку. Не паспеў ён дайсці да трыбуны, як у зале закрычалі: “А мы прыехалі не яго слухаць!”, “Васілька нам давай!”, “Сам гэтага слухай!”. Старшыня спрабаваў

супакоіць людзей: “Наш паважаны Міхась Васілёк выступіць потым, пацярпіце. А пакуль паслухайце вы...”

Гэтым ён выклікаў яшчэ большую буру незадаволенасці. Цяпер у рух увайшла ўся зала. Людзі паўскоквалі з месцаў, замахалі рукамі, зараўлі:

- Васілька! Міхася нашага!
- І няхай пачытае “Як я пана перанёс”!
- І “Эх гарэліца мая, што ты вычаўпляеш”!
- І “Век дваццаты, век харошы...”

Як з гумарам успамінаў Аляксей Нічыпаравіч: “Пакуль людзі так крычалі, я ўжо зусім апрытомнеў і непрыкметна зыйшоў з трыбуны. А яшчэ я па-харошаму пазайздросці Паэту. Гэты чалавек упэўнена можа сказаць, што жыў на свеце недарма”.

Міхась Васілёк бываў у многіх дамах скідлян. Ведаў іх жыццё. Назіральны, схільны да гумару, ён прыкмячаў і станоўчае ў жыцці, і адмоўнае, нярэдка ў смяшлівым выглядзе, як у вершы “Эх, каб грошы...”

*Пан, бач, смачна з’есці хоча.*
*Ты ж глядзіш: жывот аж квокча!*
*Хоць і змамзіў бульбы з кошык...*
*А каб грошы... эх, каб грошы!*
*Закупіў бы рыбы, мяса,*
*Кіло кракаўскай каўбасы,*
*Хлеба белага з паўторбы*
*І дальбог, адзін упёр бы!*

Ужо ў гэтым урывачку тонка, з гумарком, у народных выразах паказана сацыяльная няроўнасць, розніца паміж беднымі і багатымі. А падштурхнуў Міхася Васілька, як расказаў ён мне, сапраўдны факт. Ён ішоў з Баброўні ў Скідзель, пры заходзе на першую скідзельскую вуліцу справа (калісці на гэтым месцы стаяла цырульня) на ганку свайго багатага дома сядзеў пузаты чалавек і смачна снедаў. “А ў мяне, – расказваў Міхась Васілёк, – у страўніку было пуста, а ў кішэні ні грошыка. Так і нарадзіўся верш”.

Па гэтай вуліцы ён шмат хадзіў – і з Баброўні, і ў Баброўню. А далей праз рынкавую плошчу, каля старадаўняга княжацкага парка (злева) і гарбатага маста (справа), міма Дубровы – маляўнічага ляска, возера Можнева... Пра яго М.Васілёк напісаў шчыры верш

*Дрэмлюць люстраныя воды,*
*Спіць па-над возерам бор.*
*Тояць затокі і тоні*
*Тайну глыбокую зор...*

*Спяць векавечныя хвоі,*
*Цёмнае возера спіць,*
*Толькі ў дуброве часамі*
*Дзіка сава пракрычыць.*

*Потым ізноў супакоем*
*Дыхае сонны імшар.*
*Сэрца ў грудзях замірае,*
*П’е асалоду душа*

Чытаючы сёння Міхала Васілька, магу сказаць яго словамі, словамі майго старэйшага сябра і настаўніка на літаратурнай ніве, што мая душа п’е асолоду ад яго творчасці.

Не забываюць паэта яго землякі. У Скідзелі ў СПТВ-199 створаны музей Міхася Васілька. Шмат папрацавалі над яго стварэннем выкладчыкі вучылішча, асабліва завуч – пляменнік Міхала Восіпавіча Георгій Касцевіч (мой аднакласнік) і Валянціна Касьян, якія, на жаль, рана памерлі. Іх справу прадоўжыла Алена Салей. Сабраны цікавыя экспанаты і пра Васілька, і пра іншых пісьменнікаў Скідзельшчыны. За два дзесяцігоддзі музей наведалі дзясяткі тысяч чалавек.

Цяжкі лёс выпаў на долю **Пятра Сяўрука**. Янка Брыль у прадмове да яго вялікай падборкі вершаў у часопісе “Полымя” (№ 10, 1986 г.) пісаў:

“Пачатак Сяўруковай біяграфіі вельмі падобны да пачатку жыццяпісу другога заходнебеларускага паэта – Міхася Васілька. Аднагодкі, землякі, а потым сябры, яны з пачатку першай сусветнай вайны з роднай Скідзельшчыны выехалі ў бежанства на ўсход... Васілёк у Казлове, Сяўрук у Ліпецку... вучыліся ў школе, многа чыталі, пачыналі пісаць, а прывезеныя бацькамі на радзіму, апынуліся ў іншай сапраўднасці –у беднасці і цемры паднявольнага жыцця: Міхась у сваёй лясной Баброўні, паблізу Скідзеля, а Пятрусь у сваім гарадку.

Падабенства юнацкі лёсаў, іх паэтычных душ, працягвалася. Разбуджаная савецкай школай, скарбамі рускай і сусветнай класікі прага святла, пакутлівы неспакой, пошукі вернага шляху – з гэтым яны ўваходзілі ў сваю нялёгкую маладосць. Сяўрук захоплены Львом Талстым, сарамлівы, схільны да ціхага роздуму; Васілёк – таварыскі, дасціпны, звязаны з рэвалюцыйным падполлем. Такімі яны пазнаёміліся, пасябравалі ў гады стотысячнай Грамады і ТБШ, разам прымалі актыўны ўдзел у справе народнага адраджэння”.

Нарадзіўся Пётр Сяўрук ў ліпені 1905 г. Хата яго бацькі Якуба Сяўрука і сёння стаіць на вуліцы 17 верасня. У ёй знаходзілася бібліятэка скідзельскага гуртка ТБШ, які ўзначальваў Пётр, ёй карысталіся многія гурткоўцы са Скідзеля і суседніх вёсак. Тут яны збіраліся на сходы, вырашалі свае пытанні. У маёй маці – сястры Пятра – захаваўся фотаздымак сяброў гуртка 1927 г. Амаль усіх я памятаю –

усе яны пражылі прыстойна, ніхто не здрадзіў той справе, за якую яны змагаліся. І сёння Пятру не было б сорамна за іх.

Я прачытаў дзённікі, артыкулы, вершы свайго дзядзькі. Мне шмат расказвалі пра яго сваякі, перш за ўсё яго сястра Марыя Якаўлеўна, крыху маладзейшая за яго, якая захавала спадчыну Пятра праз дзесяцігоддзі. У мяне склаўся вобраз чалавека высокай маральнасці, прынцыповага, справядлівага, чэснага. Вось запіс з дзённіка Пятра, тады кіраўніка Гродзенскай павятовай арганізацыі ТБШ, зроблены ў 1927 г.:

“Я люблю свой народ настолькі, што не магу дапусціць і апраўдаць ніякага зла ў імя яго інтарэсаў... Нейкая стыхійная, нацыянальная грамадская адказнасць, я ўсведамляю, ляжыць на мне, і трэба было быць гатовым несці яе... Калі несправядлівасць творыцца над народам, то неабходна пакутаваць за яго”.

Менавіта так пражыў свой кароткі век гэты малады чалавек, якому лёс адмераў усяго 24 гады. Такім ён дайшоў да нас у напісаным ім – дзённіках, артыкулах, нататках, вершах, перапісцы з многімі вядомымі людзмі свайго часу. Творы яго друкаваліся ў перыядычных выданнях, у зборніках “Ростані волі”, “Шляхам гадоў”, пра яго расказана ў шэрагу нарысаў. Гісторык з Гродна Валеры Чарапіца ў кнізе “Счастье жить для других” падрабязна расказаў пра Пятра Сяўрука. Нядаўна выйшаў з друку зборнік твораў скідзельскага пісьменніка “Небыцця не існуе”.

З Баброўні родам яшчэ адзін паэт – **Макар Краўцоў** (сапраўднае прозвішча – Касцевіч). Паходзіў ён з заможнай сям'і, скончыў царкоўна-прыходскую школу ў Галавачах, Свіслацкую настаўніцкую семінарыю. Працаваў народным настаўнікам, а ў часе першай сусветнай быў на фронце, меў званне прапаршчыка. Пасля вайны пасяліўся ў Вільні, ажаніўся.

Макар Краўцоў далучыўся да беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Яго вершы прасякнуты ідэяй нацыянальнага адраджэння. А “Ваяцкі гімн” стаў надзвычай папулярны, асабліва сярод моладзі.

*Мы выйдзем шчыльнымі радамі*
*На вольны родны свой прастор.*
*Хай воля вечна будзе з намі,*
*А гвалту мы дамо адпор.*

Верш энергічны, у духу таго бунтарска-узнёслага настрою маладых беларусаў, якія імкнуліся да аб’яднання сваёй краіны. І разам з тым рашуча-упэўнены.

*Браты, да шчасця мы падходзім,*
*Хай гром грыміць яшчэ мацней,*

*Ў крывавых муках мы народзім*
*Жыццё Бацькоўшчыны сваей!*

Імя Макара Краўцова доўга замоўчвалася. Трагічны лёс яго быў прадвызначаны культам асобы Сталіна. Калі ў верасні 1939 г. Чырвоная армія прыйшла ў Заходнюю Беларусь, Макара Краўцова неўзабаве арыштавалі, і ён знік, надоўга. Як сведчыць у кнізе “Памяць. Гродзенскі раён.” Апанас Цыхун, “цень падазронасці лёг і на блізкіх паэту людзей. У тым ліку і на брата Бенядзікта, які працаваў настаўнікам Карашаўскай пачатковай школы, яму далі 25 гадоў турмы”.

А ў раздзеле той кнігі “Вернутыя імёны” сказана: “У катавальнях НКУС загінулі ўраджэнцы Гродзеншчыны паэт Макар Краўцоў... Чалавек, які сядзеў у Беластоку разам з Макарам Мацвеевічам, расказаў, што Макар Краўцоў не вытрымаў катаванняў, памёр”.

Пасля вайны прыходзіць у літаратуру новае пакаленне скідзельцаў. Маладыя пісьменнікі ішлі ад жыцця, ад бачанага і перажытага імі. **Аўгінню Кавалюк** з вёскі Стральцы (1934 г.н.) вайна яшчэ прыхапіла. Уражанні ад яе засталіся вельмі моцныя. І не выпадкова ў яе вершах тэма вайны і міру не другарадная. Найбольш значны яе твор – паэма “Дзедаўшчына”. Пад гэтым словам паэтка разумее зямлю дзядоў, якая засталася нам у спадчыну. Вось на гэтай зямлі і разгортваюцца падзеі пераломнага часу ў заходнебеларускай вёсцы, бачаныя і перажытыя Аўгінняй Трафімаўнай у дзіцячыя і маладыя гады. Тады і ў яе вёсцы ламаўся стары лад – ствараліся калгасы, мяняліся погляды на людзей, на сучаснасць, фарміраваліся іншыя жыццёвыя прынцыпы. У людзей, якія вякамі жылі на сваіх гаспадарках, якія ў час вайны зведалі гэтулькі нягодаў, кардынальна змяняўся звыклы ўклад жыцця.

Вось пра гэта і гаворыцца ў паэме Аўгінні Кавалюк. Яна паказала, як нялёгка ўсе гэта давалася сялянам. Героі паэмы, безумоўна, вядомыя Аўгінні аднавяскоўцы, яшчэ не забыўшы ваенныя страты, зноў апынуліся ў складаным становішчы. Мне вельмі блізкая сутнасць твора, паколькі і я сам перажываў падобнае ў родным Скідзелі. А дакументальнасць падзей, асэнсаваная з дапамогай мастацкіх сродкаў, відавочная. Нават геаграфічныя назвы захаваныя: Гліняны, Скідзель, поле астрынскае з “помнікам сівым”.

Натуральна, што вялікія змены ў палітычным і гаспадарчым жыцці паставілі і новыя маральныя патрабаванні. Выраслі новыя пакаленні. У іх было ўжо іншае стаўленне да матэрыяльных і духоўных патрэб. Усё гэта знаходзіць адлюстраванне ў літаратуры. У тым ліку і ў скідзельскіх літаратараў.

Аўгінню Кавалюк хвалюе лёс сваёй радзімы і яе народа. Яна турбуецца не толькі за сённяшні дзень, яна думае і пра будучыню. У вершы “Наказ сыну”:

*Вазьмі ў сваё сэрца на схову*

*Дрымоту маўклівых ракіт,*
*І поле, і луг каляровы,*
*І родны блакіт.*
*Вазьмі ў свае сэрца на схову*
*Адзінай Айчыны сцягі*
*І словы купалаўскай мовы*
*Як спадчыны скраб дарагі*

Пасля заканчэння Гродзенскага педінстытута Аўгіння Кавалюк жыла ў Рызе, цяпер у Пецярбурзе. Нямала вершаў прысвяціла суседнім краінам, іх людзям, прыгажосці. Аднак:

*Радзіма, блакітная кветка мая,*
*Да скону з табою зраднілася я.*
*Ты думка мая і сон.*
*Пад роднымі шатамі крон*
*П'ю радасць імклівых рэк…*
*З табою зродненая навек.*

Скідзельскую дзесяцігодку закончыў **Валянцін Блакіт**. Працаваў у рэдакцыях шчучынскай, жалудоцкай, воранаўскай раённых газет. У 1966 г. завочна скончыў аддзяленне журналістыкі БДУ, затым працаваў у Гродзенскім абкаме партыі, у ЦК КПБ, быў рэдактарам часопіса "Вожык". Журналістыцы Валянцін аддаў сорак год. Яна абагаціла яго ведамі жыцця, людзей. Свае погляды, назіранні выказваў у нарысах, апавяданнях, аповесцях. Выдаў кніжкі аповесцяў "Час прылёту журавоў", "Шануй імя сваё", "Усмешка фартуны", гумарыстычныя апавяданні і іншае. Асноўныя тэмы творчасці Блакіта – праблемы маралі, узаемаадносін людзей, жыццё вёскі.

У Скідзелі ў 1959 г. нарадзіўся **Алесь Чобат**. Ён мой сусед, нашы бацькоўскія хаты ўсяго праз некалькі дамоў адна ад другой. Я добра ведаю яго бацькоў, а вось з ім, як ні дзіўна, так і не знаёмы асабіста. Вышэйшую адукацыю Алесь атрымаў у Беларускім тэхналагічным інстытуце, працаваў на прадпрыемствах Гродна, у тым ліку інжынерам на ВА "Азот", у кааперытыве "ЭлТА". Паспытаў журналісцкага хлеба ў "Гродзенскай праўдзе", быў навуковым супрацоўнікам музея Максіма Багдановіча.

Безумоўна, я чытаў тое, што мне траплялася з напісанага ім у перыядычным друку, у тым ліку ў штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва". Падабаўся малады задор у яго нарысах і вершах, яршыстасць. Ён адкрыта выказваў свае погляды, часам даволі рэзка і арыгінальна, асабліва ў сатырычных вершах. Выдаў кнігі вершаў "Год", "Новая Галілея", "Маўзалей", у сааўтарстве з Данутай Бічэль "Ты не самотна", "Крэсавякі" і іншыя.

Дзесяцігодку ў Скідзелі скончыў **Іван Пяшко**. Празаік, публіцыст, журналіст. Меў некалькі прафесій, якія набыў у тэхнічным вучылішчы № 7 у Гродне, на гістфаку Гродзенскага педінстытута, які скончыў у 1967 г., на сцэнарным аддзяленні Вышэйшых курсаў сцэнарыстаў і рэжысёраў у Маскве. Працаваў электрыкам, настаўнікам, лектарам, сакратаром парткама ў шчучынскім саўгасе “Пратасаўшчына”, намеснікам рэдактара шчучынскай райгазеты. У гэтай жа газеце “Савецкая вёска” пачаў друкаваць празаічныя творы. Выдаў кніжкі прозы “Чырвоная клубніка”, “Марго з Казарэзаў”, аповесць “Сцэнарый сямідзесятых”.

**Уладзімір Шурпа** нарадзіўся ў вёсцы Саволеўка, скончыў сямігодку ў Абухаве. Працаваў механізатарам у Скідзельскай МТС, на цукровым заводзе электрыкам. І вучыўся ў сярэдняй школе ў Скідзелі завочна. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Гродзенскім педінстытуце, працаваў педагогам, дырэктарам школ у Іўеўскім і Гродзенскім раёнах. З 1974 г. – журналіст абласнога радыё. Памёр у 1998 г., пакінуўшы кнігу лірыкі “Переразвон адліг”. Сааўтар некалькіх калектыўных зборнікаў, публікаваў апавяданні.

Аднойчы прапанавалі мне паехаць з групай супрацоўнікаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры на Скідзельшчыну.

– Ты ведаеш, – сказаў мне Міхал Пратасевіч, супрацоўнік музея, мой аднакурснік па БДУ, – і пісьменнікаў, і мясціны. Вось і паможаш.

Тады сустрэліся яны з Аляксеем Карпюком, Данутай Бічэль, з іншымі. А мы з Міхалам падаліся ў Скідзель. Ён запісаў на плёнку ўспаміны пра Пятра Сяўрука яго сястры Марыі Якаўлеўны і брата Міхаіла Якаўлевіча. З’ездзілі ў Баброўню да сястры Міхася Васілька Глафіры. Пабылі ў Бандарах у **Фаіны Самойла**, дваюраднай сястры Міхася Васілька. Вершы яе друкаваліся ў “ЛІМе”, у “Гродзенскай Праўдзе”. Фаіна Ігнатаўна парадавала цікавымі ўспамінамі пра свайго дзядзьку, тое-сёе расказала пра Макара Краўцова. Пачытала свае вершы. Пасля я даведаўся, што і дачка Фаіны пісала вершы. Яны нават выдалі калектыўны зборнік – творы маці і дачкі.

Расказ пра Скідзельшчыну літаратурную, безумоўна, не можа быць поўным без **Сяргея Крыўца** – паэта ў многім арыгінальнага і чалавека адметнага. Яго радзіма – хутар каля вялікай вёскі Дубна на беразе Нёмана. Прыгожыя мясціны чаравалі ўважлівага хлопца. Уплывалі на яго лёс і ўспаміны аднавяскоўцаў пра рэвалюцыю, грамадзянскую вайну. Ды і ў самога Сяргея засталося нямала ў памяці пра тыя гады. У 1915 г. гнаная вайной яго сям’я і ён дванаццацігадовы апынуліся ў бежанстве ў Саратаўскай губерні. Там дасталося ад неўпарадкаванасці ваенна-рэвалюцыйнага часу. Сяргей і яго брат раслі без бацькі, маці даводзілася перабівацца часовымі заробкамі.

Вярнуліся на радзіму ў 1921 г. На Сяргея моцна паўплываў дзед. Ён навучыў шасцігадовага ўнука чытаць па-беларуску, а таксама па-руску і старaславянску. Гэта пасля дужа яму прыдалося. Пасля вяртання

з бежанства жылі на кватэры, гаспадар яе выкінуў сваю бібліятэку, а Сяргей падабраў яе. Начытаўшыся рэлігійных кніг ён падаўся ў Жыровіцкі манастыр. Аднак жыццё ў манастыры не задаволіла юнака, і ён пакінуў Жыровічы.

Зноў пачаў батрачыць, зноў заняўся самаадукацыяй. У 1925 г. яго выбралі сакратаром гуртка ТБШ. Пачаў пісаць вершы, некаторыя друкаваліся ў беларускім часопісе для дзяцей "Заранка". Надумаў падацца ў Савецкую Беларусь, але яго затрымалі на мяжы. Можна лічыць, што Сяргею пашанцавала: ён мог скласці галаву ў Курапатах, як і многія яго землякі, якім удалося перабрацца праз мяжу.

У Дубне Сяргей сталярнічаў. Шмат чытаў – класікі, перыядычных выданняў. Добра вывучыўшы рускую і польскую мовы, узяўся за нямецкую. У яго ёсць вершы, напісаныя на гэтых мовах.

Чым больш Сяргей пазнаваў жыццё, тым больш расла незадаволенасць ім. У пошуку лепшага пераехаў у Гродна, пасля ў Беласток. Працаваў, пісаў, удзельнічаў у рэвалюцыйным руху, за што сядзеў у турме.

Такія вось штрыхі біяграфіі С.Крыўца. Пра яго расказаў Рыгор Шырма, які дружыў з паэтам, напісаў прадмову да яго кнігі "Дубок", што пабачыла свет ў 1972 г. Працяг біяграфіі паэта ў яго вершах. У іх – яго думкі, яго пачуцці, назіранні, яго жыццёвая філасофія. Яны фарміраваліся перш за ўсё пад уздзеяннем навакольнага. А яно было далёка не радасным.

*Чаму ж загналі нас у тупік?*
*Чаму закрылі вокны, дзверы?*

Яму не па нутру мяшчанскае балота. Ён абураецца: хіба можна мірыцца з пагібеллю? Кожны чалавек павінен усвядоміць сваё месца ў гэтым свеце, бо нават самая малая кропля ў вадаспадзе стварае пэўны рух.

*А мы… а мы жывыя людзі!*
*Мы – фокус бачымых міроў,*
*У нас ёсць розум, ў нашых грудзях*
*Кіпіць збунтованая кроў.*
*Навошта мы тады марудзім?*
*Загінуць так, як тая свечка,*
*Накрыта цёмным каўпаком,*
*На свет радзіцца батраком,*
*А кончыць подлым чалавечкам, –*
*Хай трахне гром такую долю!*
*Тады зусім не варта жыць.*

Толькі ў барацьбе бачыць паэт сэнс жыцця, у пераўтварэнні рэальнасці, якая прынясла яму і яго народу гэтульні пакуты.

*Няма закону быць рабамі!*
*Мы ведаем закон жыцця:*
*Ратуй жыццё сваё зубамі,*
*Калі не змог ужо рукамі,*
*За волю біся да канца.*
*За міг адзіны людской волі*
*Аддай няволі сто гадоў...*

Такая думка праходзіць праз усю творчасць Сяргея Крыўца. Ён дзіця свайго часу, часу барацьбы. Народныя масы Заходняй Беларусі стварылі такія буйныя сілы супраць прыгнёту, як Грамада, ТБШ, КПЗБ. Забастоўкі, барыкады, мітынгі, маёўкі, лістоўкі, распаўсюджванне роднай мовы – гэтыя і іншыя метады барацьбы выкрыстоўваліся актыўна, удзельнічаў у ёй і нядаўні селянін, які стаў у Беластоку пралетарыем.

Апынуўшыся ў новым для сябе сацыяльным асяроддзі, С.Крывец даволі глыбока пазнаў яго, стаў адным з першых беларускіх пралетарскіх паэтаў. Ён пратэставаў супраць сацыяльнай несправядлівасці, эксплуатацыі народа. Характэрныя ў гэтых адносінах вершы “Другім будуеш камяніцы”, “Піліпу Кізевічу. Урывак з паэмы”. Як клятва гучаць апошнія радкі яго:

*Пакуль ў грудзёх бруіцца кроў,*
*Не разлучуся я з народам.*

Сяргея Крыўца хвалявалі пытанні маралі, этыкі. Ён грэбліва піша пра здраднікаў. У той жа час ён славіць дабрыню, таварыскасць, дружбу. Крывец ганарыцца лепшымі рысамі беларускага народа. Паэту імпануюць такія якасці беларусаў, як гумар, дасціпнасць, любоў да песні. Ён шырока выкарыстоўваў матывы народнай творчасці, легенды, прыказкі, прымаўкі, дасціпныя выразы.

Сяргей Крывец дачакаўся свабоды, за якую змагаўся, у верасні 1939 г. На гэтую падзею адкукнуўся вершам “Упалі путы”. Паступіў у педагагічны інстытут. Вершы яго напоўнены радасцю жыцця. Ды яе адабрала вайна, якая:

*Саранчою апала зялёнаю.*
*Застагналі палі пад калёсамі,*
*Задрыжала зямля пад ударамі,*
*Узвіліся дымы пад нябёсамі,*
*Старана засвяціла пажарамі.*

Паэт перажыў гады акупацыі, бачыў, што прынёс на нашу зямлю фашызм, расказаў пра гэта ў вершах. У 1944 г., калі Беласток быў

вызвалены, пайшоў на фронт. У красавіку наступнага года, незадоўга да Перамогі, загінуў каля Гдыні. Рыгор Шырма сказаў пра яго: “Сяргей Крывец ведаў літаратуру і любіў яе. Прыемна было весці з ім бяседы на літаратурныя тэмы, чытаць жывыя, востра сатырычныя яго апавяданні... Гэты рабочы з асветай за два класы пачатковай школы меў багатую літаратурную эрудыцыю... Яснагучная ліра Крыўца прайшла знаёмыя заходнебеларускім паэтам этапныя шляхі “ад астрога да астрога” і абарвалася ціхім звонам у полымі ваеннага пажару, аставіўшы ў спадчыну нам вялікую любоў да народа...”

Многія беларускія пісьменнікі маюць пэўнае дачыненне да Скідзельшчыны. У старонках “Да творчай біяграфіі” **Янка Брыль** напісаў: “Калісці, у 1935-м ці 1936-м я паслаў свае лепшыя вершы Даніле і цяпер разумею, колькі прычыніў яму гэтым турбот. А ў яго, інтэлігентнага хлопца, хапіла такту. Мусіць, робячы печ ці пліту, абдумваў, што мне напісаць у адказ. І напісаў, што любіць вершы Багдановіча, перапісаў мне сваім цвёрдым почыркам “Ведай, брат малады”, “Рушымся, брацці, хутчэй!” і яшчэ, здаецца, нешта, а таксама параіў перачытаць Лермантава “Не верь себе”. У спасылцы да гэтай нататкі пазначана: “Скварнюк Даніла Дзмітрыевіч (1903-1943) – вясковы пячнік, сябар Я.Брыля. Смерць Д.Скварнюка падсказала Брылю тэму апавядання “Memento mori”. Дарэчы, яно лічыцца адным з лепшых у Брыля. Даніла і яго жонка Вольга – сястра Пятра Сяўрука – загінулі ў полымі спаленай фашыстамі вёскі Пузавічы ў ліпені 1943 г. Дарэчы, я добра памятаю Данілу. Яго Вольга – родная сястра маёй маці. Даніла, здаецца ў 1936 г., рабіў печ у нашай новай хаце, яна і сёння служыць. Да цёткі Олі я ездзіў у госці на санях з бабай Юляй. На хутары Данілы ўся сям’я Сяўрукоў (і мая) хаваліся некалькі дзён з самага пачатку вайны.

З сям’ёй Сяўрукоў Янка Брыль падтрымліваў сувязь усё жыццё. Ён прыязджаў у Скідзель, сустракаўся з Марыяй Якаўлеўнай. Заязджаў і са сваім сябрам Уладзімірам Калеснікам, чыталі рукапісы Пятра Сяўрука. Калеснік, складальнік зборніка заходнебеларускай паэзіі “Ростані волі”, уключыў у яго вершы Пятра, сказаў пра яго добрае слова. А першую публікацыю вершаў скідзельскага паэта, як сказана было вышэй, наладзіў Янка Брыль.

Пасля маіх паездак на радзіму Іван Антонавіч нярэдка распытваў у мяне пра скідлян, пра цётку Марыю, яе дзяцей – Пятра і Рыту, перапісваўся з Марыяй Якаўлеўнай, перадаваў ён прывітанні. У адным з пісьмаў, віншуючы мяне з днём нараджэння, напісаў: “Ці думаючы пра Цябе, ці гутарачы з Табой, – заўсёды бачу ў думках Твой родны гарадок, і мне знаёмы з юнацтва, бачу і тую Тваю радню, а маю сябрыну, слаўных людзей Скідзельшчыны – сардэчна незабыўных...”

Упадабаў скідзельскія мясціны **Васіль Быкаў**. Яны – месца дзеяння яго аповесці “Пайсці і не вярнуцца”. У ёй апісаны падзеі, што адбываліся ў ваколіцах горада і ў ім. Зося Нарэйка, галоўная гераіня

аповесці, скідлянка, ураджэнка Скідзеля. Пісьменнік мастацкім словам перадаў настроі, баявы дух скідлян у змаганні з гітлераўцамі. У аповесці даюцца апісанні горада, яго наваколля, Котры, Нёмана. Не зменены іншыя геаграфічныя назвы, у тым ліку вёскі Княжаводцы, якую фашысты спалілі разам з яе жыхарамі. Героі твора маюць мясцовыя прозвішчы.

Раман **Аляксея Карпюка** “Карані” – пра недалёкае мінулае і сучаснасць. Адзін з яго герояў Міхась Васілёк, менавіта ў гэтым творы апісана сустрэча паэта са сваімі землякамі ў Скідзелі. Некаторыя іншыя падзеі таксама адбываюцца на Скідзельшчыне. Маюць стасункі са Скідзелем **Данута Бічэль**, **Юрка Голуб**. Пра іх у Марыі Мазалеўскай засталіся самыя прыязныя ўспаміны. Дануту цікавілі яе ўспаміны пра Пятра Сяўрука, творы якога яна прыняла ў музей М.Багдановіча. Юрка рыхтаваў тэлеперадачу пра яго, напісаў шчыры нарыс у абласную газету. **Зіновій Прыгодзіч** зацікавіўся мінулым Скідзеля. Ён выдаў кнігу пра Скідзельскую школу, на прыкладзе лёсаў яе выхаванцаў расказаў пра вытокі патрыятызму.

Ёсць галіны мастацтва, цесна звязаныя з літаратурай, дзе таксама ярка праявілі сябе выхадцы са Скідзельшчыны. **Любоў Мазалеўская** семнаццацігадовай дзяўчынай, паддаўшыся рэвалюцыйнай рамантыцы, пакінула сваю заможную сям’ю ў Каўшах і падалася ў 1920 г. з Чырвонай Арміяй на ўсход. Лёс кідаў яе па свеце. Л.Мазалеўская атрымала добрую адукацыю, скончыла ў Гродне прыватную гімназію, а ў Маскве – тэатральную студыю (1926 г.). Працавала актрысай, рэжысёрам у віцебскім тэатры імя Якуба Коласа, мінскім імя Янкі Купалы, на кінастудыі, выкладала ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Яна арганізатар, стваральнік і галоўны рэжысёр Беларускага тэатра юнага глядача (ТЮГ) з 1955 г. На мову сцэны пераклала дзесяткі літаратурных твораў класікаў сусветнай літаратуры, беларускіх драматургаў, выконвала ролі ў спектаклях па п’есах Я.Купалы, Я.Коласа, Э.Самуйлёнка і іншых. Знялася ў шэрагу фільмаў на беларускай кінастудыі.

Спявачка і кампазітар **Надзея Мікуліч** нарадзілася ў Скідзелі ў 1953 г. Сучасныя аматары сцэны добра ведаюць яе – з гітарай у руках, з задорным выкананнем народных і сучасных беларускіх песень. Музычную адукацыю атрымала ў Гродне, скончыла музычна-педагагічнае вучылішча. Творчы шлях яе багаты і разнастайны. Выступала як спявачка і музыкант самастойна і ў калектывах – “Верасы”, “Сябры”, “Сузор’е”. Спявала на беларускім радыё, рыхтавала свае праграмы. Пабывала з канцэртамі ў розных краінах свету.

Такая яна – Скідзельшчына літаратурная. Тут повязь часоў. Тут подых пакаленняў.

*Мікалай Дзелянкоўскі*

*Дадатак 2*

**Спіс гаспадароў і кутнікаў мястэчка Скідзель у 1816 г.**

**Гаспадары:**

1. Сцяпан Мацвееў Вітко (40 гадоў), Сцяпана пляменнік Фадзей Вітко (18 г.), слуга Якаў Сцяпанаў Вітко (11 г.);

2. Давід Мікалаевіч Голуб (44 г.), Давыда зяць Васіль Смех (24 г.);

3. Рыгор Станіславаў Размыслоўскі (84 г.), яго сыновец Міхайла (34 г.), Міхайлы сыны Аўгуст (5 г.), Іван (1 г.);

4. Сямён Міхайлавіч Ванюкевіч (31 г.), Сямёна сын Міхайла (2 г.);

5. Ігнат Іванаў Покаш (33 г.), Ігната сын Вікенці (1 г.), шурын Мікалай Астапаў Сіткевіч (25 г.);

6. Іосіф Іосіфаў Злоцкі (34 г.), Васіля Іосіфава Злоцкага сыны Кузьма (10 г.), Вікенці (8 г.);

7. Якаў Адамаў сын Шчыглінскі (40 г.), Якаў Ігнатаў Доля (уцёк у 1815 г.);

8. Іван Кузьмы сын Халецкі (44 г.), пляменнікі Івана Іосіф Пятроў (14 г.), Гаўрыла Пятроў (уцёк у 1815 г.);

9. Мацвей Іванаў Дзялынскі (70 г.), яго сын Іван (26 г.);

10. Андрэй Іосіфаў Чабатарэвіч (25 г.), яго брат Іван (19 г.);

11. Іван Іванаў Жук (памёр у 1812 г.), яго сын Клеменс (23 г.);

12. Венядыкт Сямёнаў Шань (24 г.), яго браты Астап (15 г.), Фёдар (уцёк у 1812 г.);

13. Матэуш Аляксандраў сын Лапацкі (56 г.), Матэуша сын Леон (8 г.);

14. Аляксандр Андрэеў Мілінцэвіч (50 г.):

15. Андрэй Васільеў Гобус (47 г.), Андрэя пасынак Іван Фамы сын Голуб (26 г.);

16. Сямён Станіслававіч Пучкоўскі (28 г.), Сямёна сын Іван (1 г.);

17. Міхайла Іванаў Казека (25 г.), Міхайлы брат Гіляры (23 г.);

18. Гаўрыла Антонаў Гарноўскі (44 г.), Гаўрылы сын Лукаш (5 г.);

19. Матэуш Міхайлаў Кручэўскі (28 г.), Матэуша сыны Іосіф (5 г.), Міхайла (1 г.);

20. Сцяпан Іванаў Гайдук (62 г.);

21. Павел Хведараў Грэцкі (59 г.), Паўла брат Васіль (52 г.), Васіля сыны Іван (памёр у 1812 г.), Іван (1 г.), Паўла брат Мікалай (31 г.)

22. Андрэй Мацвееў Сяўрук (66 г.), Андрэя сын Давід (45 г.), Давіда сын Іван (1 г.), Андрэя сыны Іван (27 г.), Мікалай (8 г.);

23. Лука Іосіфаў Злоцкі (25 г.), Лукі сыны Іосіф (5 г.), Іван (1 г.), Лукі шурын Себасцян Юрьеў Гарноўскі (14 г.), яго брат Іван (аддадзены ў рэкруты ў 1813 г.);

24. Мацвей Юрьеў Сяўрук (памёр у 1812 г.), яго сын Іван (32 г.), Івана сыны Франц (5 г.), Сямён (1 г.);

25. Сцяпан Базылёў Мазалеўскі (памёр у 1813 г.), Сцяпана сын Гаўрыла (7 г.), Сцяпана зяць Міхайла Андрэеўв сын Сяўрук (25 г.), Міхайлы сын Іосіф (1 г.);

26. Іосіф Іосіфаў Трусь (39 г.), Іосіфа сын Леон (5 г.), Іосіфа шурын Андрэй Вайніловіч (памёр у 1812 г.);

27. Захар Іванаў Чамерка (59 г.), Захара зяць Даніла Шань (22 г.);

28. Юры Аляксандравіч Лазук (памёр у 1812 г.), Юрыя сын Аляксандр (56 г.), Аляксандра сыны Сцяпан (памёр у 1813 г.), Іван (1 г.);

29. Васіль Іванаў Голуб (56 г.), Васіля сын Філіп (29 г.);

30. Франц Сямёнаў Шань (41 г.), Францаў сын Давід (7 г.), Франца брат Матэуш (44 г.), Матэуша сыны Іван (памёр у 1815 г.), Цыпрыян (3 г.);

31. Сямён Змітрыеў Мазалеўскі (70 г.), яго сыны Якаў (22 г.), Іван (14 г.), брат Сямёна Гаўрыла (52 г.);

32. Фёдар Антонавіч Мазалеўскі (42 г.), Фёдара сыны Міхайла (12 г.), Ізыдор (2 г.), Фёдара брат Антон (28 г.);

33. Кузьма Цыпрыянаў Лапыш (памёр у 1813 г.), Кузьмы сыны Іосіф (28 г.), Вікенці (12 г.);

34. Сцяпан Іванаў Смех (34 г.), яго сын Іван (памёр у 1813 г.);

35. Фама Іванаў Арцюкевіч (уцёк у 1815 г.), яго брат Іван (памёр у 1812 г.);

36. Сцяпан Іванаў Арцюк (59 г.), Сцяпана зяць Ігнат Мазалеўскі (39 г.), Ігната сын Сцяпан (памёр у 1813 г.), Сцяпана слуга Іосіф Варфаламееў Кузьміцкі (16 г.);

37. Леон Ануфрыеў Чамерка (55 г.), яго слуга Пётр Іванавіч Покаш (23 г.);

38. Адам Фёдараў Бараноўскі (56 г.), Адама сын Пётр (12 г.);

39. Иван Дзмітрыеў Парай (26 г.), Івана шурыны Міхайла Дземьянаў Шафаровіч (памёр у 1813 г.), Дзмітры (памёр у 1812 г.);

40. Лявонці Тамашоў Кашчыц (44 г.), Лявонція сыны Сямён (16 г.), Бенядыкт (10 г.), слуга Рыгор Мішук (уцёк у 1814 г.);

41) Мікалай Александраў Чабатарэвіч (61 г.), Мікалая сыны Іван (у рэкруты ў 1815 г.), Якаў (уцёк у 1815 г.), Гіляры (10 г.);

42. Гіляры Васільеў Мазоль (44 г.), яго сын Цыпрыян (памёр у 1812 г.);

43. Іван Фёдараў Гарноўскі (памёр у 1812 г.), яго сыны Варфаламей (23 г.), Філіп (16 г.), Мацвей (10 г.);

44) Сямён Васільеў Радзевіч (63 г.), Сямёнаў кутнік Іосіф Іванаў Дэмбскі (памёр у 1814 г.);

45) Леон Мартынаў Грэцкі (памёр у 1813 г.), Леона сын Леон (30 г.), слуга Сцяпан Шань (памёр у 1812 г.).

Кутнікі:

1. Якаў Рыгораў Паўлоўскі (19 г.), яго брат Дыянізі (уцёк у 1814 г.);

2. Іосіф Андрэеў Клімовіч (50 г.), Іосіфа зяць Аляксандр Мацвееў Лапацкі (16 г.);

3. Сцяпан Міхайлаў Пратасевіч (59 г.), яго сын Іосіф (12 г.),

4. Ігнат Данілаў Вартынскі (77 г.), яго сыны Якаў (уцёк у 1813 г.), Давід (уцёк у 1815 г.);

5. Давыд Сцяпанаў Лапацкі (19 г.);

6. Давыд Міхайлаў Мілінцэвіч (14 г.), Іван Цыпрыянаў Лапыш (45 г.);

7. Даніла Іванаў Чамерка (40 г.), Данілы сын Кузьма (8 г.), Андрэй Іванаў Лотыш (памёр у 1815 г.), Андрэя сын Франц (12 г.), Аляксандр Астапаў Кавалеўскі (у рэкруты ў 1815 г.), Іван Міхайлаў Стальбоўскі (51 г.), Пётр Філіпаў Вітко (10 г.)

Крыніца: НГАБ у Гродне. Ф. 24. В. 7. С. 34. [Рэвізскія сказкі Гродзенскага павета за 1816 г.]

**Спіс скарачэнняў**

АГАГВ – Архіў грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці

АЛМ – Акты Литоўскай метрыкі

ДАБ – Дзяржаўны архіў у Беластоку

ДАГВ – Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці

КПЗБ – Камуністычная партыя Заходняй Беларусі

КСМЗБ – Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі

НГАБ – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі

НГАЛ – Нацыянальны гістарычны архіў Літвы

РИБ – Русская историческая библиотека

LM – Lietuvos Metrika